Ба233118
117
Б 9.10.83
V
15428

Проф. У. ІГНАТОЎСКІ

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

## Ў XIX І Ў ПАЧАТКУ XX СТАЛЕЦЬЦЯ

ЛЕКЦЫІ, ЧЫТАНЫЯ СТУДЭНТАМ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЭРСЫТЭТУ

ВЫДАНЬНЕ ТРЭЦЯЕ, СТЭРЭОТЫПНАЕ

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК — 1928

Ба

9-87-203.

Ба 233118

1964 г.

Проф. У. ІГНАТОЎСКІ

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

## Ў XIX І Ў ПАЧАТКУ XX СТАЛЕЦЬЦЯ

ВЫДАНЬНЕ ТРЭЦЯЕ,
СТЭРЭОТЫПНАЕ

ЛЕКЦЫІ, ЧЫТАНЫЯ СТУДЭНТАМ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЭРСЫТЭТУ

15428

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва
Менск — 1928

ДЕРЖАВНА ПУБЛІЧНА БІБЛІОТЕКА
19.ОКТ.28
ОДЕСА

233118

Зак. № 71. У ліку 5.000. Галоўлітбел № 434.

1-ая друкарня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

10.03.2010

## Прадмова.

Курс гісторыі Беларусі ў XIX і пачатку XX сталецьця дагэтуль ніколі ні ў водным з унівэрсытэтаў ня чытаўся. Як і агульны курс гісторыі Беларусі, апрацованы і выданы раней, ён першы раз чытаўся ў нашым Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце. У васнову курсу паложаны запісы студэнтаў, што слухалі лекцыі новае гісторыі Беларусі ў 1922-23 акадэмічным годзе. Само сабою зразумела, што пры выкладаньні зусім новага курсу вельмі часта прыходзілася спатыкацца з вялікімі труднасьцямі, перад каторымі ня было часу доўга і дакладна спыняцца. Трэба было ісьці далей і далей.

Ня было таксама магчымасьці падзяліць курс на пэрыоды, бо яшчэ не настаў для гэтага час. Трэба раней больш грунтоўна апрацаваць старыя матар'ялы, набраць і сыстэматызаваць матар'ялы новыя, каб зрабіць правільна гэты падзел.

Як усякая першая праца, лекцыі з гісторыі новых часоў на Беларусі павінны мець і маюць недагляды й недахваты. Тым ня менш кніжку друкаваць трэба. Яна патрэбна, з аднаго боку, для студэнтаў, з другога боку—для настаўнікаў, каторым таксама трэба мець матар'ялы для іх штодзеннай працы па беларусазнаўству ў масавай школе.

Аўтар выражае шчырую падзяку т-шу Я. Лёсіку, каторы згадзіўся ўзяць на сябе працу падабраць адпаведныя рысункі да тэксту кніжкі.

**У. Ігнатоўскі.**

11-га кастрычніка 1924 году.
Маёнт. Горкі, Менскай акругі.

---

233118

Бел. 2005

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна

## Інкорпорацыя Беларусі ў Расійскую імпэрыю.

У XVII і асабліва ў XVIII сталецьцях хуткім крокам ішоў распад Рэчы Паспалітай польскай, у склад каторай з часу Люблінскай вуніі (1569) уваходзілі Беларусь і Літва. Рэзка вызначаны соцыяльны антагонізм, палітычная анархія, нацыянальныя і рэлігійныя спрэчкі бязьлітасна руйнавалі гэтую, на свой манер «клясавую», панскую рэспубліку. Зразумела, што пры такіх умовах гаспадарства жыць далей не магло, і было-бы дзіўным, каб яно не разваліласа. Так званыя падзелы Польшчы былі нічым іншым, як простым вынікам разлажэньня Рэчы Паспалітай, што было зьяўленьнем не надворнага, а ўнутранага характару. Ужо на гатовы баль прышлі, ужо за прыгатаваны стол селі нязваныя і незапрошаныя госьці.

Першы падзел адбыўся ў 1773-4 гадох. На аснове акту гэтага падзелу Расійская імпэрыя атрымала ваяводзтвы—Магілеўскае, Мсьціслаўскае і часьць Полацкага. Гэтыя ваяводзтвы зложылі Магілеўскую губэрню з провінцыямі—Магілеўскай, Аршанскай, Мсьціслаўскай, Рагачоўскай і тры провінцыі Пскоўскай губэрні—Дзьвінскую, Полацкую, і Віцебскую. Увесь гэты абшар у далейшыя часы зложыў Магілеўскую і Віцебскую губэрні. Да Расіі далучылася: скарбовых сялян—199.575, прыватнаўласьніцкіх сялян—316.322, шляхецтва—5.521, мяшчан—127.841; усяго да імпэрыі было прылучана 649.259 чалавек.

Пасьля першага падзелу камандны стан Рэчы Паспалітай нічога старога не забыўся і нічому новаму не навучыўся. Развал гаспадарства не супыніўся. Хатняя барацьба й спрэчкі цягнуліся яшчэ дваццаць год, што зусім аслабіла Польшчу. Зразумела, што суседнія дзяржавы—Прусія, Аўстрыя й Расія, ужо раз пажывіўшыся, пасьпяшылі скарыстаць першы зручны момант. У 1793 годзе адбыўся другі падзел Рэчы Паспалітай. Расія атрымала Менскую вобласьць, з каторай зложылася потым Менская губэрня. Да імпэрыі адышло: скарбовых сялян—81.599, царкоўных і манастырскіх — 111.921, прыватнаўласьніцкіх — 599.741, усяго сялян—793.261.

Праз два гады (1795), ня гледзячы на гэроізм рэформіцкіх шляхецкіх кол, каторыя хацелі рэформамі і дысцыплінаю выратаваць



Алегорычны малюнак падзелу Польшчы.

Польшчу і на чале якіх стаў добра вядомы Тадэуш Касьцюшка, адбыўся трэці і апошні падзел Рэчы Паспалітай. Выратаваць гнілое гаспадарства ўжо ня было ніякай магчымасьці. Па гэтым падзеле імпэрыя дастала Заходнюю Беларусь і Літву, з каторых злажыліся губэрні—

Віленская, Слонімская (Гарадзенская) і Ковенская. Да Расіі па трэцім падзеле адышло насяленьня бяз шляхты 796.333 мужчыны і 771.560 жанч.

Такім чынам, у канцы XVIII сталецьця ўся Беларусь увашла ў склад Расійскай імпэрыі. Вышла так, што з аднэй ужо раскіданай дзяржавы яна ўвашла ў другую, якая таксама не магла пахваліцца сваім здароўем. Мы добра ведаем, што ў канцы XVIII сталецьця Расія з соцыяльнага боку перажывала ўсе хваробы фэўдалізму. Аснову эканомікі імпэрыі складала вясковая гаспадарка. Яна цалком трымалася і грунтавалася на паднявольнай цяжкай працы прыгоннага, прыкутага да панскай зямлі, селяніна, каторы ў тыя часы носіць назву «раба», што кропка ў кропку адпавядае сярэднявяковай фэўдальнай назьве «сэрва» servus—раб). Расійскае земляўласьніцкае дваранства, ня гледзячы на самую інтэнсыўную эксплёатацыю сваіх «рабоў», не дастае даходаў з гаспадаркі, бо ня можа наладзіць яе, як належыць, на капіталістычны манер. Гарады існуюць толькі як адміністрацыйныя цэнтры, а як гандлёвыя пункты яны знаходзяцца ў заняпадзе. Пры панаваньні прыгоннай натуральнай гаспадаркі прамысловасьць і гандаль ня могуць разьвінуцца. Самаўладзтва расійскага імпэратара таксама носіць больш фэўдальны, чым бюрократычны, характар. Цар зьяўляецца першым дваранінам-фэўдалам у сваёй імпэрыі, і царызм ставіць сабе за мэту выключна абарону дваранскіх праў і інтарэсаў. Вялікае тэрыторыяльна і багатае прыроднымі багацьцямі гаспадарства задыхаецца эканомічна, а разам з тым і палітычна. Вось у гэтую затхлую атмосфэру гнілога вялікага організму пападае і Беларусь.

«Апека» над новапрылучанымі землямі новага ўраду пачалася адразу. Пачалі выдавацца ўсялякія прыказы й адозвы. Мы зьвернем увагу на выданы пасьля першага падзелу (1774 г.) агульнага характару прыказ губарнатара Магілеўскай і Пскоўскай губэрань, у склад якіх увашлі прылучаныя часткі Беларусі. Па сутнасьці гэтага прыказу губарнатары гэтых губэрань павінны былі абвясьціць усім насельнікам беларускага краю, што яны цяпер маюць усе тыя правы і вольнасьці, каторымі карыстаюцца старыя падданыя Расійскай імпэрыі. У прыказе было сказана паміж іншым так: «Кожны стан з насельнікаў прылучаных зямель уступае з самага гэтага дня ўва ўсе да яго належныя карысьці (выгады) па ўсім абшары імпэрыі Расійскай». Гэты ўрачысты прыказ гучэў горкаю кпінаю ў адносінах да ўсіх працоўных мас Беларусі. Сялянства, каторае ў Рэчы Паспалітай карысталася ўсімі «выгадамі» «быдла», дастала ў новым гаспадарстве «выгады» рабочага «скота». Прыблізна тыя самыя «выгады» дасталі дробныя рамесьнікі і рабочы люд па гарадох. Буржуазія беларускіх гарадоў ад новых «выгад» таксама прайграла. Яна ў Рэчы Паспалітай мела такі-сякі самаўрад на аснове

вельмі пашыранага Майдэборскага права. Цяпер яна самаўрад страціла, бо мяшчане гарадоў імпэрыі Майдэборскім правам не карысталіся.

Сярод мяшчан, як мы ведаем, па гарадох Беларусі з даўных часоў жыло шмат яўрэйства. Яно ў новым гаспадарстве дастала такую «выгаду», як добра вядомая ўсім нам «черта еврейской оседлости». Фэўдальная імпэрыя добра выявіла свае адносіны да яўрэйства вуснамі «просвещенной» Катарыны II, каторая пераказала словы сваёй зусім не «просвещенной» прадмесьніцы Лізаветы Пятроўны: «От врагов Христовых не желаю интересной прибыли». Цікава тое, што «интересная прибыль» усё-ж такі потым з яўрэйства ўрадам выціскалася. Што гэта так, паказвае выдадзены ў 1794 годзе закон, на падставе якога з тых яўрэяў, каторыя залічваліся ў мяшчане ці ў гандляры, бралі ўдвая больш падаткаў, чым належала браць з мяшчан і гандляроў хрысьціянскага вызнаньня. З гэтага закону пачалося добра вядомае нам паступовае абмежаваньне праў яўрэйства ў Расіі.

Праўда, у 70-ыя годы XVIII сталецьця ў царскім загадзе на імя гэнэрала Крэчэтнікава адносна гарадоў Беларусі, занятых рускімі войскамі, было сказана так: «Гарады заставіць на іх правох і прывілеях на першы выпадак і кожнаму з іх не перашкаджаць прасіць нас (Катарыну II) аб зацьвярджэньні іх (праў і прывілеяў)». Паводле гэтага загаду можна думаць, што гарады з Майдэборскім правам засталіся як «на першы выпадак», так і потым. Але рэч у тым, што «права прасіць» аб зацьвярджэньні прывілеяў засталося толькі правам. На дзеле просьбы не здавольваліся. Гарадзкое жыцьцё на Беларусі замірае. Колькасьць гарадзкога жыхарства вельмі нязначная; яна в нацяжкаю даходзіць да 5-6 процантаў.

Знаходзячыся ў складзе Рэчы Паспалітай, Беларусь выносіла на сваім карку немалыя падаткі. У апошнія часы існаваньня Польшчы за паўгода яна ўкладала ў польскі скарб 172.835 рублёў. Беларусі ня стала лягчэй і потым. Калі яна ўвашла ў склад Расійскай імпэрыі, то падаткі ў скарб ня толькі ня зьменшыліся, але яшчэ больш узрасьлі. Вядома, што за палавіну 1774 году Беларусь павінна была ўлажыць у імпэрскую казну 587.019 рублёў, што ў год складае больш за мілiён рублёў. Такім спосабам, пасьля прылучэньня да Расіі, велічыня падаткаў на Беларусі ўзрасла блізка што ў 6 раз. Калі мы зробім прыпушчэньне, што Беларусь, аслабленая ранейшымі пэртурбацыямі, і ня выканала ўсіх тых падаткаў, якія былі на яе наложаны, то ўсё-ж такі павінны прызнаць, што фінансавая эксплёатацыя, каторай падлегла Беларусь у новым палажэньні, была куды большая, чым у складзе Рэчы Паспалітай. Гэтая эксплёатацыя ўсім сваім цяжарам лягла не на шляхту, а на іншыя групы насяленьня, асабліва на працоўныя нізы.




Што датычыць да беларускага магнацтва й шляхецтва, то ім скардзіцца на сваю долю ня прыходзілася, бо яны наагул добра сябе пачувалі ў Расійскай імпэрыі. Праўда, яны згубілі тую «залатую вольнасьць», каторай карысталіся ў Польскай Кароне, але гэтая страта была

добра акуплена соцыяльна-экономічнымі прыбыткамі Кароны Расійскай. Шляхціц і магнат, як і раней, засталіся панамі, у руках каторых знаходзіліся ўсе выгады ад эксплёатацыі запрыгоненага сялянства. У новай дзяржаве вельмі хутка яны пачалі адчуваць сябе, як дома. Ураду Катарыны II ад шляхты прылучаных беларускіх зямель быў пададзен адрас. Там, паміж іншым, сказана: «Жывучы ня ў Польшчы, мы адчуваем сябе, як-бы ў Польшчы і нават лепш, як у Польшчы». І трэба сказаць, што панства не памылялася. Справа ў тым, што ў Рэчы Паспалітай, пад уплывам францускай рэволюцыі ў канцы XVIII сталецьця, ужо зьявіліся рэформістыя буржуазна-дэмократычнага кірунку. Яны падымалі пытаньне аб соцыяльных і політычных рэформах, у тым ліку і аб сялянскай рэформе. Што датычыць да Расійскай імпэрыі, то сюды ўплывы францускай рэволюцыі папалі куды пазьней, і Расія гэтага часу была далёка ад якога-б то ні было рэформізму. Галасы Новікава і Радзішчава былі зусім няпрыметныя. Шляхту на Беларусі ў новым гаспадарстве ня пужала страшная здань вызваленьня сялян. Шляхта магла быць спакойна.

Толькі невялікая частка шляхты, якая засталася вернаю старому польскаму патрыотызму, не скарыстала «сваіх выгад» і не магла адчуваць сябе ў Расіі, як дома.

Гэта былі найчасьцей шляхціцы-рэформістыя, а часамі і магнаты. Яны не паслухалі загаду прыняць на працягу трох месяцаў прысягу на вернасьць рускаму ураду. Пасьля таго, як назначаны тэрмін скончыўся, яны павінны былі пакінуць межы Расіі, і на іх маёнткі была назначана сэквэстрацыя, г. зн. яны былі ўзяты ў скарб. З шляхецкіх фамілій, што пакінулі Расію ды выехалі ў эміграцыю, нам вядомы, напрыклад, Радзівілы, Агінскія, Чартарыскія, Сапегі, Салагубы і іншыя. Пасьля іх выхаду, у скарб імпэрыі адышло 51 маёнтак, з 110.357 сялянскімі «душамі». Такім спосабам, больш за сто тысяч сялян з прыватнаўласьніцкіх зрабіліся скарбовымі. Калі-б так засталося й надалей, то можна было-б сказаць, што палажэньне гэтых сялян палепшылася, бо, наагул, палажэньне скарбовых сялян было лепшае ад палажэньня сялян прыватнаўласьніцкіх. Але урад вельмі хутка «папраівўся». Атрыманыя ад ранейшых паноў у скарб землі з сялянамі ён сьпешна пачаў раздаваць новым, рускім паном за розныя іх «заслугі» перад тронам. Дзякуючы гэтаму, побач з старым польскім земляўласьніцтвам, на Беларусі пачало расьці новае рускае земляўласьніцтва, каторае зноў узяло ў свае рукі толькі што забраных у скарб беларускіх сялян. Асабліва вялікія падарункі дасталі ад ураду фаворыты Катарыны, каторых, як мы ведаем, было шмат, бо яны часта мяняліся. Князь Пацёмкін Таўрыдзкі дастаў 14.227 душ, граф Румянцаў—13.326 душ, гр. Чарнышоў—5.071, гэнэрал Завадоўскі—4.734, граф Мікіта Панін—3.090, Елагін—3.712,

кн. А. Галіцын—3.152 душы і г. д. За невялікі тэрмін, у якія-небудзь пятнаццаць год на Беларусі было ўтворана для катарынінскіх вяльмож 107 маёнткаў, у якіх налічвалася 94.160 сялян. Праз нейкі час новыя шчодрыя раздачы ня толькі поўнасьцю пакрылі, але нават значна пераважылі лік атрыманых ад сэквэстру ў скарб сялянскіх душ.

Палажэньне беларускага сялянства пры інкорпарацыі Беларусі ў Расійскую імпэрыю нічым не зьмянілася, а потым, з цягам часу, паступова пачало яшчэ больш пагаршацца. Вольнае сялянства старажытных часоў Літоўска-Беларускага гаспадарства к канцу XVIII сталецьця зьнікла. Сяляне гэтага часу дзяліліся на дзьве няроўныя групы: большую групу складалі прыватнаўласьніцкія сяляне, меншую групу—скарбовыя (казённыя) сяляне. Палажэньне апошняй групы было крыху лепшае, чым палажэньне групы прыватнаўласьніцкіх сялян. У скарбовых сялян зямельныя надзелы былі большыя, а павіннасьці і абавязкі меншыя. Апрача таго, над імі ня было такога панскага зьдзеку і гвалту, каторы з дню ў дзень цярпелі сяляне прыватнаўласьніцкія. Паншчына адбывалася абедзьвюма групамі. У скарбовых дварох паншчына займала 3-4 дні на тыдзень, у панскіх маёнтках яна даходзіла з 3 дзён да 7 дзён на тыдзень. У некаторых панскіх дварох, такім чынам, сяляне ўлетку зусім ня мелі сьвяточнага адпачынку. Што датычыць да павіннасьцяй сялян, то яны былі падвойныя: павіннасьць працаю і павіннасьці натураю. Да працоўных павіннасьцяй належалі: фурманачная (падача пану патрэбнага яму ліку фурманак), вартаўнічая (варта панскага дабра), мастовая і падарожная (папраўка шляхаў і мастоў), аблаўная, невадная, вымалатачная і памольная (абавязак вымалаціць і змалоць панскае збожжа) і г. д. Павіннасьці натураю складаліся з чыншавых падаткаў пану хлебам, дамоваю жывёлаю і птаствам, маслам, салам, яйкамі і г. д. Кожны крок селяніна, кожная падзея з яго гаротнага жыцьця злучаліся з якім-небудзь абавязкам на пана.

Апроч экономічнага боку, беларускі селянін быў у поўнай юрыдычнай залежнасьці ад пана, кім-бы апошні ні быў—ці польскім шляхціцам, ці рускім вяльможам. Юрыдычна гаспадарства ня знала прыватнаўласьніцкага селяніна, і ён ня меў беспасрэдных адносін да дзяржавы. Пан быў для свайго селяніна ўсім—і судзьдзёю і адміністратарам. У 1773 годзе урадам Катарыны II быў выдадзены закон, на падставе каторага ўсякі пан атрымлівіў права караць селяніна ўва ўсіх здарэньнях паводле свайго пагляду. Паны тлумачылі гэты закон у свой бок і прыдавалі яму такі сэнс, што яны маюць поўнае права караць сялян назат караю на сьмерць. На гэтай глебе вырасталі такія пышныя кветкі панскага ўціску і самадурства, як добра вядомая ўсім Салтычыха ў Расіі. Селянін, апроч таго, ня меў ніякага права нават паскардзіцца прадстаўніком улады на свайго пана, бо урадам тэй самай Ка-

тарыны II былі забаронены скаргі на сваіх паноў, якія-б гэтыя скаргі ні былі—праўдзівыя ці непраўдзівыя. За ўсякую скаргу на пана, замест яе разгляду, селяніна няшчадна білі бізуном і высылалі ў далёкую Сібір. Зразумела, што пры такіх умовах селянін ня мог адважыцца паскардзіцца на пана, якую-б незаконнасьць ён ні рабіў. Адным словам беларускі запрыгонены селянін, як мы вышэй сказалі, з «быдла» Рэчы Паспалітай польскай зрабіўся «скотиной» імпэрыі Расійскай.

Урад Катарыны II у сваіх дэкрэтах і абвяшчэньнях заўсёды любіў зазначаць, што вельмі клапоціцца аб падтрыманьні «сьвятой» праваслаўнай веры і аб абароне праваслаўнага жыхарства на Беларусі. Трэба, аднак, сказаць, што гэтае падтрыманьне праваслаўнага жыхарства заўсёды было залежным ад таго социяльнага стану, да якога належаў той ці іншы праваслаўны. Ясна, што праваслаўны, калі ён быў запрыгонены, бясправуны селянін, ня меў урадавага падтрыманьня, калі змагаўся з каталіком шляхецкага стану. Інтарэсы социяльна-шляхецкія былі для расійскага ураду выключнымі інтарэсамі, каторым падлягалі ўсе іншыя інтарэсы. Вельмі трывалымі ў гэтых адносінах зьяўляюцца наступныя словы з указу Катарыны II, выдадзенага 17 траўня 1793 г. «Ураднікі, каторыя ў местах і на вёсках маюць нагляд над паліцыяй, павінны пільнаваць, каб, прылучаючы да (праваслаўнай) царквы нашай тых, хто таго хоча (з каталікоў і вуніятаў), не ўзялі гэтыя апошнія за прадлог ухіліцца ад паслушэнства паном сваім ці да іншых сваявольстваў». Рэлігія застаецца рэлігіяй, а ўся сутнасьць жыцьця ў «паслушэнстве» селяніна свайму пану.

## Апошнія годы XVIII сталецьця.

Вызваліўшыся з пут клерыкальна-шляхецкай рэспублікі, Беларусь апынулася ў ланцугох панска-дваранскага, царскага абсолютызму. Абсолютызм гэтага часу прадстаўлен у Расіі вельмі яскраваю асобаю, сынам Катарыны II, Паўлам I. Яго нядоўгае і сумбурнае кіраўніцтва (1796—1801) дае нам добры і тыповы малюнак таго, да чаго магло даходзіць самадурства і сваяволя расійскага царызму. Нават такі шчыры прыхільнік і абаронца рускага самаўладдзтва, як гісторык таго часу Карамзін, называе гэтае кіраўніцтва «царствованием ужаса». І гэта зусім зразумела. Царскі пасад імпэрыі займае нэрвова-хворы, інтэлектуальна-ненормальны чалавек, катораму трэба было хутчэй лячыцца ў больніцы, чым займаць царскі пасад. Сын алькоголіка, заморданы з дзяцінства бязглуздым выхаваньнем мамак і нянек, потым трыццаць год рызыкаваўшы паміж царскім пасадам і Шлісельбурскімі мурамі, Павал I і ня мог быць здаровым, нормальным чалавекам. Каб пераканацца ў гэтым, мы маем шмат фактаў, на якіх спыняцца ня будзем. Даволі зрабіць вынятак з аднаго, выданага ім для Масквы прыказу.

Там, паміж іншым, ёсьць такое цікавае месца: «Абвясьціць усім гаспадаром будынкаў з падпіскаю аб тым, каб яны загадзя, а ўласна, за тры дні давалі знаць у паліцыю, у каго мае быць у доме пажар». (Русская Старина, 1887 год, кн. I, стар. 100). Далей гэтага прыказу ўжо няма куды ісьці. Гэты шалёны чалавек меў вельмі высокі погляд на сябе і на сваё самаўладзтва. «У Расіі», казаў ён ня раз, «вялікі той, з кім я гутару і пакуль я з ім гутару».

На чале ураду, такім спосабам, стаіць чалавек, чыннасьцю якога кіруюць не разумныя мотывы, а нэрвовыя эмоцыі і хворае пачуцьцё. Найперш ад усяго ён абхоплен шалёнаю ненавісьцю да свае мацеры, Катарыны II. Гэта з яе волі афіцэры ў Ропшы забілі яе мужа, а яго айца Пятра III; гэта яна праз забойства незаконна захапіла царскі пасад, каторы павінен быў заняць ён, Павал I. Гэта яна зьдзекавалася доўгія годы над ім, насьледнікам пасаду, і пагражала яму перадачай улады яго сыну Аляксандру і заключэньнем яго, Паўла, у Шлісэльбурскую крэпасьць. Усё, што зроблена ненавісным яму ранейшым урадам яго мацеры, ён лічыць благім, шкадлівым для сябе і падлеглым перамене ці адмене.

Ня меншай ненавісьцю ахоплен Павал I і да францускай рэволюцыі. Яго хворым мазгом вялікі гістарычны акт рэволюцыі прадстаўляецца падзеяй, пакірованаю спэцыяльна й асабіста проціў яго і яго неабмяжованай нічым улады. Гэтае прадстаўленьне аб рэволюцыі ўзмацняецца яшчэ тым, што яна неміласэрна гільётынавала яго асабістых прыяцеляў, пачынаючы з Людвіга XVI і канчаючы яго прыдворнымі, з каторымі ён устанавіў добрыя адносіны ў часы сваёй падарожы заграніцу ў 70-ыя годы XVIII сталецьця. Ненавісьць да мацеры злучылася ў яго хворых мазгох з ненавісьцю да францускай рэволюцыі, бо і Катарыну II ён лічыў рэволюцыянэркаю.

І вось пачалася бязупынная барацьба з круглымі капялюшамі, гарсэткамі, фракамі, катарынінымі фаворытамі і г. д. Ува ўсім цар бачыў прыметы ненавіснай яму рэволюцыі і «рэволюцыянэркі» мацеры. Жыцьцё падданых, асабліва арміі, зрабілася неперарыўным катаваньнем. Дварцовы загавор і забойства Паўла ў ноч на 11 сакавіка 1801 г. былі зусім зразумелым і канечным вынікам з гэтага бязглуздага «царствования ужаса». І ня было ніводнага чалавека, каторы-бы пашкадаваў пазьверску забітага цара. «Як падучы мэтэор, прамільгануў гэты цар», казаў Карамзін, «усе глядзелі на яго, лічачы мінуты, і радаваліся апошняй мінуце».

Адносіны паўлаўскага ўраду да польскага, а разам з тым і да беларускага пытаньня непадобны на адносіны да гэтага пытаньня ўраду Катарыны II. Урад Катарыны з вялікаю ахвотаю і пасьпехам карыстаўся з развалу суседкі і разам з урадамі Прусіі і Аўстрыі рабіў

падзелы Рэчы Паспалітай. Расійская імпэрыя мотывавала свой удзел у разборах Польшчы гістарычнымі правамі на «рускія» землі ў Польшчы, што выразіла ў добра вядомым лёзунгу—«отторженная возвратих» (я вярнула адабранае калісь). Урад Паўла I як-бы спачувае польскай справе і лічыць, што Расія не павінна была ў свой час прымаць удзел у гэтай несправядлівай і недзяржаўнай справе. Яшчэ будучы насьледнікам царскага пасаду, у размове з вядомым польскім песьняром і патрыотам Нямцэвічам, Павал I сказаў так: «Я заўсёды быў проціў падзелу Польшчы; гэтая справа зьяўляецца столькі-ж несправядлівою, сколькі і недзяржаўнаю». Некалькі раз насьледнік расійскага трону, не баючыся нават гневу ўсемагутнай мацеры, выяўляе сваё спачуваньне польскаму дыктатару -рэформісту Тадэушу Касьцюшку.




Мядаль на памяць прылучэньня Беларусі да Расіі.

Зрабіўшыся ўрэшце расійскім імпэратарам, праз дзесяць дзён пасьля ўступленьня на трон (16/XI—1796), Павал I асабіста вызваліў з няволі Т. Касьцюшку, каторы сядзеў заарыштаваны ў ніжнім паверху Мрамарнага палацу ў Петраградзе. Не здаволіўшыся гэтым, новы імпэратар, як-бы ў піку ранейшаму ураду, праз два тыдні выдаў Т. Касьцюшку з дзяржаўнага скарбу падарунак у 60.000 рублёў, што на той час складала вельмі значную суму грошай. Урад ня спыніўся на вызваленьні толькі дыктатара. Указам ад 29 лістапада 1796 году былі выпушчаны на волю ўсе «попавшие в заточение и ссылку по случаю бывших в Польше замешательств». Лічачы падзелы Рэчы Паспалітай гістарычна-несправядлівым і недзяржаўным актам, урад Паўла I аднак-жа зусім ня думаў ліквідаваць іх і аднаўляць Польскую рэспубліку. У размове з польскім «патрыотам» графам Патоцкім Павал I сказаў, паміж іншым, так: «Падзел Польшчы ёсьць факт, які ўжо адбыўся, і з гэтым фактам палякам трэба згадзіцца».

Тым ня менш, апіраючыся на перамену настрою рускага ураду, польскае шляхецтва як у Польшчы, так і на Беларусі, стала пакладаць надзеі адбудаваць Польшчу пры дапамозе рускага ўраду. Паўлу I падаюцца такога характару адрасы й пэтыцыі. Цікавы ў гэтых адносінах політычныя пытаньні менскай шляхецкай дэлегацыі, якая, разам з другімі дэлегацыямі, зьявілася ў Маскву на ўрачыстасьць каранацыі Паўла I. Вітаючы цара ад імя новых яго падданых, дэлегацыя зьвяртаецца да рускага ураду з проэктам некаторых перамен рускай політыкі на Беларусі. Дэлегацыя проэктуе: «Каб у кіраваньні частка кіраўнікоў складалася з прадстаўнікоў польскай нацыі; каб судовыя ўстановы ў краі заставаліся, як і раней, на правох нашых польскіх, на ўласнай мове і на старых парадках; каб памешчыкі, што добра ведаюць законы, у судовыя ўстановы пасаджаны былі». Адным словам, шляхецкая дэлегацыя патрабуе, каб мясцовае полёнізаванае панства было дапушчана ў мясцовае кіраваньне грамадзянскімі справамі на Беларусі, бо толькі гэтае панства ведае старыя «польскія» законы. Трэба зазначыць, што некаторыя пункты гэтых пажаданьняў шляхты былі зьдзейсьнены, і політыка катарынінскага ураду была зьменена.

Вышэй гаварылася, што дэлегацыя прапанавала расійскаму ураду, каб судовыя ўстановы на Беларусі заставаліся, як і раней «на правох польскіх». Пад гэтымі «польскімі» правамі разумелася зусім ня польскае законадаўства, а стары «Статут Вялікага Княства Літоўскага», каторы станавіў сабою плод беларускай законадаўчай творчасьці. Зьявіўшыся ў пачатку XVI сталецьця ў беларускай мове, вытрымаўшы ў ёй тры рэдакцыі, к канцу XVIII сталецьця Статут ужо быў перакладзен з беларускай мовы у польскую і выдаваўся цяпер польскаю шляхтаю за продукт польскай юрыдычнай творчасьці. Так глядзела на Статут і расійская улада.

Калі Беларусь была далучана да імпэрыі, урад Катырыны II забараніў ужываць у судовых установах Беларусі Літоўскі Статут, каторы ён лічыў зборнікам польскіх законаў, і на яго месцы паставіў стары юрыдычны зборнік, утвораны яшчэ Маскоўскім гаспадарствам у 1649 годзе, вядомы пад назваю «Соборного Уложения царя Алексея Михайловича». Гэты зборнік у пачатку XIX сталецьця ўжываўся ўва ўсёй імпэрыі; зразумела, што і Беларусь павінна была прыняць яго ў карыстаньне. «Уложение», напісанае ў 1649 годзе, к пачатку XIX сталецьця зрабілася ўжо зусім неадпаведным судовай практыцы і для Расійскай імпэрыі наагул, як зборнік вельмі застарэлы. З цягам часу да яго было дададзена шмат усялякіх пазьнейшых указаў як у мэтах адмены, так і ў мэтах тлумачэньня і зьмены старых указаў. Усё гэта ўносіла ў зборнік, які меў практычныя мэты, вялікую блутаніну і неразьбярыху, што давала бязьмежны прастор для судовага злоўжывань‑

ня і самавольства і для таго суцяжніцтва, каторым так славілася старасьвецкая Расія. Не дарма злажылася аб гэтым рускім законе пагаворка, што ён «як дышла: куды павярнуў, туды й вышла». Ведаючы аб недахватах «Уложения», яшчэ Пётра I ў свой час думаў злажыць новы юрыдычны зборнік, але ў яго часы не ўдалося зьдзейсьніць гэтую думку. Пасьля яго сьмерці ў 1767 годзе думала злажыць «Новое Уложение» Катарына II, але з яе шырокіх і громкіх спроб таксама нічога ня вышла. Так і застаўся існаваць у імпэрыі гэты стары зборнік XVII сталецьця, які зусім ня мог здавальняць патрэб новага жыцьця. Што датычыць да Беларусі, то тут «Уложение царя Алексея Михайловича» не падходзіла яшчэ і з тае прычыны, што яно злажылася на чужым грунце ў зусім неадпаведных для Беларусі абставінах—як экономічных, так і політычных. Для Беларусі «Соборное Уложение» было ня толькі застарэлым, але й чужым, нязвыклым прававым зборнікам. Дзеля гэтага недахваты яго былі тут асабліва глыбокімі й балючымі.

Павал I пашоў на спатканьне пажаданьням польскай шляхты на Беларусі, якія яна выказала ў сваім проэкце, і згадзіўся на тое, каб «судовыя ўстановы засталіся ў краі на правох польскіх». Такім спосабам, замест «Соборного Уложения», дзейным правам на Беларусі зноў зрабіліся нормы «Статуту Вялікага Княства Літоўскага», каторы ў часы Катарыны быў забаронен на Беларусі. Хоць нормы Статуту за доўгі час яго існаваньня шляхта і прыстасавала да сваіх прыгонных інтарэсаў, але ўсё-ж такі яны карысна розьніліся ад «Соборного Уложения» як сваім зьместам, так і сыстэматызацыяй. Апроч таго, карная частка «Статуту» была больш культурная, чым адпаведная частка «Соборного Уложения». Да карыстаньня Статутам беларускія масы звыклі, ім лягчэй было разьбірацца ў яго артыкулах. Разам з гэтым урад Паўла I дазволіў аднавіць некаторыя з судовых устаноў, каторыя існавалі на Беларусі да інкорпорацыі яе ў склад імпэрыі.

Што датычыць політыкі ў адносінах да рэлігійных вызнаньняў, то і тут мы бачым, што урад Паўла I адмовіўся ад сыстэмы ранейшага ураду. Раней панавала тэндэнцыя пашырыць сярод насяленьня Беларусі праваслаўе за кошт нялюбага каталіцтва і вуніяцтва. Наадварот, урад Паўла I зусім выразна выяўляе свае сымпатыі да каталіцтва. Трэба заначыць, што з самога канца XVIII сталецьця ня толькі Павал, але і вярхі рускай арыстократыі апынуліся пад моцным уплывам каталіцтва.

Яшчэ будучы маладым, у часы сваёй падарожы па Заходняй Эўропе (70-ыя годы XVIII сталецьця), Павал I быў, паміж іншым, і ў Рыме. Там ён асабіста пазнаёміўся з рымскім папаю Піем VI. Папа, хоць і ня быў добрым політыкам свайго часу, але зразумеў, што трэба зрабіць усе крокі, каб утварыць з расійскага цэсарэвіча прыхільніка каталіцкай веры і папскага пасаду. Гэта папе і ўдалося зрабіць. Ужо ў

гэты самы час Павал зацікавіўся Мальтыйскім духоўна-рыцарскім ордэнам, каторы дажываў свой век. Праз нейкі час будучы расійскі цар запісаўся ў ордэн і атрымаў званьне рыцара. Калі Павал зрабіўся імпэратарам, то ён не здаволіўся званьнем звычайнага радавога рыцара, а атрымаў тытул гросмэйстра ордэну і да самае сьмерці лічыў сябе абаронцам гэтага каталіцкага ордэну.

Шалёная ненавісьць паўлаўскага ураду да францускай рэволюцыі таксама павінна была выклікаць асаблівую ўвагу да каталіцтва. Справа ў тым, што урад добра ведаў, што каталіцтва было больш прыстасована да барацьбы з рэволюцыйнымі ідэямі і рухам, чымся другія рэлігіі, у тым ліку, напрыклад, і праваслаўе. Каталіцтва, як сыстэма, мела старую, добра пабудованую організацыю і паслухмяную, цэнтралізованую і дысцыплінованую іерархію. Каталіцкае духавенства, як нежанатае, больш было рухавым і незалежным ад абкружаючых яго абставін жыцьця. Выхаваньне і адукацыя каталіцкіх сьвяшчэньнікаў ставілі іх кваліфікацыю куды вышэй ад кваліфікацыі сьвяшчэньнікаў праваслаўнач і вуніяцкай веры. Недарма каталіцкая царква насіла назву ваяўніцкай царквы. Організацыю яе ўзмацнялі розныя духоўныя ордэны, на чале каторых стаяў такі дысцыплінованы і багаты сіламі ордэн, як ордэн езуітаў. Ня гледзячы на рэпрэсіі, каторыя пасыпаліся на яго з апошняй чвэрці XVIII стал., ён існаваў і амаль што не па ўсёй зямлі раскінуў сетку сваіх установ. Дзякуючы ўсяму гэтаму, каталіцтва, як сыстэму, урад Паўла I лічыў, што яго трэба не аслабляць, а ўзмацняць.

Адразу былі прыпынены тыя «добравольныя» прылучэньні каталікоў і вуніятаў да праваслаўнай царквы, каторыя часта практыкаваліся мясцоваю адміністрацыяй і вельмі падтрымоўваліся цэнтральным урадам Катарыны II. Гэтыя прылучэньні «отторженных» у часы ранейшага кіраваньня павялічвалі лік праваслаўных на Беларусі і лікам аслаблялі каталіцтва й вунію. У часы Паўла пачаліся адваротныя адходы прылучаных да праваслаўя ў свае ранейшыя веры.

Не бяз уплыву ураду, якраз у гэтыя часы беларускі вуніяцкі епіскап Анастас Братаноўскі падаў уладзе дакладную запіску, у каторай ён даводзіў, што вуніяцкая царква сваёю навукаю знаходзіцца ў сьціслай сувязі з каталіцкай царквою. Адсюль ён рабіў вывад, што вуніяты павінны ў ерархічных адносінах быць падлеглымі каталіцкай царкве ў Расіі. Згодна з асноўнаю думкаю А. Братаноўскага, урад Паўла выдаў адпаведны загад, на падставе каторага вуніяцкая царква падлягала кіраўніцтву рымска-каталіцкай колегіі ў Расіі. Такім спосабам, беларусы-вуніяты ў Расіі, як раней і ў Рэчы Паспалітай, ізноў падпалі пад уладу каталіцкай іерархіі. Пачаліся масавыя як добравольныя, так і недобравольныя пераходы з вуніі ў каталіцкую веру. Рэлігійнае пытаньне і рэлігійная барацьба на Беларусі зноў абвастрылася.

У часы Паўла I Беларусь атрымала новы адміністрацыйны падзел. У часы Катарыны II лік губэрань у імпэрыі быў значна павялічан параўнальна з пятроўскім губэрніяльным падзелам. У пачатку XVIII сталецьця Расія складалася з 11 губэрань, пры Катарыне II імпэрыя была падзелена на 50 губэрань. Такім спосабам, вынікла 39 новых губэрніяльных гарадоў. Разам з тым лік паветовых гарадоў павялічыўся на 200. Новыя гарады, як вытвараныя не на экономічным грунце, былі не прамысловымі і гандлёвымі пунктамі, а проста адміністрацыйнымі цэнтрамі губэрань і паветаў. Новая адміністрацыя патрабавала шмат выдаткаў на сваё ўтрыманьне. Маючы на мэце скарачэньне выдаткаў, урад пастанавіў зьменшыць лік губэрань і паветаў у імпэрыі, у сувязі з чым і быў выдадзен адпаведны указ 12 сьнежня 1796 году. Што датычыцца да Беларусі, то тут гэты указ рэалізаваўся ніжэйпаданым спосабам. Быўшая Магілеўская губэрня і тры провінцыі губэрні Пскоўскай (Дзьвінская, Полацкая і Віцебская) злажылі адну Беларускую губэрню, галоўным горадам якой быў назначан Віцебск. У пазьнейшыя часы Беларуская губэрня была разьбіта на Магілеўскую і Віцебскую губэрні. Менская губэрня засталася бяз усякіх перамен; галоўным горадам яе быў Менск. Быўшыя губэрні—Віленская, Слонімская (Горадзенская) і Ковенская злажылі адну Літоўскую губэрню, галоўным горадам якой была назначана Вільня. У пазьнейшыя часы Літоўская губэрня ізноў разьбілася на тры—Віленскую, Горадзенскую і Ковенскую губэрні.

Палажэньне сялянства на Беларусі ў канцы XVIII сталецьця ніскολькі не палепшылася. Урад раздае казённыя землі паном за іх «заслугі» перад тронам направа й налева. Дзякуючы гэтаму, скарбовыя сяляне пераходзяць на палажэньне сялян прыватнаўласьніцкіх, ад чаго палажэньне пагаршаецца. Раздачы зямель у часы Паўла робяцца яшчэ шчадрэйшай рукою, чым у часы царыцы Катарыны. Для прыкладу дагэтуль прывесьці лік сялянскіх душ, разданых тым і другім: Катарына II за 34 гады свайго доўгага панаваньня раздала сваім вяльможам і фаворытам 800.000 сялян, а Павал I за 4 гады свайго вельмі кароткага панаваньня пасьпеў раздаць 600.000 сялянскіх душ. Урад Паўла I раздае шчодраю рукою дзяржаўныя землі і на Беларусі. Землі раздаюцца паном бяз розьніцы іх нацыянальнасьці: і рускім, і паляком. Хто атрымаў больш зямель—трудна сказаць, але для палажэньня разданых з землямі беларускіх сялян гэта было ўсё роўна. Найперш ад усяго урад у парадку амністыі зварочвае сэквэстраваныя маёнткі тым польскім паном, каторыя згубілі свае двары ў часы Катарыны II. Такім парадкам, атрымалі назад свае землі ці ўзялі іншыя ўзамен сваіх такія «патрыоты», як Патоцкія, Чацкія, Вяшкевічы і інш. Апроч таго, урад, не зважаючы на політычную небясьпеку для імпэрыі ад

23318




Дзяржаўная
бібліятэка БССР
імя У. І. Леніна

233118

павялічэньня ў краі польскага земляўласьніцтва, раздае і нанова землі польскім шляхецкім фаміліям, напрыклад, Ажароўскім, Забелам, Парчэўскім і інш. Паўлаўскі урад не забываецца і аб сваіх уласных рускіх дваранах. Атрымалі на Беларусі зямлю—Мезенцава, поэта Дзяржавін, Мельнікаў, Убра і г. д. Як вынік гэтых раздач, на Беларусі зьяўляецца павялічэньне ліку прыватнаўласьніцкіх прыгонных сялян і зьмяншэньне ліку скарбовых, дзяржаўных сялян. Адным словам, ідзе павялічэньне, лічбены ўзрост прыгоннага права.

Экономічны стан беларускага сялянства ў апошнія годы XVIII ст. нявымоўна цяжкі. Усе тагочасныя крыніцы, асабліва запіскі сучасьнікаў даюць нам у гэтым кірунку шмат яскравых матар'ялаў. Вельмі тыповым апавядацелем сялянскага быту таго часу на Беларусі зьяўляецца добра вядомы пісьменьнік катарынінскай эпохі, «певец богоподобныя царевны Фелицы» Г. Р. Дзяржавін. У паўлаўскія часы ён меў поўную магчымасьць добра пазнаёміцца з палажэньнем сялянства на Беларусі. У 1800 годзе ён дастаў ад ураду даручэньне прасачыць на месцы за прычынамі страшнага голаду, што быў тады на Беларусі. Каб выканаць гэтае даручэньне, ён аб'яжджаў цэлы рад мясцовасьцяй. Апроч таго, «певец Фелицы» быў памешчыкам на Беларусі. Яшчэ ў 1777 годзе за сваю поэзію ён атрымаў маёнтак у 274 душы ў Невельскім павеце. Дзяржавін, добра знаёмы з беларускім селянінам, так піша аб яго палажэньні ў сваёй справаздачы ураду. «Хотя жители ее (Белоруссии) и употребляют пушной или пополам с мякиной хлеб, покупая оный или брав взаймы, но сие и в самые лучшие хлебородные годы обыкновенно в том краю бывает, особенно весной до новой жатвы. Другіе пятую долю ржи с четыремя частями мякины мешают, а иные едят вареный щавель или из отрубей и выжимок вареную кислицу; при чем они по привычке и нужде в довольном равнодушии обретаются». З гэтых слоў мы бачым, што селянін на Беларусі ня толькі ў часы неўраджаю, але і ў звычайныя часы ня можа пахваліцца сваёю сытасьцю. Хлеб з мякіны, вотрубі, шчаўе і іншыя сурогаты замяняюць для яго аржаны хлеб. Дзяржавін, хочучы пацешыць урад, даносіць яму, што, ня гледзячы на пастаянны голад, беларускі селянін так звык да нужды, што зусім не абураецца, а «обретается в довольном равнодушии», падобна грэцкаму філёзофу стоіцкае школы. Факты таго часу нам ясна гавораць, што ў заўсёды галоднага беларускага сялянства якраз ня было філёзофскага, стоіцкага «равнодушия». Селянін і на Беларусі, як і ўва ўсёй Расіі, быў благім філёзофам: ён не здавальняўся сваім палажэньнем і шукаў лепшай долі, шукаў, як мог. Форма організаванага паўстаньня яшчэ была для яго недаступна, і ён пачаў протэставаць у форме бунтоў. У канцы 1796 і пачатку 1797 году па ўсёй Беларусі йдуць сялянскія бунты

процiў паноў. Асабліва абвострываюцца і ўзмацняюцца шырокія бунты ў Полацкай провінцыі. Ня гледзячы на неорганізованасьць бунтоў, мы бачым, што сялянства ўжо добра ведае, што яно галадуе, дзякуючы эксплёатацыі паноў: бунты непасрэдна пакірованы процiў панскай эксплёатацыі. Бунты адбываюцца ў маёнтках як рускіх, так і польскіх паноў, бяз розьніцы ў нацыянальнасьці. Большасьць бунтоў адбываецца ў польскіх маёнтках толькі таму, што паноў-палякоў на Беларусі было куды болей, чым паноў-рускіх. Ня гледзячы на раздачу урадам зямель рускім вяльможам і дваранам, рускае земляўласьніцтва яшчэ нязначна пашырылася на Беларусі. Сялянскія бунты часта не маглі быць спынены аднэй поліцэйскаю сілаю і шмат дзе падаўляліся войскам. Толькі к сярэдзіне 1797 году бунты былі ліквідаваны з вялікаю жорсткасьцю.

У гэты-ж самы час, 5-га траўня 1797 году, у дзень урачыстасьці царскай каранацыі, урадам быў выдан маніфэст, каторы загадваў: «Дабы никто и ни под каким видом не дерзал в воскресные дни принуждать крестьян к работам». Апроч таго, у далейшых словах маніфэст вызначаў, што «для сельских изделиев остающиеся в неделе шесть дней, по равному числу оных вообще разделяемые, как для крестьян собственно, так и для работ их, в пользу помещиков следующих, при добром распоряжении достаточны будут для удовлетворения всяким хозяйственным надобностям».

Калі мы ўглядаемся ў гэты «сэрдабольны» для сялянства маніфэст, то бачым, што ён у першай частцы, прыведзенай намі вышэй, зьмяшчае загад аб абавязковым сьвяткаваньні нядзелі. Што датычыць да другой часткі, аб ня больш як трохдзеннай паншчыне, то тут ніякага загаду няма. Паном маніфэст дае проста бацькаўскую параду, што ім «при добром распоряжении» выстарчыць і трохдзеннай у тыдзень сялянскай працы. Гаварыць аб якім-небудзь значэньні гэтага царскага маніфэсту ня прыходзіцца. Ён ня мог палепшыць і не палепшыў сялянскага палажэньня. Селянін у хрысьціянскай «благоверной» дзяржаве Расійскай атрымаў права сьвяткаваць нядзелю, на што ён меў права і бяз гэтага маніфэсту. Як раней, так і цяпер законнае права на сьвяткаваньне нядзелі засталося пустым гукам. А парада адносна трохдзеннай у тыдзень паншчыны цьвёрда выконвалася панаамі толькі тады, калі селянін дагэтуль працаваў на пана менш, як тры дні ў тыдзень.

Школьная справа на Беларусі ў апошнія годы XVIII сталецьця мае па асобных губэрнях такі выгляд. Руская школа прасякае на Беларусь з усходу на захад. Найбольш рускіх школ было ў беларускай губэрні (Магілеўшчына і Віцебшчына). Чатырохклясавыя школы былі толькі дзьве, у галоўных гарадзкіх пунктах: Магілеве і Віцебску. Больш было двухклясавых школ, каторых у губэрні налічвалася сем. Яны

знаходзіліся ў меншых гарадох, каторыя потым сталі на чале паветаў (Полацак, Невель, Вяліж, Мсьціслаў, Ворша, Чэрыкаў і Чавусы). Былі дзьве школы, каторыя насілі спэцыяльны характар, гэта—Шклоўскі кадэцкі корпус і Магілеўская праваслаўная духоўная сэмінарыя. Што датычыць да польскіх школ, то сетка іх была куды гусьцейшая і кваліфікацыя іх была вышэйшая. Адных толькі езуіцкіх колегіумаў было сем—шэсьць поўных і адзін няпоўны. Поўныя колегіумы былі ў Полацку, Віцебску, Дзьвінску, Магілеве, Мсьціславе і Воршы, няпоўны—у Чачэрску. У Талочыне была пяцёхклясавая базыліянская школа. Апроч таго, у губэрні існавалі школы і другіх манашацкіх ордэнаў, напр., домінікан, піараў (Валынцы, Ушачы, Віцебск). Існавала шмат пачатковых, так званых парафіяльных (прыходзкіх) школ пры каталіцкіх і вуніяцкіх манастырох і царквах. Па Менскай губэрні мы ведаем толькі адну рускую школу ў Рэчыцы; польскіх зарэгістраваных школ налічваеца восем (Менск, Мазыр, Бабруйск, Слуцак, Пінск, Несьвіж, Халапенічы, Паставы). У Менскай губэрні, як у Беларускай, школы вельмі часта ўтрымліваліся манашацкімі ордэнамі (базыліяне, піары). У Слуцку існавала адна кальвінская школа. У Літоўскай губэрні (Віленшчына, Горадзеншчына і Ковеншчына) рускіх школ зусім ня было. Там існавалі выключна польскія школы. На чале іх стаяла віленская езуіцкая акадэмія, што абярнулася ў пачатку XIX сталецьця ў унівэрсытэт. У акадэміі налічвалася каля 250 студэнтаў. Выкладаньне навук у акадэміі адбывалася ў лацінскай мове; польская мова толькі што яшчэ ўводзілася, як выкладовая мова ў школах. Як і ў першых дзьвюх губэрнях, шмат школ знаходзілася на ўтрыманьні манашацкіх ордэнаў (20 школ). Вядомы школы базыліянскія (4), піарскія (5), домініканскія (3), бэрнардынскія (3) і г. д.

Усе школы на Беларусі працуюць паводле навуковага пляну і статуту Адукацыйнай Комісіі, якая засталася яшчэ ад часу Рэчы Паспалітай: Былі школы, дзе ўжывалася і беларуская мова, напр., у школах базыліянскіх і парафіяльных. Наогул, беларускаю моваю карыстаюцца часта ў вуніяцкіх школах.

## Урад і яго адносіны да Беларусі ў першай чвэрці XIX сталецьця.

У ноч на 11 сакавіка 1801 году забойствам «божьего помазанника» закончылася панаваньне «ужаса». На царскі пасад праз труп бацькі ўваходзіць сын Паўла, Аляксандар I. Вярхі грамадзянства і прыдворныя колы сустрэлі яго цараваньне з надзеямі і радасьцю. Выхаваны на прынцыпах сантымэнтальнага лібэралізму, ён быў тыповым прадстаўніком дваранскай інтэлігэнцыі свайго часу. Многа гаварылася, многа пралівалася сьлёз радасьці й смутку, а суровае жыцьцё

йшло сваёю чаргою, вусім не паддаючыся ўплыву гэтых бязгрунтоўных аранжарэйных гістарычных тыпаў. Пачыналі гэтыя людзі з галосных бліскучых слоў, а канчалі ці нікчэмнымі, ці брудными справамі. Яны напамінаюць нам тыя тыпы інстытутак, каторых выхоўвалі жаноцкія закрытыя школы дарэволюцыйнай Расіі. Раней ахі і охі, наіўны сантымэнтальны ідэалізм, погляд на сьвет праз ружовыя акуляры, а потым грубае мяшчанства.



Панскія жаночыя ўборы ў пачатку XIX ст.

Вельмі яскрава намаляваў гэты тып людзей у пачатку XIX сталецьця Пушкін у сваім романе «Евгений Онегин» у васобе старой Ларынай. Як птушка з гнязда, выпархнула яна з «благородного» інстытуту, дзе яе вучылі «чему нибудь и как нибудь». Яна мела далікатнашляхецкія манеры, ведала францускую мову ляпей за рускую, была закахана ў вычытанага з сантымэнтальных романаў гэроя, пісала сьлязьлівыя вершы ў альбомы сваім таварышкам, простую Параску называла «Полиною» і г. д. А потым, зрабіўшыся па волі сваіх бацькоў жонкаю вясковага памешчыка, яна хутка і бязбольна забылася аб сваіх інстытуцкіх прычудах. Яна кінула вершы і романы, занялася дамоваю гаспадаркаю ў умовах паншчыны і прыгону, саліла на зіму грыбы, варыла канфітуры, апранула халат і чапец, біла сваяручна пакаёўку. Яе ў мінулым сантымэнтальныя мазгі дадумаліся прымусіць сенных дзяўчат, калі тыя зьбіралі ў садзе ягады, сьпяваць песьні, каб іх «лукавые уста» часам не пажывіліся панскімі ягадамі.

Зусім такім тыпам быў новы расійскі цар і яго прыдворныя. Пачалося з таго, што ўсяўладны монарх задаўся мэтаю «ограничить произвол нашего правительства», г. зн. абмежаваць самаго сябе, «устанавіць на ўсім сьвеце рэспублікі» і г. д., а окончылася вялікаю рэакцыяю. Пачалося рэволюцыянэрам, рэспубліканцам Лягарпам, а кончылася рэакцыянэрам дэгэнэратам Аракчэевым.



Адам Чартарыскі.

Заняўшы царскі пасад, Аляксандар I утварыў каля сябе асобны, што ня ўходзіць у склад агульных дзяржаўных установ, так званы Інтымны Комітэт. Найчасьцей Аляксандар, патураючы тады францускім рэволюцыянэрам, называў яго „Komitet de salut republique". Гэта была асабістая дарадчая установа пры асобе цара, дзе разглядваліся і абгаварваліся за шклянкаю гарбаты прынцыповыя пытаньні і фантастычныя проэкты будучай Расіі, каторую ўтворыць урад Аляксандра I. У склад Інтымнага Комітэту ўваходзілі асабістыя прыяцелі маладога самаўладцы, з такім самым сьветапаглядам і настроем, з такім самым загартаваньнем, як і ён сам. Гэта былі чатыры чалавекі: Качубей, Новасільцаў, Строганаў і вядомы польскі «патрыот» Адам Чартарыскі. Вельмі часта ў Комітэт наведваўся стары настаўнік Аляксандра—Лягарп. У сваіх поглядах на Беларусь Комітэт знаходзіўся пад уплывам Чартарыскага. Само сабою зразумела, што на Беларусь усе сябры Комітэту, не выключаючы й цара, глядзелі вачыма Чартарыскага. Беларусь ёсьць частка Рэчы Паспалітай, прылучаная пасьля падзелаў да Расійскай імпэрыі. Такім спосабам, беларускае пытаньне злучаецца неразрыўна з польскім пытаньнем і будзе выяўляцца разам з ім ня толькі ў першую чвэрць XIX сталецьця, але і ў далейшыя часы. На думку сяброў Інтымнага Комітэту Беларусь павінна ўвайсьці ў склад адноўленай, будучай Польшчы, як яе неразрыўная частка. Лібэралізм першых год аляксандраўскай эпохі будзе стаяць на гэтым поглядзе, пакуль не спаткнецца з суровай міжнароднай політыкай і з сваім хатнім консэрватызмам і рэакцыяй.

Гэты консэрватызм існаваў ужо ў частцы ўраду і быў прадстаўлен даволі популярнымі і моцнымі консэрватарамі таго часу, на чале каторых стаялі—чалавек старой, катарынінскай эпохі, поэта Дзяржавін

і «гісторыограф» імпэрыі Карамзін. На іх погляд, Беларусь ёсьць «искони русский край», вотчына яшчэ маскоўскіх князёў, каторая павінна заўсёды заставацца за Расіяй. Такім спосабам, у самым пачатку XIX сталецьця вытвараюцца два процілеглыя погляды на Беларусь, каторыя потым на працягу ўсяго сталецьця будуць змагацца паміж сабою і зацямняць праўдзівую істоту беларускага пытаньня. З аднаго боку будзе громка крычаць «истинно-поляк» разам з рускімі лібэраламі, з другога боку—«истинно-русский», і за імі ня будзе чутно слабога голасу беларуса, каторы ня можа крычаць з прычыны рэальнага характару.

Погляд консэрватыўных кругоў на беларускае пытаньне ў пачатку цараваньня Аляксандра I не бярэцца пад увагу ў агульнай палітыцы. Ён выплывае палітычна крыху пазьней, калі скончыцца лібэралізм ураду. Пакуль што ў вышэйшых урадавых колах пануе погляд на Беларусь, які вытварыўся ў Інтымным Комітэце пад уплывам А. Чартарыскага.

Трэба сказаць, што ня толькі рускае грамадзянства, але і рускія вучоныя хоць і цікавіліся, але яшчэ зусім мала ведалі, што такое Беларусь і беларусы ў сваім мінулым і цяперашнім. Перад намі падарожныя запісы вучонага чалавека, акадэміка Расійскай Акадэміі Навук В. М. Севергіна, каторы ў 1803 годзе зрабіў навуковую падарожу па Беларусі, цікавячыся толькі што прылучаным краем. Запісы акадэміка зьявіліся ў друку ў дзьвёх кніжках, пад назвамі: 1) «Записки путешествия по западным провинциям российского государства» (1803 г.) і 2) «Продолжение записок путешествия» і г. д. (1804 г.). Севергін—выдатны вучоны свайго часу ў галіне мінэралёгіі і хіміі, апроч таго, ён наагул ставіў сваім заданьнем пазнаньне Расіі і пашырэньне вед сярод грамадзянства. Зразумела, што ў часы сваёй падарожы ён мог добра разабрацца ў пытаньнях, блізкіх да сваёй спэцыяльнасьці. Што датычыць другіх галін жыцьця Беларусі, то тут, ня гледзячы на сваю вучонасьць, ён зусім ня можа ў іх разабрацца. Ён даволі наіўна вызначае, што на Беларусі ёсьць нават праваслаўныя цэрквы. Яго, незнаёмага з гісторыяй Беларусі, гэты факт вельмі дзівіць; таксама дзівіць і тое, што набажэнства ў гэтых цэрквах надта падобна на набажэнства, якое адпраўляецца ў цэрквах цэнтральнай Расіі; што рызы тутэйшых папоў падобны на рызы папоў у Расіі; што чытаюць і сьпяваюць на Беларусі па такіх самых славянскіх кнігах, як і ў Расіі. Тым ня менш, акадэмік зусім неспадзявана для нас называе ўсіх насельнікаў Беларусі схізматыкамі. Відаць, што аўтар зусім не зразумеў быту Беларусі, які вырас на рэальных умовах мінулага жыцьця.

Як зазначалася раней, адносіны новага аляксандраўскага ураду да Рэчы Паспалітай, а ў тым ліку і да Беларусі, ёсьць па настрою



Беларуская вёска ў пачатку XIX ст.

такія самыя, як і ранейшага паўлаўскага ўраду. Аляксандар I і Інтымны Комітэт спачувае падзеленай Польшчы і польскім патрыотам. Такія адносіны да Польшчы і яе падзелаў Аляксандр I выявіў яшчэ ў часы цараваньня Катарыны II, выяўляў і пазьней.

Яшчэ ў канцы 1795 году ў Пецярбург прыехалі прадстаўнікі польскай фаміліі Чартарыскіх, каторая ў астатнія часы існаваньня Польшчы грала вялікую ролю ў яе справах. Гэта былі браты Чартарыскія—Канстантын і Адам, аб каторым мы ўжо гаварылі раней. Вясною 1796 году паміж Аляксандрам, будучым імпэратарам, і Адамам Чартарыскім у садзе Таўрыдзкага палацу была цікавая гутарка, каторая адбывалася тры гадзіны. Гутарку з Аляксандрам Чартарыскі потым дакладна апісаў у сваіх мэмуарах. (Memoires du prince A. Czaroryski Paris, 1887, т. I.).

Прывядзем вынятак з названай вышэй гутаркі. «Ён (Аляксандар) сказаў мне, што ён ня згодзен з поглядамі і правіламі двару і габінэту; ён зусім не спагадае політыцы і спосабу дзейнасьці сваёй бабкі (Катарыны). Усе яго жаданьні былі на старане Польшчы і мелі сваёю мэтаю посьпех яе слаўнай барацьбы. Касьцюшка ў яго вачох быў вялікім чалавекам па свайму дабрадзейству і яшчэ затым, што ён бараніў справу людзкасьці і справядлівасьці». Як кажа Чартарыскі, Аляксандар прасіў яго захаваць гэтую гутарку ў глыбокай тайне і нікому нічога не гаварыць аб ёй, апроч брата. Просьба Аляксандра зусім зразумела, калі прыняць пад увагу настрой катарынінскай політыкі ў адносінах да Рэчы Паспалітай. Ясна, што Чартарыскі прыняў пад увагу прыхільныя да Польшчы словы будучага расійскага самаўладцы, каб пачаць далейшую політыку Польшчы ў сувязі з політыкай Расіі, што мела зьмяніцца. З далейшых слоў мэмуараў відаць, што Чартарыскаму, як польскаму патрыоту, настрой будучага галавы расійскага ураду быў вельмі прыемны. «Я перадаў брату аб гэтай гутарцы і, падзяліўшыся паміж сабою нашым захапленьнем і нашым зьдзіўленьнем, мы разам пачалі марыць аб яскравай будучыне, каторая, здавалася, адчынялася перад намі». (Memoires).

Пасьля ўступленьня на царскі пасад Аляксандра I, польскі патрыотызм мае падставу для сваіх надзей. Падгатаўляецца плян аднавіць Рэч Паспалітую ў межах 1772 году, утварыўшы дынастычную сувязь яе з Расійскай імпэрыяй праз асобу Аляксандра I. Адначасна з гэтым, у другой частцы польскіх патрыотычных кругоў вырастае яшчэ адзін плян: зьвязаць долю Польшчы з імем рэволюцыйнай Францыі. Там пачынае ўсходзіць сонца Напалеона, раней, як галоўнакамандуючага эгіпэцкай арміяй, потым, як консула і ўрэшце, як імпэратара французаў. З гэтым сонцам частка польскіх патрыотаў хоча злучыць дзень адноўленае Польшчы. Такім чынам, польская справа зьвязала сябе з прад-

стаўнікамі двух супярэчных імпэрыялістычных гаспадарстваў, каторыя будуць прагнуцца карыстацца Польшчаю для сваіх інтарэсаў.

У пачатку XIX-га сталецьця супярэчнасьць паміж Францыяй і Ўсходам з кожным годам расьце ўсё больш і больш. На чале рэакцыйнага Ўсходу становіцца Расійская імпэрыя, чаму зусім не прашкаджае наіўны лібэралізм яе ураду. Пачынаецца проціў Францыі кампанія 1805-6 гадоў. Для барацьбы з Францыяй складаецца коаліцыя, у каторую раней уваходзяць Расія, Англія, Аўстрыя. Праз нейкі час у коаліцыю ўцягваецца і Прусія. Польскія патрыотычныя кругі, спадзяючыся на Расію, не здаволены тым, што Расія ўвашла ў коаліцыю. Да гэтага справа адбудаваньня Рэчы Паспалітай вырысоўвалася ў іх вачох такім спосабам: Аляксандар I, імпэратар расійскі і будучы кароль польскі, зьявіцца з рускай арміяй у Варшаву і тут падпіша акт абвяшчэньня Польскай дзяржавы і каронуецца польскаю каронаю. Затым, як кароль Польшчы, ён патрабуе ад Аўстрыі і Прусіі, каб яны адмовіліся ад тых частак Рэчы Паспалітай, каторыя яны атрымалі на аснове падзелу, і прылучылі іх да рускай часткі Польшчы. Узброеныя рускія сілы ў Варшаве будуць падмацоўваць патрабаваньні новага польскага караля. Апроч таго, адначасна ў польскіх землях Аўстрыі і Прусіі арганізуюцца польскія паўстанчаскія атрады, каторыя будуць пагражаць Аўстрыі і Прусіі з сярэдзіны. У выніку ўсяго гэтага і вырастае з руін польскае гаспадарства ў тым самым складзе, у якім яно існавала да падзелаў. Ясна, што коаліцыя Расіі з Прусіяй і Аўстрыяй руйнавала магчымасьць вышэйпаказанага пляну. Рускі імпэрыялізм, у васобе Аляксандра, тым ня менш стараецца падтрымаць падупалы настрой польскіх патрыотаў усякімі туманнымі абяцанкамі.

У верасьні 1805 году Аляксандар I чатыры тыдні прагасьцяваў у маёнтку Чартарыскіх, Пулавах, недалёка ад Бярэсьця. Гасьцінам быў дадзен палітычны характар. Аляксандар саправажаў рускую армію, якая ішла на злучэньне з аўстрыйскай для барацьбы з Наполеонам, і суняўся ў Пулавах, каторыя знаходзіліся ўжо на аўстрыйскай тэрыторыі. Сюды сабраліся правадыры польскай палітыкі. Тут было пушчана ў ход усё, каб утварыць у рускага сантымэнтальнага цара адпаведны польскі патрыотычны настрой. У васобным будынку, названым храмам Сыбілы, а таксама і ў готычным палацы князёў былі сабраны ўсялякія памяткі славы старажытнай Рэчы Паспалітай. Маёнтак быў як-бы архівам і музэям дзяржаўнасьці Польшчы. Княгіня-маці сама была для гасьця тлумачом гэтых памятак мінулага. Цар з вялікаю ўвагаю выслухоўваў тлумачэньне шчырай польскай патрыоткі. (Записки Каэтана Кажмяна, Руск. Вестник, 1865 г., № 2). З свайго боку «очаровательный сфинкс» ня скупіўся на ўрачыстыя, хоць і туманныя, абяцанкі, якія адпавядалі романтычнаму настрою Пулаваў. Было сказана

многа громкіх слоў, праліта многа сьлёз захапленьня і выпіта шмат віна на банкетах і пікнікох.

А Наполеон у гэтыя часы не сядзеў злажыўшы рукі. Хуткім крокам яго армія накіравалася ў Аўстрыю. Тут пад Аўстэрліцам ён разьбіў аўстрыйскую і рускую арміі (1805). З-пад Аўстэрліца француская армія сьпешна была рушана на Вену—і сталіца Аўстрыі была ўзята. Пакончыўшы з адным членам коаліцыі, Наполеонаўская армія ўвашла на тэрыторыю Прусіі. У адзін дзень дашчэнту былі разьбіты дзьве прускія арміі, пры Іене і Аўэрштэце (1806). Праз некалькі тыдняў сталіца Прусіі, Бэрлін, таксама апынулася ў руках Наполеона. Тады на дапамогу Прусіі зьявілася руская армія. Пасьля некалькіх нерашучых стычак руская армія была разьбіта пад Фрыдляндам і адступіла за Нёман.

25 чэрвеня 1807 году адбываецца Тыльзіцкая згода паміж Францыяй і Расіяй. На грунце гэтай згоды ўтвараецца Вялікае Гэрцогства Варшаўскае, у склад якога ўвашлі амаль што ўсе польскія вобласьці, каторыя пасьля падзелаў былі ў складзе Прусіі. Новае гаспадарства было аддадзена пад уладу караля саксонскага і складала частку Рэйнскага Саюзу. Поўным гаспадаром у гэрцогстве быў Наполеон. На новае гаспадарства ён глядзеў, як на авангардны пункт для руху на ўсход. Польская армія, колькасьць якой была вызначана ў 30.000 салдат, павінна была служыць мэтам францускага імпэрыялізму. У 1809 годзе да гэрцогства былі далучаны польскія землі, адабраныя ў Аўстрыі: Заходняя Галіцыя, Кракаў і Вялічка. Усё гаспадарства злажыла каля 2.700 квадр. міль. Экономічны стан гэрцогства быў цяжкі, бо яно павінна было плаціць налогі на ваенныя патрэбы Наполеона. Вызваленае без зямлі сялянства папала ў цяжкую экономічную залежнасьць ад сваіх паноў.

Утворанае Тыльзіцкаю згодаю польскае гаспадарства ня ўключае ў свае межы Літвы і Беларусі, каторыя засталіся ў межах Расійскай імпэрыі. Гэты факт прымушае польскіх політыкаў зьвярнуць увагу на магчымасьць пашырэньня новай Польшчы на ўсход. У 1811 годзе зноў пачынаюцца перагаворы паміж Чартарыскім і рускім урадам. Вызначаюцца ўсходнія межы будучай Польшчы: яны павінны ісьці па Заходняй Дзьвіне, Бярэзіне і Дняпру. Рэч Паспалітая павінна, на аснове раньейшых плянаў, дынастычна зьвязацца з Расіяй. Рускі цар павінен заставіць у Польшчы лібэральную конституцыю, утвораную Наполеонам. Шляхам перагавораў Польшча прагнецца ўвясьці ў свае межы Беларусь, а Расія—зрабіць з Польшчы буфэр у будучай барацьбе з Наполеонам, каторая ўжо прадчуваецца. На гэты раз перагаворы не даюць ніякіх вынікаў. Сымпатыі польскіх патрыотаў ужо накіраваны

на зору Напалеона. Яны ўжо ад яго чакаюць поўнага адбудаваньня Рэчы Паспалітай.

У самым канцы 1811 і пачатку 1812 году ідзе яшчэ адна проба ўтварыць буфэрнае гаспадарства. Вынікае плян пабудаваць самастойнае, пад протэкторатам Расіі, Вялікае Княства Літоўскае. У гэтай справе вядуцца перагаворы з літоўска-беларускім магнацтвам, на чале якога стаіць Агінскі. Вызначаецца шырокая тэрыторыя для новага гаспадарства, куды ўваходзяць губэрні: Горадзенская, Менская, Віленская, вобласьць Беластоцкая, губэрні Кіеўская і Падольская. Для новага гаспадарства проэктуецца нават конституцыя, падобная на Фінляндзкую. Гэты, вельмі беспадстаўны па замыслу, плян так і ня зьдзейсьніўся, бо распачалася вайна 1812 году.

## Асьвета на Беларусі.

Маніфэстам ад 8-га верасьня 1802 году замест старых пятроўскіх колегій былі ўтвораны міністэрствы, лікам—восем. На чале іх былі пастаўлены асобныя міністры, асабіста адпаведныя перад царом кожны за сваё міністэрства. Паміж імі было ўтворана міністэрства асьветы, каторае паводле маніфэсту павінна было мець сваёю мэтаю «выхаваньне моладзі і пашырэньне навук». На чале тых міністэрстваў, каторыя ўрад лічыў вельмі адказнымі, былі пастаўлены члены Інтымнага Комітэту. Такім міністэрствамі былі прызнаны—унутраных спраў, (міністр Качубей, яго таварыш—Строганаў) і чужаземных спраў (таварыш міністра Чартарыскі).

У сувязі з утварэньнем міністэрства асьветы ўся імпэрыя была падзелена на вучэбныя акругі, у склад каторых уваходзіла па некалькі губэрань. У 1803 годзе (24 студзеня) была вызначана і Віленская вучэбная акруга. Яна займала вялізарны раён, у склад яе ўваходзіла і Беларусь. Яе складалі такія губэрні: Віленская, Ковенская, Горадзенская, Менская, Віцебская, Магілеўская, Валынская, Падольская і Кіеўская. На чале вучэбных акруг у Расіі былі пастаўлены так званыя папячыцелі, на чале Віленскае акругі—куратар, што і значыць у перакладзе з лацінскай мовы—«папячыцель». Пасаду куратара Віленскае вучэбнае акругі заняў таварыш міністра чужаземных спраў, член Інтымнага Комітэту, польскі патрыот А. Чартарыскі. Такім спосабам, пад польскім уплывам апынуліся дзьве вельмі важныя справы—кіраваньне дыплёматыяй і выхаваньне моладзі на Беларусі і часткі Украіны. На дапамогу Чартарыскаму, як куратару, прышлі такія самыя польскія патрыоты, як і ён сам,—Тадэуш Чацкі і ксёндз Гуго Калантай.

Калантай, ня гледзячы на свой духоўны стан, быў прыхільнікам ідэй Вялікай францускай рэволюцыі. Гэты здольны і энэргічны чалавек

у Польшчы быў праваднікам ідэй рэволюцыі. У 70-ыя годы Калантай прымае чынны удзел у працы Адукацыйнай Комісіі. З 90-ых гадоў ён робіцца правадыром соймавых «патрыотаў»—лібэралаў і зьяўляецца праўдзівым тварцом конституцыі 1791 году. Потым ён прымае удзел у вайсковай барацьбе Польшчы за незалежнасьць. Пасьля ліквідацыі паўстаньня Калантай уцёк у Аўстрыю, дзе яго заарыштавалі і пасадзілі ў турму. Вызвалены з турмы па просьбе рускага ураду, ён прыехаў на Валынь і быў ідэёвым памочнікам Чартарыскага. Фактычным памочнікам Чартарыскага быў Т. Чацкі, польскі вучоны і грамадзянскі дзеяч. Асноўнай яго думкай было дапасаваньне школы да рэальных патрэб жыцьця. У такім кірунку ён, разам з Калантаем, напісаў вучылішчны статут для Віленскае акругі.



Ніжні замак у Вільні ў канцы XVIII в.

Дзякуючы пэдагогічнай працы гэтых дзеячоў, ідзе выхаваньне моладзі на Беларусі ў польскім патрыотычным кірунку. Польскія патрыоты ўскладаюць вялікія надзеі на Віленскую вучэбную акругу. Вельмі цікава прывясьці тут вынятак з ліста польскага дзеяча Францішка Дмахоўскага да г. Калантая: «Пад рускаю уладаю нам (палякам) адкрываюцца добрыя для нас умовы. Разам з тым організацыя ў выбары здольных палякоў на месцы настаўнікаў зробіць тое, на што толькі можна спадзявацца ў даным выпадку». І ў самай рэчы, трэба прызнаць, што польскія культурнікі момант скарысталі.

У 1802 годзе Чартарыскі атрымаў ад рускага ураду даручэньне напісаць статут для Віленскага унівэрсытэту і іншых школ акругі. Да вясны 1803 году статут ужо гатовы, і 18 траўня зацьвярджаецца

Аляксандрам I. На аснове статуту Віленская езуіцкае акадэмія, заложаная яшчэ ў 1570 годзе, абарачваецца ў унівэрсытэт. На ўтрыманьне унівэрсытэту і ўстаноў акругі быў назначан фундуш у 1.580.000 польскіх злотых, што давала моцны грунт для іх існаваньня. Унівэрсытэт складаецца з чатырох факультэтаў: фізыка-матэматычнага, мэдыцынскага, навук моральных і політычных і навук філёлёгічных і мастацтва. Першымі організатарамі і рэктарамі унівэрсытэту былі Страйноўскі і Сьнядэцкі. Яны трацілі шмат энэргіі, каб прыцягнуць на унівэрсытэцкія катэдры лепшыя сілы з заграніцы. Унівэрсытэт атрымлівае права раздаваць вучоныя ступені і пасылаць за межы імпэрыі выдатнейшых профэсараў і студэнтаў. Ён мае пад сваім кіраўніцтвам усе школы акругі; унівэрсытэцкая рада праз кожныя чатыры гады адбірае дырэктароў і загадчыкаў вучылішч і падае кандыдатаў на зацьвярджэньне куратара акругі. Адным словам, унівэрсытэт нясе як вучэбна-навуковыя, так і адміністрацыйныя абавязкі. У гэтых адносінах ён пабудован паводле прынцыпаў польскай Адукацыйнай Комісіі, згодна з каторымі ў ранейшыя часы ўсе школы ў Кароне былі пад кіраўніцтвам Кракаўскай акадэміі, а школы на Літве і Беларусі—пад кіраўніцтвам Віленскай акадэміі.

Пасьля прыёму унівэрсытэтам школ акругі, вызначылася, што ўсяго пад яго даглядам маецца зарэгістрованых яшчэ раней 70 школ. Большасьць школ (45) утрымлівалася на кошты каталіцкага духавенства. Некалькі школ жылі на сродкі вуніятаў-базыліян. Унівэрсытэт, атрымаўшы школы, пачаў барацьбу з тым езуіцкім настроем, каторы прышчапляла ім сотні год Віленская акадэмія. З вучэбных гадзін у школах было выкасавана выкладаньне навукі аб рэлігіі. Рэлігія выкладалася толькі ў нядзелю перад набажэнствам на працягу паўгадзіны, дзеля гэтага колькасьць веды па рэлігіі была значна зьменшана. Было дадзена месца выкладаньню моралі, аснованай не на бібліі, а на прыродзе чалавека. Была зьвернута вялікая увага на фізычнае выхаваньне моладзі. Фізычныя практыкаваньні былі прызнаны абавязковымі для ўсіх вучняў. Асабліва рэкомэндаваліся практыкаваньні ваенныя, каторыя мелі на увазе шляхецкі склад вучняў школ. Школы былі разьдзелены на шасьціклясовыя й трохклясовыя, тым ня менш курс навучаньня ўва ўсіх школах быў шасьцігадовы. Шасьціклясовая школа мела 6 настаўнікаў і рабіла прыём кожны год; трохклясовая—мела 3 настаўнікаў і рабіла прыём праз год. Шасьціклясовыя школы былі ў губэрскіх гарадох, трохклясовыя—у павятовых. У програму школ было ўведзена выкладаньне рускай мовы. Некалькі шасьцігадовых школ было адчынена новых. Народных школ, каторыя-б абслужвалі сялянства й рабочы люд, зусім ня было. Было некалькі й жаноцкіх школ, выключна пры манастырох. Ува ўсіх амаль школах выкладовая мова была поль-

ская, толькі ў асобных школах ува ўсходніх губэрнях Беларусі можна было спаткаць школы з выкладоваю рускаю мовай. Само сабою зразумела, што пры такіх умовах адбывалася аканчальная полёнізацыя тагочаснай беларускай інтэлігэнцыі, якая складалася з шляхты. Гаварыць аб полёнізацыі беларускага сялянства ня прыходзіцца затым, што польская школа была недаступнаю для панскага «быдла», у юрыдычным стане якога быў селянін.

Віленскі унівэрсытэт робіцца культурным і організацыйным цэнтрам тагочаснай беларускай полёнізаванай інтэлігэнцыі, катораяя, як мы казалі, найчасьцей складаецца з сярэдняй і дробнай шляхты і часам з мяшчанскіх элемэнтаў. Пры унівэрсытэце ўтвараюцца польскія патрыотычныя організацыі моладзі, у каторых усё-ж такі трэба адзначыць прысутнасьць мясцовага беларускага колёрыту.



Марцін Пачобут, рэктар Віленскага унівэрсытэту (1728—1810 г.)

Найраней утвараецца гурток «Шубраўцаў», што існаваў напоўлегальна. Ён легалізуецца унівэрсытэтам толькі ў 1817 годзе. Гурток выдае часопіс пад назваю «Брукавыя Ведамасьці». Як відаць з статуту, гурток ставіць сваёю мэтаю пашырэньне сярод моладзі замілаваньня да асьветы, цьвярозага жыцьця, разьвіцьця працаздольнасьці і другія моральныя заданьні. Шлях, каторым «Шубраўцы» ідуць да сваёй мэты,—гэта сатыра, каторая павінна рабіць свой уплыў на моладзь і грамадзянства праз друк «Брукавых Ведамасьцяй». Шубраўцы напамінаюць нам адзін рускі тагочасны гурток «Арзамасцаў», розьнячыся ад яго сваёй лепшай організацыяй і больш сталымі мэтамі. Гурток «Шубраўцаў» мае сваю пячатку: вянок з дубовых лісьцяў, у сярэдзіне каторага былі скрыжаваны лапата й мятла. Пячатка, такім спосабам, была эмблемаю працы гуртка, каторы вычышчаў і вымятаў з жыцьця ўсякае сьмецьце. «Брукавыя Ведамасьці» выходзілі раз на тыдзень у суботу. За пяць год (1817—1822) існаваньня іх вышла 287 нумароў, што складае каля 150 друкаваных аркушаў. Артыкулы ведамасьцяй пісаліся як «Шубраўцамі», так і членамі другіх студэнцкіх гурткоў, што існавалі пры унівэрсытэце. «Шубраўцы», апроч пісаных мэт, бя-

зумоўна ставілі сабе й патрыотычныя мэты, зьвязаныя з адбудаваньнем Рэчы Паспалітай.

Адначасна з гуртком «Шубраўцаў» нелегальна існуе арганізацыя так званых «Філёматаў» (аматараў навукі). У ліку яе заснаваццеляў былі А. Міцкевіч, Тамаш Зан, Ян Чачот, Ян Яжоўскі, Твардоўскі і інш. Мэта «Філёматаў»—«шляхам добрай адукацыі палепшыць стан бацькаўшчыны». Пад бацькаўшчынай арганізацыя разумела Беларусь, як пагранічную провінцыю Рэчы Паспалітай. Арганізацыя распадаецца на асобныя гурткі. Наймацнейшы быў фізыка-матэматычны гурток, на чале каторага стаялі Т. Зан і Твардоўскі. Побач з ім існаваў гурток моральных навук (права, адміністрацыя, тэолёгія, філёзофія і гісторыя). Да гэтага гуртка належаў вядомы польскі гісторык і барацьбіт за адраджэньне Польшчы, Лелевэль. Апроч таго, яшчэ працаваў гурток вольнага мастацтва (поэзія, мова, малярства, музыка й г. д.). На чале гуртка раней стаяў вядомы польскі поэта Міцкевіч, а пасьля таго, як ён выбыў з унівэрсытэту, яго месца заняў вядомы працаўнік беларускага руху, Ян Чачот. Дзякуючы нязгодзе сярод сяброў арганізацыі, гурткі «Філёматаў» пачынаюць к 1810 году раскідацца.



Ян Чачот.

На руінах гурткоў «Філёматаў» праз нейкі час вырастае легальная арганізацыя «Праменістых», ад слова «прамень». Закладчыкам арганізацыі быў Тамаш Зан з шасьцьма таварышамі, сярод каторых быў і Адам Міцкевіч. Старшынёю арганізацыі быў Я. Яжоўскі, сакратаром—Петрашкевіч. Арганізацыя мае статут з 15 артыкулаў, напісаны Т. Занам разам з другімі сябрамі й зацьверджаны рэктарам унівэрсытэту Малеўскім. Пры зацьвярджэньні арганізацыі рэктар заўначыў, што ён спадзяецца, што яна будзе навучаць студэнтаў шчыра выконваць свае абавязкі. Для далейшага існаваньня «Праменістых» ён паставіў умову, каб арганізацыя была выключна студэнцкай. Сваёю легальнаю мэтаю «Праменістыя» ставілі інтэлектуальнае і моральнае разьвіцьцё студэнтаў. На сходах чыталіся рэфэраты на літаратурныя і навуковыя тэмы, абгаварваліся пытаньні аб пашырэньні асьветы сярод моладзі, аб арганізацыі для сяброў разумных і карысных гулянак. Тай-

наю мэтаю «Праменістых», як і ранейшых гурткоў, было політычнае выхаваньне моладзі ў польскім патрыотычным кірунку. Гэтая мэта была вядома толькі асяродку організацыі. Гурткі «Праменістых» пачалі хутка расьці. Вясеньнія часы выкарыстоўваліся гурткамі для наладжваньня загародных пагулянак, каторыя абхаплялі цэлыя сотні моладзі й давалі ёй магчымасьць ухіляцца ад надзораў унівэрсытэцкага і поліцэйскага начальства.

Будучы па сутнасьці польскай культурна-політычнай організацыяй, «Праменістыя» вельмі цікавіліся й Беларусьсю. Іх гурткі былі ахварбаваны ў мясцовы колёрыт. Паміж іншым у 8 артыкуле статуту орга-



Шляхецкі двор у Наваградчыне на Меншчыне, дзе жыў А. Міцкевіч

нізацыі было вызначана заданьне—«жадаць дабра сваім адназемцам кожнага стану і ўсяму народу наагул, захоўваць карысныя звычаі сваіх продкаў, кахаць сваю прыродную мову і вучыцца ёй». А трэба сказаць, што для большасьці «Праменістых» прыроднай мовай, мовай продкаў была беларуская. Аб мясцовым колёрыце організацыі сьведчыць прысутнасьць і дзейны удзел у ёй такога беларускага культурніка-адраджэнца, як Ян Чачот.

Калі праца гурткоў шырака разьвінулася, то яна захапіла частку й ня студэнцкай моладзі. Сталі хадзіць чуткі аб скрытым політычным кірунку «Праменістых». Рэктар Малеўскі свой дазвол на існаваньне організацыі ўзяў назад пад тым прадлогам, што ў дзейнасьці гурткоў прымаюць удзел ня студэнты. Організацыя офіцыяльна зачынілася, а

неофіцыяльна вытварыла грунт і дала жывы матар'ял для новай організацыі.

Галоўныя організатары «Праменістых» распусьцілі організацыю і ўтварылі тайнае вобчаства «Філарэтаў» (аматары добрадзейнасьці). У 1820 годзе быў складзен статут з 72 артыкулаў, куды ўвашлі і 15 артыкулаў організацыі «Праменістых». Апроч мэт культурна-асьветных, вобчаства ставіла сабе і політычную мэту: падгатаўляць адраджэньне Рэчы Паспалітай, куды павінна ўвайсьці і Беларусь. На чале «Філарэтаў» стаяў Т. Зан, як старшыня. Яго намесьнікамі былі— Ян Чачот і Франц Малеўскі, сын рэктара унівэрсытэту. Організацыя шырака разраслася і мела ў сваім складзе больш 300 дзейных сяброў. Апроч таго, організацыя ўкосна мела пад сваім уплывам сотні моладзі, Каб менш рызыкаваць, вобчаства было падзелена на невялічкія сэкцыі, каторыя што-тыдзень зьбіраілся на кватэры аднаго з сваіх сяброў. Кожны член меў за абавязак быць прысутным на сходах акуратна. Свой уплыў «Філарэты» пашыралі і на школьных дзяўчат, пранікаючы ў зачыненыя дзявочыя пансыёны. Зачынілася організацыя ў 1822 годзе, калі поліцыя напала на сьлед гурткоў. Каб зьберагчы членаў вобчаства ад поліцыі, Т. Зан спаліў усе дакуманты гэтае організацыі.

Мясцовы колёрыт усіх гурткоў пры Віленскім унівэрсытэце ясна кідаецца ў вочы. Паміж іншым, Варшава не здаволена мясцовым, беларускім кірункам гурткоў. У Варшаве лічылі, што такая дзейнасьць гурткоў пры Віленскім унівэрсытэце можа выклікаць сэпаратызм Беларусі і будзе перашкаджаць агульна-польскай справе. У гэтых адносінах вельмі цікава зрабіць выняткі з артыкулу, зьмешчанага ў № 147 «Брукавых Ведамасьцяй», пад назваю «Ліст з Варшавы», падпісанага псэўдонімам «Варшаўскі Прыяцель». Там мы чытаем: «Ня гледзячы на жартоўнасьць і вульгарнасьць вашай назвы (разумеецца назва «Брукавыя Ведамасьці»), вы ўсё-ж такі тут маеце шмат прыхільнікаў, каторыя цэняць вашую орыгінальнасьць, а асабліва ваш шляхетны намер выкараняць краёвыя хібы. Праўда, іншы раз нават вашы прыхільнікі скардзяцца, што для палякаў вы пішаце пакітайску, што яны ня могуць разумець вас. Вы пішаце для Літвы, а не для Кароны. Вы менш клапоціцеся аб тым, ці зразумее вас Варшава, абы толькі зразумелі вас Вільня і Літва. Іншы раз вы паніжаеце ваш стыль, каб толькі зрабіцца даступнымі для ўсіх».

Сябры унівэрсытэцкіх гурткоў вельмі цікавіліся краязнаўствам. У «Філарэтаў», была нават друкаваная інструкцыя наконт таго, як зьбіраць матар'ялы па географіі і этнографіі Беларусі, вельмі дэтальна апрацаваная. Інструкцыя ставіць цэлы шэраг пытаньняў, на каторыя зьбірацель павінен даць адказы. Матар'ялы звычайна зьбіралася ўлетку, калі студэнты, карыстаючыся канікуламі, разьяжджаліся па самых глу-

хіх куткох Беларусі. Вельмі часта потым гэтыя сабраныя матар'ялы, будучы апрацаванымі, друкаваліся ў «Брукавых Ведамасьцях».

З студэнцкіх гурткоў цікавасьць да Беларусі пападае і ў навуковыя, профэсарскія колы. Унівэрсытэт ня толькі навукова дасьледвае, але і знаёміць грамадзянства ў польскай мове з археолёгіяй, гісторыяй, памяткамі старога пісьменства, народнай творчасьцю, звычаямі і наагул бытам Беларусі. З Віленскім унівэрсытэтам зьвязаны працы аб Беларусі такіх дасьледчыкаў, як Лукашэвіч, Шыдлоўскі, Голэмбеўскі, Ярашэвіч, Нарбут, Даніловіч і г. д.



Шляхецкі двор пад Наваградкам, дзе жыў А. Міцкевіч.

Калі ўгледзіцца ў дзейнасьць Віленскага унівэрсытэту, то мы бачым, што ён у першую галаву быў цэнтрам полёнізацыі беларускай інтэлігэнцыі; ён канчаткова полёнізаваў дробную і сярэднюю беларускую шляхту. Але разам з тым унівэрсытэт абуджаў сярод гэтай самай шляхты цікавасьць да Беларусі і беларускай культуры. Ён выпускаў піонэраў беларускага руху. Беларускі рух стаў у неабходную сувязь з польскім адраджэнчаскім рухам, бо Беларусь, на думку польскіх патрыотаў, уваходзіла ў склад Рэчы Паспалітай ці проста, як провінцыя на ўсходніх граніцах, ці як аўтономная краіна.

Апроч унівэрсытэту, якраз напярэдадні вайны 1812 году, у Полацку была адчынена езуіцкая акадэмія замест колегіі, што існавала тэм раней. Грамата аб перабудове колегіі ў акадэмію была падпісана Аляксандрам 1 сакавіка 1812 году. Праз тры месяцы, 10 чэрвеня, адбылося ўрачыстае адчыненьне акадэміі. У процілегласьць унівэрсытэту, гэта быў асяродак чорнай рэакцыі. На адчыненьні акадэміі быў прысутным вядомы пісьменьнік рэакцыі, францускі эміграант, Жозэф дэ-Мэстр. Сваім правам і прывілеем акадэмія была прыраўнавана да Віленскага унівэрсытэту. Праца яе, параўнальна з унівэрсытэтам, асабліваго значэньня ня мела і нічога выдатнага не дала.

## Часы кампаніі 1812 году.

Кампанія 12 году і падзеі, зьвязаныя з ёю, моцна адбіліся на жыцьці Беларусі. Беларусь, як і заўсёды пры імпэрыялістычных войнах Захаду і Ўсходу, зрабілася арэнаю барацьбы. Беларусь і Літва адразу зрабіліся тым месцам, дзе Расійская імпэрыя сконцэнтравала свае ўзброеныя сілы. 11 чэрвеня армія Наполеона, пераправіўшыся праз Нёман, уступіла на тэрыторыю Расіі. Яе тут чакала руская збройная сіла.

Рускае войска было разьдзелена на чатыры арміі з агульным лікам людзей у 243.000. Дзьве арміі былі за межамі Беларусі: адна на Украіне з галоўнаю кватэраю ў Луцку Валынскім, другая ў Малдавіі, на Дунаі. Дзьве арміі разьмясьціліся на тэрыторыі Беларусі. Першая армія складалася з 120.000 чалавек. Яна знаходзілася пад кіраўніцтвам Барклая-дэ-Толі і была раскватаравана паміж Расіенамі і Лідаю. Галоўная кватэра арміі была ў Вільні. Пры гэтай арміі ў самым пачатку кампаніі знаходзіўся цар з сваім вялікім штабам. Другая армія складалася з 37.000 чалавек. Яна знаходзілася пад кіраўніцтвам Баграціона і была раскватаравана паміж Нёманам і Заходнім Бугам. Галоўная кватэра арміі была ў Ваўкавыску. Такім спосабам, мы бачым, што большасьць усёй узброенай рускай сілы была разьмешчана на Беларусі. З агульнага ліку рускага войска, каторае даходзіла да 243.000, Беларусь зьмясьціла на сваёй небагатай тэрыторыі 157.000, што складала каля ⅔ усёй збройнай рускай сілы.

Гэты факт лёг вялікім экономічным цяжарам на працоўныя масы Беларусі. Рускае інтэнданцтва, як і заўсёды, больш апекавалася аб самым сабе, аб царскім прагавітым штабе і галоўных кватэрах армій. Салдаты галадавалі. Ратуючыся ад голаду, яны павінны былі самі думаць аб сабе—рабаваць мясцовае сялянства. Рабункі не перарываліся на працягу ўсёй кампаніі. Апроч таго, значная частка харчовага ўтрыманьня арміі была ўзвалена на мясцовыя сродкі і законнымі пастановамі. Аб гэтым былі выданы вайсковымі ўладамі загады. На аснове цэлага шэрагу загадаў кожны селянін павінен быў загатаваць вядомую

колькасьць продуктаў для арміі. Дзякуючы ўсяму гэтаму беларускае сялянства апынулася ў вельмі цяжкім палажэньні. Вядома, напрыклад, што ў паўднёвых паветах Віленшчыны сялянства засталося зусім бяз хлеба і дашло да таго, што кармілася ўсялякімі сурогатамі, што выклікала хваробы і высокую сьмяротнасьць сярод жыхарства.



Пераход францускае арміі праз Нёман.

Кампанія, як вядома, адбывалася на Беларусі летам і ўвосень, у самы рабочы час. Апроч таго, што край руйнаваўся, рабочыя сілы адцягваліся ад штодзеннай вяскова-гаспадарчай працы, перарывалася работа селяніна, што давала хлеб на цэлы год. На падставе вайсковых прыказаў „усе дарослыя мужчыны, што маюць аселасьць каля граніцы, п а в і н н ы быць узброены пікамі і трымаць грамадзкія варты“. З другіх дакумэнтаў мы бачым, што такія грамадзкія варты былі ўтвораны па ўсёй Беларусі.

Пастаяўшы некалькі месяцаў і значна спустошыўшы край, руская армія пачала адыходзіць на ўсход, адступаючы перад францускай арміяй. З палавіны чэрвеня на Беларусі зьявіліся першыя авангарды

францускай арміі. Да сярэдзіны ліпеня амаль што ўся наполеонаўская армія, у каторай налічвалася каля 500.000 салдат, увайшла на Беларусь. Потым часткамі яна пасунулася на ўсход за рускай арміяй. Да-



Наполеон на беразе Нёмна.

волі вялікі кавалак яе застаўся на абшарах Беларусі, як запасны рэзэрв. Зноў ідзе рабаваньне і спусташэньне тэрыторыі. Продукцыйная творчая праца зноў перарываецца. Рабункі амаль што ня ўходзяць у сыстэму. Перад намі цэлы рад запісак сучасьнікаў. Запіскі запоўнены

дакладнымі апісаньнямі гэтых рабункаў. Мы возьмем тут для прыкладу найбольш тыповыя з апісаньняў. Вось перад намі ліст віленскага памешчыка Эйсмонта. «Войскі (францускія), заняўшы ваколіцы гораду (Вільні), адразу зьнішчылі ваколічныя з горадам абывательскія дачы, а ў ліку іх і маю дачу, што была каля гораду, пад назваю Маркуцьце. Яны забіралі ўсю, што была там, провізыю, быдла, коні, усялякую рухомую маемасьць, разьбівалі дзьверы, вокны і мэблі ў будынках. Каб давяршыць канчаткова руйнаваньне, кавалерыя скасіла ўсё дваровае і сялянскае збожжа на корм коням. Такім спосабам, на працягу аднэй гадзіны згубіў я ўсё, а сяляне мае, разагнаныя з хат, ратаваліся тым, што ўцякалі ў горад; іх я пры вялікай дарагоўлі і недахватах прымушан быў харчаваць у горадзе. Свае ўбыткі я тады вылічаў на 4.000 р. срэбрам». (К. Военский. Акты, документы и материалы для истории 1812 года, т. I, стр. 416). Мы ня верым, што пан Эйсмонт харчаваў мужыкоў у горадзе, але трэба згадзіцца, што страты, каторыя панёс ён і яго сяляне ад рабунку францускай арміі, былі не малыя. А вось яшчэ перад намі: «Записки помещика Виленской губернии». Там (стар. 21), паміж іншым, апавядаецца такі факт: «Памешчык К. Дзісьненскага павету, каторы схаваў сям'ю ў бясьпечным месцы, а сам асабіста спаткаў французаў, хацеў пачаставаць іх, але яны абабралі яго ды пакінулі ў аднэй бялізьне. У такой вопратцы памешчык быў прадстаўлен нэапольскаму каралю, які зьявіўся праз некалькі гадзін пасьля гэтага няпрыемнага здарэньня». Вывад ясны: калі так рабавалі паноў, то аб «мужыкох» і гаварыць ня прыходзіцца; калі пан мог яшчэ знайсьці абарону, то селяніну заставалася толькі цярпець.

Разам з францускай арміяй зьявіліся на Беларусі і марадзёры. Вельмі трудна падлічыць, колькі іх было. Паводле некаторых францускіх зьвестках лік марадзёраў на тэрыторыі Літвы і Беларусі даходзіў да 25.000. Гэтая цыфра вельмі і вельмі прыблізная, бо само сабою зразумела, што марадзёр ёсьць тып, каторы не падлягае зусім цьвёрдаму падліку. Сяляне ўцякалі часткаю ў гарады, як гэта відно з вышэйпаданага, найчасьцей яны хаваліся з сваёю рухомаю і нярухомаю маемасьцю ў лясы і балоты, куды ня мог дайсьці ні францускі жаўнер, ні марадзёр. Асабліва скардзілася беларускае сялянства на баварцаў і вэстфальцаў, каторых яно называла «паварцамі» і «бяспальцамі». Успамінак аб іх доўга аставаўся ў беларускай вёсцы. Трэба сказаць, што рабункі не прыпыняліся на ўсім працягу кампаніі 12-га году.

У часы напалеонаўскай кампаніі разьвіваюцца мясцовыя палітычныя падзеі, зьвязаныя з адраджэньнем вялікай Польшчы «ад мора да мора». Шляхта ў Польшчы і на Беларусі, не здавальняючыся Варшаўскім гэрцогствам, чакае, што Напалеон пашырыць тэрыторыю гэрцог-

ства, да «належных» разьмераў. Расьце вера ў зару Наполеона. „Wszyscy pewni zwycięstwa wołają ze łzami: bóg jest z Napoleonem, Napoleon z nami". («Пан Тадэуш», Міцкевіча). Пасьля таго, як францускія войскі занялі Польшчу і Беларусь, кароль саксонскі і гэрцог варшаўскі склікае ў Варшаве конфэдэрацыйны сойм, каторы ставіць пытаньні, зьвязаныя з новым палажэньнем Польшчы. Першаю пастановаю скліканага сойму быў «Акт аб аднаўленьні і незалежнасьці старажытнага каралеўства Польскага», каралеўства ў тых граніцах, у каторых яно існавала да падзелаў.



Пераправа праз Бярэзіну.

Праз нейкі час, 1 ліпеня, зусім неспадзявана для Варшавы, якая марыла аб прылучэньні літоўска-беларускіх зямель да Польскага каралеўства, Наполеон выдаў дэкрэт аб утварэньні Вялікага Княства Літоўскага. На аснове дэкрэту быў утворан часовы урад княства пад назваю—Галоўны Комітэт кіраўніцтва княствам, каторы формальна лічыцца незалежным ад Варшавы, але па настроі сваіх сяброў зусім не зьяўляецца незалежніцкім. Комітэт складаўся з 7 сяброў; на чале асьветы быў пастаўлен рэктар унівэрсытэту Сьнядэцкі. У склад княс-

тва ўваходзілі губэрні—Віленская, Горадзенская, Менская і вобласьць Беластоцкая. Урад як Польшчы, так і Літоўскага княства вельмі баіцца лібэральнага, вызваленчаскага настрою Наполеона ў адносінах да сялянскага пытаньня, бо ён складаецца з магнацтва і панства, катораму яшчэ патрэбна прыгонная праца селяніна. Што датычыць да самога сялянства, то яно, карыстаючы з моманту, вельмі часта выяўляе нездаваленьне сваім палажэньнем. Сялянскае пытаньне становіцца вастрэйшым.

Адразу-ж пасьля дэкрэту аб утварэньні Вялікага Княства Літоўскага, польскія патрыоты на Беларусі пачынаюць падгатаўляць «добравольнае» прылучэньне княства да Кароны. У розных мясцовасьцях Літвы і Беларусі організуюцца і адбываюцца акты прылучэньня да Польшчы, пачынаючы з 14 ліпеня. Урачыстасьці, зьвязаныя з актамі прылучэньня, носяць шляхецка-клерыкальны характар і прыстасоўваюцца да галоўнейшых гарадоў Беларусі, як, напрыклад, Вільня, Менск, Горадня, Пінск і г. д. У Менску акт прылучэньня адбываецца 19-га ліпеня, у катадральным касьцеле. Раней адпраўляецца імша, потым—малебен, гавораць ксяндзоўскія прамовы, і падпісваецца акт конфэдэрацыі. Зьмест акту такі: «Мы, абывателі польскага каралеўства і Вялікага Княства Літоўскага, што жывем у яго вобласьці, каторая за часы няволі была названа Менскай губэрняй,—шляхта, духавенства, мяшчане, сяляне і ўсякага стану людзі перад богам і ўсім грамадзянствам сьведчым, што, вызваленыя з ярма маскоўскай няволі і вернутыя да нашай бацькаўшчыны, мы, як толькі даведаліся аб утварэньні конфэдэрацыі ўсяго польскага каралеўства, жадаючы як наймацней зьвязацца сэрцам і зброяю з нашымі братамі, злучаемся добраахвотна, аднамысна і неразрыўна праз сягонешні ўрачысты акт з конфэдэрацыяю польскага каралеўства».

Усе гэтыя ўрачыстасьці для шырокіх працоўных мас былі пустым гукам. Наполеонаўскі імпэрыялізм, пацешыўшы польскае і беларуска-літоўскае шляхецтва політычнымі бразготкамі, вымагаў ад шырокіх мас новых гаспадарстваў матар'яльнай для сябе карысьці. Усе нявялікія сілы новаўтворанага літоўска-беларускага Часовага Ураду пакіраваны не на палепшаньне экономічнага стану Літвы і Беларусі, а на вышукваньне матар'яльных сродкаў вялікай арміі Наполеона і на папаўненьне яе ліку. Край павінен быў напружыць свае падарваныя сілы, каб здаволіць ваяўнічыя інтарэсы Наполеона. Увесь час ідуць сыстэматычныя харчовыя паборы з насельніцтва Беларусі. Вядома, напрыклад, што з аднаго толькі Віленскага дэпартаманту было выдана для наполеонаўскай арміі 200.000 пудоў жыта, 200.000 пудоў аўса, 18.000 пудоў сена і 18.000 пудоў саломы. Разам з тым на ўтрыманьне францускай арміі ў сялян бралі шмат быдла: Віленскі дэпартамант, на-

прыклад, павінен быў даставіць у інтэнданства 10.000 валоў. А тут падашла і рэкрутчына: на Віленскі дэпартамант быў вызначаны лік у 3.000 рэкрутаў. Крыху пазьней мы бачым, што па запатрабаваньню францускага камандваньня, што прышло з Масквы, Літва і Беларусь да верасьня павінны былі даставіць 150.000 злотых і 1.000 коняй.



Французы пад Барысавам.

Усе гэтыя паборы ляглі вялікім цяжарам на зруйнованы край. Сярод жыхарства пачынаецца голад, за галадам ідуць яго верныя хаўрусьніцы—хваробы. Найраней зьяўляецца крываўка, за ёю йдзе халера. Сьледам за імі пачынае касіць жыхароў тыфус, каторы ў тыя часы быў вядом пад назваю гнілой гарачкі. Пазьней пачынае хадзіць па вынішчаным зьбяднелым краі цынга. Адным словам, наполеонаўская незалежнасьць і «добрахвотнае» злучэньне з Варшаўскім гэрцогствам вельмі дорага абышліся для Літвы і Беларусі.

Паміж тым, агульныя падзеі кампаніі 12 году йдуць сваёю чаргою. Наполеонаўская армія, зрабіўшы слаўны пахол, уваходзіць у безабаронную Маскву. Тут яна дэмаралізуецца, губіць сувязь з сваёю заходняй базай і вельмі хутка нястройным натаўпам адходзіць назад

па тым шляху, каторы сама яна спустошыла. У сярэдзіне лістапада адбываецца на Беларусі добра вядомая Бярэзінская катастрофа, якая зруйнавала дашчэнту францускую армію. Організованай арміі засталося толькі каля 10.000 чалавек, пры 24 гарматах. Рэшта, у некалькі сот тысяч чалавек, неорганізованым, галодным, разьдзетым і разутым натаўпам, як шаранча, пакрывае Беларусь. Беларусь перажывае ўсе жахі неорганізованага, масавага адступленьня шматтысячнай арміі. Раней каля Ашмян, потым каля Вільні пачынаюць сваю дзейнасьць партызаны Сеславіна. Лічачы ўсё мясцовае жыхарства хаўрусьнікамі французаў, яны вядуць сябе на Беларусі, як у забраным краі.

У канцы лістапада і пачатку сьнежня 1812 году на тэрыторыю Беларусі зноў увашла руская армія на чале з Кутузавым. Праўда, армія ўвашла ў меншым ліку, чым яна была тут першы раз. Яна налічвала ў сваім складзе каля 28.000 людзей, пры 200 гарматах. Матар'яльны стан рускай арміі быў кепскі, хоць яна і атрымала перамогу над Наполеонам. Што гэта так, відно з пісьма афіцэра таго часу: «Апроч двух-трох салдацкіх кашуль, ужо старых і нягодных, другой бялізны ў мяне амаль што няма. Пэнсія ўжо за цэлы год не атрымана. Дый што можна зрабіць з нашай пэнсіяй, калі за ўсю пэнсію, г. зн. за 280 рублёў, давалі ў Вільні 11 чырвонцаў, каторых ледзьве на два тыдні хапала, каб купіць на іх харчоў. (Бартенев. Бумаги, относящиеся к войне 1812 года, ч. I, стр. 85). Калі так жылі афіцэры, то аб салдатах і гаварыць ня прыходзіцца—ім жылося куды горш. Ясна, што армія ў такім стане павінна была здабываць дадатковыя сродкі на сваё існаваньне на месцы і лягла вялікім цяжарам на зруйнованы край.

Беларусь узімку 1812-13 году і вясною 1813 году яўляла з сябе смутны малюнак. Яна ўся была пакрыта трупамі, што засталіся ад вялікай імпэрыялістычнай вайны. Трупамі найчасьцей працоўнай масы ўсялякіх краёў і народаў, не выключаючы і самых беларусаў, былі ўсыпаны шляхі, лясы і палі краю. «Пачынаючы ад Вязьмы, а найбольш ад Смаленску да Вільні шлях быў пакрыт трупамі. Выпадкова я палічыў трупы на 1 вярсьце; іх было 101». (Записки о 1812 г. Н. Муравьев). «На працягу аднэй вярсты я налічыў 148 чалавечых трупаў і 76 конскіх». (Записки о 12 годе. Левенштерн). Перад вясною 1813 году, баючыся заразы, менскі губарнатар у мясцох бітваў і пераправы праз Бярэзіну спаліў 24.000 трупаў. У гэты-ж самы час у Вільні і яе бліжэйшых ваколіцах было спалена 80.000 трупаў. А вось перад намі малюнак Віленскага базыліянскага траецкага манастыру ў канцы кампаніі 12 году. «Усе дзіркі разьбітых вакон былі заткнуты рукамі, нагамі, тулавамі й галовамі мерцьвякоў, каб уратаваць жывых ад прытоку халоднага паветра. І ў гэтых памяшканьнях, напоўненых

цяжкім духам, ляжалі гаротныя і хворыя раненыя, асуджаныя на гібель». (Шильдер. Александр I, т. III, стр. 136). Так канчала жыцьцё



Адступленьне францускае арміі.

напалеонаўскае «гарматнае мяса» на Беларусі, катороя апынулася ў палажэньні трупярні для аднаго з эпізодаў тагочаснай сусьветнай бойні.

На гэтым падзеі, зьвязаныя з 1812 годам, ня скончыліся, Руская армія супроць волі Кутузава, па загаду імпэратара, была пакі-

рована ў Заходнюю Эўропу, каб «вызваляць» яе ад уціску Наполеона. Гэтае «вызваленьне» гучэла горкаю насьмешкаю: рускі запрыгонены селянін ішоў «вызваляць» Эўропу, каторая як-ніяк перажыла Вялікую



Рэшткі францускае арміі ў Вільні каля катэдральнага касьцёлу.

Францускую рэволюцыю. Зноў ставіцца на парадак дзенны польскае, а разам з ім і беларускае пытаньне. На гэтую тэму пачынае весьціся перапіска паміж Аляксандрам I і А. Чартарыскім. Плян Чартарыскага прапануе ўтварыць польскае каралеўства, уключыўшы ў яго

склад Беларусь і Літву і зьвязаўшы яго дынастычна з Расіяй праз абраньне польскім каралём наймалодшага брата Аляксандра І, Міхаіла Паўлавіча. Плян Чартарыскага быў адкінут імпэратарам. Былі вызначаны дзьве прычыны, каторыя перашкаджалі гэтаму. З аднаго боку, проц' палякаў утварыўся сярод камандных кругоў імпэрыі варожы



Сцэна з адступленьня францускае арміі.

настрой: палякі падтрымлівалі Наполеона і разам з ім прыходзілі нават руйнаваць «сэрца Расіі» Маскву,—у ваднасінах да іх трэба прыняць рэпрэсіі, а не памагаць зьберагчы ўласнае гаспадарства. З другога боку, падтрыманьне польскага гаспадарства выклікае непаразуменьне ў чужаземнай політыцы: гэтым будуць нездаволены Аўстрыя і Прусія, якія трымалі ў сваіх руках другія часткі былой Рэчы Паспалітай, а Аўстрыя і Прусія якраз у бягучы момант зьяўляліся хаўрусьнікамі Расіі ў змаганьні з Наполеонам. Тым ня менш рускі урад ня хоча выкараняць сярод польскіх політычных дзеячоў думку аб польскай

дзяржаўнасьці, бо яму яшчэ Польшча патрэбна, як буфэр, пры магчымай барацьбе з Напалеонам. Аляксандар I дае параду польскім патрыотам, каб яны пастараліся «заслужыць давер'е рускага грамадзянства і самі мелі давер'е да расійскага ураду ў яго асобе».

Тую самую думку выказвае Аляксандар I і ў 1814 годзе польскім дэлегатам, каторыя зьявіліся віншаваць цара з перамогаю над Напалеонам. Цар кажа, што рускі урад даруе і забывае здраду польскага шляхецтва, што ён хоча бачыць край, каторы яны тут прадстаўляюць, спакойным, здаволеным і шчасьлівым. «Яшчэ крыху цярплівасьці, і ўсе вы будзеце здаволены мною», так канчаецца адказная прамова Аляксандра I да польскіх дэлегатаў.

У канцы 1814 і пачатку 1815 году ў Вене адбываецца вядомы агульна-эўропэйскі конгрэс. Руская дыплёматыя дамагалася тут зьберагчы гэрцогства Варшаўскае ў яго старых межах і ўзяць яго пад свой протэкторат, іначай кажучы, захапіць яго з рук Напалеона ў свае. Дамаганьні Расіі посьпеху ня мелі. Частка гэрцогства была аддадзена Прусіі, частка—Аўстрыі, а частка была выдзелена ў Кракаўскую рэспубліку. З рэштак была сформавана так званая «конгрэсавая Польшча» пад протэкторатам Расіі. У сярэдзіне траўня 1815 году адбываецца ўрачыстасьць абвяшчэньня польскага каралеўства. Каралём абіраецца Аляксандар I, чым утвараецца дынастычная вунія Польшчы з Расіяй. Намесьнікам сваім у Польшчы рускі цар і польскі кароль назначае свайго брата Канстантына Паўлавіча. Новаму каралеўству даецца права мець сваю армію, бясьпечную для Расіі. Спосаб кіраваньня ў конгрэсавай Польшчы—прадстаўнічы, з разьдзелам улады на законадаўчую і выканаўчую. Законадаўчая ўлада належыць да сойму, каторы, як і раней, складаецца з дзьвёх палат. Вышэйшая палата—сэнат, каторы набіраецца з магнацтва і вярхоў духавенства. Ніжэйшая палата—пасольская ізба, каторая набіраецца з шляхты. Выканаўчая ўлада належыць да караля і яго намесьніка, каторы зьяўляецца разам з тым і старшынёю рады міністраў. Міністры назначаюцца і кантралююцца каралём. Літва і Беларусь, абвешчаныя Напалеонам незалежным Вялікім Княствам Літоўскім і «дабрахвотна» далучаныя шляхтай да Польшчы ў ліпені 1812 году, уключаюцца зноў у лік губэрань імпэрыі.

Зразумела, што польскія патрыоты нездаволены новым сваім куртатым гаспадарствам і яго конституцыяй, каторая аддавала польскае каралеўства ў рукі царскага расійскага самаўладзтва, якое ўзлажыла на сваю галаву польскую каралеўскую карону. Беларускае шляхецтва, як і раней, цягнецца да Польшчы. У гэтым кірунку выхоўваецца на Беларусі і шляхецкая моладзь, каторая вучыцца ў Віленскім унівэрсытэце і школах Віленскае Акругі. Вучэбныя ўстановы паранейшаму

знаходзяцца ў руках польскіх патрыотаў. Цікава тое, што і Аляксандар I ня раз выказваўся ў тым сэнсе, што прылучэньне Літвы і Беларусі да Польскага каралеўства—магчымая рэч; што толькі опозыцыя



Казачая стаянка на Беларусі.

рускіх «патрыотычных», консэрватыўных кол, на чале каторых стаяў Карамзін, перашкаджае пакуль што зьдзейсьненьню гэтага акту. Адным словам, рускі урад падтрымоўваў польскі патрыотызм беларускай шляхецкай інтэлігэнцыі.

А опозыцыя ў Варшаве ў сойме паміж тым расьце. Апроч таго, пачынаючы з кампаніі 12 году, як у Польшчы і Беларусі, так і ў самой Расіі ідзе хуткі рост патайных організацый, варожых да рускага самаўладства. Дзейнасьць іх з 20-х гадоў робіцца вядомай ураду, каторы пачынае непакоіцца. Ідуць рэпрэсіі ў адносінах да патайных гурткоў у Польшчы і Беларусі. Абмяжоўваецца констытуцыя Польшчы, што ўсё разам выклікае эміграцыю польскіх патрыотаў заграніцу. Паступова гатуюцца сілы для паўстаньня 1831 году.

## Сялянскае пытаньне.

Яшчэ ў XVIII сталецьці зарадзіўся прамысловы капіталізм як у Расіі, так і на Беларусі. У адносінах да Беларусі даволі ўспомніць чыннасьць у другой палавіне XVIII сталецьця ў Горадні падскарбія Антона Тызэнгаўзэна. Пры яго дапамозе зьявілася ў Горадзеншчыне суконная, палатняная, мэталічная і інш. фабрыкі. Была прыведзена ў парадак друкарня. Былі ўтвораны школы чыста практычных ведаў, напр., па вэтэрынарыі, бухгальтэрыі, ральніцтву і г. д.

Але трэба сказаць, што XVIII сталецьце яшчэ ня мела адпаведнага грунту для росту новай галіны капіталізму. У Горадзеншчыне, напр., к канцу сталецьця амаль што ўся вызваная да жыцьця прамысловасьць прыпынілася. З аднаго боку, для маладога прамысловага капіталізму бракуе машын. Прамысловыя прадпрыемствы XVIII сталецьця найчасьцей зьяўляюцца мануфактурамі, што не дае ім дадатковых карысьцяй у параўнаньні з ранейшаю кустарнаю прамысловасьцю. Нават вельмі часта рабочы мануфактуры даваў менш дадатковай цэннасьці, чым кустар. З другога боку, прамысловаму капіталізму не хапала вольных рабочых рук, каторыя былі ў гэтыя часы скуты прыгонам. У той час, як гандлёвы капітал, жыўшы ня вытворчасьцю, а купляй-продажам, быў зацікаўлен у прыгнячэньні дробнага вытворцы-кустара і рамесьніка і быў ярым абаронцам прыгоннага права,— прамысловы капіталізм, эксплёатуючы працу вольных рабочых рук, патрабаваў вызваленьня сялян ад пана і ад зямлі. Гэтая процілежнасьць старых і новых экономічных адносін будзе рабіць уплыў увесь час на пастаноўку і выяўленьне сялянскага пытаньня як у Расіі, так і на Беларусі.

У пачатку XIX сталецьця руская фабрычна-заводзкая прамысловасьць пачынае крыху ўзмацняцца, што зьяўляецца адным з рэзультатаў контынэнтавай сыстэмы 1807 году і кампаніі 1812 году. Пачаўшы разьвівацца прамысловы капітал ставіць свае вызваленчаскія запатрабаваньні па сялянскім пытаньні. Аднак гэтыя запатрабаваньні ён вымаўляе тонкім, слабым галаскам дзіцяці. Што датычыць да ганд-

лёвага капіталу, то гэты стары скупшчык-прыгоншчык яшчэ моцны, і яго голас зычыць куды гуней, чым галасок падрастаючага прамыслова капіталу.



Вопраткі сялян і мяшчан на пачатку XIX ст.

Вось у чым хаваецца прычына таго, што урад Аляксандра I ўжо прагнецца паставіць пытаньне аб сялянах, але пастаноўка гэтага пытаньня будзе зроблена зусім нясьмела. Ня гледзячы на мноства сказаных лібэральных слоў, урад Аляксандра I у справе вызваленьня сялян нічога не зрабіў. Экономічнаму лепету новых запатрабаваньняў жыцьця як у Расіі, так і на Беларусі адпавядаў і палітычны лепет.

Пачалося з таго, што Аляксандар I хацеў забараніць продаж сялян без зямлі. Але далей хаценьня справа не пашла, бо прадстаўнікі рэакцыйнага дваранства былі ярымі праціўнікамі такой забароны.

Першым загадам у справе сялянскага пытаньня быў вельмі цікавы ўказ 1801 году, на аснове каторага было забаронена друкаваць у газэце «С.-Петербургские Ведомости» абвесткі аб продажы сялян. Прадаваць сялян памешчык можа, але друкаваць абвестку аб гэтым ён ня можа, каб «лібэральнаму» ураду ня прыходзілася чырванець перад Заходняй Эўропай за такія абвесткі. На аснове загаду сялян прадавалі ці проста без абвестак, ці з абвесткамі «об отдаче в услужение», што друкаваць дазвалялася. Па абвестках мы бачым, што цэны на сялян былі рознастайныя, ад 685 рублёў да 2½ рублёў, залежна ад кваліфікацыі, полу і ўзросту.

У 1803 годзе адзін з лібэральных дваран таго часу С. П. Румянцаў падае ураду дакладную запіску, дзе ён прапануе даць паном права адпускаць на волю сялян па ўзаемнай згодзе з імі, надзяляючы іх зямлёю, за каторую сяляне павінны даць выкуп. Разам з тым, Румянцаў просіць урад дазволіць яму вызваліць сваіх уласных сялян на тых асновах, каторыя ён вызначыў у сваёй дакладной запісцы. Проэкт Румянцава найраней быў разгледжан у Інтымным Комітэце і тут ніякіх супярэчак не спаткаў. Адсюль ён папаў на разгляд у Дзяржаўны Савет. Тут наўкола лібэральнага проэкту ўтварылася вялікая бура і падняліся гарачыя спрэчкі. Зразумела, што ўнесеным проэктам былі абураны дваране-прыгоншчыкі, прадстаўнікі старога экономічнага укладу жыцьця, зьвязанага з формамі гандлёвага капіталізму. На чале іх стаў ідэолёг «матушки Екатерины», поэта «богоподобной царевны Фелицы», Г. Р. Дзяржавін. Ён і ўся консэрватыўная опозыцыя даказвалі, што проэкт Румянцава шкадлівы, бо ён нясе небясьпеку сучаснаму экономічнаму і політычнаму стану імпэрыі.

Як вынік усіх гэтых разваг і гарачых спрэчак зьяўляецца ня ўказ, як гэта няправільна вызначаецца ў старых падручніках, а толькі царскі рэскрыпт аб вольных хлебаробах на імя С. П. Румянцава, падпісаны Аляксандрам I 20 лютага 1803 году. На аснове гэтага рэскрыпту, Румянцаву асабіста і тым паном, якія таго пажадаюць, даецца дазваленьне вызваляць сваіх сялян. Пішуцца умовы аб узаемных абавязках, селянін плаціць пану, па згодзе з ім, выкуп за атрыманую зямлю і волю і робіцца пасьля гэтага вольным хлебаробам. Самае афармленьне такога вызваленьня зьяўляецца вельмі зацяжлівай процэдурай. Па сваім прававым палажэньні вольныя хлебаробы прыроўніваюцца да скарбовых сялян: разам з імі яны маюць суд і кіраваньне і плацяць у дзяржаўны скарб падушны падатак. Падпісаўшы рэскрыпт, Аляксандар I адважваецца яго публікаваць. Раней яго публікуецца

і пашыраецца па губэрнях з вялікай пасьпешнасьцю цыркуляр міністра ўнутраных спраў губарнатарам. Цыркуляр зацьверджан імпэратарам пазьней ад рэскрыпту на цэлы тыдзень (27 лютага), але апублікован, як мы сказалі, раней ад рэскрыпту затым, каб паменшыць і без таго малое значэньне рэскрыпту. Сутнасьць цыркуляру, прыблізна, такая. Міністар абвяшчае, што ў хуткім часе будзе апублікован царскі рэскрыпт на імя С. П. Румянцава аб вольных хлебаробах. У сувязі з гэтым, губарнатарам даецца загад, каб яны не зразумелі вышэйпамянёнага рэскрыпту, як указу, і не націскалі на памешчыкаў у сэнсе вызваленьня імі сялян на аснове рэскрыпту. У цыркуляры даволі ясна вызначана, што рэскрыпт мае на мэце задаволіць ня столькі інтарэсы сялянства, сколькі інтарэсы паноў: яго мэта—утварыць для паноў магчымасьць аддаць мужыком свае землі па выгаднай цане.

Вышэйпаказаны рэскрыпт ня меў ніякага значэньня ні для паноў, ні для сялянства. Амаль што за 60 год яго дзейнасьці (з 1803 да 1861 году) ува ўсёй Расіі было вызвалена каля 100.000 сялян. На Беларусі гэтая цыфра даходзіла да 5-6 тысяч чалавек. «Лібэральны» урад, такім спосабам, асьмеліўся толькі паставіць сялянскае пытаньне, але ня больш. Панства зьберагло ў цэласьці сваю «сьвяшчэнную» жывую ўласнасьць.

У часы кампаніі 12 году сялянскае пытаньне на Беларусі вельмі завастрылася. Думкі аб вызваленьні ад панскага прыгону пачынаюць праходзіць у масы. Імпэрыялістычная вайна разбурыла і зруйнавала край, а разам з тым разбурыла звычайныя, штодзенныя экономічныя і політычныя адносіны паміж панам і прыгонным селянінам. На Беларусі адбывалася частая зьмена ўлад, катарая ўтварала для селяніна магчымасьць астацца воч-на-воч з тым панам, каторы ў звычайныя часы ўкрываўся за моцным каркам сваёй панскай дзяржаўнай улады. Гэты факт у сваю чаргу дае магчымасьць селяніну рабіць тое, што ён сам хоча. Найперш ад усяго, селянін выяўляе сваю волю тым, што ён проста-на-проста кідае пана і ўцякае ад яго апекі ў лясы і балоты. Там ён вольны чалавек, асабліва, калі ў яго завядзецца зброя. Весткі таго часу гавораць нам, што па лясох і балотах Беларусі ўтварыліся даволі значныя ўзброеныя сялянскія атрады, якія не давалі паном спакойна спаць. Калі жыцьцё на нейкі час уцішылася і на чале Літвы і Беларусі стаў так званы Часовы Ўрад, то беглыя сяляне і ня думалі вяртацца з атрадаў дамоў для выкананьня сваіх «хлопскіх» абавязкаў. Гэтыя атрады рабілі шмат клопату Часоваму Літоўска-Беларускаму Ураду, учыняючы непарадкі і наводзячы страх на паноў. Вядома, што проціў сялянскіх атрадаў, для падтрыманьня старога соцыяльнага парадку урад павінен быў організаваць 6 батальёнаў егэроў з лясных каманд.

Адначасна з організацыяй лясных егэроў у ліпені 1812 году Часовы Урад выдае адозву да ўсіх жыхароў Беларусі, каторая ў сутнасьці сваёй мае адносіны выключна да зьбеглага сялянства. Адозва прапануе сялянам, якія пакінулі двары і паноў, каб яны зараз-жа вяр-



Сяляне з-пад Вільні на пачатку XIX ст.

нуліся на месцы сваёй ранейшай аселасьці і прыступілі да выкананьня сваёй звычайнай земляробскай працы і павіннасьцяй. Далей, у адозьве прапануецца сялянам слухацца паноў, уласьнікаў, арандароў маёнткаў ці асоб, што іх заступалі; нічым не парушаць права ўласнасьці, каторае, відаць, у гэтыя часы сялянамі парушалася, бо йначай аб гэтым ня трэба было-б і пісаць. Панства ня кідае надзеі ўзяць зноў у свае рукі сялян, ня робячы ім ніякай палёгкі, бо разьмеры павіннасьцяй вызначаюцца «па ранейшых загадах і прадпісаньнях». У канцы адозвы пералічаны тыя «меры воздействия», каторыя урадам будуць накіро-

ваны проціў неслухаў. «Тыя, што не выпаўняюць ці выпаўняюць свае абавязкі дрэнна, па дакладзе вясковых улад павінны ўгаварвацца, карацца і прымушацца да выкананьня сваіх абавязкаў пры дапамозе павятовай адміністрацыі і нават вайсковай сілы, калі гэтага будуць вымагаць абставіны». Па тых карах, якія вызначаны ў адозьве, відаць, што сялянскае пытаньне стала вострым і часта патрабуе для свайго вырашэньня карных мер.

У запісках сучасьнікаў мы спатыкаем скаргі паноў на «необузданности» сялян. Паны баяцца сваіх мужыкоў. Наполеон падліў яшчэ масла ў агонь. Ён вельмі часта выказваўся, што мае намер вызваліць ад пана рускага мужыка. Сталі хадзіць чуткі, што Наполеон ужо выдаў закон аб скасаваньні прыгону, што паноў слухаць далей ня трэба. Апроч таго, вельмі часта і француськія салдаты падкідалі запалкі ў сухую салому: падымалі сялян на паноў і разам рабавалі панскую маемасьць. Перад намі невялікі твор Я. Баршчэўскага, сучасьніка кампаніі 12 году, пад назваю «Рабункі мужыкоў», у каторым аўтар апісвае факт, які адбыўся ў маёнтку пана Маліноўскага—Шнітаўках, каторы знаходзіўся ў 50 вёрстах ад Полацку. Там, паміж іншым, сказана: «Як пранцуская сіла з-за Дзьвіны наступіла, нам стала карціць, што-б парадак прывраціць. Аднака-ж сядзелі ціха. Аж тут прыносіць ліха пранцузаў у наш двор. І нутка делаць здор. Клеці паразьбівалі, паноў нашых запналі, нас казалі пазьбіраць і гарэлку піць і браць. Пранцузы нас пахвалялі, аб нашым краю ўпаўнялі (незразумелае слова) і на мігі нас прасілі, каб мы з імі двор лупілі. І мы доўга там гулялі, што хацелі, пілі, бралі. Той браў плацьця на вяроўку, чым абшыць жонцы шнуроўку. Іншы быдла занімаець, другі адзеньне хапаець». Калі адкінуць насьмешліва-шляхецкі тон апавяданьня, напісанага аўтарам-шляхціцам, то перад намі паўстае яскравы малюнак тагочаснага жыцьця. Мужыком ужо карцела распраўіцца з панамі, але яны не адважваліся. Прышлі француськія салдаты, у масе сваёй сяляне, і мовою клясы, жэстамі ўцягнулі беларускіх сялян у рабунак панскага маёнтку.

Зразумела, што такія факты, апроч Шнітавак, адбываліся і ў другіх мясцовасьцях Беларусі. Проф. У. І. Пічэта піша аб тэтым так: «Рабункі, забойствы, падпальваньне дамоў—звычайныя формы протэсту. Побач з гэтым, нездаволеныя сяляне рабавалі хлебныя сьвірны, забіралі сабе маемасьць. Такога роду бунты былі распаўсюджаны ў Менскай губэрні. Падобныя бунты былі і ў другіх губэрнях. Сяляне ў м. Бешанкавічах Віцебскай губ. адмовіліся слухацца пана і ня слухаліся ўгавораў адміністрацыі. У другім маёнтку вынік рух з прычыны рэкруцкага набору. Сяляне зрабавалі панскія палацы, адабралі 500 руб. грошай, разьбілі 2.400 вёдзер віна і пабілі панскую адміністрацыю. І ў другіх паветах Віцебшчыны былі бунты, вынікаўшыя, згодна афі-

цыяльнаму аб'ясьненьню, «по внушениям необузданной вольности и независимости неприятельского войска». Гэтыя бунты былі рэзультатам цяжкага стану сялянскай масы, аб чым сьведчыць і маркіз Пастарэ, быўшы інтэндантам у Віцебшчыне. Паўстаньні ў Віцебшчыне прынялі такі характар, што памешчыкі-палякі зьвярнуліся да Напалеона з просьбаю аб абароне. Былі нават арганізаваны лятучыя атрады, каб уціхамірыць беспарадкі, у каторых Наполеон бачыў падгаворы рускай адміністрацыі проці яго самога». (В. И. Пичета. История крестьянских волнений в России. Минск, 1923, стар. 76).



Ян Баршчэўскі

Пасьля кампаніі 1812 году мы на Беларусі спатыкаем ужо такіх паноў, каторыя рады былі-б як-небудзь адчапіцца ад сваіх сялян. Гэтыя паны ўжо зразумелі, што рукі прыгоннага селяніна далёка менш выгадны для прогрэсыўнай гаспадаркі, чым рукі вольна-наёмнага рабочага. Прыгонная гаспадарка затрымлівала разьвіцьцё вясковагаспадарчай тэхнікі і перашкаджала інтэнсыфікацыі гаспадаркі. Апроч таго, сялянскія бунты ў часы кампаніі 12 году паказалі, што рукі сялян пры адпаведных выпадках могуць наносіць маёнтку руйнаваньне і нават прагаць з маёнтку самога пана. Само сабой зразумела, што беларускія лібэральныя паны хацелі вызваліцца ад селяніна так, каб усязямля цалкам засталася ў іх руках. У такім выпадку яны мелі-б капітал у зямлі, а ў асобе вызваленых сялян яны мелі-б зусім танныя вольна-наёмныя рукі. Але на такое вызваленьне не згаджаўся рускі урад, які добра разумеў, што зьяўленьне на сьвет вясковагаспадарскага пролетарыяту для яго небясьпечна. Тады лібэральныя паны на Беларусі дадумаліся да вельмі добрага для іх выйсьця. Яны пачалі аддаваць сваіх сялян у наймы прамысловаму капіталу. Дзякуючы гэтаму, яны найперш ад усяго збывалі з рук ужо непатрэбнага ім прыгоннага селяніна і за тэта яшчэ атрымлівалі плату ад наёмніка сялянскіх рабочых рук. Апроч таго, яны вызвалялі сваю

зямлю ад сялян і сялян ад зямлі. Вынікам з усяго гэтага было значнае пагоршаньне палажэньня беларускага сялянства. Адзін з дзекабрыстых (Н. Тургенеў) так апісвае падобныя зьяўленьні: «Адно з самых абурлівых злачынстваў прыкмячаецца ў беларускіх провінцыях (Віцебскай і Магілеўскай), дзе сяляне так абяздолены, што выклікаюць жаласьць нават рускіх прыгонных. У гэтых провінцыях паны аддавалі сваіх сялян сотнямі і тысячамі падрадчыкам, каторыя праводзілі землякопныя работы ва ўсіх канцох імпэрыі. Гэтыя гаротныя людзі наймаюцца галоўным чынам на будоўлю вялікіх шляхоў і канаў. Пан бярэ абавязак зрабіць пастаўку на вядомы лік людзей па ўмоўленай цане, а падрадчык бярэ абавязак харчаваць іх у час работы. Урадавыя інжынэры, што наглядалі за работамі, не патрабуюць ад падрадчыкаў нічога больш ад таго, што трэба для падтрыманьня іх жыцьця. А што датыча да грошай, каторыя атрымлівае за іх пан, то ўрад ня ўмешваецца ў гэта. Такім спосабам былі пракладзены дарогі наўкола Царскага Сяла» (Ред. Семенова Россия, т. IX. Верхнее Поднепровье и Белоруссия. СПБ., стар. 110). Мы нічога ня можам дадаць да гэтага малюнку. Само сабою зразумела, што прыгнечанае беларускае сялянства адказвае паном бунтамі забойствамі і рабункамі маёнткаў, аб чым ужо гаварылася вышэй. Паўстаньні сялян пакуль што дробны, неорганізаваныя і ня зьвязаныя адно з другім. Урад з імі лёгка спраўляецца ўсялякімі рэпрэсіямі.

## Пачатак мікалаеўскай эпохі.

З 20-ых гадоў XIX сталецьця ідзе ўпартая рэакцыя. Пачаўшыся з аракчэеўшчыны, яна, пасьля паўстаньня ў сьнежні, пераходзіць у мікалаеўшчыну. Што датычыць да аракчэеўшчыны, то яна павінна разглядацца, як надворны політычны выказ тых глыбокіх экономічных процэсаў, каторыя тады перажывала імпэрыя. З 20-ых гадоў зноў моцна пачынае расьці ў Расіі маладая прамысловасьць. У 1822 годзе урад устанаўлівае высокае мыта на замежным тавары, каб менш пусьціць іх на рынак і такім спосабам падтрымаць рускую прамысловасьць, забясьпечыўшы ёй вольнае месца на рынку. Стары лад, пабудованы на грунце экономічных ўзаемаадносін гандлёвага капіталу, адчуваючы прыход на зьмену новага капіталу, каторы будзе руйнаваць старую політыку, бязглузда і ўпарта, рукамі дэгэнэрата Аракчэева, апошні раз будзе бараніць свае політычныя падставы.

На барацьбу з аракчэеўшчынай, як політычнай сыстэмай, выступаюць дзекабрыстыя. Не астанаўліваючыся на апісаньні падзей дзекабрызму, што ў нашы заданьні ня ўходзіць, мы павінны адзначыць, што дзекабрыстыя былі тыповымі прадстаўнікамі інтарэсаў прамысловага капіталу, каторому з соцыяльнага боку было патрэбна вызваленьн-

не з прыгону сялянства, а з палітычнага боку—такая канстытуцыя, каторая-б абмежавала абсолютную ўладу імпэратара сабраньнем народных прадстаўнікоў.

Час улады прамысловага капіталу яшчэ ня прышоў. Праўда, ён быў цяпер куды мацнейшы, чым раней; тым ня менш, ён быў яшчэ слабейшым ад гандлёвага капіталу. Дзекабрыстыя праваліліся. Царскі пасад «цаною крыві сваіх падданых», паводле яго ўласнага выразу, займае Мікалай I. Пачынаецца тыповая мікалаеўская эпоха. Яна прагнецца вясьці палітыку, якая адпавядала-б інтарэсам ня толькі гандлёвага, але і прамысловага капіталу, каторы ўжо пачынае ставіць свае запатрабаваньні. І таму і другому капіталу патрэбна пашырэньне тэрыторыі; тут іх інтарэсы сходзяцца. Вось дзеля гэтага урад Мікалая ўвесь час вядзе войны на захадзе і на ўсходзе. Але далёка не заўсёды магчыма пагадзіць запатрабаваньні гэтых двух драпежнікаў. У такіх выпадках мікалаеўскі ўрад прагнецца прайсьці пасярэдзіне. Адсюль і выцякае даволі частая падвойчасьць палітыкі Мікалая I. Наагул, усё-ж такі ўрад больш будзе падтрымоўваць інтарэсы гандлёвага капіталу. Эпоху яго трэба лічыць рэакцыйнаю. Але трэба сказаць, што мікалаеўская рэакцыя не падобна на аракчэеўскую, каторая зусім ня лічылася з запатрабаваньнямі новых экономічных умоў.

Мікалай I, як чалавек, не падобен на Аляксандра I шмат з якіх бакоў. Няма ў яго той інстытуцкай сантымэнтальнасьці, расплыўчатасьці і адсутнасьці лініі, якія мы бачым у васобе Аляксандра I. Мікалай I—натура рэальная, цьвёрдая і нават упартая. Яму няможна адмовіць у даволі значнай працаздольнасьці, каторая, праўда, ня выходзіла з рамак канцэлярскай пісаніны. Ніводзін цар не пакінуў пасьля сябе столькі рэзолюцый, паметак на дакладах і інш., як Мікалай. Яго цараваньне мае сваю сыстэму, сваю лінію. Тады, як часы цараваньня Аляксандра I назваць аляксандраўшчынай немагчыма, часы Мікалая I—мікалаеўшчынай мы можам.

Экономічныя рэальныя умовы патрабуюць ад ураду войнаў за пашырэньне тэрыторыі. Асоба Мікалая з гэтага боку падходзіць да запатрабаваньняў моманту. Ён любіць вайсковы, казармены парадак і дысцыпліну, разумеючы іх, праўда, з чыста фармальнага боку. Яшчэ з дзяцінства ён любіць вайсковыя цацкі: шаблі, стрэльбы, барабаны, трубы і г. д. Гэта вучань не часоў Лягарпа, а часоў Ламсдорфа, каторы цялесныя кары лічыў найлепшай мерай пэдагогічнага ўплыву, а ваенную муштру—найважнейшай і найпатрэбнейшай навукай. На погляд Мікалая I жыцьцё ўва ўсёй імпэрыі павінна быць пабудована так, як і ў арміі, пры тым, у мікалаеўскай арміі. Імпэрыя павінна зрабіцца падобнай на мікалаеўскую казарму. На гэтую тэму ён часта любіў гаварыць: «Тут, у арміі, парадак, строгая бязумоўная дысцыпліна, усё

выходзіць адно з другога, усё пакіроўваецца да аднэй мэты, усё мае адно заданьне, вось чаму мне так добра сярод ваенных, і я заўсёды буду трымаць пачэсна званьне салдата. Я гляджу на ўсё чалавечае жыцьцё, толькі як на службу, бо кожны служыць» (Стеблев. Очерки по истории XIX в.).

Адносіны ураду Мікалая I да польскага пытаньня былі вынікам агульнай політыкі мікалаеўскай эпохі. Мы ўжо казалі, што урад павінен будзе здабываць для рускага капіталу новыя землі. Само сабою зразумела, што Польшча павінна будзе згубіць нават уяўную сваю незалежнасьць. Ня можа быць і размовы аб далучэньні да яе Беларусі. Наадварот, яна сама павінна будзе ўвайсьці ў склад звычайных губэрань Расіі. Урад Мікалая I не згаджаўся з лібэралізмам польскай політыкі часоў Аляксандра I. Ён лічыў такую політыку шкадлівай для інтарэсаў імпэрыі і нязгоднай з прынцыпамі самаўладзтва рускага цара.

Асабісты настрой Мікалая I зусім адпавядаў такой політыцы. Яшчэ з дзяцінства ён мае погляд на палякоў, як на «бунтаўшчыкоў», і як такіх—ненавідзіць. Такі погляд на палякоў ён атрымаў ад сваёй нянькі Лаон, каторая была выпісана для яго выхаваньня з Англіі. У часы польскага паўстаньня 1794 году Лаон якраз ехала праз Польшчу ў Расію па вызаве рускай царскай фаміліі. Па дарозе яна папала ў Варшаву ў самы разгар паўстаньня. Разам з рускімі яна была заарыштована і пасаджана ў турму. У вельмі цяжкіх абставінах яна прасядзела там цэлых 7 месяцаў. Само сабою зразумела, што арыштованыя ў турме павінны былі перажыць усе жахі польскага паўстаньня, часта рызыкуючы быць забітымі. Сувораў, пасьля штурму Прагі, узяў Варшаву і вызваліў з турмаў усіх рускіх, а разам з імі і Лаон. Толькі пасьля гэтага Лаон прыехала ў Пецярбург і зрабілася нянькай малога Мікалая. Вельмі часта потым яна апавядала яму ўсе тыя жахі рэволюцыі, каторыя яна перажыла ў польскай турме. Мазгі дзіцяці з жывасьцю ўспрымалі тэтыя бабскія ды яшчэ і прыфарбованыя апавяданьні, яны моцна адбіліся ў яго памяці на ўсё жыцьцё.

Падзеі 1812 году замацавалі ў Мікалая I адмоўны погляд на палякоў. Палякі былі для яго ня толькі ненавіснымі рэволюцыянэрамі, але й зацятымі ворагамі Расіі, бо яны ў ліку «двадесяти языков» былі ў Маскве і палілі яе, як тады гаварылі консэрватыўныя кругі камандных вярхоў. Такі адмоўны погляд на палякоў, ня толькі тых, што жылі ў Польшчы, а і тых, што жылі на Беларусі, Мікалай I захаваў на ўсё жыцьцё. У яго журнале, у каторы ён запісваў свае штодзенныя мысьлі, здарэньні і пляны, мы чытаем аб польскім шляхецтве такія словы: «На Беларусі шляхецтва, што складаецца амаль што ўсё з вельмі багатых палякоў, зусім ня выказала вернасьці да Расіі і, апроч нека-

торых віцебскіх і паўднёва-магілеўскіх шляхтаў, усе іншыя прысягнулі Наполеону» (Шильдер. Николай I, т. I, стр. 68).

Заняўшы царскі пасад, Мікалай ня раз адкрыта казаў, што ён не згаджаецца з сваім прадмесьнікам наконт польскай палітыкі і што яго нават абурае дараваньне Аляксандрам I канстытуцыі польскім землям. Адмоўна адносячыся да ўсякага парлямэнтарызму, ён лічыць вельмі шкадлівым для неабмежаванай імпэрыі мець яго пад бокам. Абсолютызм новага імпэратара быў так яскрава выразным, што нам зразумелы ўсе гэтыя заявы.

Не прашло і некалькіх месяцаў, як мы ўжо бачым, што паміж царом і яго намесьнікам у Польшчы, Канстантынам Паўлавічам, вынікаюць непаразуменьні. Ня гледзячы на ўсю сваю сумбурнасьць і нетактоўнасьць, Канстантын у польскім пытаньні трымаўся лініі лібэральнай палітыкі. Польскую дзяржаўнасьць, на яго погляд, трэба зьберагчы. Для імпэрыі карысна мець у Польшчы буфэр, настрой камандных кругоў каторага пакіраван у бок Расіі. Што датычыць да меж Польшчы, то іх трэба пашырыць, аддаўшы польскаму куртатаму каралеўству тэрыторыю Літвы і Беларусі. Адным з мотываў такіх поглядаў Канстантына на польскую палітыку было жаданьне пашырыць свой асабісты ўплыў на ўсход і ўзмацніць сваю уладу намесьніка. Само сабою зразумела, што Мікалай I не згаджаецца з поглядам Канстантына. Яго прынцып—гэта прынцып Катарыны II. Расія вярнула сабе свае ўласныя «отторженные» калісь землі і павінна цяпер моцна трымаць іх у сваіх руках. Калі польская дзяржаўнасьць прызнана Венскім конгрэсам, то з гэтым пакуль што прыходзіцца мірыцца, але ні ў якім выпадку ня можна дапускаць думкі аб тым, што Літва і Беларусь павінны ўвайсьці калі-небудзь у склад польскага гаспадарства. Літва і Беларусь гэта «исконные» рускія землі.

Супярэчнасьці паміж намесьнікам польскага каралеўства і Мікалаем I вынікаюць з-за дробных здарэньняў, але ў гэтых драбніцах выяўляюцца прынцыповыя погляды таго і другога. Канстантын быў галоўнакамандуючым польскай арміі, разам з тым ён быў і камандзірам так званага Літоўскага корпусу на Беларусі. Як гэта было звычайна ў мікалаеўскія часы, з Пецярбургу быў дадзен загад перамяніць форму мундзіраў Літоўскага корпусу. Канстантын прапанаваў, каб Літоўскаму корпусу былі дадзены мундзіры з польскімі адзнакамі і афарбоўкай. Мікалай, наадварот, даў загад, каб мундзіры корпусу мелі рускія адзнакі і афарбоўку. Гэта было зроблена, па завяе Мікалая, затым, каб ня даць польскім патрыотам нават намёкаў на магчымасьць якой-небудзь блізкасьці Літвы і Беларусі да Польшчы.

У свой час, калі падняўся рух дзекабрыстых, то ён стаў у сувязь з рухам за адбудаваньне Польшчы. Пасьля разгрому паўстаньня па-

чала працаваць комісія па разглядзе справы дзекабрыстых. Яна жорстка расправілася з загаворшчыкамі. Паказаньні абвінавачаных выявілі, што дзекабрыстыя вялі жывыя зносіны і трымалі пастаянную сувязь з патайнымі гурткамі як у Польшчы, так і на Беларусі. Гэтыя гурткі ставілі сваёю мэтаю падтрымаць пераварот дзекабрыстых у Расіі і скарыстаць яго для адбудаваньня Рэчы Паспалітай, незалежнай ад Расіі, у старых яе межах. Проэкты рускіх дзекабрыстых, напрыклад, «Руская Праўда» Пэстэля, таксама прымалі пад увагу пажаданьні польскіх патрыотычных гурткоў. З польскіх гурткоў, зьвязаных з дзекабрыстымі, нам вядомы: «Грамада праўдзівых палякоў», «Грамада вольных палякоў», «Прыяцелі» і г. д. Што датычыць гурткоў на Беларусі, то яны былі таксама польскімі па сваіх мэтах і па сваім складзе. Яны былі зьвязаны з студэнцкімі гурткамі Віленскага унівэрсытэту. З гурткоў на Беларусі, зьвязаных з дзекабрыстымі, нам вядомы: «Патрыотычны саюз», «Чорныя браты», «Вайсковыя прыяцелі» і інш. Па некаторых зьвестках можна думаць, што ў 1823 годзе ўсе патайныя гурткі ў Польшчы і на Беларусі ўстанавілі паміж сабою сувязь і зьліліся ў адзін «Агульны патрыотычны саюз». Усе гэтыя організацыі ня выступілі проціў рускага ураду ў сьнежні 1825 году толькі таму, што рух дзекабрыстых падняўся неспадзявана для іх, і яны не пасьпелі зрабіць адпаведнай падгатоўкі да выступленьня.


Беларускія салдаты ў канцы XVIII веку (Конная артылерыя).

Такія матар'ялы, атрыманыя рускім урадам, выклікалі ў Мікалая I яшчэ большае абурэньне проці Польшчы. Члены патайных гурткоў, раскрытых на Беларусі, судзіліся і караліся тым самым Вярхоўным Угалоўным Судом, каторым караліся наагул усе дзекабрыстыя ў Расіі. Загаворшчыкі на Беларусі паплаціліся, хто крэпасьцю, хто турмою, хто катаргаю, хто выгнаньнем «в места не столь отдаленные Сибири». Што датычыць да членаў польскіх патаемных арганізацый, то, па констытуцыі польскага каралеўства, яны не маглі быць аддадзены пад суд імпэрыі. Для сьледзтва і кары над імі, па загаду польскага караля, якім быў Мікалай I, быў арганізован асобны суд пры польскім сойме. Гэты суд не сьпяшаўся з разборам справы і разьбіраў яе больш чым год, наўмысьля зацягваючы процэс. Прыцягнутым да суду членам патайных арганізацый было пастаўлена абвінавачаньне ў тым, што яны ведалі аб загавары дзекабрыстых і не данясьлі аб ім ураду і што яны мелі намер зьвергнуць законны парадак у Польшчы і ўвясьці констытуцыю 3 мая 1791 году. Ня гледзячы на такое цяжкае абвінавачаньне, суд апраўдаў абвінавачаных, чым, зразумела, быў вельмі абураны урад Мікалая I. Паміж іншым, старшыня соймавага суду Бялінскі на запытаньне рускага ураду, чаму суд апраўдаў абвінавачаных, адказаў так: «Маё сэрца перашкаджала мне асудзіць нацыянальнае пачуцьцё». Даведаўшыся аб такім адказе Бялінскага, Мікалай I, кажуць, кінуў такія словы: «Няшчасныя, яны выратавалі віноў-



Беларускія салдаты у канцы XVIII в. (улан і пачтавік.)

ных, але загубілі бацькаўшчыну». З гэтых слоў ясна відаць настрой польскіх грамадзянскіх кругоў і намеры адносна Польшчы рускага ураду. Соймаваму суду за непажаданы, на погляд Мікалая, разбор справы быў зроблен выгавар, але прыгавор яго ўсё-ж такі быў зацьверджан.

5 траўня 1829 году ў Варшаве адбылася ўрачыстасьць каранацыі Мікалая I польскім каралём. Праз год (1830) у траўні адчыніўся чарговы сойм, каторы пачаў сваю бягучую працу. На адчыненьне сойму ў Варшаву зноў прыяжджаў Мікалай I і адчыніў яго сваёю прамоваю. Прамова царственага караля насіла сухі, афіцыяльны характар, не давала ніякіх, нават дэкляратыўных, абяцанак і на прысутных зрабіла няпрыемнае ўражаньне. Праца сойму пашла сваёю чаргою, але гэта была толькі знадворнасьць. У глыбіні ўжо гатаваліся сілы для паўстаньня, каторае і пачалося з восені гэтага самага 1830-га году.

## Паўстаньне 1830-31 году.

Мы ўжо гаварылі аб працы патайных організіцый у Польшчы і на Беларусі. Яны мелі ў сабе шмат моладзі—як студэнцкай, так і вайсковай. Цэнтрам організацый Польшчы была Варшава, Літвы і Беларусі—Вільня. Разгром дзекабрыстых у Расіі і патайных гурткоў на Беларусі ня спыніў вызваленчаскага руху на захадзе,—тым больш, што ў Польшчу рускае самаўладзтва так і не прабралася, што відаць з процэсу над членамі польскіх патайных гурткоў. Вельмі хутка пад уплывам Варшавы ўзмацняецца рух за аднаўленьне Польскай дзяржавы і на Беларусі. Тут ён атрымоўвае такіх відных ідэёвых кіраўнікоў, як профэсара Віленскага унівэрсытэту Лелевэля і польскіх песьняроў—А. Міцкевіча і Ю. Нямцэвіча.

У 1928 годзе Расія пачала Турэцкую кампанію, каторая патрабавала шмат сродкаў і сіл. Зразумела, што ўся увага рускага ураду была пакірована на поўдзень, дзе адбывалася кампанія. Надзеі польскіх вызваленцаў падняліся. Агітацыя сярод студэнцкай і вайсковай моладзі павялічылася. Момант для паўстаньня быў зручны, бо Расіі ня было магчымасьці зварачаць увагу на захад.

Улетку 1830 году рэволюцыйны вызваленчаскі настрой у Польшчы яшчэ больш падняўся, дзякуючы падзеям францускай ліпнёўскай рэволюцыі. Рэволюцыянэры спадзяваліся, што рэволюцыя з Францыі перакінецца ў другія гаспадарствы і дакоціцца да Польшчы. Рэволюцыя адразу перакінулася ў Бэльгію. Рэакцыйны урад Мікалая I ня мог ня прыняць дзейнага удзелу ў пагашэньні рэволюцыі. У восень 1830 году ў Варшаву з Пецярбургу прышоў загад прывясьці ў баявую гатоўнасьць польскую армію і пакіраваць яе на захад, каб задушыць бэльгійскую рэволюцыю. Зразумела, што гэты загад пагражаў

плянам рэволюцыянэраў. У вадказ на яго і пачалося польскае паўстаньне ў Варшаве.

Вынікла паўстаньне ў ноч з 17 на 18 лістапада (стар. стылю). Маладыя афіцэры і вучні ваенных школ на чале з галоўным агітатарам Высоцкім кінуліся на палац намесьніка—Бэльвэдэр. Ім удалося разброіць варту палаца, а праз нейкі час захапіць арсэнал. Намесьнік ледзьве выратаваўся ад сьмерці. Ён наагул выявіў поўную бязьдзейнасьць і даў загад рускай арміі, каторая была ў Варшаве, трымацца ў старане. Пры такіх умовах яму заставалася толькі ўцячы з ахопленай паўстаньнем сталіцы, што ён і зрабіў, выехаўшы сьпешна ў падгародную вёску Вержбу. Туды-ж пачалі зьбірацца часьці рускай арміі і тыя часьці польскай арміі, каторыя засталіся вернымі намесьніку і рускаму ураду. Горад, такім чынам, вельмі лёгка, амаль што бяз бою, дастаўся паўстанцам.

Праз дзень да намесьніка ад паўсталай Варшавы была адпраўлена дэлегацыя з польскіх арыстократаў на чале з Любецкім. Яна паставіла пытаньне аб прызнаньні за Польшчай рэальных праў незалежнага гаспадарства, якім яна толькі лічылася, і аб далучэньні да Польшчы Літвы і Беларусі. Намесьнік адмовіўся даць той ці іншы адказ, ссылаючыся на тое, што ён ня мае поўнамоцтва ў гэтых пытаньнях ад свайго брата Мікалая I. Дэлегацыя вярнулася зноў у Варшаву. Канстантын, адпусьціўшы ад сябе, што былі вернымі яму, польскія войскі, толькі з рускай арміяй, каторая сабралася пры ім, вышаў зусім з тэрыторыі Польскага каралеўства. Гэта разьвязала рукі паўстанцам, і паўстаньне пачало разрастацца. У Варшаве быў утваран Часовы Урад Рэчы Паспалітай, на чале каторага стаў у якасьці дыктатара і галоўнакамандуючага збройнымі сіламі дзяржавы гэнэрал Хлапіцкі.

З самага пачатку стала выяўляцца, што паўстанцы ня маюць адзінай програмы і рэзка падзяляюцца на дзьве партыі. Адна партыя—белых—складалася з арыстократаў. На чале гэтай партыі стаіць добра вядомы нам польскі патрыот, быўшы прыяцель Аляксандра I, Адам Чартарыскі. Магнацкая партыя лічыла, што паўстаньне ня трэба даводзіць да крайняга пункту, што трэба захаваць сувязь з Расійскай імпэрыяй і весьці з ёю перагаворы, націскаючы адначасна на расійскую ўладу праз дыплёматыю чужаземных двароў. Польшча, на іх погляд, павінна застацца, як і дагэтуль, абмяжованай монархіяй. Ніякіх соцыяльных рэформ рабіць ня трэба. Сяляне, як і раней, павінны заставацца ў прыгонным стане. Другою групіроўкаю паўстанцаў была партыя чырвоных. На чале яе стаяў вядомы дэмократ свайго часу проф. Лелевэль. Складалася партыя з дробнабуржуазнай інтэлігэнцыі лібэральнага настрою. Партыя лічыла, што трэба канчаткова парваць сувязь з расійскай уладай і не весьці ніякіх перагавораў з

Мікалаем I, бо яны не дадуць ніякіх вынікаў. Не дыплёматыя, а толькі збройная барацьба можа і павінна вырашыць долю Рэчы Паспалітай. На думку чырвоных, Польшча ў будучыне павінна быць дэмократычнай рэспублікай. Прыгон павінен быць скасован і вольнае сялянства надзелена зямлёю, для якой мэты трэба ў кожнага з паноў адабраць частку зямлі. Апошні пункт, хоць і ня зусім ясна выражаны ў чырвоных, уносіў вялікую нязгоду паміж дзьвюма партыямі паўстанцаў.

У часовым урадзе ахопленай паўстаньнем Польшчы атрымала верх магнацкая партыя белых. Дыктатар Хлапіцкі быў тыповым прадстаўніком яе. Ён зусім не разумее значэньня для паўстаньня ў Польшчы і асабліва на Беларусі вырашэньня сялянскага пытаньня. Паглыбленьне рэволюцыі яго палохае. Узяўшы ўладу ў свае рукі, ён не парывае зносін з рускім урадам. Вось перад намі асабісты ліст яго да Мікалая I: «Найміласьцівейшы кароль! Пераканаты ў тым, што сойм ня здолее сярод буры ўстанавіць спакой і маючы перад вачыма прошлыя страшныя дні (пачатку рэволюцыі), я пастанавіў узяць выканаўчую ўладу ў свае рукі, каб яна не папала ў рукі агітатараў і бурыцеляў, каторыя хоць і ня маюць адвагі ў мунціты небясьпячэнства, але ўсё-ж такі ўмеюць падбураць і злучаць натаўп. Будучы ворагам анархіі і прытым бачачы на працягу некалькіх дзён тры зьмены ураду, я пастанавіў узяць уладу ў свае рукі». (B. Limanowski. Historya demokracyi polskej. Wyd. II, Cz. I, W. 1922, стр. 208).

Так глядзіць на паўстаньне і ўся партыя белых: лепш з Мікалаем, чым з чырвонымі. Белыя пастанавілі, ня гледзячы на протэсты дэмократаў, паслаць у Пецярбург двух дэлегатаў: Езерскага і таго самага Любецкага, аб якім ужо гаварылася. Яны, зьявіўшыся ў паўночнай сталіцы, дабіваліся ад рускага ураду, каб Мікалай I прыняў іх, як поўнамоцных дэлегатаў новаўтворанага польскага часовага ураду. На гэта Мікалай не згадзіўся і даў ім аўдыенцыю толькі як прыватным асобам. Зразумела, што на гэтай аўдыенцыі яны нічога не дабіліся ад рускага ураду. Мікалай згадзіўся толькі на амністыю пры умове, калі паўстанцы адразу зложаць зброю. З такім адказам дэлегаты вярнуліся ў Варшаву. Пасьля такога адказу партыя чырвоных у Варшаве ўзмацнілася.

Быў склікан сойм, каторы, пад уплывам чырвоных, 13 студзеня 1831 году абвясьціў дынастыю Раманавых нізложанай з польскага каралеўскага пасаду. У адказ на паўстаньне і на соймавую пастанову, 25 студзеня быў выпушчаны маніфэст Мікалая I, у каторым было сказана так: «Мы даем загад нашым верным войскам выступіць проціў мяцежніка».

Пачала комплектавацца руская армія. К канцу 1830 году было скомплектавана 45.000, але праз некалькі месяцаў лік рускай арміі да-

ходзіў да 100.000. Пад камандваньнем Дзібіча рускія войскі былі пакіраваны на паўстанцаў. Паўстанцы, з свайго боку, пачалі гатавацца да абароны свае справы. Польская армія, лік каторай у пачатку даходзіў да 35.000, была павялічана так званымі касіньерамі. На чале арміі, замест Хлапіцкага, быў пастаўлен Радзівіл, чалавек хоць мала здольны для вайсковых спраў, але больш рашучы і сьмелы, чым Хлапіцкі. Ня гледзячы на павялічэньне, польская армія мела каля 60.000 салдат, каторыя маглі быць пастаўлены на поле бітвы.

Руская армія без вялікіх перашкод дашла амаль што не да самай Варшавы. У сярэдзіне лютага адна за другою адбыліся дзьве бітвы,—адна пры Ваўру, другая пад Грохавым. У абедзьвюх бітвах польскія войскі былі разьбіты і адступілі пад Варшаву. Тут яны занялі і ўзброілі Прагу. Руская армія застанавілася, бо ў яе ня было прылад для аблогі. У Варшаве пачалася паніка, бо ўсе чакалі, што Дзібіч будзе рабіць пераправу праз Віслу і наступ на Варшаву. Але руская армія гэтага не зрабіла і, такім спосабам, не скарыстала зручнага моманту. У Варшаве, паміж тым, паніка памалу пачала спыняцца. Замест Радзівіла, на чале польскай арміі быў пастаўлен больш здольны галоўнакамандуючы Скржынецкі, каторы ўсе свае сілы накіраваў на тое, каб падняць настрой арміі, які ўпаў пасьля ранейшых няўдачных бітваў. Ён выбраў тактыку зацягнуць кампанію і скарыстаць нявыгаднае расплажэньне рускай арміі.

Руская армія стала пад Варшаваю на зімоўку. У арміі зьявілася халера, каторая пачала разьвівацца вельмі хутка і касіла шмат людзей. Зразумела, што настрой арміі быў прыгнечаны. Паўстаньне з польскай тэрыторыі перакінулася на Літву і Беларусь. На чале паўстаньня тут стаіць падпольны Віленскі цэнтральны рэволюцыйны комітэт. Ён абзясьціў сябе падданым Варшаўскаму часоваму ураду, і паўстаньне ішло ў імя прылучэньня Літвы і Беларусі да Польшчы. Часовы урад прагнуўся ўсімі сіламі падтрымаць і пашырыць паўстаньне на Беларусі, каторае тут з самага пачатку пашло даволі слаба. На дапамогу паўстанцам сюды быў пакірован вясною атрад Гелгуда, каторы, пасьля злучэньня яго з атрадам Хлапоўскага і другімі мясцовымі групамі, дарос да 25.000. Пры дапамозе гэтай арміі паўстанцам пашанцавала заняць на нейкі час Вільню. Але яны тут утрымацца не маглі. Руская армія пад начальствам Сакена, дarосшы да 27.000, разьбіла галоўныя паўстанчаскія сілы і заняла зноў Вільню.

Паўстаньне на Беларусі, як гаварылася раней, не захапіла шырокіх мас. Удзел у паўстаньні прыняло панства і дробныя шляхецкія і інтэлігэнцкія элемэнты. А на гэтых групах далёка ня выехаць, асабліва на Беларусі, што добра разумелі і лепшыя з паўстанцаў. «Нідзе ў даўнейшай Рэчы Паспалітай пытаньне ваеннае не залежала так ад пы-

таньня грамадзянскага, як на Русі. Усякае паўстаньне, каторае не пачыналася ад вызваленьня сялян і дапушчэньня іх да грамадзянскіх праў, ня мела ніякай будучыны» (Мераслаўскі. Паўстаньне польскага народу. Парыж, 1846, т. 2, стр. 4). У сялянскіх колах паўстаньне ня было популярным. Палітычны дэвіз паўстаньня ня мог цікаваць беларускага запрыгоненага селяніна. Яму было ўсё роўна, дзе ён будзе рабом,—у Польшчы ці ў Расіі. Соцыяльны дэвіз чырвоных паўстанцаў—вызваленьне сялян—зацямняўся тым, што яны самі былі панамі і, апроч таго, дапусьцілі да улады такіх паноў (белую партыю), каторыя воража адносілася да скасаваньня прыгону. Наадварот, вельмі часта селянін на Беларусі, як потым і галіцыйскі селянін у 1848 годзе, адмоўна адносіўся да паўстанцаў, лічачы іх сваймі соцыяльнымі ворагамі. Былі і такія факты, што сяляне прымалі удзел у паўстаньні па загаду паноў, каторыя мелі над імі ўладу, але такі прыгонны, паднявольны удзел ня мог быць дзейным. Часам, карыстаючыся з агульнага забурэньня, сялянства падымала свае ўласныя бунты проціў паноў, напр., у Меншчыне і ў Горадзеншчыне, каторыя праходзілі няпрыметна ў агульным руху. Адным словам, на Беларусі польскае паўстаньне вялікай моцы ня мела.

Паўстаньне на Валыні і Падолі таксама пасьпехам не карысталася. Туды для падтрыманьня паўстаньня часовы урад паслаў атрад, на чале каторага стаяў здольны начальнік Дзьвярніцкі. Яго здольнасьць разбілася аб поўнае неспачуцьце паўстаньню украінскіх сялянскіх мас. Яго атрад, акружаны амаль што з усіх бакоў рускай арміяй, павінен быў пакіравацца ў Галіцыю і схаваўся на аўстрыйскай тэрыторыі, дзе ён і быў інтэрнаваны.

Няўдачы падалі на паўстаньне і ў Польшчы. Пад Астраленкаю, дзе была згрупована польская армія, 14 траўня адбылася крывавая бітва з арміяй Дзібіча, каторая скончылася перамогаю рускіх. Польская армія панясла вялікія страты, пасьля якіх яна ўжо не магла аправіцца.

Праз два тыдні пасьля бітвы ад халеры памёр галоўнакамандуючы Дзібіч. Яшчэ праз два тыдні (15-VI) у Віцебску таксама ад халеры памёр няўдалы намесьнік Польшчы Канстантын. На места Дзібіча галоўнакамандуючым быў назначан Паскевіч. Пасьля яго прыезду ў армію, справа ліквідацыі паўстаньня пашла хутчэй. Паскевіч па наведзенаму масту пераправіў армію праз Віслу і стаў пагражаць Варшаве. У Варшаве зноў пачалася паніка. Замест Скржынецкага, галоўнакамандуючым быў назначан Дэмбінскі, каторага хутка зьмянілі на Малахоўскага. Прэзыдэнтам рэспублікі абралі белага магната Крукавецкага. Як вынік панікі, 3 жніўня ў Варшаве адбылося сваё паўстаньне. Пачалі шукаць здраднікаў. Натаўп кінуўся на турмы, і там

пачаліся забойствы тых, каго лічылі здраднікамі. Паўстаньне было хутка прыпынена, тым ня менш паміж Крукавецкім і дэмакратамі йшла патаемная барацьба. Крукавецкі не давяраў народнай масе Варшавы, дзякуючы чаму ён ня мог скарыстаць яе проці ворага, каторы ўжо пачаў аблогу сталіцы. Замест таго, каб усю армію рушыць проці рускіх, ён частку яе выдзеліў для ахраны парадку ў горадзе, каб змагацца з «анархістымі», каторымі ён лічыў чырвоных.

26 жніўня руская армія ўжо заўладала ваколіцаю Варшавы, Воляй, а на другі дзень была ўзята і Варшава. Рэшткі польскай арміі паўцякалі за прускую і аўстрыйскую межы, дзе былі разброены. У кастрычніку 1831 году Мікалаем I была абвешчана гучная амністыя з такімі выключэньнямі, каторыя амаль што нічога не пакідалі ў гэтай амністыі. З амністыі былі выключаны: зачыншчыкі паўстаньня, удзельнікі забойстваў 3 жніўня, члены сойму, каторыя падавалі свае галасы за нізлажэньне дынастыі Раманавых з польскага каралеўскага пасаду, афіцэры і жаўнеры, што не палажылі зброі ў час капітуляцыі Варшавы.

Пасьля ліквідацыі паўстаньня, рускі урад заняўся рэорганізацыяй кіраваньня былой Польшчы. Констытуцыя, дадзеная Польшчы ў часы Аляксандра I, была скасована. Замест яе, у 1832 годзе быў выданы так званы органічны статут. На аснове статуту быўшае Польскае каралеўства інкорпоруецца ў організм Расійскай імпэрыіі. Уся яго тэрыторыя дзеліцца на губэрні, каторыя прыроўнены да другіх губэрань Расіі. Закасованы ўсе прыметы дзяржаўнасьці: сойм, законы, войска і г. д. Уводзяцца прысутныя месцы і ўстановы імпэрыі. На чале польскіх губэрань былі пастаўлены адміністрацыйны і дзяржаўны Саветы, складзеныя з чыноўнікаў рознастайных установ. Адміністрацыйны Савет пасылаў на зацьверджаньне цара кандыдатаў на грамадзянскія пасады. Дзяржаўны Савет утвараў законапроэкты і складаў бюджэт на польскія губэрні. Законадаўчая ўлада належала да рускага цара.

Паўстаньне 1831 году правалілася. Галоўнейшаю прычынаю правалу была політыка белых у сялянскім пытаньні, каторая аддаліла ад паўстанцаў запрыгоненыя сялянскія масы. Гэты факт асабліва адчуваўся на Беларусі. Перад намі ёсьць вельмі цікавы дакумант, каторы яскрава сьведчыць аб адносінах беларускага селяніна да паўстаньня. Афіцэр польскай разьбітай арміі Багданскі разам з трыма таварышамі прабіраецца з Беларусі ў Галіцыю. Ім трэба прабрацца праз балоты, і стары паляшук узяўся быць іх павадыром. Па дарозе стары селянін так аб'ясьніў прычыну няўдачы паўстаньня: «Як за Касьцюшкам, так і цяпер ёсьць адна прычына няўдачы паўстаньня—гэта адносіны паноў да сялянства. Паны думалі самі зрабіць паўстаньне, але забыліся, што іх мала, а мужыкоў столькі, як мурашак. Паны не хацелі вызваліць

сялянства, бо, згубіўшы паншчыну і падданства мужыкоў, яны згубілі-бы свае даходы ад мужыка і сваю вагу ў гаспадарстве, дзе яны—усё, мужык—нішто. Вы ніколі ня будзеце мець Польшчы, пакуль мужыкі яе не адваююць, а яны не адваююць яе, ня маючы перакананьня, што адбіваюць яе для сябе. Паншчына ёсьць прычына упадку паўстаньня» (Zbiór pamiętników z 1831 r., str. 219—220).



Сяляне з-пад Пінску ў пачатку XIX веку.

Няўдача паўстаньня значна павялічыла польскую эміграцыю. Частка эміграцыі, зьвязаная ў свой час з чырвонымі, дае пачатак польскаму ўтопічнаму соцыялізму. У такім кірунку йшла, напрыклад, праца Ворцэля, Сьвентаслаўскага, Крэмпавецкага і др., што залажылі в польскіх жаўнераў у Портсмуце організацыю «Люд польскі». Часам закладаюцца проста дэмократычныя організацыі, як, напрыклад, «Маладая Польшча». Эміграцыя белая разьмясьцілася па чужаземных дварох. Яна прагнецца рабіць уплыў на урады і камандныя кругі Заходняй Эўропы. Найбольш эміграцыі абселася ў Францыі. У розных кутках Эўропы пачынаецца зноў праца па аднаўленьню Польшчы.

## Русіфікацыя Беларусі.

Прылучыўшы Беларусь да імпэрыі, урад Катарыны II, лічачы новы край «искони русским», паставіў сабе за мэту русіфікаваць яго і пачаў ужо гэтую справу. Але Катарына хутка памёрла, а новы урад Паўла I не падзяляў поглядаў ранейшага ураду на Польшчу і на Беларусь. Русіфікацыя Беларусі прыпынілася, і пачалося другое. Мы бачым, што на працягу першай чвэрці XIX сталецьця на Беларусі йдзе добра знаёмая краю полёнізацыя, якая праводзіцца цьвёрдаю рукою польскіх патрыотаў, на чале каторых стаяць добра вядомыя нам Чартарыскі, Чацкі і др.

Іначай стала справа ў часы мікалаеўскай эпохі, каторая будавала сваю політыку на трох падставах—праваслаўе, самадзяржаўе і народнасьць. Пад народнасьцю разумелася руская народнасьць, якая, на думку камандных кругоў, павіна была праглынуць усе другія народнасьці, каторыя дасталі назву «інародцаў». У палажэньне «інародцаў» папалі і беларусы, і ліцьвіны, і палякі, і яўрэі. У сувязі з гэтым, на Беларусі старую полёнізацыю зьмяняе русіфікацыя.

Першы плян русіфікацыі Беларусі быў утворан добра вядомым потым «вешацелем» М. Н. Мураўёвым. Пакуль што гэта проста «раскаявшийся» дзекабрысты, каторы пачынае рабіць сваю чыноўніцкую кар'еру. Месцам яго кар'ернай чыннасьці зьяўляецца Беларусь. Летам 1827 году ён назначан Віцебскім губарнатарам; праз год, у восень 1828 году, ён перамешчан на тую самую пасаду губарнатара ў Магілеў, дзе і сядзіць да восені 1830 году. З пачатку паўстаньня Мураўёў пакідае губарнатарскую пасаду і назначаецца чыноўнікам для асобых даручэньняў пры штабе рэзэрвнай арміі, каторая была ўтворана на Беларусі для падмацаваньня той арміі, якая гасіла паўстаньне ў Польшчы. Пасьля таго, як паўстаньне было задушана ў 1831 годзе, Мураўёў назначаецца на пасаду горадзенскага губарнатара, на якім месцы ён і прабыў да 1835 году.

За ўвесь гэты час малады кар'ерысты, каб зьвярнуць на сябе увагу начальства, піша шмат усялякіх дакладных запісак наконт Польшчы і Беларусі. Для нас цікавы дзьве запіскі аб русіфікацыі Беларусі, напісаныя ім у 1831 годзе. Зьмест іх такі. Усе чыноўнікі на Беларусі, асабліва губэрскія, павінны набірацца з цэнтральнай Расіі. Іх трэба выклікаць адтуль спэцыяльнымі абвяшчэньнямі і вабіць сюды, «предоставив выгоду в чинах и содержании». Што да «туземцев», то было-б карысна «даць ім магчымасьць служыць у імпэрыі, пасля чаго, калі некаторыя з іх заслужаць давер'е начальства, то могуць дастаць пасады і на Беларусі». Каб утварыць рускі выгляд краю, трэба ўводзіць у быт рускія назвы ўстаноў, пасад, мясцовасьцяй, вуліц і г. д. У рускай

мове павінны пісацца і друкавацца урадовыя і службовыя паперы і абвесткі. Старыя літоўскія законы па сваёй сутнасьці і форме адчужаюць Беларусь ад Расіі, а загэтым трэба выкасаваць з ужываньня ў судох на Беларусі Літоўскі Статут. «Трэба рашуча зьнішчожыць гняздо літоўскага вольнадумства скасаваньнем Віленскага унівэрсытэту і расформаваньнем яго па розных школах унутры імпэрыі». Усе другія школы ў Літве і на Беларусі трэба паступова і няўхільна перарабляць на ўзор рускіх школ. Трэба адабраць прывілеі ў каталіцкага духавенства, зьменшыць яго моц, узяць пад строгі нагляд і адсунуць бязумоўна ад асьветы. Усе каталіцкія ордэны, манастыры і школы—зачыніць. Тое месца, якое раней займала каталіцкае духавенства ў жыцьці Беларусі, павінна заняць праваслаўнае духавенства.

Вышэйпаказаныя запіскі *Мураўёва* зьяўляюцца урадоваю праграмаю мікалаеўскай русіфікацыі на Беларусі, каторая, з дадаткам усялякіх дэталяй, выконвалася ў другую чвэрць XIX сталецьця. Справа пачалася з ненавіснага для рускага ураду «гнязда літоўскага вольнадумства»—Віленскага унівэрсытэту, які становіў цэнтр ня толькі «патрыотычнай» польскай культуры, але й мясцовай беларускай культуры, каторая разьвівалася тут побач і ў сувязі з польскай. 1 траўня 1832 г. Віленскі унівэрсытэт быў зачынен, профэсары яго часткаю разьбегліся самі, часткаю былі разагнаны урадам. Замест унівэрсытэту, быў астаўлен толькі адзін мэдыцынскі факультэт, каторы атрымаў назву мэдыцынскай акадэміі. Пры акадэміі існаваў вэтэрынарны аддзел, які быў вельмі рэдкім зьяўленьнем у тыя часы. Акадэмія ў Вільні праіснавала 10 год, зьяўляючыся, як раней унівэрсытэт, цэнтрам патрыотычнага руху польскай і беларускай шляхецкай моладзі. У 1838 годзе руская паліцыя ўстанавіла сувязь студэнтаў акадэміі з эмісарам чырвонай польскай эміграцыі Канарскім. Загаворшчыкі былі адкрыты. Канарскі, злоўлены урадам, скончыў сваё жыцьцё на шыбеніцы ў Вільні на Лукіскім пляцы (1839 г.), а студэнты, што мелі з ім сувязь, паплаціліся катаргаю і выгнаньнем у далёкія краі Сібіры. Улада пастаралася даказаць, што прэзыдэнт акадэміі, проф. Кучкоўскі, ведаў аб палітычных настроях студэнтаў, а таксама аб зносінах іх з Канарскім і не паказаў на іх рускаму ураду. Усё гэта ўтварыла для рускай улады мотывы, каб зачыніць рэштку Віленскага унівэрсытэту—акадэмію. Акадэмія была зачынена ў 1842 годзе. Профэсары і студэнты былі раскасіраваны па мэдыцынскіх факультэтах рускіх унівэрсытэтаў. Так скончыў сваё больш чым трыццацёхлетняе існаваньне на Беларусі Віленскі унівэрсытэт. Замест яго, Беларусь так і не атрымала ад Расійскай імпэрыі ніякай вышэйшай школы. Гэты факт цяжка адбіўся на навукова-культурных дасьледзінах Беларусі. Толькі ў нашыя часы, калі Беларусь зрабілася Савецкай рэспублікай, улада рабочых і сялян

дала краю тое, чаго ён ня мог дачакацца ад царызму. У 1921 годзе быў заснован унівэрсытэт, а ў 1922 г. сельска-гаспадарчы інстытут, каторыя зьяўляюцца асяродкамі новай культуры і навукі на Беларусі.

У свае часы (у 1832 і 1842 гадох), пасьля зачыненьня Віленскага унівэрсытэту ўсе навуковыя яго цэннасьці—бібліотэка, габінэты, музэй і г. д.—былі неравезены ў Кіеў, і там быў заложан Кіеўскі унівэрсытэт (1834 г.), каторы і існуе да нашых дзён.

За унівэрсытэтам наступіла чарга і для Віленскае вучэбнае акругі. На думку яе заснаваццеля Чартарыскага, акруга концэнтравала ў сваіх межах усе землі былой Рэчы Паспалітай, што ўвашлі ў склад Расійскай імпэрыі. Такім спосабам утваралася поўная магчымасьць адзінага концэнтраванага польска-патрыотычнага ўплыву на тэрыторыях Літвы, Беларусі і Украіны. Гэтыя землі культурна-політычнаю дзейнасьцю акругі як-бы падгатаўляліся да таго, каб потым уліцца ў будучую Польшчу. Зразумела, што урад Мікалая І дапусьціць далейшае існаваньне акругі, утворанае для такіх мэт, ня мог. Віленская акруга была падзелена на дзьве часткі. Адна частка яе (паўночная) злажыла Беларускую акругу, а другая (паўднёвая) адышла да новае Кіеўскае акругі.

Потым урад прыняўся за рэформу школ. У 1834 годзе былі выданы новыя штаты для школ на Беларусі, ці, як сказана ў палажэньні аб штатах,—«для учебных заведений Северо-Западного края». Пры разглядзе гэтых штатаў мы бачым, што пры замене польскіх школ рускімі агульны лік школ зьменшаўся, прыблізна, на палавіну. Перад паўстаньнем 1831 году на Беларусі лічылася 13 гімназій і 33 павятовых школ, усяго 46; паводле рускіх штатаў 1834 году, на Беларусь было вызначана гімназій і павятовых школ разам толькі 25. Была закасована, такім спосабам, 21 школа з 46. Потым урад пачаў папраўляцца, і лік рускіх школ паступова павялічваецца. Праз 10 год (1844 г.) на Беларусі (губэрні—Віленская, Горадзенская, Ковенская і Менская), замест 25 школ, налічваецца ўжо 44.

Само сабою зразумела, што выкладовую моваю ў гэтых школах была руская мова. На програмах і сыстэме іх выказалася ўся рэакцыйнасьць мікалаеўскай асьветнай політыкі. Програмы гімназій былі зложаны на квазі-клясычным грунце. Мотывы для гэтага грунту ў палажэньні аб гімназіях былі формуляваны так: «Дабы заснаваць рускую адукацыю цьвярдзей і глыбей на старажытнай адукацыі той нацыі, ад каторай Расія атрымала і сьвятое навучэньне веры і першыя пачаткі сваёй асьветы». Ясна, што пад нацыяй, вызначанай тут, урад разумеў ня грэкаў антычнага часу, а грэкаў-візантыйцаў эпохі ўпадку антычнай культуры. Вось гэтая ўпадачная культура і лягла ў аснову програмы мікалаеўскай гімназіі. Сыстэма асьветы была наўмысьля пабудована так, каб парушыць адзінства і паступовасьць школы; каб з

школы ніжэйшага тыпу ня можна было без перашкод перайсьці ў школу вышэйшага тыпу. Клясычная програма была злучана з саслоўнай сыстэмай школы. Гімназіі павінны былі абслужваць толькі шляхту. Людзі «подлых станаў» не павіны былі пераходзіць па скончэньні школы ў гімназію. Зразумела, што, разам з гімназіяй, для ня шляхціца быў зачынен і унівэрсытэт, бо шлях у вышэйшую школу ішоў праз гімназію. Вышэйшая школа, на думку ураду, была шкадлівай для людзей ніжэйшых станаў грамадзянства, «ибо, составляя лишнюю роскошь, оно (высшее образование) выводит их из круга первобытного состояния без выгоды для них и государства». На думку ураду, прадстаўнікі працоўных мас не павінны лезьці ўгару, а павінны аставацца ў «першабытным стане».

Для новаяўленых рускіх школ на Беларусі не хапала настаўнікаў. Каб запоўніць гэты прабел, выклікаюцца з цэнтральнай Расіі настаўнікі, каторых урад прываблівае сюды павышанымі пэнсіямі і падарожнымі грашыма. Для пачатковых школ урад прагнецца выкарыстаць мясцовых сьвяшчэньнікаў. Апроч таго, ім даецца загад адчыняць рускія школы напарафіях пры царквах. Не хапае і папоў, якія добра ведалі-б рускую мову. Дзеля гэтага урад выклікае на Беларусь рускіх папоў, даючы ім тыя самыя прывілеі, што і настаўнікам. Заадно рускія папы павінны русіфікаваць і праваслаўную царкву на Беларусі. Забаронена як у праваслаўных, так і вуніяцкіх царквах гаварыць казаньні пабеларуску, што часта практыкавалася ў вёсцы, бо беларуская мова была прыроўнена да польскай і рэшткі яе выжываліся разам з польскай мовай

Потым урад прыняўся за польскую культуру і літаратуру, а разам з ёю і за беларускую. Ставіліся ўсялякія перашкоды пры цэнзуры і выданьнях твораў, аўтары іх браліся пад нядрэмнае вока мікалаеўскай паліцыі. Цікава тое, што беларуская літаратура часам больш падлягала рэпрэсіям, чым нават польская. У той час, як «Пан Тадэуш» Міцкевіча вольна зьяўляўся ў друку ў польскай мове, пераклад яго дзьвюх першых песень, зроблены беларускім песьняром В. Дунін-Марцінкевічам, быў зьнішчан.

Ува ўсіх адміністрацыйных і судовых установах была ўведзена руская мова як для вуснага карыстаньня, так і для канцэлярскіх спраў. Зразумела, што пры такой перамене не хапала мясцовых ураднікаў, каторыя-б ведалі рускую мову, бо раней ува ўстановах яны карысталіся польскай мовай. Недахват запаўнялі вызывамі ураднікаў з цэнтральнай Расіі. Старыя польскія ураднікі звыклі да мясцовага быту і беларускай мовы, чым палягчалі для сялянства зносіны з урадовымі ўстановамі, дзе дзелаводзтва вялося ў польскай мове. Апроч таго, большасьць ураднікаў былі палёнізаванымі беларусамі, для каторых бела-

руская мова і быт былі больш зразумелымі і блізкімі, чым польская мова і польскі быт, дзеля чаго яны карысталіся моваю беларускай большасьці на кожным кроку. Новыя урадпікі, выклікаyыя з Расіі, зусім ня былі знаёмы ні з мясцовым бытам, ні з моваю, дзеля чаго беларускія працоўныя нізы, каторыя, апроч сваёй мовы, ніякай другой ня ведалі, сталі тым лагаднейшым матар'ялам для чыноўніцкага кручкатворства і судовай валакіты. Трэба сказаць, што вызывы урадпікаў з цэнтральнай Расіі вялікіх вынікаў у першыя часы ня мелі. Першыя кадры рускага чынавенства на Беларусі зьбіраліся паціху. У саракавыя годы лік выкліканых урадпікаў складае 25-30% усяго чынавенства на Беларусі. Бачачы гэта, рускі урад выдаў загад, каб мясцовыя урадпікі, палякі і беларусы, вучыліся для дзелаводзтва рускай мове. Быў назначан тэрмін, пасьля якога ня ведаўшыя рускай мовы урадпікі выключаліся з урадовых установ.

Што датычыць да панства, каторае прымала удзел у паўстаньні, то яно ў сваёй большасьці пастаралася ўсякімі спосабамі ўвастанавіць добрыя адносіны з рускім урадам па зразумелых прычынах. Пацярпела больш шляхта, каторая ў паўстаньні далёка зашла. Найбольш дасталося безабароннай, малазямельнай, дробнай, так званай засьценкавай шляхце. Нязначная меншасьць панства і шляхты, каторая не ўвашла ў згоду з рускім урадам, часткаю ўцякла заграніцу ў эміграцыю, часткаю была асуджана і выслана «в места не столь отдаленные Сибири». Маёнткі тых і другіх былі рэквізаваны ў скарб і раздаваліся потым за «заслуги пред царем и отечеством» рускім дваранам і урадпікам. Вельмі часта з рэквізаваных зямель выкрайваліся надзелы для сьвяшчэньнікаў праваслаўных парафій. Земляўласьніцтва на Беларусі ў сваёй аснове ўсё-ж такі засталося польскім, як і раней. Гэты факт утварыў для польскай эміграцыі магчымасьць, цераз абложэньне нелегальнымі падаткамі зямель сваіх радакоў, прыгатаўляць экономічныя рэсурсы для будучага паўстаньня і падрываць усе адміністрацыйныя распараджэньні ураду, пакіраваныя на ўраўненьне краю з цэнтральнай Расіяй.

Пачынаючы з часоў Паўла I, суд на Беларусі зноў адпраўляўся па нормах Літоўскага Статуту, каторы пры далучэньні Беларусі да Расіі быў выкасаван з ужытку урадам Катарыны II. Беларускія масы звыклі да гэтых норм, карыстаючыся імі на працягу соцен год. Яны вырасьлі на мясцовай глебе і, як такія, адпавядалі укладу мясцовага жыцьця. Урад імпэрыі па сваёй гістарычнай і палітычнай няпісьменнасьці быў пераконаны, што Літоўскі Статут цалкам ёсьць продукт польскай дзяржаўнай творчасьці. Адсюль урадам рабіўся вывад, што «польскае» права, апрацованае ў Літоўскім Статуце, трэба замяніць рускім правам, аб чым і пісаў у сваёй запісцы М. Н. Мураўёў.



Сяляне-беларусы на Смаленшчыне ў пачатку XIX ст

Якраз у часы мікалаеўскага ураду, у 1833 годзе, амаль што пасьля 200-гадовага перарыву (1649—1833), была канчаткова зроблена кодыфікацыя рускага права. Над гэтым працаваў лібэрал аляксандраўскіх часоў, што потым пакаяўся ды стаў тыповым чыноўнікам мікалаеўскай эпохі, вядомы Сьперанскі. Раней ён сабраў усе юрыдычныя матар'ялы і разлажыў іх у хронолёгічным парадку. Пасьля гэтай падгатоўчай працы сабралася 45 томаў «Полного собрания законов Российской империи». Потым Сьперанскі зрабіў сыстэматызацыю сабраных матар'ялаў па асобных відах праступкаў, выбіраючы толькі тыя законы, якія былі прыстасованы да сучаснага яму жыцьця. Такіх законаў набралася 15 томаў; яны былі выдадзены пад назваю «Свод законов Российской империи».

Пасьля таго, як імпэрыя атрымала «Свод законов», яна пашырыла яго па сваім абшары. У 1834 годзе, па распараджэньні ураду, Літоўскі Статут быў скасаваны ды заменен агульна-расійскім «Сводом». Гэтая замена пагоршыла судовую справу на Беларусі. Найперш за ўсё, па заяве самога Сьперанскага, «Свод» ня быў яшчэ апрацован да канца; яго трэба было яшчэ раз перагледзець, значна скараціць і зрабіць больш цэльным і зьвязным. Апроч таго, «Свод» ня мог адпавядаць умовам і абставінам бягучага жыцьця на Беларусі, бо ўзрос і быў апрацован на грунце быту цэнтральнай Расіі.

А цікава адзначыць, што Беларусь мела ў гэты самы час апрацованы для яе і адпаведны умовам яе жыцьця зборнік законаў. Вядомы вучоны юрысты таго часу, профэсар Віленскага унівэрсытэту І. Даніловіч, доўга працаваўшы над нормамі мясцовага права, прыгатаваў для друку так званы «Западный Свод законов». У аснову гэтага «Своду» якраз былі паложаны нормы старажытнага беларускага права, на каторых утварыўся Статут Вял. Княства Літоўскага. Гэты зборнік лепш быў апрацован, чым «Свод» Сьперанскага, і больш адпавядаў умовам беларускага жыцьця. Урад Мікалая І забракаваў працу Даніловіча, як працу «польскага» характару, і Беларусь ніколі так і не пабачыла «Заходняга Своду законаў».

## Ліквідацыя царкоўнай вуніі 1596 году.

У 1596 годзе ў Берасьці адбылася вунія праваслаўнай царквы ў Рэчы Паспалітай з дзяржаўнай у Польшчы рымска-каталіцкай царквою. Акт вуніі адбыўся даволі скандальна. Царкоўны сабор, каторы быў склікан для злучальнай працы, праходзіў вельмі бурна, ніяк ня мог злучыць дзьве стараны—прыхільнікаў і праціўнікаў вуніі—і ўрэшце разьбіўся на дзьве часткі, кожная з каторых абвясьціла сябе самастойным саборам. Адзін з сабораў даводзіў канечную патрэбу вуніі, другі лічыў яе актам здрады ў адносінах да праваслаўя. Абодва сабо-

ры рабілі свае пасяджэньні асобна і да канца засталіся кожны пры сваёй думцы. Вуніяты абвясьцілі анатэму і лішылі сану тых епіскапаў, каторыя не згаджаліся на прыняцьце вуніі, а прыхільнікі чыстага праваслаўя зрабілі тое самое ў адносінах да сваіх праціўнікаў.

Што датычыць да ураду Рэчы Паспалітай, то ён цьвёрда стаў на бок вуніятаў, пачаў лічыць вунію адбытым фактам, падтрымліваў вуніятаў епіскапаў і абвясьціў праваслаўе нелегальнай верай. Праваслаўных пачалі гнаць і адбіраць у іх цэрквы і манастыры з іх маемасьцю для вуніятаў. Акт царкоўнай вуніі набраў, такім спосабам, палітычнага характару. Царкоўная Берасьцейская вунія зрабілася простым працягам палітычнай Люблінскай вуніі 1569 году. Урад і камандныя колы ў Польшчы былі зацікаўлены ня толькі ў тым, каб падданы-праваслаўны кідаў сваю веру, перарабляўся на каталіка ці вуніята і праз гэта кіраваўся ў нябеснае царства, але і ў тым, каб ён праз рэлігійную сувязь з дзяржаўнай верай Рэчы Паспалітай прымаў палітыка-соцыяльны і культурны ўплыў Польшчы. Пры дапамозе вуніі з каталіцтвам трэба было адарваць праваслаўных падданых Рэчы Паспалітай ад царкоўнай падлегласьці ўсходу і маскоўскаму мітрапаліту ці патрыярху, бо з гэтай царкоўнай падлегласьцю ўсходу злучаўся маскоўскі культурны і палітычны ўплыў.

Зусім зразумела, што пасьля далучэньня Беларусі да Расійскай імпэрыі, калі зьмянілася палітычная сытуацыя, зноў павінна было стаць і пытаньне аб вуніі. У першую чвэрць сталецьця яно ня стала, толькі дзякуючы нявыразнасьці палітыкі рускага ураду. У мікалаеўскую эпоху, паколькі на Беларусі было яскрава пастаўлена пытаньне аб яе русіфікацыі, то трэба было зьніштожыць вунію, каторая ў свае часы была ўтворана для палёнізацыі краю. Трэба было скасаваць вунію, каб вызваліць беларусаў вуніятаў ад царкоўнай падлегласьці заходняму епіскапу (рымскаму папе), а разам з тым ад культурнага і палітычнага ўплыву Захаду і Польшчы, каторая й пасьля падзелаў лічылася небясьпечнай для Расійскай імпэрыі. У свой час, каб утварыць вунію, урад Рэчы Паспалітай яшчэ загадзя пастараўся знайсьці адпаведных для сваіх мэт епіскапаў, доўгімі поламі каторых і прыкрыў свае чыста палітычныя мэты. Яшчэ за некалькі год да сабору (1591 г.) агэнты ураду, пусьціўшы ў ход экономічныя і палітычныя абяцанкі, з'арганізавалі з праваслаўных епіскапаў энэргічную групу, каторая пачала з таго, што падала каралю Жыгімонту заяву аб прызнаньні імі старшынства рымскага папы, пад умоваю, каб у праваслаўнай царкве былі пакінуты ўсходня-грэцкія абрады. Кароль адобрыў такое іх пажаданьне. Тады, у 1595 годзе, на грошы ураду з граматамі караля і з пісаным актам вуніі прадстаўнікі патрэбнай ураду групы (Луцкі епіскап Кірыла Цярлецкі і Ўладзімерскі епіскап Іпаты Пацэй)

зрабілі падарож да папы ў Рым і там усталявалі для вуніі грунт. Гэта група праводзіла вунію на Берасьцейскім саборы, а пасьля яго пашырала і змагалася за яе на Беларусі.

Такімі самымі крокамі йшоў і царскі урад, катораму трэба было скасаваць вунію. Ён пастараўся знайсьці сярод вуніяцкіх епіскапаў такіх, каторыя ўзяліся-б за ліквідацыю вуніі і пакрылі-б палітычныя мэты ураду зданьню царкоўнасьці. Вельмі хутка патрэбныя епіскапы знашліся. Гэта былі—Віленскі епіскап Язэп Сямашка, беларускі епіскап Васіль Лужынскі і Полацкі—Смарагд. На чале іх стаў самы энэргічны і разумны з іх—Язэп Сямашка. Праз памянёную групу рускі урад і пачаў падгатоўку да ліквідацыі вуніі. Названыя епіскапы паказалі сябе найлепшаю зброяю ў руках ураду. Нават часам іх шчырасьць пераходзіла патрэбныя межы і была не па розуме, так што мікалаеўскаму ураду прыходзілася супыняць іх чыннасьць.

І тут, пры ліквідацыі вуніі, як і пры яе ўтварэньні пры Жыгімонце, пачалося з дакладной запіскі. У 1827 годзе Язэп Сямашка падае ураду запіску «аб стане вуніяцкай царквы ў Расіі і аб спосабах звароту вуніятаў у лона праваслаўнай царквы». Тут апавядаецца гісторыя вуніі і вызначаецца, што вунія ў далейшыя часы зрабілася тым мастом, па каторым беларускі народ пераходзіў з праваслаўя ў каталіцтва. Паступова грэцкія абрады вуніяцкай царквы зьмяніліся на лацінскія, і яна, такім спосабам, пачала зьліваццa з каталіцкаю царквою. Праз каталіцтва, у сваю чаргу, вуніяты збліжаліся з палякамі і цяпер разам з імі ваража адносяцца да «маскалёў». Але справу з вуніятамі магчыма яшчэ паправіць. «Даволі толькі аддзяліць іх ад рымлян, даць пры дапамозе выхаваньня належны кірунак розуму духавенства, што займае 1.500 вуніяцкіх парафій, і народ лёгка пойдзе па шляху, паказанаму пастырамі». «Выдаленьне ад рымлян» прывядзе да зьбліжэньня з «маскалямі», а аддаленьне ад рымлян магчыма пры скасаваньні вуніі. Канчаецца запіска зусім выразнымі словамі: «Няхай урад перабачыць сію шчырасьць і стараннасьць, з якімі я жадаў-бы бачыць міліён з паловаю рускага народу калі ня злучаным, то прынаймней прыбліжаным, калі ня зусім дружным, то і не варожым да сваіх братоў; бачыць гэты народ шчырым да веры сваіх бацькоў, да карысьці сваёй бацькаўшчыны і да службы агульнаму айцу-гаспадару».

Вуніяцкая царква ў 30-ыя годы складалася з чатырох епархій: Берасьцейскай, Віленскай, Полацкай і Луцкай. Яна кіравалася так званым другім дэпартамантам рымска-каталіцкай колегіі. Гэта колегія ў сваю чаргу была ў веданьні дэпартаманту чужаземных вызнаньняў, каторы знаходзіўся пад кіраўніцтвам міністра народнай асьветы, адмірала А. С. Шышкова. У сваёй вышэйпаданай дакладной запісцы Сямашка, паміж іншым, казаў, што трэба аддзяліць вуніяцкі дэпарта-

мант ад каталіцкай колегіі і зрабіць яго незалежнай у вадносінах да колегіі ўстановай. Апіраючыся на запіску Сямашкі, каторы быў тады толькі асэсарам вуніяцкага дэпартаманту, урад выдаў 22 красавіка 1828 году высачайшы ўказ аб перабудове вуніяцкага дэпартаманту ў самастойную грэка-вуніяцкую колегію. Дзякуючы гэтаму, яна была вызвалена ад паслушэнства рымска-каталіцкай колегіі і падчынена беспасрэдна дэпартаманту чужаземных вызнаньняў. У гэтым-жа годзе ў мястэчку Жыраве Слонімскага павету была адчынена грэка-вуніяцкая духоўная сэмінарыя з праваслаўным уклонам, каторая павінна была выхоўваць патрэбнае рускаму ураду вуніяцкае духавенства. Дагэтуль вуніяцкая царква атрымоўвала духоўных асоб з рымска-каталіцкай сэмінарыі пры Віленскім унівэрсытэце.

Адбылося польскае паўстаньне 1831 году. На другі год была выдана царская пастанова аб тым, каб на Беларусі, для ўзмацненьня рускага ўплыву, замяшчаць пасады вуніяцкіх сьвяшчэньнікаў асобамі, што скончылі духоўныя сэмінарыі ў Расіі, і каб дзяцей беларускага духавенства пасылаць для адукацыі ў духоўныя школы Вялікарусі і Украіны. Увесь час ішло зачыненьне базыліянскіх манастыроў, прыняўшых удзел у паўстаньні. Была адчынена Полацкая праваслаўная епархія, на каторую быў назначан пецябурскі вікарны епіскап Смарагд Крыжаноўскі.

Гэтая «новая мятла» пачала мясьці. З дапамогаю тутэйшых губарнатараў, Хаванскага і Шрэдэра, і мясцовай паліцыі Смарагд пачынае вясьці «добровольные» далучэньні вуніятаў да праваслаўнай царквы. Зразумела, што пры такой дапамозе справы яго пашлі вельмі пасьпешна. На працягу менш як аднаго месяца ён далучыў да праваслаўя каля 4.000 чалавек. Было зроблена многа гвалтаў і злачынстваў. Вялікае абурэньне й злосьць падняліся ў масах. Нават Сямашка перапалохаўся, як-бы неразумны ліквідатар вуніі не сарваў яму справы. У сваім данясеньні ў Пецярбург аб далучэньнях, зробленых Смарагдам, ён піша: «Праяжджаючы цераз Беларусь, я пераканаўся, што шмат спроб (на прылучэньне да праваслаўя) былі зусім няўдалымі і паднялі ў народзе толькі фанатызм. Сам прэасьвяшчэнны Смарагд, князь Хаванскі і губарнатар Шрэдэр прызнаюцца, што надта скора ўзяліся за справу і згаджаюцца, што трэба прыпыніць сваю работу. Можна нават сказаць, што самыя лепшыя з гэтых далучэньняў звярочваюцца да вялікай шкоды для вуніяцкай справы». Мікалай I, даведаўшыся аб усім, што рабілася ў Полацкай епархіі, пісаў у сакрэтнай інструкцыі праваслаўным епіскапам на Беларусі адносна Смарагда так: «Прэасьвяшчэннаму Смарагду строга падцьвердзіць гэтаю папераю для карысьці самой справы і для яе цэннасьці не сьпяшацца, а рабіць вельмі асьцярожна». Адным словам. мэтод Смарагда правaліўся.

Добра азнаёміўшыся з полацкімі падзеямі, і расійскі урад і яго слуга Сямашка прышлі да вываду, што трэба зьмяніць стары мэтод прылучэньня вуніятаў да праваслаўнай царквы, як мэтод занадта прымітыўны. Яны лічаць, што вуніятаў ня трэба рабіць праваслаўнымі адразу, прылучаючы іх да праваслаўя цэлымі парафіямі. Трэба зьвярнуць увагу на сутнасьць вуніяцтва і вельмі і вельмі паступова трэба мяняць адзін за адным абрады вуніяцтва з каталіцкіх на праваслаўныя. Справа ў тым, што, на аснове акту вуніі 1596 году, абрады ў вуніяцкай царкве павінны былі застацца ўсходня-грэцкія. З цягам часу паступова, пад уплывам каталіцтва, яны зьмяніліся на заходня-лацінскія. Сямашка й высунуў думку паступова касаваць гэтую абрадавую заходнюю знадворнасьць вуніяцтва, замяняючы яе па частках праваслаўнымі абрадамі. З пачыну Сямашкі ў 1834 годзе зьбіраецца нарада з вуніяцкіх епіскапаў, большасьць каторай складаецца з прыхільнікаў Сямашкі. Нарада таксама выносіць пастанову прыбліжаць паступова абраднасьць вуніяцкай царквы да абраднасьці праваслаўнай царквы.

У наступным 1835 годзе урадам быў утворан тыповы для мікалаеўскага часу «асобны, сакрэтны» комітэт вуніяцкіх спраў, каторы складаўся з вышэйшых духоўных і сьвецкіх саноўнікаў. Комітэт афіцыяльна згадзіўся з паглядамі на спосаб далучэньня вуніятаў да праваслаўя, выяўленымі як Сямашкаю, так і нарадаю вуніяцкіх епіскапаў.

З гэтага-ж году пачалося і зьдзейсьненьне пляну Сямашкі. Найперш заняліся іконастасамі і прастоламі. У вуніяцкіх царквах замест іконастасу была проста нявысокая загародка, а прастол прыстаўляўся да сьценкі, а не стаяў пасярэдзіне аўтара, як гэта бывае ў праваслаўных царквах. Паставіць прастол пасярэдзіне было лёгка, затое будаваць іконастасы было цяжэй: патрэбны былі сродкі. На будоўлю іконастасаў адпушчаны былі грошы з скарбу, але іх не хапала. Тады міністар унутраных спраў выдаў загад—«прапанаваць паном будаваць іконастасы і прастолы ўласнымі сродкамі ў сваіх маёнтках для здавальненьня патрэбнасьцяй сялян, што прыносяць ім карысьць сваёю працаю». Каталікі-паны, такім спосабам, павінны былі будаваць праваслаўныя іконастасы. Гэта была свайго спосабу кара польскаму панству на Беларусі за яго удзел у паўстаньні. Потым пачалі выносіць з вуніяцкіх царквей арганы і ў 1836 годзе забаранілі карыстаньне імі. За арганамі пашлі званочкі, за званочкамі—так званыя цыборыі, за цыборыямі—амбоны для казаньняў і г. д. Старыя кнігі для набажэнства былі заменены кнігамі, выданымі ў Маскве. Было загадана вуніяцкаму духавенству весьці мэтрычныя кнігі ў рускай мове. Зноў на Беларусі адбывалася шмат гвалтаў і злачынства. Цёмная сялянская маса, хоць і не разумела, у чым справа, але абуралася зьменаю абра

даў, да каторых яна ўжо звыкла за доўгі час існаваньня вуніі. Усякія протэсты супакойвалі лозамі і бізунамі. Мацей Бурачок у сваім вершы «Хрэсьбіны Мацюка» даў нам яскравы малюнак працы тагочасных прылучацеляў да праваслаўнай царквы.

Пасьля такой падгатоўчай працы урад лічыў ужо магчымым у самым пачатку 1837 году выдаць указ, на аснове каторага дэпартамант вуніяцкіх спраў перадаваўся пад загад Сыноду. Сынод яшчэ больш памагае на прыбліжэньне вуніяцтва да праваслаўя. Каля гэтага часу ўміраюць вуніяцкія епіскапы—Булгак і Жарскі,—каторыя не спачувалі дзейнасьці Сямашкі і ураду, чым рукі Сямашкі і яго прыхільнікаў былі зусім разьвязаны. Яны цяпер патрабуюць ужо поўнага далучэньня вуніятаў да праваслаўнай царквы. У 1838 годзе Антоні Зубко ў сваёй запісцы аб вуніі піша так: «Грэка-вуніяцкая царква ёсьць цяпер падобна на занова-адбудованы будынак, пакуль пакінуты бяз даху, і ваbooжыя стыхіі полёнізму і каталіцызму могуць памалу руйнаваць яго так, што потым і пабудованы дах не абароніць будынку. На мой погляд трэба, каб хутчэй пасьледвала царская воля аб прылучэньні нашай царквы да грэка-расійскай, згодна з пажаданьнем амаль што ўсяго духавенства».

У сувязі з такім настроем вышэйшага вуніяцкага духавенства націск на вунію і вуніятаў з яго боку вельмі ўзмацняецца. У вадказ на яго ўзмацняецца і протэст проці скасаваньня вуніі з боку ніжэйшага духавенства, каторае падтрымліваецца нездаволенымі элемэнтамі жыхарства.

Зьніштажэньне вуніяцкіх служэбнікаў і замена іх праваслаўнымі служэбнікамі, надрукованымі ў цэнтральнай Расіі, выклікалі два протэсты,—адзін на Беларусі, другі на Украіне (Клецк, Валынскай губ.). У Меншчыне, у Наваградку, сабралася да 60 вуніяцкіх папоў, каторыя падалі запіску, што яны і іх парафіі ня хочуць прымаць новых служэбнікаў. Пасьля націску ўлады, большасьць протэстантаў заявіла, што яны згодны пакарыцца загадам вышэйшай іерархіі. Урад выбраў з непакорных 6 папоў, абвясьціў іх зачыншчыкамі і строга пакараў,— каго турмою, каго высылкаю ў манастыр. Протэст быў зьліквідован.

Праз нейкі час падняўся протэст у Беластоцкай вобласьці. 15 парафій адмовіліся ўводзіць праваслаўныя абрады ў сваіх царквах. Было напісана паданьне на імя цара, дзе вуніяцкія папы гэтых парафій прасілі рускі урад абараніць іх веру ад уціску і гвалту. На чале падаўшых прашэньне стаялі: Кляшчэльскі пратапоп А. Сасноўскі, Чыжоўскі, поп Ф. Гаворскі і Беразоўскі поп А. Панькоўскі. У вадказ на паданьне пачаліся рэпрэсіі над папамі і парафіянамі. Пад іх цяжкасьцю парафіі адна за другою пачалі здавацца і выяўляць сваю пакорнасьць начальству. Наймацней трымаліся Кляшчэлі, але ўрэшце і

яны здаліся. Трэба сказаць, што рэшткі вуніяцтва тут трымаліся вельмі доўга. Яшчэ ў 90-ых гадох XIX сталецьця тут у праваслаўных ужо царквах стаялі абразы вуніяцкіх сьвятых і сьпяваліся ў часы набажэнства сьпевы старых, так званых богагласьнікаў.

Асабліва моцны і шырокі рух проці прылучэньня да праваслаўнай царквы падняўся ў Беларускай епархіі, цэнтрам якога зрабіўся г. Полацак і яго акруга. Тут на абарону вуніі выступілі больш чым сто парафій з іх папамі. На чале руху стаялі вельмі адукаваныя для свайго часу сьвяшчэньнікі—Ян Ігнатовіч і Адам Тамковіч. І тут, як і ў Беластоцкай вобласьці, было пададзена прашэньне на імя цара. Пад прашэньнем падпісаліся ад імя сваіх парафій 111 сьвяшчэньнікаў. Яны прасілі вызваліць вуніятаў ад улады тагочасных іх епіскапаў, каторыя не абаранялі, а гвалтавалі вуніятаў, даць ім праўдзівага вуніяцкага біскупа, адчыніць друкарню, у якой друкаваліся-б вуніяцкія царкоўныя кнігі, адчыніць школы для падгатоўкі вуніяцкага духавенства і г. д. Сямашка, даведаўшыся аб руху ў Полаччыне, пісаў ураду, што ў адносінах да тых, хто падпісаў паданьне, трэба прыняць самыя рашучыя меры. Зразумела, што урад і бяз гэтай парады йшоў да сваёй мэты—скасаваньня вуніі—вельмі рашуча. У вадказ на паданьне пасыпаліся рэпрэсіі на тых сьвяшчэньнікаў. Частку з іх разаслалі па рускіх праваслаўных манастырох, частку перамясьцілі ў другія епархіі, частку панізводзілі на пасады прычотнікаў-дзякоў і г. д. Пад цяжарам гэтых рэпрэсій абаронцы вуніі павінны былі здацца і па паказаньнях афіцыяльных папер «раскаяліся». «Нераскаяных» грэшнікаў, каторыя не захацелі адступіць з сваёй пазыцыі, засталося каля 10 чалавек. Іх канчаткова выселілі ў вялікарускія губэрні, дзе яны і памёрлі. Протэст быў зьліквідован. Тут пералічаны толькі некаторыя з протэстаў. Іх было шмат. Яны вялікім цяжарам ляглі на сялянства Беларусі.

Пасьля ліквідацыі протэстаў прышоў ужо час «будаваць дах» над новым недабудованым домам. У студзені 1839 году сабраўся ў Полацку царкоўны сабор вышэйшага вуніяцкага духавенства. На чале яго стаялі тры вуніяцкія епіскопы: Язэп Сямашка, Васіль Лужынскі Полацкі і Антон Зубко Берасьцейскі. Зразумела, што размова на саборы была кароткая, трэба было толькі абформіць прылучэньне. У лютым 1838 г. ўжо быў падпісан акт «возсоединения униатов с православной церковью». Пад актам было падпісана 24 начальствуючых духоўных асоб.

Вось галоўнейшая частка гэтага акту. «Мы ўхвалілі: 1) прызнаць зноў адзінства нашай царквы з праваслаўнаю сусьветнаю царквою і загэтым ад сяго дню быць разам з данымі нам паствамі ў аднамысьлі з найсьвятшымі ўсходнімі праваслаўнымі патрыярхамі і ў паслушэнстве найсьвятшаму ўсерасійскаму Сынюду; 2) усепадданейша прасіць

благачасьцівейшага гасудара імпэратара прыняць гэтую пастанову нашу пад сваю аўгусьцейшую апеку».

Расійскі Сынод доўга намаўляць ня прышлося. У сакавіку 1830 г. ён разгледзіў акт і ўхваліў такую пастанову: «Епіскапаў, сьвяшчэньнікаў і парафіі так званай дагэтуль грэка-вуніяцкай царквы, па сьвяшчэнных правілах і прыкладах сьвятых айцоў прыняць у поўную і канчатковую злучанасьць са сьвятою праваслаўна-кафалічнаю, усходняю царквою ўсерасійскаю». Сямашка за чыста зробленую палітычную працу атрымаў чын архіепіскапа Літоўскага і Віленскага, а цар, здаволены такім канцом справы, на акце налажыў рэзолюцыю: «Дзякую бога і прымаю». Акт варт рэзолюцыі, і рэзолюцыя варта акту.

Масы простага беларускага люду маўкліва згадзіліся з скасаваньнем вуніі, паколькі царкоўна-рэлігійнае пытаньне ня было для іх найбольш балючаю хваробаю. Такою хваробаю было прыгоннае права, што аддавала селяніна цалкам у рукі пана. Трэба ўсё-ж такі сказаць, што за 243 гады існаваньня вуніі беларускі люд у пачатку сілком, потым добрахвотна зжыўся з вуніяй і звык да яе. Гвалтоўная ліквідацыя вуніі зноў ударыла па яго цярплівасьці, зноў разьвярэдзіла яго рэлігійную хваробу. Загэтым і цяпер беларускі селянін з такою труднасьцю вылечваецца ад гэтай хваробы.

## Беларускі рух у першай палавіне XIX сталецьця.

Росквіт беларускай культуры падае на XVI і XVII сталецьці. Пачынаючы з канца XVII сталецьця, узмацняецца полёнізацыя вышэйшых станаў беларускага грамадзянства, каторыя як экономічна, так і палітычна зьвязаны з шляхецкім ладам Польшчы і інтарэсы каторых цягнуцца туды. К канцу XVIII сталецьця беларусам застаецца толькі селянін і чорнарабочы, інтарэсы каторых не здавальняюцца польскім укладам жыцьця і ў каторых няма орыентацыі на Польшчу. Гэтая вялікая шматміліённая грамада беларусаў зьяўляецца социяльна і палітычна прыгнечанаю масаю, тым рабочым, хлопскім «быдлам», каторае сваім мазалём і потам багаціць польскага ці полёнізаванага беларускага пана, шляхціца і магната. За цяжкаю прыгоннаю працаю ня было часу хлопу-беларусу думаць думку аб тым, хто ён такі, якога ён роду і плямені. Яму было не да культурна-нацыянальнага пытаньня, калі над ім вісеў панскі бізун. Беларускія прыгнечаныя масы ведаюць толькі, што яны «тутэйшыя», што складаюцца яны з мужыкоў і чорнарабочых, што іх мова і быт не такія, як у полёнізаванага і польскага пана,—мужыцкая мова і мужыцкі быт. Толькі сярод дробнай беларускай шляхты, каторая яшчэ не пасьпела полёнізавацца, дзе-ні-дзе яшчэ засталося пачуцьцё сваёй нацыянальнасьці.

XIX сталецьце ў пачатку нясе на Беларусь полёнізацыю, а з 30-х гадоў—русіфікацыю. Але трэба сказаць, што і тая і другая пашыраюцца сярод социяльна-вышэйшых груп беларускага жыхарства. Ня чуючы сваёй мовы сярод паноў, чыноўнікаў і інтэлігэнтаў, цёмны беларускі селянін пачаў думаць, а потым стаў пераканаНы ў тым, што яго мова ёсьць толькі мужыцкая мова, мова някультурнага і бясправўнага люду; што на гэтай мове немагчыма ані гаварыць нешта разумнае, ані пісаць, ані чытаць, ані друкаваць кніжак. У гэтай думцы падтрымлівалі яго і пануючыя станы, выстаўляючы на зьдзек беларускую мову, як мову мужыцкую, мову някультурных працоўных мас. І беларус-селянін, захаваўшы ў курнай хаце беларускую мову, меў пакуль што пачуцьцё сваёй асобнасьці соцыяльна-экономічнай, а з нацыянальнага боку ён ня быў сьвядомым.



Вёска на Магілеўшчыне на пачатку XIX ст.

Тым ня менш, з пачатку XIX сталецьця на Беларусі і па-за яе межамі пачынаецца разьвіцьцё нацыянальнага беларускага руху. Карані гэтага руху вырастаюць з экономічнага, разам з тым політычнага стану Польшчы, Расіі і Беларусі.

Польшча, падзеленая ў канцы XVIII сталецьця суседзямі, прагнецца ў гэтыя часы зноў стаць на ногі і адрадзіцца, як політычны організм. Сучасныя абставіны спрыяюць ёй. Але само сабою зразумела, што без тэрыторыі Беларусі, як сваіх усходніх «крэсаў», Польшча адбудавацца ня можа, як дужае гаспадарства. Ня можа і ня хоча яна абыйсьціся бяз прыгоннай працы беларускага селяніна, каторы працаваў на поль-

скага пана не адну сотню год. Да гэтага трэба далучыць яшчэ і гістарычна зложаную тэндэнцыю Польшчы праглынуць Беларусь,—тэндэнцыю, асабліва яскрава падкрэсьленую астатняю польскаю конституцыяй 3 траўня 1791 году. Было ясна, што і ў далейшыя часы, калі Польшчы прыдзецца рабіць паўстаньне як у Польшчы, так і на Беларусі, яна ня зможа яго зрабіць без беларускага селяніна. Такім спосабам, беларуская тэрыторыя і беларускія працоўныя масы аказаліся вельмі патрэбнымі экономічна і політычна для Рэчы Паспалітай польскай, якая хоча ўваскроснуць.

Расійская імпэрыя, дастаўшы Беларусь, таксама была зацікаўлена экономічна і політычна захаваць тэрыторыю Беларусі, як свой «северо-западный край», і насельнікаў краю за сабою. Дзякуючы ўсяму гэтаму, і з боку Польшчы і з боку Расіі вынікае цікавасьць да мужыцкай Беларусі, пабудаванай на экономічных і політычных інтарэсах гэтых двух гаспадарстваў. Каб шчыльней падыйсьці да Беларусі і беларускага селяніна, а таксама, каб прыцягнуць яго ў свой бок, некаторыя колы Польшчы і Расіі будуць старацца загаварыць часам з беларускім селянінам на яго «мужыцкай» мове, пачаць дасьледзіны яго быту, тэрыторыі, дзе ён жыве, яе гісторыю і г. д. Адны пачнуць даказваць, што беларускі селянін імкнецца да Польшчы, другія—што ён спакон веку быў і цяпер ёсьць рускі чалавек па сваім быце і па жаданьням. Кожны будзе старацца перацягнуць яго ў свой бок. Такім спосабам, зусім незалежна ад актыўнасьці беларускага селяніна, пачнецца культурна-нацыянальны беларускі рух.

Першымі пачынаюць падыходзіць да беларускага пытаньня палякі. Ужо патрыотычныя студэнцкія гурткі пры Віленскім унівэрсытэце, аб якіх гаварылася вышэй, афарбаваны ў мясцовы, беларускі колёрыт. Падгатаўляецца і потым адбываецца паўстаньне 1830-31 г.г. Польскія патрыоты гэтых часоў разумеюць усю важкасьць для польскай справы беларускага пытаньня і пачынаюць бліжэй падыходзіць да беларускага селяніна. Як адбітак сучасных польскіх настрояў, у польскай літаратуры зьяўляецца так званая беларуская школа. Пісьменьнікі гэтай школы паставілі сваёю мэтаю з беларускага селяніна зрабіць чалавека, які-б стаў грамадзянінам, патрыотам Польшчы і пашоў-бы, калі трэба, за паўстанцамі. Найчасьцей яны пішуць папольску, але тэмы і сюжэты бяруць з беларускага жыцьця. Часам яны пераходзяць на беларускую мову. Трэба сказаць, што гэта ім лёгка зрабіць, бо яны паходзяць з беларускай апалячанай шляхты. З пісьменьнікаў гэтай школы мы можам назваць—Яна Баршчэўскага з Віцебшчыны, Алеся Рыпінскага з Дзісьненшчыны і Яна Чачота з Наваградчыны. Усе яны ня толькі пісьменьнікі, але і патрыоты падзеленай Польшчы, вельмі часта удзельнікі паўстаньня 1831 г. Па іх поглядах Беларусь ёсьць хоць

і асобная краіна, але ўсё-ж такі яна зьяўляецца часьцінаю Рэчы Паспалітай. Што датычыць да беларусаў, то яны ёсьць частка польскай нацыі, ці, як тады казалі, беларусы ёсьць—«gente rutheni, nacione poloni». Ускосна да гэтай школы можна аднесьці і Адама Міцкевіча. У яго творах мы знаходзім шмат беларускіх малюнкаў і тэм; сваёю бацькаўшчынаю ён лічыць Літву, пад каторую разумее Беларусь, як непадзельную частку Польшчы.

Асабліва тыповым прадстаўніком пісьменьнікаў беларускай школы ў польскай літаратуры зьяўляецца Алесь Рыпінскі. У 1831 годзе ён прымаў удзел у паўстаньні, дзеля чаго павінен быў потым кінуць бацькаўшчыну і эміграваць у Парыж. Седзячы ў Парыжы, ён ня кідаў сувязі з Беларусьсю і Польшчай. У 1839 годзе ён у гуртку эмігрантаў чытаў лекцыі аб Беларусі, з якіх утварыўся першы якбы падручнік па беларусазнаўству. Яго кніжачка была выдадзена ў Парыжы ў 1840 годзе пад назваю: «Białoruś. Kilka słów o poezii prostego ludu tej naszej polskiej prowincyi». Як відаць з самай назвы кніжкі, шляхціц Рыпінскі цікавіцца «простым людам», сялянствам Беларусі. Беларусь, на яго погляд, ёсьць толькі провінцыя Польшчы. Аўтар кніжкі лічыць, што сялянства Беларусі павінна політычна і культурна зьліцца з палякамі. Не дарма кнігу сваю ён пасьвячае «першаму з беларускіх мужыкоў, каторы навучыцца ўперад чытаць, а потым і думаць папольску». У сувязі з гэтым, Рыпінскі першы скарыстаў для беларускай мовы польскія літары, дадаўшы да некаторых з іх асобныя адзнакі. Гэтаю азбукаю, крыху пераробленаю, беларуская мова часта карыстаецца і ў нашы часы, асабліва пры пашырэньні беларускай культуры і друку сярод тых беларусаў, хто вучыўся ў польскіх школах. Свой агульны погляд на Беларусь і беларусаў Рыпінскі выказаў у прадмове да сваёй кніжкі: «Гэта Русь складае непадзельную часьціну нашай дарагой бацькаўшчыны (Польшчы). Гэты народ (беларусы) захаваўся дзеля таго, каб давясьці, што ён сам можа выбраць сабе пана, а чужых гаспадароў ня хоча знаць». За пана Рыпынскі лічыў Польшчу, а пад чужымі гаспадарамі разумеў Расію. Яму ў галаву ня прыходзілі думкі аб тым, што працоўная беларуская маса павінна быць сама сабе панам і гаспадаром.

Усе пісьменьнікі беларускай школы ў польскай літаратуры пісалі і пабеларуску, каб знайсьці чытача сярод беларускіх мас. Рыпінскі напісаў баляду «Нячысьцік», вершы-псалмы—«Стары Восіп барадаты», «О, мой божа, веру табе», верш «Ты-ж сам, суседзька, хацеў» і г. д. Баршчэўскі напісаў вершы—«Рабункі мужыкоў», «Гарэліца», «А чым-жа твая, дзеванька, галоўка занята» і шмат беларускіх уставак у сваім польскім творы „Szlachcic Zawalnia, czyli Białoruś w fantastycznych opowiadaniach“. Чачот пісаў лірычныя вершы, падобныя да народных

песень. Апроч таго, пісьменьнікі беларускай школы сабралі шмат матар'ялаў як бытавых, так і народнай творчасьці. Ян Баршчэўскі выдаў зборнік у рускай мове пад назваю: «Очерки северной Белоруссии». Ян Чачот выдаў дзьве кніжкі сабраных ім народных твораў пад назваю: „Piosnki wieśniacze z nad Niemna i Dźwiny". Тут ён даў месца 120 народным беларускім песьням, 150 народным прыказкам і прыкметам. Да сваіх зборнікаў Чачот дадаў невялічкі слоўнічак беларускіх слоў. У тыя самыя 30-ыя і 40-ыя годы зьбіраецца і друкуецца ў польскай мове зборнік Е. Тышкевіча пад назваю: «Апісаньне Барысаўскага павету ў статыстычных, прамыслова-гандлёвых і мэдыцынскіх адносінах». У зборніку ёсьць шмат і гістарычных матар'ялаў. Тут таксама можна знайсьці нарысы штодзеннага вясковага жыцьця, народныя песьні, загаворы і забабоны; шмат ёсьць і прыказак. Пазьнейшыя зьбірацелі этнографічнага беларускага матар'ялу часта карысталіся з гэтай добраапрацованай кнігі.

Усе аўтары беларускай школы па сваім соцыяльным стане зьяўляюцца шляхціцамі. Зразумела, што іх творы прасякнуты шляхецкімі поглядамі на беларускае сялянства. Часам яны нават спачуваюць цяжкай долі гарапашніка-селяніна, але наагул усе яны лічаць, што прыгоннае права ёсьць тая аснова жыцьця, каторай ня можна парушаць у імя грамадзянскай карысьці. Такі іх соцыяльны погляд яскрава выяўляецца ў іх творах і асабліва ў творы Баршчэўскага пад назваю «Рабункі мужыкоў», аб якім мы гаварылі вышэй. Сяляне, пад уплывам жаўнераў францускай арміі, паднялі паўстаньне проціў свайго пана, прагналі яго і захапілі ў свае рукі панскі двор. Баршчэўскі не спачувае гэтаму выяўленьню сялянскай волі і не згаджаецца з гэтым актам. Ён усімі сіламі стараецца абсьмяяць сялян і намаляваць іх паўстаньне ў комічным стылі. Найбліжэй падыходзіць да прыгнечанага беларускага сялянства Ян Чачот. Ён кажа, што затым бог даў яму на сьвеце гора гараваці, каб ён лепш любіў селяніна і ўмеў яму спагадаці. Яскрава апісвае Чачот сялянскае гора: у хаце дымна і зімна, калеюць і хварэюць дзеткі; разам з скацінаю ў сморадзе і цемры жыве тут сялянская сям'я («Нашто нам дым выядае вочкі»). Але і ў Чачота адносіны да селяніна шляхецка-клерыкальныя. Бяда селяніна не ў існаваньні прыгону, а ў тым, што селянін часта гультаіць і п'е шмат гарэлкі. Селянін будзе добра жыць, калі будзе працавітым і цьвярозым гаспадаром («Каб у карчме не сядзеў»). Аб школе на вёсцы Чачот не гаворыць. Ён лічыць, што хопіць з селяніна, калі ён будзе аддаваць сваіх дзяцей у навуку да шаўца, каваля, бондара і др. рамесьнікаў («Ой ты, суседзе»). Ідэальны селянін, на думку Чачота, працуе бесьперастанку ўва ўсе чатыры пары году, пры тым працуе ў радасьці й вясельлі. Вясною ён гародзіць, возіць гной, арэ і сее, летам косіць лугі, жне і ко-

сіць збожжа, зімою возіць дровы, чэша калкі, гатовіць лучыну, восеньню папар арэ, малоціць, зноў сее і г. д. Калі захоча пагуляць,—«у дом просіць госьці, тады сабе чарку гарэлкі вып'е да вашмосьці» («Як то добра, калі мужык»...). Калі прыходзіць сьвята, селянін ідзе ў царкву ці касьцёл. Ён толькі знае бога, пана, сваю хату і клопат свой мужыцкі. Зразумела, што такі селянін будзе слухацца бога, ксяндза, папа і пана і ня будзе рабіць няпрыемных пану «рабункаў».

Цікавасьць да навапрылучанай, спрэчнай «Северо-западной окраины» вынікае і на ўсходзе. Да Беларусі падыходзяць рускія вучоныя і падыходзяць ужо ня так наіўна, як падыходзіў калісь акадэмік Севергін. Вядомы архівісты-гісторык К. Калайдовіч, родам беларус, пачаў прыглядацца да дакумантаў стара-беларускага пісьменства, не здавальняючыся тымі ведамі, якія даходзілі да яго праз рукі польскіх вучоных. У 1822 годзе зьявілася ў друку яго праца «О белорусском наречии». Асноўная думка працы тая, што рускім вучоным трэба ведаць сучасную беларускую мову для таго, каб лепш разабрацца ў старажытнай мове заходня-рускіх грамат і актаў, а гэта патрэбна затым, каб падыйсьці да агульна-рускіх помнікаў. Трэба прыцягнуць да працы над помнікамі «самих белоруссцев, которые вернее и лучше могут исследовать свое наречие и помощью оного об'яснить древний язык наших памятников». Выходзіла так, што, цікавячыся Беларусьсю з боку мовы яе археолёгічнага матар'ялу, Калайдовіч меў на ўвазе агульна-рускія культурна-навуковыя інтарэсы.

Трэба сказаць, што наагул у Расіі цікавасьць да Беларусі меншая, чым у Польшчы. Беларусь уваходзіць у склад Расіі, як пагранічча імпэрыі, якая абараняецца штыхамі рускай арміі. Дзякуючы гэтаму вельмі ажытавацца і клапаціцца аб захаваньні яе за Расіяй ня прыходзіцца, тым больш, што рускі урад у часы аракчэеўшчыны і мікалаеўшчыны і ня любіць, калі прадстаўнікі рускага грамадзянства ўмешваюцца ў палітыку. Зусім другая справа на Захадзе, у Польшчы. Беларусь трэба здабраць у Расіі, а над гэтым трэба больш ламаць галаву, мацней працаваць, тым больш, што пасьля 31 году ў Польшчы штыхоў няма, і надзеі будуюцца на паўстаньні беларускага селяніна.

Праца рускіх пісьменьнікаў і вучоных крыху ажывае ў 40-ыя і 50-ыя годы. Над досьледам Беларусі працуюць Кушын, Эгілеўскі, Г. З. Шпілеўскі (Драўлянскі), Кіркор і др., таксама родам беларусы. Характар твораў Шпілеўскага напалавіну навукова-этнографічны, напалавіну бэлетрыстычны. Ён апісвае быт беларускага селяніна: жніва, вясельле, хаўтуры, кірмашы, усялякія забабоны вёскі і г. д.; зьбірае і запісвае беларускія байкі, песьні, прыказкі, легэнды. Лічачы беларуса

найчысьцейшым усходня-славянскім тыпам, ён часта называе яго крывічом, якая назва часта потым будзе спатыкацца ў далейшых этнографаў. Найцікавейшы яго твор «Путешествие по Полесью и Белорусскому краю», надрукованы у 1853-4 гадох. Тут апісана падарожа аўтара ад Варшавы да Ігумна (Чэрвеня). Вельмі доўга аўтар спыняецца на апісаньні Менску. М. Гарэцкі так характарызуе гэты твор Шпілеўскага: «Падарожа напісана ў лёгкай бэлетрыстычнай форме, жывою літаратурнаю маскоўскаю моваю з беларускімі ўстаўкамі: орыгінальнымі словамі, зваротамі мовы, а то і з цэлымі размовамі. З кожнага радка «падарожы» выступае гарачая любоў да Беларусі і глыбокая сыноўская пашана да яе нацыянальнага духу. Беларускія тыпы, пэйзажы, абразы стаяць, як жывыя, уваччу на працягу ўсяго твору. Ліецца салодкі аромат нашай поэзіі, чуецца шчыры дух нашага жыцьця». (М. Гарэцкі. Гісторыя беларускае літаратуры. Выд. I, 1920 г., стар. 74). З канца 40-ых гадоў пачынае сваю працу і Кіркор. Яго творы пачынаюць друкавацца з 50-ых гадоў. Найлепшым з іх зьяўляецца праца «Літоўскае і Беларускае Палесьсе», надрукованая ў III томе выданьня П. П. Сямёнава «Живописная Россия». Гэтую працу і цяпер карысна знаць усякаму, хто цікавіцца беларускім пытаньнем. Тут ёсьць надта цікавыя артыкулы археолёгічнага і гістарычнага зьместу. Апрача таго, у творах Кіркора ёсьць шмат этнографічна-бытавых матар'ялаў. Жыцьцё беларуса абхоплена з усіх бакоў. Мы бачым селяніна-беларуса на радзінах, вясельлі і хаўтурох, у сьвята і ў будні; бачым, як ідзе ён, сьпяваючы сваю песьню, у поле і з поля; бачым, як, сеўшы паважна на прызьбе сваёй хаты, ён слухае казкі і паданьні, якія апавядае яму сівая старасьветчына вуснамі сівога дзеда.

У процівагу польскім пісьменьнікам беларускай школы рускія аўтары даказваюць, што Беларусь—«искони русский край», што яна зьяўляецца толькі паўночна-заходняй краінай Расійскай імпэрыі, што беларусы ёсьць тое самае, што і вялікарусы, што беларуская мова ёсьць толькі «наречие» рускай мовы.

Цікавасьць да Беларусі з боку Польшчы і Расіі адбілася і на інтэлігэнцкіх колах самой Беларусі. Сярод іх падтрымваецца беларускі нацыяналістычны настрой і інтарэсы да твораў у беларускай мове. Асаблівую популярнасьць заваявалі два рукапісныя творы, каторыя перапісваліся бясконца і шырака хадзілі па руках. Гэта—«Пераліцованая Энэіда» і «Тарас на Парнасе». Мы ня будзем тут прыводзіць зьместу гэтых поэм, бо яны добра вядомы ўсім, хто хоць крыху знаёміўся з гісторыяй беларускай літаратуры. Названыя творы пашыраюцца сярод дробнай шляхты, чыноўнікаў, настаўнікаў, вучняў і г. д. і праз іх часам даходзяць да самых глухіх вясковых куткоў. Жартаў-

лівасьць зьместу абедзьвюх поэм дапамагае іх пашырэньню. Аўтар поэмы «Энэіда» добра невядомы. Некаторыя вучоныя лічаць аўтарам яе Манькоўскага з Віцебшчыны, але, здаецца, больш даных прыпісаць яе Равінскаму з Смаленшчыны. Аўтар поэмы «Тарас на Парнасе» зусім невядомы. «Энэіда» зьявілася на сьвет прыблізна ў пачатку XIX сталецьця, «Тарас на Парнасе»—у 30-ых гадох XIX сталецьця. Форма або-



„Дзевіч-вечар" з-пад Менску ў пачатку XIX ст.

двух твораў і пабудова сюжэту антычныя, але іх зьмест і мова—беларуская. Абедзьве поэмы апісваюць грэцкіх і рымскіх багоў, надаючы ім беларускія рысы, і даюць добрую характарыстыку беларускага жыцьця таго часу. Верш у некаторых мясцох папсован за часы рукапіснага існаваньня твораў, тым ня менш, трэба прызнаць наагул лёгкасьць і ў некаторых мясцох вобразнасьць вершу. Жарты над беларускім селянінам гавораць аб тым, што настрой у аўтара поэм шляхецкі, бо становішча селяніна ў тыя часы было зусім не «жартоўнае». Як відаць з зьместу твораў, яны напісаны людзьмі адукаванымі,

каторыя поруч з беларускім бытам і мовай добра ведалі польскую і рускую літаратуру свайго часу.

Паралельна з вышэйпаказанай літаратурай і не бяз уплыву яе ў 30-ыя годы XIX сталецьця мы спатыкаем творы зусім другога роду. Пабеларуску пачаў пісаць ужо ня шляхціц, а запрыгонены селянін Паўлюк Бахрым. Нажаль, мы зусім мала ведаем аб асобе і творах гэтага песьняра. Родам ён з Крошына Наваградзкага павету. Там была школа пад загадам ксяндза-народніка Магнушэўскага, дзе і вучыўся Паўлюк. Магнушэўскі атрымваў з Вільні «Брукавыя Ведамасьці» і меў невялічкую бібліотэку, з каторай даваў кнігі і вучням. Хлопчык Паўлюк вельмі любіў чытаць вершы, каторыя ён вывучваў напамяць і перапісваў. Зразумела, што гэта былі вершы польскіх песьняроў. Ад перапіскі вершаў П. Бахрым перашоў і да ўласнай творчасьці, але яна выяўлялася ўжо ў вясковай, «мужыцкай» беларускай мове. Пяру яго прыпісваюцца тры вершы—«Гутарка Данілы са Сьцяпанам», «Размова пана з мужыком» і «Заграй, заграй, хлопча малы». Усе тэмы зьместам рэальна вясковыя. Зьместам зьяўляецца апісаньне цяжкой долі запрыгоненага селяніна. Ненавісьць да пана злучаецца з монархізмам, што вельмі тыпова для селяніна, каторы пры сваім соцыяльным бунтаўніцтве быў зусім несьвядомым політычна. Асабліва цікавы верш «Заграй, заграй...», каторы мае, здаецца, і аўтобіографічнае значэньне. Верш народны, поўны жывых вобразаў, узятых з вясковага сялянскага жыцьця.—Сярдзіты, неміласэрны пан у Крошыне. Кіямі забіў ён бацьку селяніна. Маці тужыць, сястра плача. Лепш быць ваўкалакам, лепш быць вольным коршуном, бо тады селянін абышоўся-бы без паноў. «У панічыну-б не пагналі і ў маскалі-б не аддалі». Аўтар ненавідзіць паноў і перакананы ў тым, што на галаву іх калісь прыдзе расплата за іх злачынствы ў адносінах да сялянства. Але пакуль што настрой песьняра бязвыхадна цяжкі. Куды пайсьці, дзе абярнуцца? «Ой, кажане, кажане! Чом ня сеў ты на мяне, каб я больш не падрос ды ад бацькавых калёс!» Калі-б ён быў такім малым, яго не аддалі-б у маскалі.

У Крошыне здарыўся сялянскі бунт. П. Бахрым, як мы ведаем з некаторых вестак, быў прызнан уладаю удзельнікам гэтага бунту. Шмат сялян за бунт выслалі ў Сібір, а П. Бахрыма паставілі «пад чырвоную шапку» (здалі ў маскалі), дзе і прыпынілася яго творчасьць. Пасьля 25-гадовай мікалаеўскай службы ён вярнуўся дадому ў Крошын, дзе і памёр, здаецца, у 1891 годзе.

Такім чынам загінуў пясьняр, каторы меў задаткі, каб зрабіцца Шаўчэнкам беларускай поэзіі. Дзьверы да тагочаснага беларускага нацыянальна-культурнага руху былі яшчэ зачынены для запрыгоненага, простага селяніна.

## Сялянскае пытаньне ў часы мікалаеўскай эпохі.

Другая чвэрць XIX сталецьця была часам росту агульна-рускай прамысловасьці. Прамысловасьць ужо вырасла настолькі, што для продуктаў яе вырабу зьяўляўся зацесным стары хатні рынак. Прыгоншчык пан адбіраў у селяніна лішкі, каторыя давалі-б яму большую купчую здольнасьць. Каб уцягнуць сялянства ў пашырэньне рынку, трэба было пакінуць гэтыя лішкі яму, вызваліўшы яго ад панскага прыгону. Гэтага-ж вызваленьня селяніна ад прыгону патрабаваў моцна растучы кляс фабрыкантаў і прадпрыемцаў, каб мець рабочыя рукі больш танныя, чым яны былі дагэтуль. А заработная плата павышалася затым, што значная большасьць рабочых была з аброчных сялян, каторыя павінны былі запрацаваць і сабе на пражыцьцё, і пану на выплату аброку. Тыя фабрыканты, каторыя карысталіся прыгоннымі рабочымі, зразумелі, што для прадпрыемства вольна-наёмная праца зьяўляецца больш продукцыйнай, чым прыгонная. Фабрыкі і заводы, да каторых былі прыпісаны прыгонныя, так званыя посэсыйныя сяляне, у якасьці рабочых, пачалі іх вызваляць, што прабівала дзірку ў мурох векавога прыгону.

Зьявіліся паны-прадпрыемцы і ў вясковай гаспадарцы. Яны, зганяючы з зямлі сваіх сялян, пашыралі сваю панскую запашку і прагнуліся да інтэнсіфікацыі гаспадаркі. Гэты факт даволі часта спатыкаецца на Беларусі. Тут сагнаныя з панскай зямлі сяляне носяць назву месячнікаў. Яны забіраюцца панам на яго ўтрыманьне. Зразумела, што пан дае ім толькі такое ўтрыманьне, каб яны не памёрлі з голаду. Месячнікі, каторыя такім чынам, ужо зусім ня мелі сваёй уласнай сялянскай гаспадаркі, былі пастаяннаю рабочаю сілаю маёнтку, каторая рабіла магчымаю інтэнсіфікацыю панскай гаспадаркі. Прыгоннае права ўжо не здавальняла паноў новага тыпу, бо перашкаджала інтэнсіфікацыі іх гаспадаркі.

Але стары гандлёвы капітал, які карміўся сокамі запрыгоненага сялянства, яшчэ не здаваўся. Прыгоншчыкі паны, ня чуючы новых запатрабаваньняў жыцьця, моцна стаялі на старых, сталецьцямі пабудаваных позыцыях. Прыгоннае права, на іх погляд, было тэю экономічнаю асноваю жыцьця гаспадарства, каторая цалкам яго трымала. Зруйнаваньне гэтай асновы няўхільна давядзе гісторыю да поўнага упадку.

Урад апынуўся паміж двух агнёў—паміж молатам прамысловага капіталу і кавадлам гандлёвага капіталу.

Між тым палажэньне сялянства ўсё пагаршаецца. Урад завален скаргамі сялян на паноў. Факты, апісаныя ў скаргах, настолькі паграseverжаючыя існуючаму строю, што нават царскі урад часам назначае

расьследваньне. Павялічаюцца ўцёкі сялян на поўдзень. Сярод забітых мас пашыраюцца самагубствы, каторыя прымаюць стыхійны характар. Каб зацямніць гэтыя факты, для іх устанаўліваецца нават, як фігавы лісток, афіцыяльная назва «скоропостижно умершие». У некаторых паветах такіх «скоропостижно умерших» прыходзіцца лічыць сотнямі.

Справа ня спыняецца на гэтым пасыўным протэсьце. Сялянскае нездавальненьне выяўляецца і актыўнымі спосабамі. Яно выяўляецца ў сялянскіх паўстаньнях, каторыя носяць хоць і спорадычны характар, але ніколі не перарываюцца. Рэпрэсыйныя мерапрыемствы ўлады нічога ня могуць зрабіць: толькі што задушаць паўстаньне ў адным месцы, яно вынікае ў другім. За часы мікалаеўскагаараваньня вынікла па прыблізным падліку больш 650 паўстаньняў, што ў сярэднім дае на год больш 20 паўстаньняў. Але тыпова тое, што лік паўстаньняў раскладаецца па гадох не роўнамерна, а прогрэсыйна ўзрастае. У 1826 годзе налічвалася 85 сялянскіх паўстаньняў, а ў 1845 годзе яны дашлі да лічбы 207. Локальныя, спорадычныя паўстаньні ў 1854 і 1855 гадох перашлі ў масавае паўстаньне ў сувязі з чуткамі, што хто запішацца ў апалчэньне, той будзе мець волю.

Палажэньне селяніна на Беларусі было яшчэ цяжэйшае, чым нагул у Расіі. Толькі што адбылося паўстаньне 1831 году. Край перажыў грозную буру, каторая пакінула пасьля сябе сьляды зруйнаваньня. Калі паўстаньне распачыналася і селянін быў патрэбен як паўстанцу, так і рускай уладзе, то яму з двух бакоў абяцалі ўсялякія палепшаньні. Польскія паны заклікалі беларускага селяніна да удзелу ў паўстаньні, стараючыся даказаць яму, што вольная Рэч Паспалітая дасьць яму і яго дзецям нагароду за яго удзел у адбудаваньні Польшчы. Вельмі часта паны цягнулі беларускага селяніна ў паўстаньне сілком, карыстаючыся з паднявольнасьці прыгоннага «хлопа». Што датычыць да прадстаўнікоў рускай улады, то яны наадварот, заклікалі селяніна на дапамогу да сябе, таксама абяцаючы яму палепшаньне яго долі. І тут часта бывала, што селянінам урад карыстаўся зусім проціў яго волі. Кончылася паўстаньне, і селянін ня толькі не атрымаў ніякіх здабыткаў ні з таго, ні з другога боку, але яшчэ больш зьбяднеў ад спусташэньня краю, каторы цярпеў і ад паўстанца і ад рускага салдата. У тых мясцох, дзе селянін воляй ці няволяй пашоў за палякам-панам, яго пустошылі атрады рускіх. Там, дзе ён ішоў проціў паўстанца, яму пападала ад прыгоншчыка-пана. Там, дзе селянін трымаўся нэйтральна, яму найчасьцей пападала з двух бакоў разам, бо кожны ваюючы бок лічыў яго сваім ворагам.

Пасьля паўстаньня беларускае сялянства вельмі неспакойна. То там, то сям вынікаюць неорганізаваныя локальныя бунты, для пагашэньня каторых прыходзіцца ураду ўжываць збройную сілу. Вельмі

часта бунты канчаюцца ці пачынаюцца забойствам паноў. Данясеньні паліцэйскія гавораць нам, што пабольшалі асобныя напады на панскія двары, каторыя, на думку паліцыі, рабілі сяляне. Зразумела, што абураныя паны не астаюцца ў даўгу ў сялянства і робяць помсту, каторая ў сваю чаргу ня толькі не супакойвае запрыгоненую масу, але яшчэ больш распаляе яе злобу. Адным словам, утвараецца небясьпечнае палажэньне, каторае пачынае звярачаць на сябе увагу прадстаўнікоў царскай улады. Менскі губарнатар таго часу Допэльмайер у паперы, разасланай ім да ўсіх павятовых шляхецкіх маршалкаў, піша: «Пры такім стане справы страшэнныя і неаднакроць зробленыя забойствы ўласьнікаў сваймі сялянамі і частыя данясеньні аб тым, што той ці іншы селянін «скоропостижно умер», што тая ці іншая сялянка, будучы ўцяжку, скінула дзіця ці скончыла жыцьцё самагубствам, дзякуючы нялюдзкай кары за малаважныя праступкі,—усё гэта зьвярнула на сябе увагу ня толькі начальства, але і самога гасудара-імпэратара». Віцебскі губарнатар у 1835 годзе закідае сваймі данясеньнямі вышэйшую ўладу. Гэты чыноўнік, каторы зусім ня можа быць западозраным у спачуваньні да сялян, піша, што сялянства зусім замучана няволяй, што ў яго няма нават і пажаданьня мець якую-небудзь уласнасьць, бо яна не забясьпечана ад сваволі пана. Такі факт прыносіць убытак гаспадарству. Селянін працуе на пана 6 дзён у тыдзень і толькі ў нядзелю працуе на сябе, што руйнуе сялянскую гаспадарку. Аб немагчымым палажэньні сялянства піша і беларускі губарнатар, вызначаючы небясьпечнасьць для дзяржавы такога стану.

Адным словам, губарнатары на Беларусі, баючыся паўстаньня, лічаць за патрэбнае зьвярнуць увагу як дваранства, так і цэнтральнага ураду на патрэбу сялянскай рэформы, каторая-б абмежавала правы і ўладу паноў на Беларусі ў адносінах іх да сялянства. Панская сваволя і ўціск над сялянствам становяцца ўжо небясьпечнымі для нормальнага палітычнага і эканомічнага жыцьця ў цэлай дзяржаве. Яны нясуць небясьпеку і самому самаўладзтву. Ураднікі на Беларусі, каторыя стаяць каля дзяржаўнага руля бліжэй, чым звычайныя дваране, і каторыя маюць больш практычнага дзяржаўнага розуму, вельмі часта выказваюць думку, што ўжо наступае час так ці йначай скасаваць сялянскую няволю. Але вышэйшыя колы мікалаеўскага ураду, на чале з самым Мікалаем, гэтай думкі ня прымаюць і не рэалізуюць. З аднаго боку, яны лічаць прыгон небясьпечным, а з другога боку—яны баяцца глыбака закрануць яго. У габінэце Мікалая I стаіць шафа з паперамі па сялянскім пытаньні. Часта расхрабрыўшыся, пад сакрэтам, ён паказвае гэтыя скандальныя паперы некаторым з бліжэйшых сваіх прыдворных і абяцае прынясца за выкараненьне рабства. Але сакрэт так і застаўся сакрэтам. Нерашучасьць ураду будзе залежыць ад

нявыяўленасьці экономічнага палажэньня вялікага краю і ўвесь час будзе рабіць уплыў на мерапрыемствы ў справе сялянства. Вельмі тыповых у гэтых адносінах зьяўляецца адзін з улюбёных афорызмаў самога Мікалая I: «Прыгоннае права ёсьць зло, але скасаваньне яго ёсьць яшчэ горшае зло». Верна і нязьменна трымаючыся такога прынцыпу, мікалаеўскі урад не скасуе прыгону. Ён здаволіцца напоўмерамі, каторыя не дадуць ніякіх рэальных вынікаў і не здаволяць запатрабаваньняў складнага бягучага моманту.

Сялянскую справу урад пачаў выяўляць у зьвязку з пытаньнем аб скарбовых дзяржаўных маемасьцях. Гэты факт ёсьць вельмі тыповы для таго часу, бо скарбовы (казённы) селянін мікалаеўскай эпохі зьяўляецца маемасьцю гаспадарства, а не яго грамадзянінам. На чале справы быў пастаўлен Мікалаем I П. Д. Кісялёў, міністр скарбовых маемасьцяй (государственных имуществ), якое міністэрства было ўтворана ў 1839 годзе. Лічачы сялянскае пытаньне вельмі важным і балючым, Мікалай I увесь час прагнецца сам кіраваць усёю справай і рукаводзіць дзейнасьцю Кісялёва. Урад ня мае рашучасьці адразу заняцца палепшаньнем быту прыватнаўласьніцкіх сялян, бо баіцца раптам закрануць інтарэсы паноў-земляўласьнікаў. Першы шляхціц фэўдальна-бюрократычнага свайго гаспадарства, рускі самаўладца, з вялікаю асьцярожнасьцю падыходзіць да інтарэсаў сваіх малодшых таварышаў, дваран Расіі. Вось чаму сялянская справа пачынае разглядацца з сялян не прыватнаўласьніцкіх, а скарбовых. Скарбовых сялян, паміж іншым, значна менш, чым прыватнаўласьніцкіх і палажэньне іх усё-ж такі лепшае, чым апошніх.

У канцы 1839 году быў абвешчан указ аб тым, каб па ўсёй імпэрыі пачаць так званую люстрацыю скарбовых маёнткаў. На аснове ўказу і ў Расіі і на Беларусі было прыступлена да складаньня люстрацыйных сьпіскаў для скарбовых маёнткаў. Люстрацыйны сьпісак устанаўліваў ніжэйпаданае: 1) агульны зямельны фонд маёнтку; 2) расклад па сялянскіх дварох тых зямель з фонду, каторыя для іх нарэзваліся для больш-менш сталага карыстаньня; 3) дакладнае пералічэньне тых абавязкаў і павіннасьцяй, каторыя трэба было нясьці сялянскаму двару за атрыманую зямлю. Люстрацыйнымі сьпіскамі ўрад хацеў цьвёрда ўстанавіць колькасьць зямлі на сялянскі двор і абавязкі скарбовага селяніна ў адносінах да скарбу, каб такім спосабам, з аднэй стараны, селянін ня мог ухіліцца ад падаткаў і павіннасьцяй, а з другой стараны, каб было менш гвалтаў і злоўжываньня ў адносінах да селяніна з боку кіраўнікоў скарбоваю маемасьцю. Скарбовыя сяляне на Беларусі пры ўтварэньні люстрацыйных сьпіскаў атрымалі надзелы ад 12 да 22 дзесяцін зямлі на двор. Раней плата за адпуск скарбовага селяніна на аброк залежала ад кіраўніка маёнтку і была

рознастайная. Цяпер была ўведзена цьвёрдая плата, якая падлягала скарбоваму кантролю. Кіраўнік скарбовай маемасьці меў права, як і раней, караць селяніна, але цяпер кара накладвалася па суду, а не па асабістым поглядзе кіраўніка. Суд звычайна адбываўся ў так званых «сельских расправах», каторыя былі ўтвораны ў скарбовых пасёлках. Хоць і далей гвалты ў адносінах да скарбовых сялян не прыпыніліся зусім, але ўсё-ж такі люстрацыя ў некаторых мясцох крыху палепшыла іх палажэньне, устанавіўшы нейкія прававыя нормы. Што датычыць усёй скарбовай сялянскай масы, то яна мала скарыстала з гэтых норм, дзякуючы агульным умовам самадурскай мікалаеўскай эпохі.

Потым загаварылі і аб прыватнаўласьніцкіх сялянах, палажэньне якіх пагражала імпэрыі вялікай небясьпекай. Кісялёў падаў ураду дакладную запіску, дзе ён падышоў да гэтага пытаньня вельмі асьцярожна. Кісялёў лічыць, што вызваленьне сялянства без надзяленьня яго зямлёю ўтворыць значны лік бабылёў-пролетараў, чаго не павінна быць. З другога боку, калі пры вызваленьні даць сялянам надзелы, то гэта зусім аслабіць экономічную і разам з тым політычную вагу дваранства. Трэба было знайсьці такі шлях, каб былі воўкі сыты і авечкі, хоць для вока людзкога, былі цэлы. У сваёй запісцы Кісялёў Е. У. прапанаваў: памешчыкі павінны зьберагчы за сабою права ўласнасьці на зямлю, а сяляне павінны атрымаць асабістую вольнасьць. Паны наразаюць «вольнаму» сялянству ў карыстаньне дзялянкі зямлі, за што яно абавязана нясьці паншчыну і павіннасьці ў адносінах да пана. Павіннасьці вызначаюцца ў асобных інвэнтарох. Разьмер зямельных дзялянак вызначаецца ня ўрадам, а самым панам, таксама вызначаюцца і павіннасьці. За панамі астаецца адміністрацыйная ўлада над сваімі сялянамі. Усе лясы і нетраное багацьце зямлі знаходзіцца ў руках паноў. Сяляне, стаўшыя ў такія адносіны да пана, атрымліваюць назву «абязаных» сялян. Кісялеў раіў як найхутчэй прыступіць да ўзлажэньня інвэнтароў у прыватнаўласьніцкіх маёнтках. Інвэнтарныя запісы ў панскіх дварох па зьместу, прыблізна, раўняліся люстрацыйным сьпісам скарбовых маёнткаў. У іх павінна было быць вызначана: 1) зямельны фонд маёнтку, 2) расклад дзялянак зямлі па сялянскіх дварох, 3) абавязкі сялян у адносінах да пана. Для Беларусі інвэнтарныя запісы ня былі навасьцю. Яны існавалі тут яшчэ з часоў Рэчы Паспалітай. Яшчэ тады яны мелі на ўвазе выясьніць разьмер сялянскага надзелу і лік рабочых рук, платы і павіннасьцяй з надзелу. У даўнейшыя часы інвэнтарныя запісы мелі практычнае значэньне, але з цягам часу, калі прыгон стаў узмацняцца, яны згубілі сваё значэньне, бо яны, з аднаго боку, застарэлі, а з другога боку—паны з імі зусім ня лічыліся.

Запіска Кісялёва была аддадзена на разгляд аднаго з «Сакрэтных Комітэтаў». Комітэт згадзіўся з пропозыцыяй Кісялёва і свае пастано-

вы паслаў на конфірмацыю цара. Мікалай I на адпаведных пунктах журналу 27 сакавіка 1840 году палажыў рэзолюцыю, у каторай, паміж іншым, было сказана: «Лічу, што магчыма рашуча прыказаць увясьці ў панскіх маёнтках тыя інвэнтары (гэта значыць—люстрацыі), каторымі сам урад здавольваецца ў сваіх арэндных маёнтках. Калі ад гэтага будзе чекаторае зьмяншэньне праў паноў-земляўласьнікаў, то яно бес-пасрэдна датычыць іх прыгонных людзей і ніякім спосабам не павінна супыняць добрай мэты ўраду».

У сакавіку 1842 году законапроэкт аб «абязаных» сялянах быў пастаўлен у Гасударственым Савеце. Цар у сваёй прамове сказаў, што указ, з аднаго боку, не адбірае ў земляўласьнікаў зямлі, а з другога боку—ня робіць сялянства безьзямельным пролетарыятам. Прынцыпу абавязковасьці для ўсіх паноў указ ня мае, і выпаўненьне яго залежыць ад іх добрай волі. Такім чынам, мы бачым, што цар, параўнальна з 1840 годам, ужо пачынае біць адбой. Адзін з членаў Савету (кн. Д. Галіцын) дадаў, што ўказу трэба надаць прынцып абавязковасьці. На гэта цар адказаў, што хоць ён і самаўладны цар, але такога кроку ня можа зрабіць. Указ быў абнародаваны ў красавіку 1842 году. Паны спачатку крыху спалохаліся ўказу, але хутка супакоіліся, бо зразумелі значэньне яго. Сярод сялянства ўказ падняў чуткі аб вызваленьні, што яшчэ больш паднімала абураных сялян.

Сялянская справа ішла ўперад надзвычайна ціха. У красавіку 1844 году быў выдан царскі ўказ аб утварэньні інвэнтарных комітэтаў у заходніх губэрнях імпэрыі. Кожны такі комітэт павінен быў складацца з 4 ураднікаў цэнтральных губэрскіх установаў і трох шляхціцаў-земляўласьнікаў. Ураднікі назначаліся ў комітэт губарнатарамі, а земляўласьнікі абіраліся шляхецтвам губэрні. Старшынства ў комітэце меў губарнатар. Комітэты ў заходніх губэрнях былі, такім спосабам, больш чыноўніцкімі, чым земляўласьніцкімі, што залежала ад недавер'я ураду да польскага панства, каторае прымала удзел у польскім паўстаньні 1831 году. Комітэт павінен быў разглядаць тыя інвэнтарныя сьпісы, каторыя падаваліся яму земляўласьнікамі. Найчасьцей гэтыя інвэнтары прымаліся комітэтамі бяз усякіх рэальных паправак. Зразумела, што інвэнтары складаліся панамі так, каб яны адпавядалі іх уласным, а не сялянскім інтарэсам. Земляўласьнікі, апроч таго, апіраючыся на неабавязковасьць для іх указу 1842 году, стараліся зацягнуць справу і не падавалі ў комітэты інвэнтарных сьпіскаў. Вельмі часта адміністрацыя сама павінна была складаць інвэнтары за рахунак земляўласьнікаў, калі апошнія адмаўляліся з тых ці іншых прычын складаць інвэнтары ў сваіх маёнтках. Такія чыноўніцкія інвэнтары таксама не маглі адпавядаць сялянскім інтарэсам. Пачынаючы з 1844 г., інвэнтары на Беларусі пісаліся аж да 1852 году, не даючы сялянству

нічога практычнага і не абхапляючы ўсіх прыватнаўласьніцкіх маёнткаў.

Тады па дакладу міністра ўнутраных спраў Бібікава царскім указам было загадана, каб на Беларусі пашырыць інвэнтары ў тэй форме, каторая была зацьверджана для Кіеўскага гэнэрал-губарнатарства ў 1848 годзе. На аснове кіеўскіх інвэнтароў, прыватнаўласьніцкі селянін асабіста, як юрыдычная асоба, лічыўся вольным; затое ён быў у поўнай залежнасьці ад пана ў экономічных, зямельных адносінах. Інвэнтары дакладна вызначалі тую надзельную зямлю, каторая была нарэзана панам. Калі ў асобнага селяніна ня было экономічнай моцы, каб апрацаваць нарэзаны для яго надзел, то ён, на аснове інвэнтароў, павінен быў перайсьці не назад да пана, а залічаўся ў склад грамадзкай сялянскай зямлі. Інвэнтары вызначалі і абавязковую колькасьць надзелу зямлі на адзін сялянскі двор. Яна была меншаю ад надзелаў скарбовых сялян і раўнялася ⅔ яе, што складала ад 8 да 15 дзесяцін на адзін сялянскі прыватнаўласьніцкі двор. У інвэнтарох былі вызначаны і павіннасьці сялян да паноў. Гэтыя павіннасьці не маглі перавышаць з аднае цяглае сям'і трох дзён паншчыны ў тыдзень мужчынскіх і аднаго дню—жаноцкага. Усякая другая праца селяніна на пана лічылася незаконнаю. Калі прыватнаўласьніку для яго маёнтку патрэбна была яшчэ праца сялян, што ня ўходзіла ў норму, вызначаную інвэнтаром, то ён меў права карыстацца ёю ці за плату, ці ўключаючы новыя рабочыя дні ў рахунак будучай, назначанай інвэнтаром паншчыны.

Так пісалася на паперы, але ня так абстаяла справа ў рачавістасьці. Рэволюцыя 1848 году на Захадзе перапалохала як рускі урад, так і тых лібэралаў, каторыя былі прыхільнікамі новых узаемаадносін паміж прыватнаўласьнікам і прыгонным селянінам. Панства, звыклае да неабмяжованай працы мужыка, і ня думала лічыць для сябе абавязковымі новыя нормы, што абмяжоўвалі панскае самавольства і гвалты над сялянамі. А што датычыць да ураду, то ён ня лічыў магчымым, як мы ведаем з ранейшага, рабіць зьверху той ці іншы націск на паноў. Указ 1852 году, апроч таго, робіцца няпрыметным на Беларусі яшчэ і затым, што ён вельмі спазьніўся. Экономічныя умовы ў Расіі і на Беларусі ўжо злажыліся так, што праз некалькі год павінна адбыцца новая сялянская рэформа 1861 году.

У другой чвэрці XIX сталецьця урадам Мікалая 1 былі праведзены яшчэ некаторыя дробныя рэформы, пакірованыя на тое, каб урэгуляваць сялянскае пытаньне спэцыяльна на Беларусі. На гэтым трэба крыху затрымацца.

Пан-прыватнаўласьнік на захадзе імпэрыі, а таксама на Беларусі, вельмі рана,—раней, чым усходні яго брат, зразумеў цэннасьць зямель-

нага капіталу. Дзеля гэтага ён усімі сіламі стараўся збыць са сваёй зямлі сядзеўшых на ёй прыгонных сялян. Калі яму, дзякуючы ўказу 1842 году, не ўдалося вызваліць сялян без зямлі, ён дадумаўся да другіх мер, напрыклад, аддаваць іх у наймы на адходныя промыслы, сярод якіх асабліва былі пашыраны земляныя работы, каторыя адбываліся ў розных канцох імпэрыі.

Малады прамысловы капітал патрабаваў ужо для свайго існаваньня шмат рабочых рук. Такое запатрабаваньне і скарысталі земляўласьнікі на Беларусі. Аддаючы свайго прыгоннага селяніна ў найміты, земляўласьнік гэтым самым здымаў з сябе ўсякую апеку над асобай і дабрабытам селяніна. Ён кідаў яго ў найміты бяз вопраткі і без харчоў. Пан апраўдываў такія свае адносіны да селяніна тым, што аб утрыманьні наймітаў павінен клапаціцца прадпрыемца, катораму патрэбна праца нанятых ад пана сялян. Прадпрыемца і не адмаўляўся ад утрыманьня наймітаў-сялян. Але ён, зьбіраючы капітал, карміў і адзяваў нанятых такім спосабам сялян пастолькі, паколькі яму былі патрэбны іх жыцьцё і рабочая сіла. Ён утрымваў іх паўгалоднымі і паўадзетымі. Зразумела, што сьмяротнасьць сярод выкінутага ў наймы сялянства была страшэнная. Памёршых замянялі новымі, а калі і тыя ўміралі, то і іх замянялі зноў новымі і г. д. Цэлымі вёскамі паны збывалі са сваіх рук, такім спосабам, непатрэбных ім сялян, атрымваючы ад гэтага пэўныя даходы. Як кажа проф. У. І. Пічэта, кожны год адбываўся з нашага краю свайго роду «ісход» беларускага народу.

Урад Мікалая І павінен быў зьвярнуць увагу на гэты факт, лічачы яго вельмі небясьпечным для дзяржавы ў сэнсе рэволюцыянізацыі мас. У 1835 годзе былі выданы правілы аб аддачы беларускімі панамі сваіх сялян у наймы. Сутнасьць гэтых правіл была такая. Пан ня мае права аддаць у наймы ўсю вёску цалком і з сям'і ён ня можа аддаць у наймы больш палавіны. (Цікава тое, што менш палавіны—можна). Паводле правіл, пан павінен за зданых у наймы сялян заплаціць у скарб патрэбныя падаткі і забясьпечыць ім харчы і вопратку. Правілы, апроч таго, бралі на сябе абарону сялян-наймітаў з боку паляпшэньня умоў іх працы і павышэньня аплаты працы. Была вызначана велічыня рабочага дню, якасьць і колькасьць харчоў у дзень на кожнага рабочага. Былі вылічаны процанты заработнай платы, якія павінен быў застаўляць селянін для сябе і якія ён мусіў аддаваць свайму пану. Адным словам, добрыя намеры аўтараў гэтых правіл былі вельмі шырокія. Але з гэтых добрых намераў нічога ня вышла. Правілы засталіся на паперы, а падвойная экспллёатацыя панам-земляўласьнікам селяніна засталася ў рачавістасьці.

На Беларусі сярод багатых вялікіх паноў, магнатаў вельмі быў пашырэн звычай аддаваць свае маёнткі ці ў арэнду, ці пад нагляд кі-

раўнічых (упраўляючых) і аканомаў. Вялікі пан лічыў ніжэй свайго гонару самому гаспадарыць у маёнтку. Паны падарожнічалі, а панскія маёнткі знаходзіліся ў руках іх паслугачых, каторых беларускі селянін называў агульнаю назваю падпанкаў. Надужыцьце і гвалты з боку падпанкаў былі вялікія. Яны карысталі з свайго выпадковага палажэньня, каб выцягнуць з селяніна здабыткі легальныя і нелегальныя



Сяляне з Магілеўшчыны ў пачатку XIX ст.

для пана і зусім нелегальныя для сябе. Дзеля гэтага вельмі часта яны аказваліся яшчэ горшымі эксплёататарамі і гвалтаўнікамі, чым самі паны. Сярод беларускага сялянства ў некаторых мясцовасьцях нават злажылася прыказка, што падпанак—сабака, зьлейшы ад пана. На гэтым грунце на Беларусі ўтварылася шмат сялянскіх протэстаў і бунтаў. Прадстаўнікі ўлады, баючыся бунтаў, зьвярнулі на такое зьявішча сваю увагу. Губарнатары краю бачылі ў пашырэньні арэнды на Беларусі вялікую небясьпеку. Цікава ў гэтым сэнсе прывясьці тут вынятак з памянёнага ўжо вышэй цыркуляра менскага губарнатара Допэльмайера на імя павятовых шляхецкіх маршалкаў. Ён піша: «У губэрні амаль што ўсюды існуюць нейкія варожыя адносіны сялян да іх улась-

нікаў. Разбіраючыся ў прычынах гэтага няпрыемнага зьяўленьня, я пераканаўся, што варажасьць сялян да іх паноў вынікае часам ад падбухторваньня злонамерных асоб, але найчасьцей ад таго, што ўласьнікі маёнткаў перадаюць сваіх сялян у рукі бязьлітасных і карысталюбівых кіраўнікоў і арандатараў, каторыя абкладаюць іх цяжкімі работамі, ня гледзячы ні на годы, ні на пол, ні на хваравітае здароўе, і адмаўляюць ува ўсякай дапамозе на набыцьцё патрэбных для сялянскага быту рэчаў. Усё тэта робіцца, звычайна, бяз ведама і проці волі земляўласьніка. У некаторых дробных маёнтках уціск бывае ад самых уласьнікаў». Тут мы спатыкаемся з вельмі тыповым для таго часу поглядам: уся бяда ня ў прыгонным праве, а ў некаторых надужыцьцях прыгону, каторыя ўчыняюцца благімі панамі ці падпанкамі. Даволі зьніштожыць такое зло, і ўсё будзе добра. Бяда ў нягодных кіраўнікох і арандатарах, а ня ў прыгоне.

Гэтае самае пытаньне было закранута ў дакладзе і Віцебскага губарнатара. Віленскі гэнэрал-губарнатар таксама падняў пытаньне аб арэндах у «паўночна-заходнім краі» ў сваім дакладзе цару. Павінен быў зьвярнуць увагу на арэнды і Мікалай I. Цэнтральны урад вырашыў, што кожны пан павінен сам кіраваць сваім маёнткам, а калі ён гэтага ня робіць, то маёнтак забіраецца пад дагляд палаты скарбовых маемасьцяй. У 1853 годзе быў выдан адпаведны закон, на аснове каторага аддача панамі маёнткаў у арэнду была забаронена. Гэтае распараджэньне засталося існаваць на паперы і зусім не праводзілася ў жыцьцё.

## Урад Аляксандра II (1855—1881).

Прамысловасьць у мікалаеўскую эпоху хоць і паціху, але разьвівалася і перарастала фэўдальны рускі рынак. Пашырыць гэты рынак было магчыма вызваленьнем больш дваццаці-міліённага сялянства з панскага прыгону. Як мы бачылі вышэй, урад Мікалая I яшчэ ня быў гатоў, каб гэта зрабіць і такім спосабам павялічыць ёмкасьць хатняга рынку. Яму заставалася другая дарога для пашырэньня рынку, які стаў зацесным. Такою дарогаю была вайна. Вайна павінна была найперш ад усяго пашырыць тэрыторыю імпэрыі і, разам з тым, тэрыторыю хатняга рынку; апроч таго, яна павінна была даць выхад рускім таварам на ўсход ад меж імпэрыі. Вось чаму другая чвэрць XIX сталецьця так багата запоўнена войнамі. З 1826 да 1828 г. йдзе карысна Пэрсідзкая вайна, каторая прылучае да Расіі новыя тэрыторыі і адчыняе для рускіх тавараў выхад у Пэрсію. Потым карысна для Расіі адбываецца Турэцкая вайна (1828—1829). Расія зноў атрымоўвае новыя тэрыторыі ў Азіі і на Каўказе, забясьпечвае за сабою Чорнае мора і дастае протэкторат над Грэцыяй і Турцыяй. Няўхільна

вядзецца наступ Расіі ў Сярэднюю Азію: Расія дастае Кіргіскі стэп, замацняецца ў нізінах Сыр-Дар'і (1847 г.). У 1850 годзе імпэрыя ўступае ў барацьбу з Кокандам і адбірае ад яго Заілійскі край. Здабываюцца землі на далёкім усходзе—левы бераг Амура і яго вусьце. Вядзецца бязупынная доўгалетняя барацьба з каўкаскімі вольнымі пляменьнямі, каб здабыць тэрыторыю для рускага рынку.

Зразумела, што пасьпехі Расіі на ўсходзе не маглі не зьвярнуць на сябе ўвагі заходніх імпэрыялістычных дзяржаў, асабліва Англіі, каторая таксама хацела захапіць усходнія рынкі. Пабачыўшы, што эканомічны ўплыў Расіі на ўсходзе ўсё расьце, яны заварушыліся. Скарыстаўшы другую Турэцкую вайну Расіі, Англія, Францыя, Сардынія і др. дзяржавы ўмяшаліся ў яе, стаўшы проціў Расіі. Расія пачала цярпець паражэньне за паражэньнем. Імпэрыя напружыла ўсе сілы працоўных мас. Было набрана 360 тысяч апалчэнцаў, рэкруцкія наборы йшлі адзін па другім. Але ўсё гэта не памагло. Ангельцы і французы ўвашлі са сваімі флётамі ў Чорнае мора, высадзіліся ў Крыме і праз 11 месяцаў узялі месца стаянкі чорнаморскага флёту, крэпасьць Сэвастопаль. Руская армія з добрым, вынослівым салдатам, з нягодным вышэйшым камандным складам, з зладзейскім інтэнданцтвам і адсталаю прымітыўнаю тэхнікаю не змагла абараніць для рускага гандлёвага і прамысловага капіталу рынкаў блізкага і далёкага ўсходу. Палітыка Мікалая І з трэскам правалілася. Трэба сказаць, што ён добра зразумеў гэты правал. Няўдача зламала гэтага чалавека, і ён атруціўся. Перад сканаsucc ньнем ён выказаў сыну, Аляксандру II, вельмі тыповыя для сябе словы: «Здаю табе каманду, але, нажаль, не ў такім парадку, як жадаў, астаўляючы табе шмат працы і клопату. Мне хацелася-б, прыняўшы на сябе ўсё цяжкае, пакінуць табе царства мірнае, добра збудованае і шчасьлівае, але бог судзіў іначай». На царства канаючы цар глядзіць, як на вайсковую каманду. У камандзе завёўся «непарадак», каторага так баяўся Мікалай І.

Да гэтых слоў трэба дадаць, што ня бог, а барацьба імпэрыялістычных гаспадарстваў за пашырэньне рынку «судзіла іначай» і павярнула ў другі бок старую палітыку, ахварбаваўшы ў чорны колер ружовыя погляды на сваё кіраваньне ўпартага Мікалая І. Апроч таго, трэба яшчэ сказаць, што каманда была здадзена ня ў лёгкім непарадку, як думаў Мікалай І, а ў поўным беспарадку. Улада ў Расіі згубіла папулярнасьць як дома, так і заграніцай. Проціў улады былі настроены ня толькі сяляне, што чакалі ды не дачакаліся вызваленьня ад паноў, але і прамысловыя капіталістыя, запатрабаваньні каторых на пашырэньне рынку праваліліся.

Новаму ўраду бязумоўна трэба было ўжо рабіць новую палітыку. Прамысловы капітал заяўляе свае прэтэнзіі і патрабуе для сябе мес-

ца ў дзяржаўным ладзе. Ужо ў канцы цараваньня Мікалая I лібэралізм, неразрыўна зьвязаны з разьвіцьцём прамысловага капіталізму, носіцца ў паветры. Само сабою зразумела, што ў гэтым паветры выгадуецца і лібэралізм Аляксандра II ў той меры, якая магчыма для рускага самаўладцы. Новы цар будзе насіць на сваёй асобе адзнакі новых экономічных і політычных запатрабаваньняў. Павінна будзе распачацца эпоха некаторых рэформ, каторая лібэральнай буржуазіяй таго часу будзе апранута ў ружовую вопратку і будзе вызначана, як «эпоха вялікіх рэформ», хоць знайсьці тут «вялікасьці» нельга.

На царскі пасад уваходзіць, можна сказаць, яшчэ малады чалавек, 37 год, сын Мікалая I, Аляксандр II. Яго бацька, Мікалай, заняў царскі пасад неспадзявана для сябе і для другіх, бо быў трэцім сынам Паўла I і ня меў беспасрэднага права на заняцьце царскага пасаду. Зразумела, што яго выхоўвалі і адукавалі не як будучага цара, а як звычайнага вялікага князя. Зусім другая справа была з Аляксандрам II. Ён быў першым сынам Мікалая I і ад самага нараджэньня прызначаўся заняць царскі пасад. У залежнасьці ад гэтага, на яго выхаваньне і адукацыю было зьвернута больш увагі, чым на выхаваньне і адукацыю яго бацькі. Паміж іншым і цар Мікалай цікавіўся выхаваньнем свайго насьледніка і выказваў некаторыя погляды пэдагогічнага кірунку. Ён, паміж іншым, гаварыў: «Я хачу выхаваць у асобе майго сына чалавека раней, чым зрабіць з яго гаспадара». Пры ўсёй рэакцыйнасьці сваёй агульнай політыкі, тут Мікалай I праявіў нейкія адзнакі лібэралізму, што зусім зразумела, калі прыняць пад увагу рост у яго часы лібэралізму паводле росту прамысловага капіталізму. Рэакцыйнае самаўладзтва тут папала пад экономічны і політычны ўплыў эпохі.

Згодна з такім поглядам цара на выхаваньне і адукацыю яго насьледніка, былі падабраны і адпаведныя настаўнікі, каторымі былі—гэнэрал Мэрдэр, профэсар Кавелін і вядомы поэта Жукоўскі. Асабліва моцны ўплыў на выхаваньне Аляксандра II меў Жукоўскі, чалавек сантымэнтальнага настрою і лібэральнага кірунку. Ён таксама лічыць, што ў асобе яго выхаванца трэба разьвіць так званыя «агульна-чалавечыя» рысы. Жукоўскі ёсьць прадстаўнік таго наіўна-лібэральнага кірунку мікалаеўскай эпохі, каторы адважваўся думаць і гаварыць такія «сьмелыя» думкі, што «и крестьянки чувствовать умеют». Лібэралізм таго часу дашоў да «сьмеласьці» сказаць, што цар і селянін ёсьць асобы аднаго віду—«homo sapiens» Калі на настаўнікаў насядалі, каб яны вучылі насьледніка ўсім тонкасьцям ваеннага штукарства, то Жукоўскі не згаджаўся з гэтым. Ён лічыў, што гэта прыносіць выхаваньню толькі шкоду. Вось перад намі ліст, напісаны Жукоўскім да імпэратрыцы. Там на гэтую тэму сказана так: «Вучыць занадта насьледніка вайсковай справе—усё роўна, калі-б васьмігоднюю дзяўчынку па-

чаць навучаць усім хітрыкам кокецтва. Апроч таго, усе гэтыя ваенныя цацкі могуць сапсаваць у ім тое, што павінна быць першым яго заданьнем». Такім першым заданьнем насьледніка на думку Жукоўскага, павінен быць гуманны настрой. Аб гэтым ён пісаў і ў спэцыяльным вершы на нараджэньне Аляксандра II: «Да на чреде высокой не забудет святейшего из званий—человек».

Пасьля таго, як настаўнікі скончылі з насьледнікам курсы самых патрэбных навук, было пастаноўлена, каб будучы цар беспасрэдна пазнаёміўся з об'ектам свайго кіраваньня. Для гэтай мэты была арганізавана падарожа Аляксандра II па Расіі. Яму таварышавалі Жукоўскі, Кавелін і ад'ютант Юрэвіч. Па дарозе організуюцца сантымэнтальныя спатканьні і провады будучага монарха пры дапамозе паноў і поліцыі, каторыя зганялі для гэтага ў назначаныя месцы запрыгоненых «пейзанов і пейзанок». Паезьдзіўшы па Эўропэйскай Расіі, насьледнік у 1837 годзе зрабіў падарожу па Сібіры да Табольску. Будучы ў Сібіры, Аляксандр II спаткаўся з некаторымі высланымі сюды дзекабрыстымі. Яны прасілі яго і яго спутнікаў палепшыць іх долю. Лібэральны настрой насьледніка і Жукоўскага ў адносінах да дзекабрыстых выявіўся ў заступніцтве за іх. Пад дыктоўку настаўніка, Аляксандр II піша ліст да свайго бацькі, у каторым паміж іншым сказана: «Мне было-б надзвычайна прыемна, мілы і бясцэнны айцец, каб мой прыезд прынёс гэтым няшчасным палягчэньне ў іх долі». Трэба згадзіцца, што заступніцтва за політычных праступнікаў, каторыя былі прадвесьнікамі буржуазнага лібэралізму, характарызуе добра будучага цара. Трэба было быць лібэралам, каб адважыцца на гэта. Справа ў тым, што Мікалай I бяз гневу і абурэньня ня мог успамінаць дзекабрыстых, і гаварыць аб іх значыла страціць царскую ласку. Цікава тое, што на гэты раз ліст сваёй мэты дасяг, і лібэралы-рэволюцыянэры 20-х гадоў атрымалі некаторыя, хоць і нязначныя, палягчэньні. На другі год (1838) насьледнік паехаў агглядаць Эўропу, дзе ён цікавіцца ладам заходніх гаспадарстваў і іх установамі.

Такім спосабам, у часы мікалаеўскай рэакцыі будучы цар гадуецца ў сантымэнтальна-лібэральным кірунку, чаго вымагае ідучы на зьмену гандлёваму капіталізму прамысловы капіталізм. Зразумела, што гэты вельмі паверхоўны лібэралізм будзе неразрыўна злучан і ў асобе Аляксандра II, і ў жыцьці з перажыткамі фэўдальнай рэакцыі мікалаеўскай эпохі, тым ня менш, ён усё-ж такі адзначыць пачатак другой палавіны сталецьця, ня зусім падобнай на першую.

У 1856 годзе адбыўся ў Парыжы мір, зьлiквідаваўшы спадчыну мікалаеўшчыны, крымскую вайну. Пачалі адчувацца новыя павеі. Старое фэўдальнае дваранства трывожна настаражылася. Лібэральная буржуазія спаткала новы настрой ураду з ружовымі надзеямі. Яна

адчувае, што настаў такі час, калі урад павінен будзе лічыцца з ёю больш, чым гэта было раней. Урад новага цара росьціць такія надзеі. У заключальных словах маніфэсту ў сувязі з заканчэньнем Крымскай вэйны (19 сакавіка 1856 г.) ужо вызначана істота новых лавей, новай програмы. Там сказана так: «Пры дапамозе божага промыслу, што заўсёды спрые Расіі, няхай зацьвярджаецца і паляпшаецца яе хатні дабрабыт, праўда і міласэрнасьць няхай пануюць у судох яе; няхай разьвіваецца ўсюды і з новай моцаю імкненьне да асьветы і ўсякай ка-



Шляхецкі двор на Меншчыне.

рыснай дзейнасьці, і кожны пад аховай законаў, для ўсіх аднолькова справядлівых і ўсіх аднолькова забясьпечваючых, няхай карыстаецца пладамі нявіннай працы. Урэшце—і гэта ёсьць першае жывейшае жаданьне наша—сьвет спасаючай веры, азараючы вумы і даючы моц сэрцам, няхай абараняе і паляпшае болей і болей грамадзянскую звычаёвасьць, гэты вярнейшы залог парадку і шчасьця».

Маніфэст, як бачым, напісан у самаўладна-лібэральным духу. Справа пачынаецца з божага промыслу, далей ідуць лібэральныя намёкі і паўсловы, і ўрэшце зноў мы спатыкаемся з вераю ў бога, звычаёвасьцю і парадкам. Ня гледзячы на ўсю сваю скромнасьць і нязначнасьць, маніфэст зьвярнуў на сябе ўвагу з двух бакоў: з боку лібэралаў і рэакцыянэраў. Адны лічылі яго мэтазгодным актам, другія трубілі ўва ўсе трубы, што для імпэрыі пачынаюцца шкадлівыя часы. У самай рэчы маніфэст быў толькі папераю, над каторою зусім ня

было сэнсу ажытавацца. Што датычыць да рабоча-сялянскіх нізоў, то яны маўчаць. Уся гэтая шуміха як консэрватараў, так і лібэралаў застаецца збоку. Дзе-ні-дзе ідуць бунты, якія падаўляюцца, як і раней, з вялікай жорсткасьцю. Ходзяць чуткі аб волі, толькі не аб такой, якую ім хоча даць прамысловы капітал разам з промыслам божым.

## Сялянская рэформа 1861 году.

19 лютага 1861 году адбылася «сделка» паміж старым гандлёвым капіталам і новым прамысловым капіталам. «Сделка» гэтая ў творах старых буржуазных гісторыкаў ідэалізуецца, хварбуецца ў ружовую хварбу і носіць зусім незаслужаную громкую назву «вялікай сялянскай рэформы». Ранейшы «пан»-прыгоншчык павінен быў зрабіць уступку маладому «пану»-прадпрыемцу, прамысловаму капіталістаму. «Вызвалены» на словах селянін у рачавістасьці застаўся пад эканомічным уплывам і пад уладай усё роўна «пана», толькі новага тыпу. У дадатак, увашоўшы ў беспасрэдныя зносіны з дзяржаўнай уладай, ён папаў пад ласкавую апеку зьбяднелых паноў, што парабіліся ураднікамі (чыноўнікамі), напрыклад, міравога пасрэдніка, зборшчыка выкупных плацяжоў, капітан-спраўніка, асэсара і г. д. Апроч таго, «рэформа» ўтварыла для селяніна ненормальна цяжкія зямельныя адносіны, у каторых ён задыхаўся. Тым ня менш, лібэральна-патрыотычнай шуміхі аб «вызваленым селяніне» было шмат.

Як мы казалі, сялянства перад рэформаю было не ў спакойным стане. У часы мікалаеўскай эпохі ў розных кутках імпэрыі вынікаюць бунты. Паўсюды ў цёмнай сялянскай масе ходзяць цьвёрдыя чуткі аб тым, што будзе дадзена сялянству воля. Стыхія пачуцьцём адчувала экономічную неабходнасьць. Зразумела, што чуткі малявалі гэтую волю ў самай ружовай ахварбоўцы. Не спакойны і паны. Сярод іх таксама ходзяць усялякія трывожныя чуткі. Паны насторажыліся. Яны прыглядаюцца да сялянства і сочаць за кожным яго крокам. Кожную хвіліну бачаць яны наўкола сябе ці скрыты, ці яўны бунт там, дзе ім зусім і ня пахне. Улада завалена скаргамі паноў на непаслушэнства і «дерзости» сялян. Гэтыя скаргі пры росьследах аказваюцца вельмі часта пладом дасужай фантазіі застрашаных, здэнэрваваных паноў. Такіх прыкладаў з жыцьця таго часу мы маем шмат. Князь Ф. М. Мышэцкі скардзіцца губарнатару, што сяляне яго вёскі адмаўляюцца заплаціць належны яму з іх аброк. Паводле загаду губэрнатара для разбору справы выяжджае на месца паліцыя, каторая, пры ўсім жаданьні пана падцьвердзіць сваю скаргу, павінна афіцыяльна сказаць, што сяляне не адмаўляюцца, а толькі просяць адкласьці выплату аброку на месяц, бо яны зусім зьбяднелі. Вось перад намі дробна-памесная паня. Яна скардзіцца, што падуладныя ёй сяляне бунтуюць, адмаўляюць у па-

слушэнстве і чыняць ёй «дерзости». Дазнаньне паліцэйскіх улад, катораых мы ніяк ня можам западозрыць у спачуцьці сялянам, выяўляе, што бунт сялян выражаецца ў тым, што яны просяць сваю паню, каб яна дала ім магчымасьць працаваць на сябе два дні ў тыдзень. Адным словам, такія неабаснованыя скаргі паноў на сялян мы спатыкаем на кожным кроку: не дарма кажуць, што ў страха вочы вялікія.

Экономічнае разьвіцьцё краю, тымчасам, патрабуе вызваленьня сялян. Прыкмячаюцца паграджаючыя сымптомы з розных бакоў. Статыстыка вызначае, што прыгон вядзе сялянскія масы да фізычнага выраджэньня. З кожным годам зьмяншаецца прыродны прырост сялянскай люднасьці. У 1830 годзе прыгоннае сялянства складае 45 проц. усяго насельніцтва імпэрыі; у 1852 годзе гэты процант спускаецца да лічбы 35. Процантна зьмяншаецца, такім спосабам, лік паднявольных рабочых рук, што зусім не карысна нават для прыгоннай гаспадаркі, каторая будуецца на гэтых руках. А тут яшчэ, побач з гэтым, выяўляецца ўся непродукцыйнасьць прыгоннай сялянскай працы і недаходнасьць прыгоннай гаспадаркі. Маёнткі паноў ува ўсерасійскім маштабе з кожным годам даюць усё менш і менш даходаў. З кожным годам усё больш і больш такіх маёнткаў, каторыя ўжо ня могуць стаяць на ўласных нагах. Зразумела, што яны патрабуюць на сваё ўтрыманьне скарбовых сродкаў замест таго, каб даваць даходы скарбу. Па дзесятай рэвізіі 1852 году ў Эўропэйскай Расіі лічыцца 103 тысячы прыватнаўласьніцкіх маёнткаў. Мы ведаем, што ў 1859 годзе 44 тысячы гэтых маёнткаў былі заложаны ў скарбовых банках. На заложаных маёнтках ляжаў значны на той час доўг лікам у 450 тысяч рублёў, што ў сярэднім на кожны заложаны маёнтак складае каля 10 тысяч рублёў. Калі-б палажэньне не зьмянілася, то ўсе маёнткі праз два-тры дзесяткі год папалі-б пад залог у скарб разам з усёю сваёю маемасьцю, а ў тым ліку—і з сялянамі. Селянін такім спосабам з прыватнаўласьніцкага зрабіўся-б дзяржаўным бяз ніякай політычнай рэформы.

Як зазначалася раней, вызваленьне сялян было патрэбаю фабрычнай прамысловасьці. Фабрыка й завод патрабавалі прастору, патрабавалі вольных рабочых рук і пашырэньня ўнутранага рынку для сваіх тавараў. І першае, і другое не магло быць здаволена пры існаваньні прыгону над шматміліённым сялянствам. Моцна гаварылі аб патрэбе вызваленьня сялян і земляўласьнікі новага, прогрэсыўнага тыпу. Яны, апіраючыся на прынцып вызваленьня сялян, хочуць проста-на-праста пазбавіць самых сябе ад сялян, заставіць у сваіх руках зямлю, як вольны капітал, сагнаўшы з яе сялян. Такія прогрэсыўныя пажаданьні—пабудаваць вясковую гаспадарку не на фэўдальным, а на капіталістычным грунце—асабліва пашыраны на захадзе імпэрыі, у Польшчы,

Літве і Беларусі. Тут на гаспадарку робіць уплыў заходні капіталізм, каторы яскрава вызначае ўсю некарыснасьць гаспадаркі, пабудованай на сярэднявяковых фэўдальных нормах.

Яшчэ ў 1857 годзе, па прыкладу мікалаеўскай эпохі, паводле загаду Аляксандра II быў утворан Сакрэтны Комітэт для палепшаньня быту сялянства. Комітэт займаўся канцэлярскаю перапіскаю і пісаньнем усялякіх проэктаў. Якраз прыбыў у Петраград віленскі гэнэралгубарнатар Назімаў, каторы прывёз з сабою проэкт вызваленьня сялян, апрацованы панствам літоўскіх і беларускіх губэрань. Сэнс проэкту зводзіўся да таго, каб аслабаніць зямлю ад сялян, чаго даўно дабівалася літоўскае і беларускае панства. Паны прапанавалі ўраду вызваліць сялян без зямлі, пусьціўшы іх на ўсе чатыры бакі, даць ім, гаворачы прасьцей, так званую воўчую волю. Проэкт праваляўся ў комітэце каля месяца, пераходзячы з аднаго пасяджэньня на другое, з аднэй канцэлярыі ў другую, пакуль не папаўся ў рукі цара.

Зразумела, што ўрад ня мог згадзіцца на пропозыцыю безьзямельнага вызваленьня. Воўчая воля была для царскага ўраду політычна небясьпечнай, бо, дзякуючы такому вызваленьню сялян, у імпэрыі зьявілася-б каля 22 міліёнаў беспакойных, неабседлых, рухавых пролетараў, каторыя пагражалі-б існаваньню самаўладнага ладу. Выбітыя з старой каляіны, незабясьпечаныя нават працай, як беспрацоўныя, яны былі-б тэю сухою саломаю, каторая пры самай маленькай іскрачцы дае вялікае полымя.

У лістападзе 1857 году, у вадказ на пропозыцыю панства Літвы і Беларусі (Горадзенскай, Ковенскай і Віленскай губ.), быў выдан царскі рэскрыпт на імя віленскага гэнэрал-губарнатара Назімава. Паводле рэскрыпту дазваляецца вызваленьне толькі з зямлёю. За панамі прызнаецца права ўласнасьці на зямлю; сялянам даецца права выкупіць ва ўласнасьць усадзебную зямлю і атрымаць у карыстаньне палявую зямлю за аброк ці паншчыну. Што датычыць да колькасьці зямлі, то ў рэскрыпце сказана, што зямлі павінна хапіць «для належнага забясьпечаньня сялянскага быту і для выкананьня абавязкаў перад урадам і панам». Такая нявыразная формуліроўка колькасьці зямлі заўсёды давала перавагу пану, каторы вызначаў і даваў надзел селяніну. Рэскрыпт загадвае Назімаву зложыць у Віленскай, Горадзенскай і Ковенскай губэрнях комітэты па справе вызваленьня сялян. Комітэты павінны апрацаваць проэкты вызваленьня і проэкты «положений» для вызваленых ужо сялян. Копіі з рэскрыпту былі разасланы ўсім губарнатарам і шляхецкім губэрскім маршалкам, што надало рэскрыпту агульнадзяржаўны сэнс. Некаторыя губарнатары прынялі копіі з рэскрыпту, як загады, і комітэты паступова пачалі ўтварацца ў розных губэрнях. Вельмі хутка зьявіліся комітэты ў губэрнях—Менскай, Віцебскай і

Магілеўскай. Потым яны пачалі ўтварацца і ў цэнтральных губэрнях імпэрыі.

У лютым 1858 году Сакрэтны Комітэт быў перароблен у Галоўны Комітэт па сялянскай справе. Новы комітэт не сьпяшаўся. Ён зьбіраў проэкты, утвораныя губэрскімі комітэтамі, апрацоўваў іх і стрыг пад адзін грэбень. Такім спосабам і ўтварыўся агульны проэкт вызваленьня сялян, каторы быў потым зацьверджан Аляксандрам II.

Мы ня будзем спыняцца на тэй канцэлярскай працы, каторая адбывалася ў губэрскіх і Галоўным Комітэце, скажам толькі, што маніфэст аб вызваленьні сялян быў падпісан Аляксандрам II 19 лютага 1861 году. Публікацыя яго адбылася 5 сакавіка. Справа ў тым, што ў дзень падпісаньня маніфэсту якраз была масьленіца. Урад баяўся, што сяляне, падпіўшы на масьленіцу, абавязкова забунтуюць, як пачуюць маніфэст. Дзеля гэтага маніфэст быў апублікован у пост. Найперш ад усяго сялянская маса не зразумела маніфэсту. Маніфэст быў напісан прадстаўніком фэўдальна-дваранскай групы, вядомым рэтроградам, маскоўскім мітрапалітам Філарэтам, каторы не спачуваў новым лібэральным поглядам. Мёртвая славянская мова зусім зацямніла і без таго бедныя мысьлі й рэформы, скрытыя ў маніфэсьце. Там, дзе сялянства зразумела маніфэст, яно засталося нездаволена ім. «Маніфэст гаварыў аб вызваленьні, а на дзеле сяляне павінны былі, як і ў старыну, нясьці павіннасьці на карысьць паном. Як кажа Бутурлін, пасьля азнаямленьня з маніфэстам у Калускай губэрні сяляне разыходзіліся з царквы найчасьцей маўклівыя, пахмурныя, разачараваныя, у якімсь недамысьленьні. Такім самым недамысьленьнем сустрачаўся маніфэст і ў другіх губэрнях. Нідзе ня было ніякай радасьці і захапленьня, а газэты, каторыя давалі весткі аб агульнай радасьці, па заяве хэрсонскага шляхецкага маршалка, проста лгалі. Такія адносіны да так званай волі не прадвяшчалі нічога добрага». (В. И. Пичета. История крестьянских волнений в России. Минск, 1923. стр. 121).

Потым, калі ўрад стаў праводзіць маніфэст у жыцьцё, селянін урэшце зразумеў яго, але застаўся ім зусім нездаволеным. Маніфэст не адпавядаў яго пажаданьням, і сялянства аднеслася да яго варожа. Варожасьць сялянства да няўдалай рэформы выявілася ў сялянскіх забурэньнях, каторыя разьліліся па ўсёй імпэрыі. На працягу двух год (1861-1863) лік іх даходзіў да 1100. Урад жорстка распраўляўся з бунтарамі-сялянамі.

Ня было спакойна і на Беларусі. Шмат дзе на Віленшчыне сяляне адмовіліся ісьці на паншчыну. Пашлі арышты зачыншчыкаў, сялян секлі лозамі, ставілі на пастой па хатах вайсковыя часьці. Такая самая гісторыя паўтарылася і на Віцебшчыне. Вельмі шырака разрасьліся сялянскія непарадкі на Ковеншчыне і Магілеўшчыне: і там яны

ліквідаваліся збройнымі сіламі. Шмат дзе на Меншчыне сяляне адмовіліся ад паншчыны і далі арганізаваны адпор прысланым войскам, каторыя ўрэшце пусьцілі ў ход зброю. Лозы былі вельмі пашыранаю караю як у Расіі, так і на Беларусі. «Вызваленыя» сяляне пароліся ўва ўсерасійскім маштабе. Непарадкі былі задушаны, і «вялікая рэформа» стала праводзіцца.

На аснове маніфэсту беларускі селянін вызваляўся з няволі, як асоба, бяз выкупу; затое ён павінен быў выкупіць у пана тыя кавалкі зямлі, каторыя ён ад яго атрымаў. Выкуп за зямлю быў назначан вельмі высокі як па ўсёй імпэрыі, так і па Беларусі. Каб ілюстраваць гэта, прывядзем такія лічбы: калі вылічыць цану зямлі, што дасталася сялянству ў надзел па звычайных сярэдніх тагочасных цэнах, то за яе трэба было-б заплаціць 648 міліёнаў рублёў, а нам вядома, што ў самай рэчы сяляне павінны былі заплаціць за зямлю 867 міліёнаў рублёў. З гэтых лічбаў відаць, што наагул цана зямлі для сялянства была павышана на 25 проц. Гэтая надбаўка фактычна была нічым іншым, як скрытым выкупам з няволі самой асобы вызваленага селяніна.

Пры вызваленьні селянін атрымлівае зямельны надзел, каторы ён павінен так ці йначай выкупіць. Беларускае панства ўсякімі праўдамі і няпраўдамі хоча зьменшыць сялянскія надзелы, бо для яго зямельны фонд быў вялікай каштоўнасьцю. Гэты факт пачыў адчувацца ўжо даўно. Апошні раз ён выявіўся ў проэкце вызваленьня сялян зусім без зямлі, каторы падалі літоўска-беларускія паны з Назімавым у Петраград. Звычайнае зьяўленьне на Беларусі—гэта малы, куртаты сялянскі надзел, што зрабілася потым асноўнаю крыніцаю далейшага малазямельля і безьзямельля беларускага селяніна. На Беларусі на кожную рэвіскую душу ў сярэднім было дадзена ад чатырох да пяці дзесяцін. Скарбовыя сяляне былі надзелены куды шчадрэй. Іх сярэдні надзел раўняўся пяці з паловай-шасьці з паловай дзесяцінам. Лік прыватнаўласьніцкіх сялян, вызваленых рэформаю на Беларусі, даходзіў да 2 міліёнаў. Што датычыць скарбовых сялян, то іх на Беларусі было ў 4 разы менш, чым прыватнаўласьніцкіх, што складала каля 500 тысяч людзей.

Ідучы на спатканьне паном, каторыя хацелі як мага больш пакінуць сабе зямлі, урад уставіў у палажэньне пункты, каторыя здавальнялі панскія інтарэсы і яшчэ больш павялічвалі сялянскае безьзямельле і малазямельле. Аднымі з такіх пунктаў былі пункты аб так званых дармовых надзелах. На аснове іх, пану давалася права, па згодзе з тым ці іншым селянінам, даваць яму без усялякага выкупу з яго боку надзел, каторы раўняўся ¼—⅓ нармальнага надзелу. Сяляне назвалі такія надзелы жабрацкімі. На Беларусі жабрацкі надзел раўняўся

$1\frac{1}{4}$—$1\frac{1}{2}$ дзес. Жадаючы больш сялян пусьціць на жабрацкія надзелы, панства дапускала ўсялякія надужыцьці. Каб «угаварыць» сялян згадзіцца на дармавы надзел, найчасьцей пускалася ў абарот гарэлка; часам застрашвалі забітага беларускага селяніна ўсялякімі страхамі, а часам проста секлі лозамі. Так ці йначай на жабрацкі надзел было пасаджана шмат сялян. Апроч таго, трэба сказаць, што забясьпечаньне зямлёю не адносілася да дваровых людзей. Не гаворачы ўжо аб тым, што пан на Беларусі спакон веку меў у сваім двары вялікі штат дворні, ён перад рэформаю пастараўся яшчэ павялічыць гэты штат, каб пры вызваленьні пусьціць яе ў сьвет з «воўчаю» воляю. Таксама не атрымалі нормальных надзелаў тыя сяляне, каторыя былі ў дробных паноў, маёнткі каторых не перавышалі 75 дзесяцін. Калі прыняць пад увагу вялікі лік на Беларусі дробнай шляхты, то ясна, што і гэты факт утвараў шмат малазямельных і безьзямельных «вольных» сялян. Рэформа, такім спосабам, адразу ўтварыла на Беларусі вялікую лічбу ня толькі малазямельных, але і безьзямельных сялян, бабылёў, каторыя адразу зложылі вясковы пролетарыят і векавечных арандатараў скарбовых, царкоўных і прыватнаўласьніцкіх зямель.

Спосаб землякарыстаньня на ўсёй Беларусі да рэформы ўстанавіўся падворны, а не абшчынны. Рэформа, аставіўшы на захадзе Беларусі стары спосаб землякарыстаньня, на ўсходзе, у Магілеўшчыне і Віцебшчыне, увяла землякарыстаньне абшчыннае. На працягу далейшых часоў мы бачым, што сялянства віцебска-магілёўскага раёну няўхільна прагнецца вызваліцца ад незнаёмых і чужых ім форм абшчыны і перайсьці да падворна-індывідуальнай гаспадаркі. Ня гледзячы на перашкоды, сялянам гэта ўдавалася часам паўлегальна, часам нелегальна. Абшчына была навязана рэформаю, але яна не адпавядала выпрацаваным з старыны поглядам сялян на іх зямельна-прававыя адносіны. За дзесяткі год сялянства Магілеўшчыны і Віцебшчыны не магло звыкнуць да мысьлі аб ураўненьні і перадзелах зямлі, што было нязгодна з старажытнымі прававымі нормамі Беларусі. Кожны селянін трымаўся сваіх атрыманых у спадчыну ад бацькоў палосак. Само сабою зразумела, што абшчына без ураўніцельнага прынцыпу і перадзелаў была ў Віцебшчыне і Магілеўшчыне толькі юрыдычнай фікцыяй; фактычна і тут землякарыстаньне было падворным. Адсюль самі напрошваюцца некаторыя вывады, каторыя карысна адзначыць. Беларускі селянін з самага пачатку прырос да сваёй зямлі і зьяўляецца больш выразным уласьнікам, чым абшчыньнік-вялікарус, бо ніколі ня ведаў перадзелаў, каторыя былі і ёсьць звычайным зьявішчам на ўсходзе. Ён больш разьвінуў зямельную, вяскова-гаспадарчую культуру, чым селянін на Вялікарусі, але грамадзянскіх навыкаў і задаткаў колектывізму ён мае менш, чым селянін-абшчыньнік на Вялікарусі.

На аснове рэформы выходзіла, што селянін да таго часу, пакуль ён ня выкупіць атрыманага ад пана надзелу, знаходзіцца ў адносінах да яго ў стане часова-абавязанага. На Беларусі найчасьцей яго абавязкі ў адносінах да пана складаліся з трох дзён паншчыны ў тыдзень мужчынскіх і двух у тыдзень—жаноцкіх. Паншчына часам, як і ў часы прыгону, замянялася аброкам, каторы ад 15 рублёў даходзіў да 22 рубл. у год. Польскае паўстаньне 1863 году прымусіла рускі урад



Народныя ўборы з-пад Пінску на пачатку XIX ст

скасаваць на Беларусі палажэньне часова-абавязаных сялян. Каб прыцягнуць у свой бок селяніна, урад абвясьціў яго зусім вольным ад паншчыны і аброку. Замест іх, з 1864 году селянін пачаў плаціць беспасрэдна ураду выкупныя плацяжы. Экономічная абавязковая сувязь яго з панам была скасована. З панамі меў справу рускі урад, каторы адразу заплаціў ім авансам па вельмі шчодрай расцэнцы выкуп за сялянскую зямлю даходнымі процантнымі паперамі. Што датычыць да «вызваленага» сялянства, то яно павінна было плаціць добрачынцу ураду з лішкаю на працягу дзесяткаў год свой як-бы доўг выкупнымі штогодными плацяжамі. Дорага каштавала селяніну гэтая панска-царская ласка.

Апроч скарбовых і прыватнаўласьніцкіх сялян, рэформа 1861 г. закранула і другія групы дробнага вясковага жыхарства.

Ад часоў Рэчы Паспалітай на Беларусі існавала група так званых панцырных баяр. Гэтая пышная назва зусім не адпавядала свайму зьместу. Да панцырных баяр належала дробная шляхта, што дастала ў старыя часы зямельныя надзелы за шматгадовую вайсковую службу. З часам панцырнікі абяднелі, і іх надзелы мала чым розьніліся ад сялянскіх; апроч таго, яны прынялі дзейны ўдзел у паўстаньні і гэтым згубілі царскую ласку. У 1866 годзе асобным указам яны былі прыпісаны да сялян. Пазьней тыя з іх, каторыя з якіх-небудзь прычын зусім згубілі зямлю, былі прыпісаны да мяшчан гарадоў.

Апроч панцырных баяр, існавала яшчэ на Беларусі даволі значная група так званых аднадворцаў, каторая злажылася з зьбяднелае дробнае шляхты часоў Рэчы Паспалітай. Як і першая група, яны папалі пад няласку царскага ўраду. Пасьля рэформы 1861 году дашла чарга і да іх. Частка аднадворцаў па асобных загадах апынулася ў палажэньні звычайных скарбовых сялян, а частка абселася на прыватна-ўласьніцкіх землях, як арандатары, па зусім прыватнаму дагавору з земляўласьнікамі.

Вельмі добрую характарыстыку гэтай беларускай шляхты ў сялянстве дае Я. Лёсік у сваім артыкуле, зьмешчаным у зборніку «Беларусь», выданым у 1923 годзе («Культурны стан Беларусі к моманту Лютаўскай рэволюцыі», гл. стр. 101, 102, 103). Па социяльнаму стану былы шляхціц—той самы земляроб, што й селянін. Не падобен ён на селяніна хіба толькі тым, што жыве ня ў вёсцы, а ў засьценку ці на хутары. Апроч таго, ён памятае сваё мінулае шляхецтва ды трымаецца з гонарам. «Даўнейшыя прывілеі зьбліжалі шляхціца з панскім дваром, а гэта выгадавала ў ім некаторыя адзнакі пустой шляхецкай ганарлівасьці. Шляхціц ганарыцца сваім шляхецкім пахаджэньнем і неахвотна кампануе з сялянствам. А селянін, не знаходзячы ніякай социяльнай розьніцы паміж сабою і шляхціцам, стараецца пры здарэньні высьмеяць яго пустую шляхецкую заносьлівасьць і не далюблівае яго за ўгодлівасьць перад панам... Самы бедны шляхціц любіць у сьвята чыста адзецца, зьезьдзіць на кірмаш, пайсьці ў госьці да суседа. Селянін і тут стараецца высьмеяць яго зухаўство ды кажа на шляхціца: «На назе бот скрыпіць, а ў гаршчку трасца кіпіць». Большасьць шляхты трымаецца каталіцкага вызнаньня, як усе мясцовыя паны-земляўласьнікі, але ёсьць шляхта і грэцкага, праваслаўнага, вызнаньня» (стар. 103).

З часоў Рэчы Паспалітай на Беларусі існавала яшчэ група так званых вольных людзей. Яна складалася з самых markednaстайных элемэнтаў. Сюды ўваходзілі быўшыя каленістыя, чужаземцы, што цьвёрда

абселіся на Беларусі, шляхціцы, згубіўшыя з тэй ці іншай прычыны сваё шляхецтва, быўшыя прыгонныя сяляне і дваровыя, выпушчаныя на волю асабістымі панскімі актамі і г. д. Уся гэтая рознакаліберная група вольных людзей на грунце рэформы была прызнана прыналежнаю да стану звычайных вызваленых сялян.

У сувязі з вызваленьнем сялян, з 1861 году на Беларусі пачало існаваць сялянскае надзельнае земляўласьніцтва. Наколькі можна бачыць з ранейшага, яно ня было вялікім і значна ўступала шляхецкаму земляўласьніцтву. У той час, як шляхецкае земляўласьніцтва ў сярэднім складала каля 60% усёй зямлі, сялянскае земляўласьніцтва ў сярэднім раўнялася, прыблізна, 30%, спускаючыся часам і ніжэй, напрыклад, на Віцебшчыне, дзе яно складала толькі 24%. Зразумела, што пры такіх умовах была забясьпечана векавечная арэнда сялянамі прыватнаўласьніцкіх і скарбовых зямель. Апроч таго, што яшчэ важней, для панскіх маёнткаў былі забясьпечаны амаль што дармовыя сялянскія рабочыя рукі як для сэзоннага, так і для пастаяннага найму. Селянін, апрацаваўшы свой невялічкі надзел, быў вольны, а вечная недахватка гнала яго ў панскі двор, дзе ён, як ласкі, шукаў працы, каб не памерці з голаду. Іначай кажучы, рэформа пусьціла селяніна ў сьвет напоўпралетарам. Калі дадаць да гэтага, што ў 60-ыя годы на Беларусі і ў Расіі прыватнаўласьніцкія землі былі амаль што выключна панска-шляхецкімі, то становіцца зусім ясным, што юрыдычна вызвалены селянін з экономічнага боку быў моцна прывязан да таго самага пана, ад каторага ён залежаў сотні год.

Такім спосабам, вызваленьне сялян ад прыгону мела чыста знадворны характар З рук гандлёвага капіталу селянін папаў у рукі прамысловага капіталу.

Зямлі селяніну далі куды менш, чым ён апрацоўваў раней, прычым лепшую зямлю пан аставіў сабе, а горшую аддаў яму. За гэтую зямлю селянін павінен быў заплаціць даражэй, чым яна каштавала, і яшчэ даваць даплаты процанты. Уласьнікі жабрацкіх надзелаў вельмі хутка, а былыя дваровыя адразу, пачалі ўваходзіць у клясу пралетарыяту, што стаяла ў поўнай сувязі з агульным разьвіцьцём прамысловасьці.

У цэнтральнай Расіі сялянская зямельная рэформа была зьвязана з другімі лібэральнымі мерапрыемствамі і рэформамі, напрыклад, земскай, судовай і г. д. На Беларусі, апроч Смаленшчыны, і гэтага ня было. Урад, баючыся польскага панства на Беларусі, каторае, скарыстаўшы лібэральныя ўстановы, магло-б організавацца, другіх рэформ не праводзіў. Такім спосабам, і ў гэтых адносінах Беларусь нічога не атрымала. Яна апынулася ў горшым палажэньні, чым цэнтральная

Расія У той час, як у Расіі будаваліся школы і больніцы, дарогі і масты і г. д., Беларусь асталася збоку.

Пасьля вызваленьня, сялянства атрымала ад ураду асобнае вясковае саслоўнае «самоуправление», каторае амаль што без перамен прабыло да часоў рэволюцыі. Сяляне складаюць вясковыя вобчаствы з



Сялянскія вопраткі ў пачатку XIX сталецьця, з-пад Горадні.

сельскімі сходамі, старастамі, соцкімі і дзесяцкімі. Некалькі вясковых вобчастваў складаюць валасное вобчаства са сходам, старшынёю і пісарам. Тут-жа пры валасьці знаходзіцца і сялянская юстыцыя ў відзе валаснога суду. Тут-жа ў валасьці «вольнага» селяніна лібэральна сякуць лозамі. Усе гэтыя вынікі рэформы былі і ў Расіі і на Беларусі.

Спыняцца на іх мы ня будзем, бо яны ўсім добра вядомы. Зразумела, што ўсё гэтае сялянскае самакіраваньне было фікцыяй, бо ўлада над селянінам была ў руках пана ці беспасрэдна, ці праз міравога пасрэдніка, каторы быў прадстаўніком шляхецкіх інтарэсаў. Што гэта так, мы можам бачыць нават з афіцыяльнага дакуманту. Перад намі выпіска з «Журнала Гродненского Губернского по крестьянским делам Присутствия» ад 8 жніўня 1863 году. Там, паміж іншым, сказана: «Из замечаний членов поверочных комиссий, сделанных ими во время об'езда волостей, оказывается, что под влиянием бывших мировых учреждений общественное крестьянское управление находилось в самых неблагоприятных условиях. Права крестьян, дарованные им положениями 19 февраля 1861 года, оставались им почти неизвестны, вследствие сего волостные старшины, назначенные по большей части по настоянию помещиков... распоряжались самоуправно, под руководством их или поставленных от них писарей, общественными делами. Волостные и сельские сходы не имели надлежащего значения. Сельские старосты были преимущественно подрядчиками на господские работы и ограничивались надзором за их исправностью. Крестьяне по распоряжению своих должностных лиц, поддерживаемых помещиками, подвергались телесным наказаниям в совершенно произвольном размере. О волостном суде крестьяне не имели и понятия. Дела, спорные между крестьянами, решались старшинами или волостными писарями».

Вынятак, на наш погляд, вельмі яскравы, што добра рысуе палажэньне. Няма ніякай патрэбы дадаваць да яго што-небудзь. З вынятку мы бачым, што сялянскае самакіраваньне пасьля рэформы ёсьць нішто іншае, як старое дарэформенае кіраваньне сялянамі з панскага двара і панскай стайні. Калі так справа апісваецца ў афіцыяльным дакуманце, то жыцьцё давала яшчэ яскравейшыя малюнкі ўсялякіх непарадкаў, бязупыннага гвалту і зьдзеку. «Вялікая» рэформа мела вельмі няпэўную «велічыню».

## Паўстаньне 1863 году.

Ліберальны настрой ураду адбіўся і на палітыцы Расіі ў адносінах да былой Рэчы Паспалітай. Ён выявіўся з чыста надворнага боку ўжо тым, што, пасьля сьмерці Паскевіча (1856 г.), у Польшчу назначаліся адзін па адным такія намесьнікі, каторыя не маглі трымаць такога залезнага рэжыму, які быў пры Паскевічу. Гэта былі больш саноўныя старычкі, каторым трэба было даць якую-небудзь пачэсную сінэкуру. Адзін за другім ішлі Гарчакоў, Сухазанэт, Ламбэр і Лідэрс, каторых палітыка была ў тым, што яны не вялі ніякай палітыкі. Апроч таго, у вадносінах да Польшчы урад робіць некаторыя палягчэньні. Была

апублікавана амністыя ўсім палякам, каторыя былі сасланы ў Сібір і другія мясцовасьці імпэрыі за ўдзел у паўстаньні 1831 году. Было дазволена выдаваць творы поэты Міцкевіча, каторыя дагэтуль былі забаронены цэнзураю. У Варшаве была адчынена мэдыцынская акадэмія, каторая адразу пачала групаваць наўкол сябе патрыотычна-настроеную моладзь. У Варшаве-ж было адчынена земляробскае таварыства, каторае аб'яднала ўсю шляхту Польшчы. На чале таварыства стаў вельмі популярны ў польскіх шляхецкіх колах Андрэй Замойскі.

Дзякуючы ўсім гэтым палёгкам, сярод польскай арыстократыі ўтвараецца група, каторая ставіць сабе за мэту аб'яднаньне польскіх інтарэсаў з інтарэсамі Расіі. На чале групы становіцца Велепольскі. Ён і яго аднамысьленьнікі трымаюцца консэрватыўных поглядаў, каторыя магчыма сформуляваць так: лепш ісьці з рускім урадам, чым з польскімі рэволюцыянэрамі-якобінцамі. На думку гэтай групы, Польшча павінна ўваходзіць у склад Расійскай імпэрыі, як аўтономная адзінка. Велепольскі, разам з Любенскім, Губэ, Сьвідзінскім і др., апрацоўвае проэкт самакіраваньня Польшчы, каторы падае рускаму ўраду. На аснове проэкту рускі ўрад праводзіць у Польшчы рэформу 27 сакавіка 1861 году. На чале краю стаіць Рада стану каралеўства, якая складаецца з выдатнейшых сьвецкіх і духоўных саноўнікаў; такія-ж Рады ўтвараюцца ў месьце Варшаве, другіх галоўнейшых гарадох і ў губэрнях Польшчы. Рада стану кіруе праз комісію народнай асьветы і комісію адміністрацыйную. Велепольскі становіцца на чале комісіі народнай асьветы. Рэформа не здавальняе польскіх патрыотаў. Варожы настрой у Польшчы да рускага ўраду не зьмяншаецца.

Рух у Польшчы пачынаецца з маніфэстацый і канчаецца аружным паўстаньнем. Першая маніфэстацыя ў Варшаве адбылася яшчэ 10 ліпеня 1860 году ў сувязі з хаўтурамі ўдавы Савінскага, дзеяча паўстаньня 1831 году. Потым маніфэстацыі ідуць адна па другой, часта канчаючыся забойствамі. На Беларусі рух пачаўся пазьней. Першы раз засьпявалі рэволюцыйныя песьні ў касьцеле ў Вільні 8 траўня 1861 году; першая маніфэстацыя адбылася ў Вільні на Пагулянцы 18 верасьня 1861 году. Першая збройная група была прыкмечана каля Вільні ў мястэчку Берштанах 21 ліпеня 1862 году. Збройнае паўстаньне ў Польшчы пачалося ў ноч з 10 на 11 студзеня 1863 году. На Беларусь яно перакінулася праз два месяцы, а ўжо з канца 1862 году існуе ў Вільні рэволюцыйны комітэт, каторы організуе на Літве і Беларусі паўстаньне.

На рух робіць вялікі ўплыў загранічная эміграцыя як польская, так і рэволюцыйная руская. Барацьба Італіі, што адбывалася ў гэты час за сваё аб'яднаньне і вызваленьне ад Аўстрыі, зварачае на сябе ўвагу і падтрымлівае рэволюцыйны настрой палякаў. Імя Гарыбальдзі, попу-

лярнае ўва ўсёй Эўропе, робіцца асабліва популярным у Польшчы. Польскія патрыоты ўскладаюць свае надзеі на дапамогу заходніх гаспадарстваў, асабліва Францыі. Францыя вядзе барацьбу з Аўстрыяй за вызваленьне Італіі, потым яна будзе змагацца з Расіяй за вызваленьне Польшчы. Чаго не пасьпеў зрабіць Наполеон I, тое зробіць, на думку польскіх патрыотаў, яго наступнік Наполеон III. Тварэц навуковага рэволюцыйнага соцыялізму, Кароль Маркс, лічыць паўстаньне 1863 году прогрэсыўным гістарычным зьяўленьнем. Вялікі ўдзел у паўстаньні прымаюць гурткі відных рэволюцыянэраў таго часу, Герцэна і Бакуніна.



У Варшаве ў 1861 г.

Усё-ж такі трэба зазначыць, што паўстаньне 1863 году, ня гледзячы на яго інтэнсыўнасьць і гэроічнасьць асобных момантаў, ня мела той шырыні і размаху, што паўстаньне 1831 году. У 1831 годзе Польшча паўстала, як гаспадарства. Яна і Расія былі дзьвюма ваюючымі старонамі ў стане вайны паміж сабою. Польшча мела хоць і невялікую параўнальна з Расіяй, але ўсё-ж такі рэгулярную армію, каторая стала воч-на-воч з рускай рэгулярнай арміяй. Цяпер у палякаў была магчымасьць толькі партызанскай барацьбы, каторая, як-бы яна моцная ні была, не магла стаць проціў організаванага напору рэгулярнай арміі. Апроч таго, сялянства, на каторае мог спадзявацца і апірацца партызанскі рух, было цяпер ня так варожа настроена ў адносінах да Расіі, як у канцы 20-х і пачатку 30-х гадоў. Гэтыя годы былі ў Расіі зьвязаны з ненавіснымі іменьнямі Аракчэева і Мікалая I, а цяпер «лібэральны»

царскі ўрад, хоць і няўдала, але ўсё-ж такі правёў вызваленьне сялян ад прыгону, чаго не зрабіла панская Польшча мінулага часу.

Мэта паўстаньня—ранейшая: адбудаваць Рэч Паспалітую ў старых межах да 1772 году. Новым у адносінах да Беларусі было тое, што паўстаньне 1863 году зазначала ўсю важнасьць сялянскага пытаньня і высунула для зьдзейсьненьня плян пабудаваньня незалежнай Беларусі.



Герцэн

Гэтыя два пытаньні стаялі ў сувязі з тэорыямі тагочасных рэволюцыйных гурткоў Герцэна і Бакуніна і выклікаліся рэальнымі інтарэсамі працоўных мас Беларусі. Герцэн у польскім пытаньні быў прыхільнікам незалежнай Польшчы, але ён ня быў згодзен з тым, каб уваскрослая Польшча праглынула Украіну, Літву і Беларусь; апроч таго, ён лічыў, што паўстаньне павінна дасягнуць ня толькі мэт палітычных, але і соцыяльных: яно павінна вызваліць сялян ад прыгону і даць ім зямлю. Таксама мысьліў і Бакунін. Сялянская Расія, хлопская Польшча, вызваленыя Украіна, Беларусь і Літва, на яго думку, павінны стварыць вольныя фэдэрацыі.

У 1862 годзе ў Варшаве, замест Варшаўскага гарадзкога Комітэту, організаваўся Народны Цэнтральны Комітэт, каторы хутка абвясьціў сябе Народным Жондам (урадам). Ён вядзе сваю працу і ўтрымліваецца на сродкі, каторыя, з аднаго боку, перакідваюцца яму ў заграпічнай эміграцыі, з другога боку—атрымліваюцца, як спэцыяльныя зборы з уласьнікаў зямлі ў Польшчы і на Беларусі. Падпольны ўрад мае вялікія сувязі ня толькі з паўстанцамі краю: ён зьвязан з замежнай эміграцыяй і, апроч таго, праз палякоў афіцэраў, чыноўнікаў, студэнтаў і г. д. ён мае сувязь з рэволюцыйнымі організацыямі ў розных мясцовасьцях Расіі.

Як і ў 1831 годзе, паўстаньніцкі рух з самага пачатку разьбіўся на дзьве часьці: белую і чырвоную. На чале партыі белых стаяць польскія магнаты і багатая, радавітая шляхта. Усе яны концэнтруюцца навокал старога палітычнага дзеяча, вядомага нам Адама Чартарыскага і яго сваякоў (Лямбэраў отэль у Парыжы). Яны лічаць, што для адбудовы Рэчы Паспалітай першую і галоўную ролю павінна граць дыплёматыя. Збройнае паўстаньне патрэбна пастолькі, паколькі яго могуць скарыстаць дыплёматы. Панскае земляўласьніцтва і шляхецкія выключныя правы ў будучай Польшчы павінны застацца непа-

рушнымі. Польшча павінна адрадзіцца, як караўлеўства, у тых самых формах, у якіх яна памёрла. Чырвоныя складаюцца з дробнай рэволюцыйна-настроенай буржуазіі, інтэлігэнцыі і студэнцтва. Цэнтр польскай справы, на іх погляд, павінен быць не ў дыплёматычных забаўках, а ў рэволюцыйных актах. Землі павінны быць адабраны ад паноў і раздадзены сялянам. Абвестка аб гэтым акце павінна быць зроблена адразу, у самым пачатку паўстаньня, ясна і катэгорычна, каб працоўныя масы цалком увашлі ў паўстаньне. Рэч Паспалітая павінна будавацца не па старых асновах, а як шырока-дэмократычная рэспубліка. Некаторыя з чырвоных сваю соцыяльную програму выражалі вельмі яскрава і вобразна. «Пякельнаму дэмагогу» Мераслаўскаму прыпісваюць, напрыклад, такія словы: «Польшча будзе вольнай толькі тады, калі на кішцэ апошняга ксяндза будзе павешан апошні шляхціц».

Зразумела, што паміж чырвонымі і белымі йдуць нясупынныя прынцыповыя спрэчкі. І тая і другая партыя мае ў Парыжы свае ўласныя органы друку: белыя—«Wiadomości Polskie», чырвоныя—«Przgląd Rzecy Polskich». Паміж гэтымі часопісямі ідзе бесьперарыўная полеміка. Белыя не згаджаюцца з радыкалізмам чырвоных. Найбольшае, на што частка белых згаджаецца пайсьці,—гэта пусьціць у сялянскія масы няясную абяцанку палепшаньня іх долі ў будучыне.

Як гаварылася вышэй, паўстаньне пачалося ў ноч з 10 на 11 студзеня. Шмат дзе ў краі сталі выступаць партызанскія групы. Масавае сялянства пасыўна адносіцца да паўстаньня, дзякуючы таму, што белыя іграюць у ім відную ролю. Часта нават у каронна́й Польшчы прыкмячаліся адмоўныя адносіны да паўстанцаў. Удзельнік паўстаньня, добраволец француз Л. Фук у сваёй кніжцы « P us de Pollogne»,успамінаючы аб паўстаньні, гаворыць, што нярэдка сяляне віталі паўстанцаў словамі «сабачая шляхта». І Грабец у сваім творы «Рок 1863», выданым у нашы дні, таксама дае шмат прыкладаў варожых адносін польскага сялянства да паўстаньня. Сялян—«здрайцаў айчыны» паўстанцы сотнямі вешалі і яшчэ ў большым ліку ім вылічалі «solenne batogi» (стр. 238, 248 і г. д.). Часта і самі паўстанцы ўхіляліся ад таго, каб даць удзел у паўстаньні праўдзіва-рэволюцыйным пролетарскім элемэнтам. Л. Фук у тэй-жа кніжцы адносна гэтага апавядае: Сем тысяч рабочых запісалася ў польскім комітэце ў Парыжы, каб ісьці ў Польшчу ў якасьці паўстанцаў, але комітэт іх туды не пакіраваў, бо народны жонд меў на ўвазе адну мэту—пабудаваць у Польшчы старажытны уціск над простым людам.

Каб прыцягнуць селяніна да паўстаньня, белыя прыбеглі да спрабаванага сродку—рэлігіі. Пушчаны былі ў справу ксяндзы, каторыя абвясьцілі паўстаньне і удзел у ім сьвятою справаю. Цікава тое, што чырвоныя таксама не адмаўляліся ад таго, каб скарыстаць рэлігійны.

а часам і фанатычны настрой польскага сялянства. Ксёндз Фелінскі, каторы потым быў варшаўскім арцыбіскупам, у сваіх гутарках з выпускнымі студэнтамі Пецярбурскай каталіцкай духоўнай акадэміі, піша,




**Нелегальныя газэты ў 1863-64 г. г. (Беларуская газэта „Hutarka“—„Гутарка“).**

што чырвоныя ў процівагу белым вельмі часта са студэнтаў вышэйшых сьвецкіх школ перараблялісі на ксяндзоў, апранаючы сутану для палітычных мэт.

Паўстаньне на Літве і Беларусі пачалося трохі пазьней і на чале чго стаў мясцовы народны урад пад назваю Літоўскага Комітэту.

Ён офіцыйна быў аддзелам Варшаўскага цэнтру, але, трэба сказаць, далёка не заўсёды прызнаваў сваю поўную залежнасьць ад польскага жонду. Цэнтрам паўстаньня на Літве і Беларусі была Вільня. Прыметы паўстанцкага руху пачалі вызначацца яшчэ з канца 50-х год. Пачала пашырацца агітацыйная паўстанцкая літаратура як у польскай, так і ў беларускай мове. Гэтая літаратура прызначалася спэцыяльна для беларускага селяніна і выдавалася як белымі, так і чырвонымі. У Беластоку для гэтай мэты была наладжана патайная друкарня. Было выдана 9 нумароў часопісі для сялян—«Мужыцкая Праўда». Пашыраліся брошуры—«Гутарка старога дзеда», «Перадсьмертны разгавор пустэльніка Пятра» і г. д. Літаратура кліча селяніна ў паўстаньне, гаворачы аб тым, што з маскалём селяніну дабра ня будзе, што толькі ў адбудованай нанава Рэчы Паспалітай ён будзе вольным і роўным з панамі. З 1861 году ў гарадох Беларусі сталі адбывацца вулічныя патрыотычныя маніфэстацыі. У касьцёлах натаўп, наэлектрызаваны ксяндзамі, сьпяваў гімны рэлігійна-патрыотычнага зьместу. Гімны былі пературумачаны пабеларуску і прыстасованы да Літвы і Беларусі. Мужчыны пачалі насіць конфэдэраткі, кунтушы і чамаркі, а кабеты—жалобныя вопраткі, каторыя павінны былі сьведчыць аб жалобе па прыгнечанай бацькаўшчыне. Зьявілася шмат усялякіх патрыотычных эмблем, як, напрыклад, белы арол, пагоня, паломаны крыж у кайданах ці вянку і г. д.

Паўстанцы і патаемны ўрад Літвы і Беларусі, як і ў Польшчы, адразу распадаюцца на белых і чырвоных. Да белых належыць беларускае магнацтва і панства. Яны глядзяць на паўстаньне вачыма польскіх земляўласьнікаў. Іх цягне да сябе белая Варшава. На Беларусі ў іх няма ніякай апоры, бо сялянскія беларускія масы ў адносінах да іх настроены варожа. Што датычыць да чырвоных, то яны шукаюць апоры ў беларускіх сялянскіх гушчах, каторым яны прапануюць даць зямлю, волю ў шырэйшым разьмеры, чым гэта зрабіла царская Расія. Іх ня цягне да сябе Варшава. У той час, як белыя лічаць віленскі урад падлеглым цэнтральнаму жонду Варшавы, чырвоныя не згаджаюцца падданць рэволюцыю ў Літве і Беларусі інтарэсам Варшавы. Ім не патрэбна ні шляхецкая Польшча, ні царска-дваранская Расія. Яны змагаюцца за перамогу «мужыцкай праўды» на Беларусі, каторую разам з імі павінны бараніць і самі мужыкі. «Дзяцюкі! Жывучы пад жондам маскоўскім, кожны ведае, што ён нас абдзірае і глуміць, але мала хто добра падумаў, чы можна ад яго спадзявацца чаго-небудзь для нас альбо дзяцей нашых. Я, дзяцюкі, лепш знаючы ад вас, уздумаў напісаць пісьмо, каб не маглі туманіць розуму вашага. Для таго чытайце з увагаю, а як перачытаеце, давайце да другой вёскі. Чалавек такую мае натуру, што калі даведаецца, то хоча вразумеці добра

і дастаці ўсяго, што яму належыць. Гэта вялікая праўда. От яшчэ нядаўна гаварылі нашыя, што яны створаны для таго, каб служылі паншчыну і былі нявольнікамі, а чы сягоньня гэтак скажуць, калі ўжо ведаюць многа і многа хочуць. Сягоньня ўсе ўжо паразумнелі, усе ўжо мужыкі талкуюць, што бог стварыў чалавека, каб ён карыставаў з вольнасьці справядлівай, і сьмяюцца, як маглі інакш думаць. Мы сягоньня ўжо ведаем, што чалавек вольны тады, калі мае кавалак сваёй зямлі, за каторую ані чыншу і аброку ня плаціць, ані паншчыны ня служыць... Няма чаго чакаць ад нікога, бо ўжне толькі той, хто пасее. Так сейце-ж, дзяцюкі, поўнаю рукою, не шкадуйце працы, каб мужык быў чалавекам вольным, як на цалюськім сьвеце» («Мужыцкая Праўда» № 3).

Селянін на Беларусі прыгнятаецца ня толькі рускім царызмам, але і польскім панствам. Адсюль чырвоныя мэханічна павінны былі перайсьці да процівапастаўленьня ня толькі соцыяльных, але і нацыянальных інтарэсаў беларускага працоўнага народу нацыянальным інтарэсам польскага панства і рускага самаўладзтва. Яны поруч з соцыяльным вызваленьнем беларускага селяніна ад пана-паляка і рускага цара, ставяць сваёю мэтаю політычнае і культурнае вызваленьне «мужыцкай» Беларусі ад Расіі і Польшчы. Само сабой зразумела, што нязгода паміж чырвонымі на Беларусі яшчэ мацнейшая, чым у Польшчы. Там яны расходзяцца паміж сабою ў соцыяльным пытаньні, а на Беларусі, апроч соцыяльных расходзін паміж чырвонымі і белымі, ідуць спрэчкі па політычных і нацыянальных пытаньнях. Утвараецца вельмі заблутаная сытуацыя. Паўстанец 1863 году збройна выступае процiў расійскага самаўладзтва, але гэты паўстанец рэзка разьбіўся на дзьве, зусім непадобныя адна на другую, палавіны. Белыя на Беларусі, як гаварылася ўжо вышэй, былі прадстаўлены «зубрамі»-магнатамі. Самую выдатную ролю сярод іх гралі такія буйныя земляўласьнікі, як-горадзенскі губэрскі маршалак шляхты Старжынскі, менскі губэрскі маршалак шляхты Лапа, менскі пан Аскерка, князь Мікалай Гедройц, А. Еленскі і інш. На чале справы стаяў Старжынскі, чалавек хітры, лоўкі; ён меў шырокія сувязі як з мясцовым магнацтвам, так і з магнацкай замежнай эміграцыяй. Гэта—выразны прыгоншчык, каторы, ня гледзячы на сваю політычную опозыцыю ў адносінах да рускага ураду, разам з ім душыў сваіх сялян. У 1861 годзе сялянства ў яго маёнтках у Беластоцкім павеце, пачуўшы аб волі, папрабавалі не пайсьці на паншчыну. Старжынскі тады адразу вытрабаваў з Горадні рускую вайсковую сілу, каторая пакарала сялян. Адсюль ясна, як сялянства потым, у 1863 годзе, падтрымлівала такога паўстанца.

Чырвоныя складаліся з дробнай зьбяднелай шляхты, студэнтаў, вучняў, рамесьнікаў. Вакол іх групавалася больш сьвядомае сялянства.

Дробна-буржуазная рэволюцыйная інтэлігэнцыя займала тут першае месца. На чале чырвоных стаіць адзін з выдатнейшых рэволюцыянэраў таго часу Кастусь Каліноўскі, на асобе каторага нам трэба спыніцца.



Паўстанцы выходзяць у лес („Do lasu").

Каліноўскі радзіўся ў Горадзеншчыне, у Ваўкавыскім павеце, у 1838 годзе. Бацька яго, дробны зьбяднелы шляхціц, ужо ня мог жыць з зямлі і зарабляў хлеб, як кустар-ткач. Сына ён аддаў у навуку. Кастусь скончыў пяціклясовую прогімназію ў Сьвіслачы і паступіў у Маскоўскі унівэрсытэт. За удзел у студэнцкіх непарадках яго адкуль выключылі і ён, пасьля ўсялякіх труднасьцяй, залічыўся ў Пецярбурскі унівэрсытэт і скончыў яго, як кандыдат права. У унівэрсытэце канец 50-х гадоў Каліноўскі жыве звычайным жыцьцём студэнта-бедняка і выходзіцца з рускімі падпольнымі народніцкімі гурткамі і рэволюцыйнымі польскімі організацыямі. Творы Герцэна і Бакуніна робяць вялікі ўплыў на яго сьветапагляд. У 1860 годзе Каліноўскі ўжо тыповы рэволюцыянэр-народнік таго часу. У 1862 годзе Каліноўскі ўжо на Беларусі. Зразумела, што тут ён адразу знаходзіць сабе месца ў лягеры чырвоных паўстанцаў і робіцца членам літоўскага патаемнага ураду. Усю восень, пад імем Васіля Сьвіткі, апрануўшыся ў сялянскую вопратку, ходзіць ён па вёсках добра знаёмай яму Горадзеншчыны і вядзе пропаганду сярод сялянства. Паліцыя ганялася па яго сьлядох, але злавіць не магла, бо сяляне хавалі яго. Ён быў сярод іх сваім чалавекам, імя яго было акружана ўсялякімі легэндамі. Вандруючы па працоўных беларускіх вёсках, ён пераканаўся, што толькі тады паўстаньне можа мець посьпех, калі селянін пойдзе яго рабіць. А селянін толькі тады пойдзе яго рабіць, калі яно будзе пакіравана для здавальненьня яго інтарэсаў, а не інтарэсаў земляўласьнікаў. І трэба якраз так пакіраваць паўстаньне. Ён гаварыў сялянам, што трэба адабраць зямлю ад паноў і аддаць сялянству ўжо цалком без усялякіх «выкупаў». Трэба змагацца з царскім урадам, каторы падтрымлівае паноў і вызваляе не сялян ад паноў, а зямлю ад сялян. Трэба ўтварыць «мужыцкую» Беларусь, незалежную і ад польскага пана, і ад рускага

самаўладзтва, бо яны разам смокчуць кроў беларускага селяніна. Вельмі тыповымі для Кастуся зьяўляюцца словы, каторыя часта любіў ён гаварыць сялянам у сваіх прамовах: «Сякера паўстанца не павінна спыняцца нават над калыскаю шляхецкага дзіцяці», «такой бязмозглай галаве, як Варшава, ня можна даверыць долю Беларусі». Гаворыць Каліноўскі з сялянствам у яго, роднай яму беларускай мове, у гэтай-жа мове друкуе ён свае адозвы і часопісі-пракламацыі да сялянства, падпісваючы іх псэўдонімам «Яська, гаспадар з-пад Вільні». Літаратурны псэўдонім яго робіцца такім-жа папулярным сярод сялянства, як і звычайнае імя. Энэргічны, бясстрашны, поўны энтузіязму і веры ў перамогу беларускіх працоўных мас, ён быў найяскравейшаю асобаю паўстаньня на Беларусі. Таварышамі і памочнікамі Кастуся Каліноўскага былі людзі, падобныя на яго. З іх нам вядомы Т. Дылеўскі, па пахаджэньні дробны шляхціц, акуратны выканаўца плянаў Кастуся, чалавек вялікай вытрыманасьці і дысцыпліны; паручнік рускай службы, добры арганізатар і агітатар Малахоўскі, настаўнік па профэсіі, прапагандысты сярод інтэлігэнцыі Пшыбыльскі і інш.



Кастусь Каліноўскі.

Віленскі патаемны урад, кіруючы паўстаньнем на Беларусі, складаўся з 5 асоб: капітана рускай службы Зьвіржджоўскага, Кастуся Каліноўскага, Малахоўскага, залезнакалейніка Вярыгі і лекара Длускага. Прадстаўніком варшаўскага ураду на Літве і Беларусі—Дзюлёран. Большасьць ураду складаецца з чырвоных. Дзюлёран—выразны белы. Дзюлёран пачаў пасылаць у Варшаву даносы аб сэпэратызьме і якобінізьме віленскага ураду. Цэнтральны урад рашыў захапіць уладу на Беларусі ў белыя рукі. Паступова чырвоныя часткаю выціскаюцца з віленскага

комітэту (Каліноўскі, Малахоўскі), часткаю выбываюць самі па сабе (Зьвіржлоўскі) і замяняюцца белымі. Чырвоныя, што засталіся, бялеюць пад уплывам белай Варшавы. Каліноўскі з таварышамі, каб пад мацавацца, уступаюць у зносіны з чырвонаю групаю цэнтральнага ураду.

Перамозе белых як у цэнтры, так і на Беларусі, памагло тое, што на старану белых перадалася моцная «Цэнтральная польская арганізацыя» ў Петраградзе, каторая да вясны 1863 г. лічыла сябе чырвонаю. На чале польскай арганізацыі ў Расіі стаяў штабс-капітан акадэміі гэнэральнага штабу Зыгмунт Серакоўскі, яго памочнікам быў віцэ-дырэктар дэпартаманту неабкладных збораў, Ёзафат Агрызка. Арганізацыя мела вялікія сродкі і шырокія сувязі з рэволюцыйнымі коламі ў Расіі. Шмат хто з яе сяброў займалі вельмі высокія вайсковыя і цывільныя пасады. Дзякуючы гэтаму, арганізацыя мела магчымасьць выведваць палітычныя і стратэгічныя сакрэты і адводзіць ад сябе памысьленьне ў палітычнай няпэўнасьці. Гурткі арганізацыі былі параскіданы па губэрскіх і павятовых гарадох Расіі. Асабліва многалюднымі і добра арганізованымі былі польскія гурткі ў Маскве, Кіеве, Казані. Усе гурткі вялі акуратныя зносіны паміж сабою, з Пецярбургам, з Вільняю, Варшаваю і Парыжам. Былі ўстаноўлены арганізацыйныя сувязі з рускімі падпольнымі арганізацыямі, каторыя зьвязваліся з польскімі гурткамі, як опозыцыйнымі і рэволюцыйнымі, не ўглядаючыся ў іх соцыяльныя запатрабаваньні і соцыяльны склад сяброў.

Пасьля перагавораў з Варшаваю, Вільняю і Парыжам польская арганізацыя ў Расіі ўвашла ў контакт з белымі. Апіраючыся на яе, белыя і ў Польшчы, і на Беларусі пачалі граць на першых скрыпках. Каліноўскі і Малахоўскі ў Вільні прымушаны былі ўхіліцца ад удзелу ў дзейнасьці комітэту. Яны абодва пакіраваліся тады ў Горадзеншчыну, куды Каліноўскі быў назначан камісарам. Што датычыць да Малахоўскага, то ён праз нейкі час быў назначан памочнікам начальніка Вільні.

У сакавіку 1863 году ў Вільню ад пецярбурскай польскай арганізацыі прыехаў Серакоўскі. Разам з белым комітэтам, ён апрацаваў плян паўстаньня на Беларусі. Першаю мэтаю было пастаўлена заняць крэпасьць Дзьвінск. Прапанавалася для гэтай мэты ўвясьці ў горад і крэпасьць паўстанцаў у постаці рабочых, каторыя як-бы прышлі туды для будоўлі дзьвінскага косьцелу. Потым на ўсходзе Беларусі павінны былі быць заняты Горы-Горкі, дзе трэба было сабраць усіх паўстанцаў Магілеўшчыны і, разам з імі, захапіць магілеўскі артылерыйскі парк. Паўстанцкі штаб з галоўнейшымі сіламі павінен абсесьціся ў Ковеншчыне. Тут будзе працаваць Серакоўскі разам з выдатным ксяндзом-партызанам Мацкевічам. У лясох Ковеншчыны будзе арганізован пастаянны набор паўстанцаў і будзе формавацца армія для паўстаньня на Літве і Беларусі.

Мы ня можам судзіць аб тым, добра ці ня добра быў распрацован плян Серакоўскага. Вядома толькі, што выканаць яго не ўдалося. Справу ў Дзьвінску сапсаваў Плятэр, каторы, не паразумеўшыся з загаворшчыкамі ў горадзе і крэпасьці, зрабіў напад на транспорт з зброяю каля Краслаўкі і пакіраваўся на Дзьвінск. Тут ён быў адбіт, паранен, узяты ў палон і пасаджан у турму. Пры дапросах быў выкрыт плян заняцьця крэпасьці, і добра падгатаваны загавор, у каторым прымала удзел нават мясцовая жандармэрыя, праваліўся. У Горы-Горках паўстанцы спачатку мелі пасьпех. Пры чынным удзеле студэнтаў Горацкага земляробскага інстытуту ў ноч з 5 на 6 траўня паўстанцы ўзялі горад, абабралі скарбовую касу ды рушылі да Магілева. Мясцовае сялянства, бачачы ў паўстанцах прыгоншчыкаў-паноў, ня стала на іх бок. Сяляне сачылі за атрадам паўстанцаў і праз нейкі час, разам з рускімі салдатамі, абкружылі яго і захапілі ў палон. У Ковеншчыне пачаў справу сам Серакоўскі пад псэўдонімам Даленгі, маючы званьне ваяводы Літоўскага і Ковенскага. Ён спадзяваўся, што да яго пойдзе народ дзесяткамі тысяч, але ў самай рэчы яму ўдалося набраць атрад каля 2.000 паўстанцаў. Праўда, трэба сказаць, што атрад быў добра ўзброен і абучан. Шмат дапамог Серакоўскаму выдатны партызан, ксёндз Мацкевіч, каторы скарыстаў фанатычна-каталіцкі настрой мясцовага жыхарства і выгодную для партызаншчыны мясцовасьць краю. Атрад меў некалькі ўдалых стычак з урадавымі часьцямі. У красавіку ён спаткаўся з рускім гэнэралам Ганецкім. Адна за аднэй (25, 26 і 27 красавіка) адбыліся тры бітвы. Паўстанцы былі разьбіты. Сам Серакоўскі быў паранен куляю ў грудзі навылет, узят у палон і пасаджан у турму. Мацкевіч сабраў рэшткі паўстанцаў, папоўніў атрад новымі сіламі і доўга яшчэ выступаў у Ковеншчыне. З некаторых фактаў мы можам думаць, што потым ён увашоў у зносіны з чырвонымі і прыняў соцыяльную іх програму.



Ксёндз Антон Мацкевіч.

Няўдачы белых высунулі зноў да справы чырвоных. Хутка злажыўся зноў чырвоны урад, каторы назначыў Каліноўскага дыктатарам Літвы і Беларусі. Але было ўжо запозна. Сялянства, бачачы столькі

часу на чале паўстаньня паноў, не магло ў масе эразумець Каліноўскага і пайсьці за ім. Толькі ў тых мясцох, дзе сяляне ведалі і чулі аб Сьвітцы-Каліноўскім (напр., Горадзеншчына), яны адгукнуліся на новы покліч чырвоных і падтрымвалі іх.

Такім спосабам белыя стварылі паўстаньне на Беларусі. Іх удзел у паўстаньні быў значны і адбіўся на настроі сялянства. Каб гэта было больш зразумелым, мы возьмем адзін з малюнкаў паўстаньня, каторы пакажа нам усе адмоўныя бакі удзелу ў паўстаньні белых.



Сцэна з паўстаньня (бітва ў Аўгустоўскім лесе).

Справа ідзе ў раёне Багушэвічаў Ігуманскага павету. На чале паўстаньня стаіць магнат, вялікі земляўласьнік Баляслаў Сьвентаржэцкі. Яго маёнткі зьяўляюцца багацейшымі ўва ўсёй акрузе. Больш двух тысяч прыгонных сялян працуюць на гэтага паўстанца. Найбольшы яго маёнтак з раскошным палацам і з броварам знаходзіцца каля мястэчка Багушэвічаў. Мястэчка таксама пабудавана на яго зямлі і штогод выплачвае яму чыншавы падатак. Апроч Багушэвічаў, ён мае яшчэ чатыры вялікія двары: Траскоўшчыну каля Менску, Вялікую Гануту ў 5 вярстах ад Багушэвічаў, Ляды ў 20 вярстах ад Вялікай

Гануты і Горкі ў 20 вярстах ад Багушэвічаў. Апроч Сьвентаржэцкага, у паўстаньні прымаюць удзел буйнейшыя земляўласьнікі ваколіцы: браты Лукашэвічы, паны дзух маёнткаў—Бродцы і Нягонічы, Есьман—пан маёнтку Кабылякі, Навіцкі—пан маёнтку Востраў, Рагоўскі—пан маёнткаў Асмолаўкі і Гарадзішча, Карказовіч—пан маёнтку Лагі, Ваньковіч—вельмі багаты магнат, каторы мае ў Ігуменшчыне адзін з сваіх маёнткаў, Забашэвічы; Асоўскі—пан маёнтку Рудня, Борсук—пан некалькіх маёнткаў, з каторых у Ігуменшчыне была Альхоўка; Бараноўскі—кіраўнічы вялікага маёнтку графа Патоцкага, Бярэзіны; Акуліч—пан маёнткаў Малая Ганута і інш. Я наўмысьля пералічыў гэтых яснавяльможных удзельнікаў паўстаньня на Беларусі. каб паказаць, з якім пахучым букетам прыходзілася стаяць бок-а-бок паўстанцам-народнікам. Да гэтага панскага букету трэба дадаць яшчэ ксяндзоў прымаёнткавых і парафіяльных касьцёлаў, каторыя імем маткі боскай і анёлаў клікалі сваіх авечак на сьвятую справу адбудаваньня польскай айчыны. У касьцёлах хавалася зброя для паўстанцаў. Асабліва многа зброі ляжала схованай у мураваным касьцеле маёнткаў Багушэвічы, каторы потым быў перароблен Мураўёвым на праваслаўную царкву сьвятога Данілы. Да паноў і ксяндзоў трэба яшчэ дадаць ігуманокага спраўніка, зьбяднелага пана Сушчынскага, і асэсара (станавога прыстава) мястэчка Бярэзіны, таксама зьбяднелага пана Крукоўскага. Гэтыя два рускія урадніікі былі вельмі карысны для паўстанцаў. Яны заўсёды мелі пэўныя весткі аб тым, дзе хаваюцца паўстанцкія групы, і кіравалі рускія войскі, пасланыя для барацьбы з паўстанцамі, зусім ня туды, куды было трэба. Паўстанцкія групы ў Багушэвіцкім раёне былі невялікія, ад некалькіх дзесяткаў да сотні з палавінаю чалавек. Такі невялікі лік груп вельмі кідаецца ў вочы, калі ўзяць пад увагу вялікае багацьце правадыроў паўстаньня ў раёне. Групы амаль што ня мелі сувязі з мясцовым сялянствам; яны складаліся ў сваёй значнай большасьці з элемэнту прышлага і пераяжджалі з месца на месца на панскіх дворных парфконных карах.



Паўстанцы на Беларусі.

Зусім зразумела, што сялянства ня лічыла гэтых «дворных» паўстанцаў сваймі абаронцамі. Як толькі сяляне даведваліся, што праз іх вёску будуць ісьці такія паўстанцы, яны ўцякалі ў лясы, каторымі густа была пакрыта ўся Ігуманшчына. Найчасьцей такая самая гісто-

рыя была, калі да вёскі падыходзілі рускія салдаты. Усё-ж такі ў гэтым разе мы часта находзім здарэньні, калі сяляне памагалі салдатам лавіць паўстанцаў, бо паўстанцы мелі сувязь з ненавіснымі ім панамі. Калі сяляне спатыкаліся з групамі чырвоных паўстанцаў, то і ім адразу не давалі веры, бо прымалі іх за белых.

Малюнак паўстаньня ў аколіцы мястэчка Багушэвічаў дае нам як-бы ключ для эразуменьня паўстаньня на Беларусі і прычыны яго няўдачы. Былі прычыны, каторыя не далі паўстаньню ўрасьці сваймі каранямі глыбока ў сялянскія працоўныя гушчы Беларусі. Паўстанцы-народнікі былі вядомы толькі ў некаторых мясцовасьцях і больш сьвядомым колам сялянства і рамесьнікаў. Ад шырокіх рабочасялянскіх гушч чырвоныя рэволюцыянэры былі аддзелены тоўшчаю белых паўстанцаў, праз каторую ім трудна было прабівацца да чорназемнай бататай глебы, што магла карміць паўстаньне. Паміж працоўнымі масамі і такімі рэволюцыянэрамі, як Каліноўскі, стаў прыгоншчык, абшарнік-пан, каторы кінуў свой цень і зацямніў чырвоны твар паўстаньня. Пры такіх умовах рускаму ураду было лёгка справіцца з паўстаньнем на Беларусі, тым больш, што белыя паўстанцы вельмі хутка перакінуліся на старану рускага ураду.



Тып паўстанца на Беларусі (Раман Рагінскі).

## Ліквідацыя паўстаньня.

Паўстаньне 1863 году нарабіла шмат гоману. Аб ім гаварылі ў дыплёматычных колах, шмат пісалі ў замежных і расійскіх газэтах. Урадавыя колы былі скомпромітаваны тым, што яно так зацягнулася. Трэба было так ці йначай канчаць гэты «спор славян между собой». Для гэтай мэты быў вызначан для пасылкі на Беларусь «верный росс», тыповы рэакцыянэр-чыноўнік Міхал Мікалаевіч Мураўёў. Ён быў назначан у траўні 1863 году віленскім гэнэрал-губарнатарам з надзвычайнымі поўнамоцтвамі.

Мы ведаем больш-менш кар'еру гэтага мікалаеўскага чыноўніка, насіцеля тагочасных дэвізаў: праваслаўе, самаўладзтва і руская народнасьць. Гэтыя дэвізы данёс ён да 60-х гадоў. Захаваў ён і тактыч-

ныя прыёмы і спосабы мікалаеўскай эпохі: цяжкую руку і моцны кулак. Да 1835 году Мураўёў рабіў кар'еру на Беларусі, дзеля таго ён і быў прызначан рускім урадам за спасіцеля Беларусі ў момант паўстаньня 1863 году.



Карыкатура „Расія й Польшча".

У сярэдзіне траўня 1863 году Мураўёў з вялікаю помпаю зьявіўся ў Вільню. Як мы бачылі, паўстаньне ў гэты час ужо пашло на зьмяншэньне, дзякуючы віднаму ўдзелу ў ім белых. Праўда, пасьля правалу белых, чырвоныя прыняліся папраўляць справу, але яны ня мелі ў патрэбным ліку экономічных сродкаў і, што важней, не маглі ўцягнуць у паўстаньне ўсю працоўную масу, адстрашаную ад паўстаньня белымі. Ясна, што цяпер задушыць паўстаньне было лёгка.

Пачалося, як і заўсёды, з звычайнага прыёму Мураўёвым галоўных чыноўнікаў гэнэрал-губарнатарства, шляхецкіх маршалкаў, духавенства, гандляроў, ваенных і інш., каторым новы гэнэрал-губарнатар урачыста абвясьціў свае прыёмы ўлады і заявіў, што ён з працаўнікамі рускага ураду жартаваць ня будзе. Свае словы новы начальнік пастараўся даказаць прыкладамі. Вось перад намі адпаведны вынятак з уласных запісак Мураўёва: «Паўстанцамі былі запоўнены ўсе турмы, але, на жаль, іх судовыя справы ня былі закончаны, нават і не пачаты. А аб тых асобах, над каторымі прыгаворы вайсковых судоў ужо адбыліся, ня было зроблена канчатковых конфірмацый, бо баяліся строгасьцю абураць паўстанцаў. Наадварот, жадаючы паказаць палякам, што урад наш іх не баіцца, я адразу заняўся разглядам прыгавораў аб больш важных праступніках, не чакаючы, конфірмаваў іх і даў загад выканаць прыгаворы ў Вільні на гандлёвым пляцы, у поўдзень, з абвесткаю па ўсім горадзе з барабанным боем». (Русская Старина, т. 36, стр. 406). Адразу, каб застрашыць як паўстанцаў, так і мясцовае жыхарства, было шмат паўстанцаў павешана. Найраней з «барабанным боем» павесілі двух паўстанцаў-ксяндзоў, што навяло паніку на каталіцкае духавенства. Потым павесілі некалькіх начальнікаў паўстаньніцкіх атрадаў, а сярод іх ужо памянёнага намі раней ваяводу літоўскага Серакоўскага-Доленгу. Потым пачаліся «урачыстыя» кары сьмерцю рускіх афіцэраў, каторыя прымалі удзел у паўстаньні, звычайных паўстанцаў, тых, хто здаваўся падазронным і г. д. У вынясеньні сьмярот-

ных прыгавораў Мураўёў і яго верныя служкі давалі сабе поўную волю. Вешалі, як кажуць, направа і налева, вінных і нявінных у паўстаньні.

Быў павялічан нагляд за паветамі. На паветы і воласьці былі лакіраваны ваенныя павятовыя начальнікі і ваенныя станавыя начальнікі, каторым былі нададзены надзвычайныя поўнамоцтвы. Мураўёўскім начальнікам павінны былі падлягаць усе мясцовыя ўлады і тыя часьці рускіх войск, каторыя стаялі ў паветах і валасьцёх. Быў арганізован адкрыты і патаемны нагляд за ўсімі нярускімі панамі і ксяндзамі, былі ўстаноўлены правілы, каторыя абмяжоўвалі магчымасьць



Расстрэл паўстанца З. Падлеўскага.

іх пераезду з месца на месца. Дабраліся і да каталіцкага біскупа на Беларусі, каторага за спачуцьцё паўстанцам выслалі ў далёкую Пензу. Потым прыняліся за каталіцкія манастыры, некаторыя з якіх былі асяродкам паўстанцкага руху. Было зачынена больш як 30 манастыроў. Прычым, часта зачынялі і такія манастыры, каторыя ніякага дачыненьня да паўстаньня ня мелі. Па ўсіх паветах і станах былі дадаткова расстаўлены вайсковыя часьці, наўмысьля выкліканыя з цэнтральнай Расіі. Спэцыяльнымі цыркулярамі ад 28 траўня і 11 чэрвеня былі выданы для вайсковых часьцей загады: «Каб войскі не заставаліся бязвыхадна ў гарадох ці ў другіх пунктах паветаў, але бесьперастанку каб рухаліся па іх раёну, каб начальнікі атрадаў дзейнічалі рашуча для разьбіцьця паўстанцкіх груп і сачылі за імі па пятах не-

адступна і ўпарта, да поўнага расьсеяньня і зьнішчэньня, каб былі сформаваны асобныя атрады, каторыя заўсёды былі-б у руху» і г. д. Адным словам, павінна ўжывацца звычайная ваенная тактыка ў адносінах да партызанскіх груп. Новага тут нічога няма.

Рускія ваенныя сілы павінны былі карміцца мясцовым жыхарствам. На гэтым грунце вынікала шмат злачынства. Як і заўсёды, ад вайсковых пастояў цярпела сялянства. Паны мелі сродкі, каб адкупіцца, а бедната аддувалася за іх. А што гэта было так, мы бачым з запісак гэнэрала Мэера, каторы, бачачы злачынства ў гэтым кірунку, прапануе: «Трэба старацца, каб цяжар харчаваньня ня падаў на непавінных і бедных праваслаўных сялян. Нават цяпер войскі разьмешчаны па кватэрах у сялян, для каторых яны не падпора, а цяжар. Уласьнікі-ж маёнткаў, цераз смуты якіх трэба было ўвясьці ў край гэтыя войскі, не далі нават ніводнай афіцэрскай кватэры». («Записки генерал-майора Мейера. Подготовка к польскому мятежу в Минск. губ.», стр. 47). Вельмі часта пастоі назначаліся ў тыя вёскі, праз якія праходзілі паўстанцы, што зусім не залежала ад жыхароў вёскі. Паны біліся, а ў мужыка чуб трашчаў.

Дзеля таго, што ў паўстаньні прымалі ўдзел каталіцкія манастыры, ксяндзы і каталікі-паны, пачалася ўпартая барацьба з каталіцызмам і гвалтоўнае насаджваньне і штучнае падтрыманьне праваслаўя, каторае было сынонімам царскага самаўладзтва і рускай народнасьці. І тут ня было нічога новага. Былі толькі выкарыстаны старыя мікалаеўскія прыёмы і загады. Яшчэ ў 1852 г. Мікалай I, апякуючыся над ажыцьцяўленьнем на Беларусі прынцыпаў «праваслаўе, самаўладзтва і руская народнасьць», даў загад, каб паны пабудавалі для сваіх сялян праваслаўныя цэрквы там, дзе іх ня было, ды адрамантавалі старыя, дзе яны прышлі ў нягоднасьць. Гэты загад у свае часы так і ня вылез з-пад сукна канцэлярскіх сталоў і заставаўся забытым аж да 1863 г. У гэтым годзе Мураўёў выцягнуў з архіву мікалаеўскі загад і пачаў рэалізаваць з уласьцівай яму ўпартасьцю. Палякі-паны, каторых усіх Мураўёў лічыў удзельнікамі паўстаньня і каторыя па сваім вызнаньні ўсе былі каталікамі, павінны былі будаваць новыя і папраўляць старыя цэрквы для сваіх сялян, каторыя ў пераважнай большасьці былі праваслаўнымі. Цікава тое, што да рускіх паноў праваслаўнага вызнаньня гэты загад не адносіўся. Былі выпісаны з Расіі два чыноўныя архітэктары—Рэзанаў і Чагін, каторыя і пачалі праводзіць у жыцьцё мураўёўскі загад. Зразумела, што гэнэрал-губарнатар дапамагаў «мастацкай працы» іх, дзе было трэба, рэпрэсіямі. Разам з тым, у дапаўненьне да загаду 1852 г., Мураўёў зачыняе каталіцкія манастыры і касьцёлы і перарабляе іх на праваслаўныя.

Тымчасам паўстаньне пачынае зьмяншацца ў сваім размаху. Белы Варшаўскі Комітэт пачынае распускаць свае організацыі і паўстанцкія групы, каторыя расьцярушваюцца, часткаю эмігрыруючы за межы імпэрыі, часткаю пападаючы ў рукі рускага войска. Паўстаньне зьмяншаецца не затым, што рускі урад сваймі гэніяльнымі мікалаеўскімі мерапрыемствамі заспакойвае край, а затым, што сужыцьцё белых і чырвоных паўстанцаў робіцца немагчымым; затым, што белыя дыскрэдытавалі паўстаньне ў працоўных гушчах. Белыя спалохаліся зданя чырвонага «якобінскага» паўстаньня і паступова пачалі станавіцца на грунт законнасьці, парадку і абароны «сьвяшчэннай уласнасьці», у чым яны зусім схадзіліся з самаўладным царскім урадам. Скомпромітаваўшы раней сваёй прысутнасьцю ў паўстаньні перад працоўнымі масамі чырвоных паўстанцаў, яны цяпер, адны за другімі, сьпяшаюцца «падаць да ног» рускага царызму. Прычым яны не абмяжоўваюцца тым, што скомпромітаваных імі чырвоных астаўляюць «на произвол судьбы», а прагнуцца хутчэй даносамі прадаць іх у рукі рускага ўраду. Уся дзяржаўная заслуга Мураўёва была ў тым, што ён кулаком падганяў паноў, каторыя ішлі да царызму ў цьвёрдым розуме й памяці; падганяў затым, што яму здавалася, што ідуць яны ня так хутка, як ён хацеў.



Карыкатура на Мураўёва.

Ужо ў канцы ліпеня 1863 году да Мураўёва зьявілася дэлегацыя з 15 асоб ад шляхецтва Віленскай губэрні, на чале з губэрскім маршалкам шляхты Дамэйкам. Дэлегацыя падала яму ліст на імя імпэратара Аляксандра II, у каторым яна з папраўдзе шляхецкай «гжэчнасьцю» каялася ў мінулым і заяўляла аб вернападданьніцкіх пачуцьцях шляхецтва Віленскай губэрні ў адносінах да царскага трону. Пад лістом было 235 подпісаў віднейшых магнатаў і шляхціцаў. За віленскім шляхецтвам пасунулася шляхецтва і другіх губэрань. Ужо ў жніўні зьяўляецца да Мураўёва з вернападданьніцкім лістом дэлегацыя ад Ковенскага земляўласьніцтва. Пад лістом стаіць 500 шляхецкіх подпісаў. У палавіне верасьня падносіць Мураўёву ліст горадзенскае шля-

хецтва; пад лістом мы чытаем ужо 1.600 панскіх подпісаў. У канцы верасьня сыпяшаецца з вернападданьніцкм лістом і менская шляхта. Яна пабівае рэкорд як «гжэчнасьцю» падхалімскіх выразаў, так і лікам подпісаў. Усяго пад менскім лістом мы налічваем 2.700 падпісаў. Спазьнілася крыху віцебская і магілеўская шляхта, каторая падала свае лісты апошнімі. У кожным выпадку ніхто не забыўся адзначыць, што паўстаньне было абмылкаю.

На арэне бою як у Польшчы, так і на Беларусі засталіся адны чырвоныя. У Варшаве ўтварыўся Чырвоны Жонд, які складаўся з праўдзівых рэволюцыянэраў: Асныка, Бахонскага, Ігнася Хмяленскага, Стася Франкоўскага і інш. Вельмі хутка і тут трэба было перайсьці да дыктатуры. Дыктатарам быў абвешчан Траўгут. Гэта быў энэргічны, рашучы чалавек, з містычным настроем. Вельмі хутка ён разышоўся з



Паўстанцы на катарзе (закаваньне ў кайданы).

чырвонымі і пачаў групаваць укола сябе пераважна людзей консэрватыўнага кірунку, што павінна было прывясьці польскае паўстаньне да хуткага канца. На Беларусі на чале чырвонага руху быў дыктатар Каліноўскі, каторы цьвёрда стаяў на сваёй програме. Як і раней, ён набірае свае атрады з вясковай і гарадзкой беднаты і ўпарта ваюе на два фронты: з белымі, здрайцамі-панамі і з рускім самаўладзтвам. Сілы чырвоных слабнуць, атрады іх зьмяншаюцца. Застаўся яшчэ толькі адзін спосаб вясьці далейшую барацьбу. Такім спосабам быў тэрор, накіраваны таксама ў два бакі. Быў утворан патайны рэволюцыйны трыбунал, каторы выносіў сьмяротныя прыгаворы ў адносінах да асобных здрайцаў ці гвалтаўнікоў. Каб выконваць загады трыбуналу, была організавана каманда кінжальшчыкаў, з самых вытрывалых рэволюцыянэраў. Першым актам тэрору на Беларусі, выкананым кінжальшчыкамі, быў напад на вышэйпамянёнага маршалка шляхты Віленскае гу-

бэрні—Дамэйку. Здрайцы пашанцавала: паранены ў некалькх мясцох, Дамэйка выздаравеў. Паны, бачачы сваю небясьпечнасьць ад чырвоных, пачалі разам з мураўёўскай адміністрацыяй змагацца з імі. Пачаліся даносы, каторыя выкрывалі і пасылалі да мураўёўскай шыбеніцы аднаго чырвонага па другім.

У сялянскія цёмныя масы былі пушчаны провокацыйныя чуткі, што чырвоныя вядуць барацьбу з рускім урадам за тое, што цар вызваліў з прыгону сялян; што мэтаю чырвоных паўстанцаў зьяўляецца ізноў увясьці прыгон на Беларусі. І трэба прызнаць, што провокацыя ўдалася дзеля таго, што беларускі селянін у папярэдні пэрыод бачыў у паўстанцах паноў, каторых баяўся і ненавідзеў. Усё-ж такі, ня гледзячы на гэта, паўстаньне яшчэ ня сьціхала. Яно трымалася ў Горадзеншчыне і Ковеншчыне. Горадзеншчына была пад уплывам Каліноўскага, а ў Ковеншчыне не здаваўся ксёндз Мацкевіч, каторага не пакідала літоўскае сялянства. Яго паўстанцкая група то зьмяншаецца, то павялічваецца і ніколі ён не застанецца без падтрыманьня. Мацкевіч пераходзіць з месца на месца, і яго доўга ня могуць злавіць. Зьяўляючыся зусім неспадзявана там, дзе яго не чакаюць, ён вельмі часта наносіць нават паражэньні урадавым войскам. Толькі ў лістападзе 1863 году рускаму атраду ўдалося разьбіць яго атрад і ўзяць у палон непакойнага ксяндза і здольнага партызана. У сьнежні на Лукіскім пляцы ў Вільні Мацкевіч, урэшце, загінуў на мураўёўскай шыбеніцы, і Ковеншчына заціхла.



Маршалак Дамэйка.

Мёртвая пятля, што абхапляла чырвоных, усё звужалася. У канцы 1863 году па даносе былі арыштаваны тры сябры Віленскага Комітэту: Дылеўскі, Здановіч і Дарміноўскі, каторыя гралі вялікую ролю ў паўстаньні. Дылеўскі быў памочнікам Каліноўскага, Здановіч загадваў усёй гаспадарска-грашовай часткаю паўстаньня, а Дарміноўскі быў паўстанцкім камісарам Віленшчыны. Разам з імі былі заарыштаваны і дакуманты організацыі. Урад разумеў, што ў асобах заарыштаваных ім ён мае кіраўнічых паўстаньня і прагнуўся як пагрозамі, так і абяцанкамі дабіцца паказаньняў. Ніякіх паказаньняў яны не далі. Спі-

койна, з глыбокаю верою ў праваку сваёй справы, яны загінулі на эшафоце: Здановіч і Дарміноўскі ў сьнежні 1863 г., а Дылеўскі—у студзені 1864 году.

Хутка ўлада напала на сьлед Малахоўскага. Каб па яго сьляду сышчыкі не напалі на сьлед рэштак організацыі, ён павінен быў пакінуць Вільню. Акольнымі шляхамі ён дабраўся да Пецярбурга, але й адсюль павінен быў выехаць заграніцу.

Застаўся адзін Каліноўскі. Перакананы ў правільнасьці сваіх поглядаў, сьмелы, энэргічны, вытрыманы, ён усё яшчэ спадзяваўся падняць працоўныя беларускія масы проці польскага пана і рускага самаўладцы. Ён нанава організуе атрады, падтрымоўвае старыя, знаходзіць усё новых і новых супрацоўнікаў, піша і пашырае адозвы і г. д.



Нерчынская катарга ў Сібіры.

Што ні тыдзень прыходзіцца яму мяняць сваё прозьвішча, што ні дзень—сваю кватэру і вопратку. Усе спробы злавіць яго канчаюцца няўдачай, бо сялянства і гарадзкія нізы даюць яму прыпынак, ня гледзячы на тое, што ім за гэта пагражае цяжкая кара. Каліноўскі чакае вясны, каб зноў распачаць паўстаньне, але ўжо бяз белых, апіраючыся на працоўныя гушчы Беларусі. Ён у сваіх адозвах зьвяртаецца да паўстанцаў, просячы іх пацярпець да цёплых дзён вясны, калі лік іх зноў павялічыцца і лясы дадуць лепшы прытулак.

Але здрада не драмала. Думаючы, што Цэнтральны Паўстанцкі Комітэт знаходзіцца ў Менску, Мураўёў у студзені 1864 г. паслаў туды на разьведку спэцыяльную комісію на чале з жандарам Лосевым. Комісія напала на сьлед мясцовай менскай падпольнай організацыі. Пачаліся арышты. Сярод арыштаваных знаходзіўся шляхцюк Парфіяновіч, каторы ведаў, як знайсьці чырвонага дыктатара. Жандармэрыя

абяцала яму памілаваньне, калі ён выдасьць Каліноўскага. Ратуючы сваю скуру, ён здрадзіў Каліноўскага.

Каліноўскі ў гэты час жыў пад імем Вітольда Вітажэнца ў Вільні, у Сьвята-Янскіх мурох. Тут знаходзілася гімназія, архіў, музэй старасьветчыны, былі і прыватныя кватэры. Каліноўскі жыў у кватэры настаўніка гімназіі. Поліцыя ўначы патаемна аблажыла кругом увесь квартал, не даючы нікому выхаду адтуль і арыштуючы ўсіх, хто ўваходзіў. Быў арыштаваны (7/I 1864) і Каліноўскі. Некалькі месяцаў пратаміўся ў турме чырвоны дыктатар, чакаючы сьмяротнай кары. Яго мучылі допросамі і пагрозамі, але зламаць не маглі. Ён заставаўся цьвёрдым, поўным веры ў сваю справу. З турмы.



1863.

PISMO AD JASKA HASPADARA S PAD WILNI

DA MUŻYKOW ZIEMLI POLSKOJ.

DZIACIUKI!

Kab Boh dau mnie rozum, to ja wam budu radzić jak rabici tre[...] pa sprawiedliwości i pa praudzie, a kali wy majecie ro[...] mienie posłuchajecie.

Jak tolko zapamiatajuć naszyje baćki, maskal żyu adno aszukaństwom i nieczystaju siłaju. Pakasawau jon usio dobroju, a ustanawiu szto adno może wydumać czartouskaja chitrość. Byli małyje padatki, a jon-horło jeho nie sytoje, ustanawiu wielikije, jakich nie ma na całuśkom świeci; byli prywilej Karalou Polskich, a ciepier hdzie jeny? Synou naszych bieruć w rekruty, da i honiać czort wiedaje hdzie, kab prapadali marnie jak sabaki. Narod hinie, nie maje czym prażyci, rwuć jak mohuć, nihdzie nie najdziesz nijakoj sprawiedliwości, skasawali naszu Unijacku Wieru, adarwali nas siłaju ad praudziwaho Boha, uahnali w wiecznoje patonplenie. Pad Sewastopolom kali Prancuz pryniewoliu maskała daci nam wolność, to jon adno aszukaństwom zajmausia; praszło sześć let i my ni akoj wolności i w oczy nie baczyli. Ciepier kali Rąd Polski abjawiu szto ziemlu mużykow pańskich i kazionnych addaje na wieczność mużykam, a chto nie maje ziemli i pojdzie da paustania, toj dastanie najmienaz try morgi, to car maskouski wydau manifest szto mużyk musić placić kożny rok wielikije hroszy za swaju ziemlu szto Rąd Polski im uże addau.

Dziaciuki! kali ciepier Rąd Polski padniausza paustanie prociu maskala, daje nam ziemlu, sprawiedliwoju wolność i Wieru naszych Baćkou, kali Prancuz, Angliczanin i cely świet idzie nam pamahaci, kali jak szyroka ziemla nasza, narod hramadoju, chto ze strelboju, a chto s kasoju, idzie na adwiecznaho naszaho nieprzyjaciela, maskala pahanaho, kali maskal ad naszych kos abniom uciekaje, czyż my Dziaciuki, siedzieci budziem? my, szto żywiemo na ziemli Polskoj, szto jemo chleb Polski, my, Palaki z wiekou wiecznych. Treba nareści i nam pryjci da taho rozumu, szto adno siłoju, da[i] kasoju, dabjem sia sprawiedliwoj wolności i wiery naszych dziedow i pradziedow.

Dawoli, Dziaciuki, uże żdaci; nastau uże czas, Bożyj czas! chto za Rądom Polskim, tamu praudziwa Wolność, chto prociu Jeho, tamu wieczna niewola na hetom, i wiecznoje patonplenie na tamtom świeci! Wybierajcie szto komu lepszoje.

Szto da mienie, to ja Wam, Dziaciuki, kazu, bierecie za kosy, heto maja rada, a na wieki rozstaniem sia z maskalom pahanym, z jeho zdzierstwom, z jeho syzmoju, z jeho rekrutczynaju, z jego sabaczymi pamierami i abrokami.

JAŚKO haspadar s pad Wilni.

Адозва Каліноўскага.

яму ўдалося напісаць да сваіх прыяцеляў і прыхільнікаў два лісты, адзін да сваёй бацькаўшчыны—Беларусі, другі—да беларускага народу. Для нас мае асаблівую цікавасьць другі ліст, каторы мы тут і прыводзім:



KOMITET CENTRALNY

JAKO TYMCZASOWY

RZĄD NARODOWY.

Warszawa, dnia 22 Stycznia 1863 r.

Маніфэст 1863 г. Цэнтральнага Комітэту паўстанцаў.

«Беларусь, браты мае родныя! З-пад шыбеніцы маскоўскай прыходзіцца мне пісаць да вас і можа астатні раз. Горка пакінуць зямельку родную і цябе, дарагі мой народзе! Грудзі застогнуць, забаліць сэрца, але ня жаль згінуць за тваю праўду. Прымі, народзе, па шчырасьці маё слова перадсьмертнае бо яно як-бы з таго сьвету толькі для дабра твайго напісана. Няма ш, браткі, большага шчасьця на гэтым сьвеце, як калі чалавек мае розум і навуку. Тагды ён толькі можа быць у радзе, жыць у дастатках, і тагды толькі, памаліўшыся богу, заслужыць неба, бо, узбагаціўшы навукай розум, разаўе сэрца і народ свой цэлы шчыра палюбіць. Але як дзень з ноччу ня ходзіць разам, так і навука праўдзіва ня йдзе разам з няволяй маскоўскай. А пакуль яна ў нас будзе, у нас нічога ня будзе. Ня будзе праўды, ня будзе багацьця і ніякай навукі, адно намі, як скацінай, варочаць будуць не для дабра, а на пагібель нашу. Бaюй, народзе, за сваё чалавечае і народнае права, за сваю веру, за зямлю сваю родную. Бо я табе з-пад шыбеніцы кажу, народзе, што тагды толькі зажывеш шчасьліва, калі над табой маскаля ўжо ня бу-

дзе. Яська, гаспадар з-пад Вільні». («Наша Думка» 1920 г. № 5). З зьместу ліста мы бачым, што рэжым мураўёўскай турмы налажыў сваю пячатку на настрой рэволюцыянэра. Мотывы социяльнай барацьбы за «мужыцкую» праўду тут зычаць, як і раней. Але лейт-мотывам ліста зьяўляецца покліч да беларускага «народу» (у народніцкім сэнсе) вясьці барацьбу за вызваленьне Беларусі ад рэжыму царызму, каторы прадстаўлен агіднай мураўёўшчынай.

У красавіку 1864 г. адбылася кара сьмерцю чырвонага дыктатара, каторага стовусная сялянская маса назвала «каралём Літвы», разуме-


PRYKAZ

AD

RADU POLSKAHO NAD CEŁYM KRAJEM

LITOUSKIM I BIEŁORUSKIM

DA

Narodu ziemli Litouskoj i Bieloruskoj.

[illegible]

Прыказ Чырвонага Ураду на Беларусі.

ючы пад Літвою беларускія абшары. «Сёмага (20) красавіка 1864 г., у дзень кары Каліноўскага была ясная халодная раніца. Каліноўскі шоў на кару цьвёрдаю, сьмелаю стапою. Прышоўшы на Лукіскі пляц, ён стаў тварам да шыбеніцы і толькі часам кідаў погляд на далёкі натоўп. Перад самым павешаньнем, калі да Каліноўскага зьвярнуўся ксёндз затым, каб зрабіць споведзь і праззаў яго шляхціцам, Каліноўскі груба яму адказаў: «у нас няма шляхты, у нас усе роўныя». (Кастусь Каліноўскі. «Савецкая Беларусь» № 8602, IV, 1923 г.).


CENTRALNY NARODOWY KOMITET
jako tymczasowy
RZĄD NARODOWY

zważywszy, że uwłaszczenie włościan pomimo ogólnéj chęci kraju, z powodu stawianych przez Rząd Najezdniczy przeszkód dotąd do skutku nie doszło—obok tego

zważywszy, że oddanie gospodarzom rolnym na własność gruntów, dotąd przez nich tytułem czynszów, pańszczyzny lub innych obowiązków posiadanych, zmniejsza mienie dotychczasowych właścicieli,

postanowił i stanowi:

Art. 1. Wszelka posiadłość ziemska jaką każdy gospodarz dotąd tytułem pańszczyzny, czynszu lub innym tytułem posiadał—wraz z należnemi do niéj ogrodami, zabudowaniami mieszkalnemi i gospodarskiemi, tudzież prawami i przywilejami do niéj przywiązanemi—od daty niniejszego Dekretu staje się wyłączną i dziedziczną dotychczasowego posiadacza własnością, bez żadnych jakichkolwiek bądź obowiązków, danin, pańszczyzny lub czynszu, z warunkiem jedynie opłacania przypadających z niéj podatków i odbywania należnéj służby krajowéj.

Art. 2. Dotychczasowi właściciele nadanych gospodarzom rolnym gruntów, otrzymają odpowiednią wartości tychże indemizacyi z funduszów narodowych za pośrednictwem długu Państwa.

Art. 3. Zasady do oznaczenia wysokości szacunku ziemi, oraz rodzaj instytucyi kredytowéj w osobnych dekretach wskazane będą.—

Art. 4. Wszelkie Ukazy, Reskrypta przez Rząd Najezdniczy w przedmiocie tak zwanych stosunków włościańskich wydane znoszą się, a tém samém nikogo nie obowiązują.—

Art. 5. Dekret niniejszy stosowany być winien tak do własności prywatnych, jako téż i do własności Rządowych, Donacyjnych, Kościelnych i wszelkich innych.

Art. 6. Ogłoszenie i wprowadzenie w wykonanie niniejszego Dekretu, Centralny Narodowy Komitet jako tymczasowy Rząd Narodowy Naczelnikom wojskowym i wojewodzkim poleca.

Dan w Warszawie 22 Stycznia 1863 r.

CENTRALNY NARODOWY KOMITET
jako tymczasowy
RZĄD NARODOWY

zważywszy, że [illegible] wymaga jak największéj liczby walczących i nikt od pełnienia służby wojskowéj wymówić się nie może,

zważywszy nadto, że każdy obywatel z pracy rąk utrzymujący się skoro pójdzie na wojnę mieć winien zapewniony byt tak dla siebie jak i dla swéj rodziny,

postanowił i stanowi:

Art. 1. Chałupnicy, Zagrodnicy, Komornicy, Parobcy i w ogóle wszyscy obywatele z zarobku jedynie utrzymanie mający, którzy powołani do broni w szeregach wojska narodowego za Ojczyznę walczyć będą otrzymają a w razie ich śmierci żony i dzieci na własność po ukończeniu wojny z Dóbr Narodowych dział gruntu najmniéj mórg trzy przestrzeni zawierający.

Art. 2. Ogłoszenie i wprowadzenie w wykonanie niniejszego Dekretu Centralny Narodowy Komitet jako tymczasowy Rząd Narodowy Naczelnikom wojskowym i wojewodzkim poleca.

Dan w Warszawie 22 Stycznia 1863 r.

KOMITET CENTR. NARODOWY

Маніфэст Цэнтральнага Народнага Комітэту аб тым, што зямля, на якой жылі сяляне пры паншчыне, застаецца іх уласнасьцю.

Кару сьмерцю Кастуся Каліноўскага магчыма лічыць астатнім яскравым эпізодам паўстаньня 1863 г. Паўстаньне прыпынілася. Мураўёў быў абвешчан рускім гэроем, katoраму афіцыяльныя пісакі самаўладзтва курылі ладан, як маглі. У гэтай справе некаторыя з іх даходзілі да вышэйшай віртуознасьці. Вось для прыкладу адзін вынятак з тагочаснай «патрыотычнай літаратуры» аб Мураўёве. «С моей точки зрения он (Муравьев) заслуживает еще при жизни памятника на счет поляков за то добро, которое он им сделал, энергично и быстро подавивши мятеж» (И. Митропольский. Повстание в Гродне 1863-4 г.г. Русский архив, 1895 г.; № 1, стр. 138). Аўтар забыўся толькі прылучыць да палякоў беларусаў, лічачы, відаць, іх надта беднымі для такой дарагой справы, як пастаноўка помніка.

Цікава тое, што нават вядомы поэта «печали и гнева», каторы клікаў моладзь «от ликующих, праздно болтающих, умывающих руки в

крови»ісьці «в стан погибающих за великое дело любви»—Некрасаў таксама зьнізіўся да дыфірамбаў на пачэсту вешальніка-Мураўёва. У красавіку 1866 г. ангельскі клюб у Маскве даваў урачысты абед у пачэсту Мураўёва. Пасьля абеду, калі госьці разышліся па пакоях клюбу піць каву, да гуртка, у каторым быў Мураўёў, падышоў Некрасаў і прачытаў свой верш, прысьвечаны вешальніку. Мы прыводзім тэкст вершу ў тэй рэдакцыі, каторую перадае «Русский архив» (1885 г. т. II).

Бокал заздравный поднимая,
Еще раз выпить нам пора
Здоровье миротворца края.
Так много-ж лет ему! Ура!
Мятеж прошел, крамола ляжет,
В Литве и Жмуди мир взойдет;
Тогда и самый враг твой скажет:
Велик твой подвиг... и вздохнет,—
Вздохнет, что, ставши сумасбродом,
Забыв присягу, свой позор,
Затеял з доблестным народом
Поднять давно решенный спор.
Пускай клеймят тебя позором
Лукавый запад и враги:
Ты мощен Руси приговором,
Её ты славу береги.
Нет, не помогут им усилья
Подземных их крамольных сил.
Зри! Над тобой, простерши крылья,
Парит архангел Михаил.

Гэты пэрл творчасьці Некрасава пачынаецца «бокалом», пакрашаецца «крамолай» і «прысягай», а канчаецца «архангелом Михаилом». Далей гэтага, здаецца, ужо няма кудыісьці. І гэта піша сын палячкі. Праўда, паводле некаторых зьвестак магчыма думаць, што вышэйпаданы верш ня ёсьць запраўдны верш, прачытаны Некрасавым вешальніку-Мураўёву. «Московские Ведомости» (ад 20, IV, 1866 г.) вызначаюць, што верш Некрасава канчаўся словамі: «виновных не щади». Апроч таго, і сам Некрасаў казаў у свае часы, што яго застольны верш меў 12, а ня 20 радкоў, як гэта відаць з вышэйпаданага. Але нават К. Чукоўскі, каторы задаўся мэтаю апраўдаць Некрасава, кажа: «Здаецца, што той (запраўдны) верш быў ня лепшы, але яшчэ горшы за гэты (вышэйпаданы), і Некрасаў выявіўся ў ім яшчэ большым здраднікам у адносінах да сваіх пераконаньняў» (К. Чуковский. Поэт и палач. Петербург. 1922, стр. 11).

Наш погляд на Мураўёва даволі просты. Перад намі звычайны чыноўнік-рэакцыянэр мікалаеўскай выпраўкі, каторага скарыстала аляксандраўская «эпоха великих реформ». Назва «вешальнік» вельмі падходзіць да гэтага экс-дзекабрыстага, каторы, каб пагасіць ужо загаслы агонь паўстаньня, павесіў, па скромным падліку Грабеца, 396 чалавек і выслаў у Сібір каля 15.000 людзей. Зразумела, што ў гэтай вакханаліі самаўладзтва пацярпела шмат ні ў чым непавінных людзей. Мураўёўскі рэжым так заблутаў соцыяльнае, нацыянальнае і рэлігійнае пытаньне на Беларусі, што толькі сучасная рэволюцыя змагла падыйсьці да іх і разблутаць.



Пячатка Народ. Ураду.

## Русіфікацыя на Беларусі.

Паўстаньне ў Польшчы і на Беларусі выклікала ў консэрватыўных фэўдальных колах імпэрыі прыліў нацыяналізму. Цэнтрам гэтага рускага нацыяналізму і гура-патрыятызму эрабілася Масква. Што датычыць чыноўных і прыдворных кругоў Пецярбургу, то тут мы бачым яшчэ працяг лібэралізму, што пачаўся з дня царавањня Аляксандра II. Цар і кучка яго інтымных прыяцеляў былі прыхільнікамі лібэральных мерапрыемстваў у адносінах да паўстанцаў. Толькі пад уплывам таго, што паўстаньне разрасталася і пагражала шырокімі пасьледзтвамі, цар згадзіўся на назначэньне ў Вільню Мураўёва, каторага выстаўляла консэрватыўная Масква. «У Пецярбурзе улада графа Мураўёва вісела на валаску. Ён быў заклікан да ўлады хутчэй як нешта няўхільнае, чым пажаданае, падобна таму, як гэта было ў 1812 годзе з Кутузавым». (Л. Тихомиров. Варшава и Вильна в 1863 году. 1897 г. Москва, стр. 6.). Такім спосабам, для рэакцыйных людзей Масквы Мураўёў быў другім Кутузавым, шторатаваў «матушку Россию» ад польскай крамолы, ад «инородческого засилия».

Узмацненьню рускага рэакцыйнага нацыяналізму садзейнічаў той факт, што чужаземныя дзяржавы, пад уплывам польскай белай эміграцыі, выражалі гатоўнасьць стаць на абарону паўстаўшай Польшчы і ўмяшацца ў хатнія справы імпэрыі. Утварылася ультра-руская партыя, каторая вышла з славянафільскіх кругоў. На чале партыі стаяў вядомы рэтроград таго часу, маскоўскі мітрополіт Філарэт. Ідэёвым правадыром і популярызатарам партыі ў прэсе быў Каткоў. У партыю ўваходзілі такія асобы, як І. Аксакаў, Гільфэрдынг, Пагодзін, Леонцьеў і інш. Мураўёў быў як-бы штандарам партыі, каторы яна трымала ў сваіх руках. Партыю падтрымлівалі чыноўніцкія, ваенныя і абываталь-

скія колы, для каторых самаўладная Расійская імпэрыя была смачным кавалкам пірага. Наўкола імя Мураўёва быў учынен вялікі шум, на каторы зьвярнуў увагу нават Герцэн, назваўшы тагочасныя настроі рэакцыйнай прэсы «патриотическим сифилисом», каторы з Масквы пачаў пераходзіць ува ўсе куткі чыноўніцка-дваранскай Расіі. «Як толькі Мураўёў выступіў на барацьбу з паўстаньнем, на яго пасыпалася такая агромністая колькасьць сьпічаў, дэпэш, адрасоў, дэпутацый, малебнаў, урачыстых спатканьняў, аглушаючых выкрыкаў «ура», царкоўных звонаў, букетаў, гірлянд, вэнзалёў, штандараў, плошак, альбомаў, віншавальных лістоў, ікон (асабліва ікон: бясконца вялікіх і маленькіх, залатых і срэбных), што гэтыя штодзенныя пачэсты зрабіліся для яго неабходнасьцю. «Пьем за здоровье и успехи вашего превосходительства! Ура!»—тэлеграфавалі і пісалі яму з Пірацiна, Суражу, Меньзеліжка, усіх расійскіх гарадоў і мястэчак. Хутка ён пачаў адчуваць сябе любімцам Расіі, найпапулярнейшым чалавекам у імпэрыі. «Увага і спачуцьцё Расіі—лепшая для мяне нагарода», заўсёды адказваў ён на гэтыя прывітаньні. «Задушыўшы паўстаньне, ён прыняўся за такую-ж самую лютую русіфікацыю Польшчы... пры чым яго законы аб мірнай русіфікацыі Польшчы аказаліся яшчэ горшымі ад шыбеніц» (К. Чуковский. Поэт и палач. стр. 13). Мы выпісалі гэты вынятак, як даючы вельмі яскравы малюнак тых абставін, пры каторых адбывалася русіфікацыя зямель, што ўваходзілі калісь у склад Рэчы Паспалітай. Апроч таго, вынятак у сваім канцы вызначае правільна пагубнае значэньне для краю русіфікацыі, каторая пашкодзіла нам больш, чым шыбеніцы. Мураўёў-русіфікатар зрабіў больш бяды, чым Мураўёў-вешальнік.

Русіфікацыя стаяла ў беспасрэднай сувязі з ліквідацыяй паўстаньня. Яна павінна была завяршыць ліквідацыю паўстаньня. Трэба было край зрабіць «истинно-русским». Беларус 60-х гадоў лічыў сябе асобным ад вялікаруса: трэба было сілком парадніць яго з ім у імя не яго «мужыцкіх» інтарэсаў, а ў імя інтарэсаў дваранска-царскай Расіі.

Програма русіфікацыі была апрацована ў дакладной запісцы Мураўёва, каторую ён падаў на царскі разгляд 14 траўня 1864 г. Мы ня будзем разглядаць усяго зьместу запіскі, застановімся толькі на агульна-адміністрацыйных мерапрыемствах. Мураўёў тут піша так: «Трэба: 1) зацьвердзіць канчаткова аб паўсямесным уводзе рускай мовы, як гэта цяпер зроблена, з прыпыненьнем карыстаньня польскаю моваю ўва ўсіх офіцыяльных і службовых зносінах, а таксама і ў надворных малюнках усякага роду, асабліва ў мясцох, дзе часта бывае народ; 2) не чакаючы, усе вышэйшыя службовыя пасады па ўсіх ведамствах, а таксама ўсе пасады, маючыя дачыненьне да народу,

замясьціць рускіміураднікамі, а іншыя пасады замяшчаць рускімі паступова; 3) паставіць у строгі абавязак усім міністэрствам выканаць гэтыя мерапрыемствы камандыраваньнем з Расіі ураднікаў, політычна пэўных, і прыпыніць усялякія ў гэтых адносінах спрэчкі паміж сабою, як гэта часта здараецца цяпер з боку некаторых ведамстваў; 4) засяляць край рускім жыхарствам як мага гусьцей. Рабіць гэтае засяленьне, ня ўхіляючы і старавераў, бо яны больш за другіх захоўваюць рускую народнасьць».


Trybunał Rewolucyjny
NACZELNIK MIASTA WILNA

Прыгавор рэволюцыйнага трыбуналу Дамэйку і паведамленьне аб яго выпаўненьні.

Програма русіфікацыі, зьмешчаная ў запісцы, была зацьверджана і прынята да выкананьня. Рэалізацыя програмы стала праводзіцца памураўёўску—шляхам гвалтаў і тэрору.

Калі мы чытаем дакладную запіску Мураўёва, то бачым, што русіфікацыя павінна датычыць палякоў, польскай мовы і наогул польскай культуры, але трэба зазначыць, што фактычна яна найбольш ударыла па беларусу і па беларускай культуры. Паляк на Беларусі быў у пераважнай большасьці земляўласьнікам-шляхціцам, і для яго, з эканомічнымі сродкамі і шырокімі сувязямі, закон быў ня пісан. Дзе хабаром, дзе протэкцыяй, дзе суцяжніцкімі выкрутасамі шляхціц меў магчымасьць вылезьці сухім з вады, тым больш, што рускі урад нік таго часу глядзеў на закон, як сродак нелегальнага заработку. Ня тое было з беларусам, каторы ў сваёй масе быў земляробам ці чорнарабочым, толькі зрэдка падымаючыся да дробна-памеснай, фальварковай шляхты. Яго русіфікацыя зацёрла, прыгняла і пазбавіла ўсякага ходу. Ня было чым адкупіцца ад наскокаў панасыланых з Вялікарусі ураднікаў і ня было каму паскардзіцца. Тое самае было і з культураю. Моцная польская культура, каторая мела на чале шляхецкую інтэлігэнцыю, не баялася мураўёўскай, даволі прымітыўнай русіфікацыі. Беларуская-ж культура, каторую гналі з канца XVII ст. і каторая была прадстаўлена амаль што аднымі сялянамі і чорнарабочымі,

пераіжыла, дзякуючы ўдарам русіфікацыі, цяжкі крызіс і вялікі заняпад. Рускі урад мерыўся ўдарыць па кані, а замест таго ўдарыў па аглоблях.

Што гэта так, мы бачым з разгляду пытаньня аб польскім земляўласьніцтве на Беларусі. Мы ведаем, што Мураўёў задаўся мэтаю зьнішчыць польскае земляўласьніцтва на Беларусі і замяніць яго рускім. Больш 1.500 польскіх маёнткаў было сэквэстравана ў казну. У 1864 і 1865 г. г. былі выдадзены законы, на аснове каторых палякам і яўрэям было забаронена купляць зямлю на Беларусі. Маёнткі, каторыя засталіся ў польскіх руках, былі павінны плаціць 10-проц. збор з іх даходу на надзвычайныя расходы па замірэньні краю, апроч таго, асобны збор на ўтрыманьне збройнай вясковай варты. Рускім урадам падтрымлівалася пакупка прыватнымі асобамі, рускімі і немцамі, сэквэстраваных польскіх маёнткаў, для якой мэты з рускага скарбу было адпушчана 5 мільёнаў рублёў. Шмат конфіскаваных польскіх маёнткаў было дадзена ў нагароду тым рускімураднікам і гэнэралам, каторыя выказалі асобныя заслугі пры ліквідацыі паўстаньня ці пацярпелі ад паўстанцаў. Ня гледзячы на ўсё гэта з польскім земляўласьніцтвам у краі урад так і ня справіўся. Яно засталося пануючым, ня гледзячы на ўсе мерапрыемствы палітычнага і экономічнага характару. Шырака разьвінуўся звычай пакупкі маёнткаў на імя падстаўных асоб, так што ў 1885 годзе трэба было выдаваць асобны закон проці яго. Організоўваліся польскія крэдытовыя таварыствы для земляўласьнікаў і г. д. Перад намі скаргі рускіх дасьледчыкаў (П. Жуковіча, А. Уладзімірава і др.), каторыя сьведчаць а бязьсільлі на Беларусі рускага земляўласьніцтва ў 60-я і 70-я гады. Асабліва плача над гэтым Уладзіміраў. Ён піша: «Рускае культурнае земляўласьніцтва ў краі пацярпела поўнае фіаско. Агромністая большасьць маёнткаў знаходзіцца ў польскіх і яўрэйскіх руках, а ў рускіх толькі нязначная меншасьць і пры гэтым ня з відам прочнай аселасьці і сур'ёзных заняцьцяў вясковаю гаспадаркаю, а з мэтаю спэкуляваньня землямі» (А. П. Владимиров. О русском землевладении в Северо-Западном крае. Москва, 1894, стр. 38). На думку аўтара гэта вельмі смутнае зьяўленьне, бо «Паўночна-Заходні край» (Беларусь) ёсьць адна з найлепшых краін Расійскай дзяржавы. Клімат тут вельмі добры, мяккі і здаровы. Глеба ў многіх мясцох вельмі пладавітая; нават і горшая глеба, дзякуючы вільготнасьці паветра, паўсюды здольна прымаць культуру. Вады многа, рэк, вазёр і лесу многа. На працягу майго жыцьця ў краі, тут ня было ніводнага неўраджаю. Збыт вясковых продуктаў лёгкі—у Пецярбург, Рыгу, Лібаву і ў Прусію. Шляхаў зносін мноства: залезная каляя рэжа край ува ўсе бакі; ёсьць каналы і судаходныя рэкі—Нёман, Дзьвіна, Прыпяць і Дняпро» (Там-жа, гл. стар. 21-22). Калі дадаць сюды шосэйныя шляхі

і добрыя грунтавыя гасьцінцы, то на Беларусі пэўна рай. Адна бяда, на думку аўтара, у гэтым раі ня можа сесьці на карк беларускага селяніна, замест старога прыгоншчыка, польскага пана, новы прыгоншчык, пан «истинно-русского» пахаджэньня.

Дастойным супрацоўнікам Мураўёва па русіфікацыі быў І. П. Карнілаў. У 1864 годзе з пасады памочніка папячыцеля Пецярбурскае вучэбнае вакругі ён, па прадстаўленьню Мураўёва, быў назначан папячыцелем Віленскай вучэбнай акругі, у склад каторае ўваходзіла Беларусь і Літва. Мураўёў, як прадстаўнік адміністрацыйнай улады, забясьпечваў найчасьцей інтарэсы бягучага моманту; Карнілаў, як прадстаўнік рускай навукі і як кіраўнік тагочаснай адукацыі і выхаваньня на Беларусі, павінен быў забясьпечваць будучыну русіфікацыі. Агульныя асноўныя прынцыпы русіфікацыі—праваслаўе, самаўладзтва і руская народнасьць—зрабіліся асноўнымі прынцыпамі і школы. Школа, каторая паступова пападае пад лепшы дагляд і кантроль рускай улады, атручвае гэтымі прынцыпамі беларускую моладзь і гатовіць новых русіфікатараў ужо мясцовага пахаджэньня.

Самаю моцнаю і пэўнаю атрутаю, каторую найбольш карысталіся і на якую найбольш зьвярталі ўвагу русіфікатары-працаўнікі акругі—была праваслаўная рэлігія. І тут яны ішлі звычайным шляхам мураўёўшчыны, каторая тое самае рабіла ў адміністрацыйнай часьці. У васнову выхаваньня і навучаньня ў школе кладзецца праваслаўе, і з ім ужо зьвязваецца, на яго ўжо апіраецца і руская народнасьць: каталік—значыць паляк, праваслаўны—значыць рускі. Такім спосабам, зусім выкасоўваецца беларус; ён лічыцца за паляка, калі ён каталік, і за рускага, калі ён праваслаўны. Школа ўсімі выхаваўчымі сродкамі стараецца прышчапляць вучням нецярпімасьць да другіх вер і нацый, каторых так многа на Беларусі. Вучням прышчапляецца думка, што запраўднай на Беларусі зьяўляецца толькі праваслаўная вера, каторая робіць беларуса праўдзівым рускім чалавекам; апроч таго, яна, змагаючыся з каталіцтвам, каторае спуталася з паўстаньнем і паўстанцамі, робіць беларуса шчырым прыхільнікам рускага самаўладзтва. Тую ролю, якая была ўскладзена вучэбнай акругай на праваслаўную рэлігію ў школе, добра вызначыў сам Карнілаў у сваёй гадавой справаздачы за 1868 год. Ён там піша так: «Калі наогул вельмі важна, каб праваслаўная моладзь выхоўвалася ў пачуцьцях павагі і прыхільнасьці да правіл сваёй веры, то ў Заходнім Краі, дзе праваслаўная царква так доўга была прыніжана і прыгнечана і дзе праваслаўная барацьба з лацінствам яшчэ ня скончана, такое запатрабаваньне робіцца прадметам важнай канечнасьці. Праваслаўная царква зьяўляецца тут адвечным абаронцам рускага духу, надзейнаю апораю проці дамаганьняў лацінства і полёнізму і моцным зьвяном, каторае зьвязвае край з цэнтральнай

Расіяй». Выходзіць, што беларускую моладзь затым трэба выхоўваць у правілах праваслаўнае царквы, што ў гэтай царкве «русский дух и Русью пахнет», што яна зьвязвае з рускім цэнтрам і што яна ўрэшце вучыць змагацца з каталіцызмам і полёнізмам.

У сувязі з вышэйсказаным, галоўным кіраўніком рускай праваслаўнай школы на Беларусі павінен быць праваслаўны сьвяшчэньнік. Што датычыць да настаўніка, хоць ён іграе і другую ролю, тым ня менш і ён павінен быць ня толькі праваслаўным, але й рускім. Настаўнікі-палякі выганяюцца са школ; разам з імі выганяюцца і настаўнікі-беларусы каталіцкага вызнаньня, бо яны, як каталікі, лічацца за палякоў. Бяруцца пад сумненьне і праваслаўныя беларусы, як мясцовы элемэнт, праваслаўе каторага вельмі часта вышла з вуніяцтва. Сьвяшчэньніку, калі ён беспасрэдна не зьяўляецца загадчыкам і настаўнікам школы, даецца права быць наглядчыкам за школаю. Апроч таго, у кожным выпадку, ён павінен навучаць правілам веры і сьвяшчэннай гісторыі, каторыя прызнаны асноўнымі прадметамі школы. Як у сярэднія вякі у Заходняй Эўропе, усе іншыя навукі былі пастаўлены ў службовую залежнасьць ад веры. Адказным за «дух» школы зьяўляецца сьвяшчэньнік; ён даглядае за палітычнай пэўнасьцю настаўніка ў адносінах да праваслаўя, самаўладзтва і рускай народнасьці. Доля настаўніка пры такіх умовах жыцьця знаходзіцца ў руках яго духоўнага айца. Нават зусім пэўны ў палітычных адносінах настаўнік можа згубіць месца, мець іншыя няпрыемнасьці, нават папасьці пад нагляд паліцыі, кал ён асабіста не спадабаўся духоўнаму айцу. Асабліва, напр., пацярпелі проста безгалосыя настаўнікі толькі за тое, што не маглі самі сьпяваць на крыласе і вучыць гэтаму вучняў, ці проста басам чытаць на набажэнстве «апостала».

Пры такой пастаноўцы выхаваньня і навучаньня моладзі мясцовых праваслаўных сьвяшчэньнікаў і настаўнікаў не хапала. Тым больш, што тыя з іх, каторыя раней былі вуніятамі, былі ўзяты пад падазронасьць і лічыліся неадпаведнымі для русіфікацыі. Тады пачынаюць выклікаць сьвяшчэньнікаў і настаўнікаў з цэнтральнай Расіі. Зразумела, што за «так-сабе» ніхто ня кіне наседжанага месца,—тым больш, што трэба ехаць у край, каторы нашумеў паўстаньнем. Прышлося вабіць русіфікатараў на Беларусь экономічнымі выгодамі. Для гэтай мэты былі асыгнаваны грошы, каб да звычайнай пэнсыі русіфікатараў дадаваць нейкую спэцыяльную суму «за обрусение края». Дзякуючы гэтаму дадатку, пэнсія для асоб, што прыяжджалі на Беларусь для русіфікацыі, павялічваецца ў $1\frac{1}{2}$ разы. Падарожныя грошы асобам, выкліканым на Беларусь з Расіі, павялічаны, параўнальна з звычайнымі падарожнымі, у два разы. Калі прыняць пад увагу дальнасьць пераездаў. то ясна, што яны складалі даволі прыкметную велічыню. Апроч таго,

каб прыехаўшы з Расіі «культуртрегер» мог лепш абсесьціся на новым месцы, яму выдавалася, без залічэньня на рахунак, паўгадовая пэнсія. Разам з сьвяшчэньнікамі і настаўнікамі выклікаюцца з устаноў цэнтральнай Расіі і ўраднікі як на вышэйшыя, так і на звычайныя пасады. Беларусь сьпешна нагружаецца вялікарускімі бюрократамі ўсіх рангаў і тыпаў, каторыя ў большасьці зьяўляюцца адбросамі Расіі.

Не здавальняючыся афіцыяльнымі запрашэньнямі ўлады, Карнілаў піша прыватныя лісты да архірэяў, грамадзкіх і навуковых дзеячоў Расіі, каб яны па сваёй добрай ахвоце агітавалі і пропагандавалі сярод вучнёўскай моладзі наконт яе прыезду на Беларусь і ў Польшчу. Друкуюцца адпаведныя абвесткі ў мясцовых і расійскіх газэтах. На рускіх пісьменьнікаў і дзеячоў правага лягеру, асабліва на славянафілаў, гэтыя прызывы зрабілі ўражаньне. Яны пачынаюць прапаведваць «крыжовы паход» на «заходнія вобласьці» Расіі ў імя русіфікацыі гэтых краін. Вось перад намі артыкул І. Аксакава пад назваю «Что такое полонизм?», зьмешчаны ў газэце «День». Там мы чытаем такое месца: «У газэтах бесьперастанку друкуецца пропозыцыя ад ураду да рускіх з вялікарускіх губэрань, каб яны занялі пасады міравых пасрэднікаў і некаторыя іншыя ў нашых заходніх вобласьцях. Няхай-жа чэсная адукаваная моладзь, скончыўшы навуку ў унівэрсытэце, пакіруецца ў Заходні край з сваімі сьвежымі, бадзёрымі сіламі і зьявіцца там місыёнэрамі рускай народнасьці» (С. Шолкович. Сборник статей, раз'ясняющих польское дело в Зап. России. Вильна. 1885 г. Вып. 2, стр. 337). «Крыжовы паход» на Беларусь адбыўся. Трэба толькі сказаць, што ў ім прыняла удзел ня столькі «чэсная», колькі кар'ерыстычна-настроеная моладзь.

Каб павялічыць лік настаўнікаў, каторыя-б адпавядалі урадавай політыцы як на акраінах, так і ў цэнтры, у 1864 годзе было прынята «палажэньне аб настаўніцкіх сэмінарыях». У гэтым-жа годзе ў Маладзечне закладаецца першая наагул у Расіі настаўніцкая сэмінарыя. Статут сэмінарыі прасякнуты звычайнымі для таго часу прынцыпамі— праваслаўя, самаўладзтва і рускай народнасьці. Былі падабраны адпаведныя духу уставу пэдагогі, найбольш з скончыўшых духоўныя школы. Сэмінарыі адпушчаюць сродкі для вучнёўскіх стыпэндый, каб прыцягнуць да навукі бедных мясцовых юнакоў, замацаваць іх за школай і перарабіць на працягу 3-4 год «в истинно-русских людей». І трэба зазначыць, што сэмінарыі з пасьпехам выконвалі ўскладзенае на іх рускім урадам заданьне. Яны тварылі і выпускалі ў сьвет новую, вышаўшую найчасьцей з сялянства інтэлігэнцыю, каторая адрывалася ад працоўных беларускіх мас і прыставала да тэй інтэлігэнцыі і бюрократыі, каторая была выклікана з Вялікарусі. На першым месцы сэмінарскае програмы стаяў «закон божы». Рэдкая сэмінарыя ня мела сва-

ёй уласнай дамовай царквы, каб рабіць на сваіх выхаванцаў рэлігійны праваслаўны ўплыў. У сэмінарыях вучылася руская патрыотычна-самаўладная гісторыя і літаратура, прыродныя навукі «у згодзе са сьвятым пісаньнем», пэдагогіка і г. д. Вучням прышчэпліваліся ідэі вялікарускай вялікадзяржаўнасьці і шовінізму, культываваўся погляд на нярускіх, як на інародцаў, асабліва цьвіло юдафобства. Матчыная беларуская мова вучняў была абвешчана някультурнай мужыцкай мовай, каторую трэба выганяць з ужытку. Ішлі заўсёдныя сыстэматычныя зьдзекі над мовай, манерамі і вопраткай вучняў. Яны, закупленыя скарбовай стыпэндыяй, усё цярпелі, каб ня быць выкінутымі на вуліцу, паступова здаваліся і перарабляліся на новы капыл.

Праз дзесяць год (1872 г.), адначасна з палажэньнем аб гарадзкіх вучылішчах, утвараюцца як-бы вышэйшыя настаўніцкія сэмінарыі пад назваю настаўніцкіх інстытутаў, для падгатоўкі настаўнікаў гарадзкіх вучылішч. Курс навучаньня трохгадовы. Для Віленскае акругі засноўваюцца ў Вільні два інстытуты: раней хрысьціянскі для праваслаўных і потым яўрэйскі. Па духу гэта—тыя самыя сэмінарыі, толькі павышанага тыпу. З інстытутаў выходзілі больш кваліфікаваныя і больш заўзятыя русіфікатары.

Для ўсіх школ прысылаюцца з Расіі новыя падручнікі адпаведнага характару. Пры школах утвараюцца бібліотэкі, складзеныя з кніжак таго-ж самага кірунку. Пры некаторых вясковых школах гэтыя бібліотэкі прыстасованы для абслужваньня ня толькі вучняў, але й наогул жыхарства. У бібліотэках быў вялікі аддзел кніг рэлігійна-патрыотычных. Перад кожнай лекцыяй і перад усімі наогул раніцай уводзіцца чытаньне праваслаўных малітваў, ня гледзячы на тое, што і вучні і настаўнікі належалі да другіх мясцовых вер. Школа перарабляецца як-бы ў «воінствуючы аддзел царквы». «Каб школа зрабілася рускай, яна павінна была перабудавацца ў свайго роду «ecclesia militans» ня толькі з характару абароны, але й наступу. З гэтаю мэтаю ўжо граф Увараў (прадмесьнік Карнілава) ускладаў на рускіх настаўнікаў у школах Паўночна-Заходняга краю абавязак ня толькі абаронцаў, але й місыянэраў праваслаўя, самаўладзтва і рускай народнасьці» (А. И. Миловидов. Памяти И. П. Корнилова, 1911 г., стр. 16). Такім спосабам, пасілкамі Карнілава і яго супрацоўнікаў на Беларусі ўтвараецца школа ваяўніцкага рэтроградзтва, школа чужая для побыту і шкадлівая для інтарэсаў працоўных мас нашага краю.

Урадаваю моваю на Беларусі абвяшчаецца выключна руская мова. Раней на працягу соцень год працоўныя нізы краю ламаліся пад польскую мову й культуру, цяпер яны ламаюцца ў другі бок,—пад рускую мову й культуру. Зразумела, што і тут найбольш пацярпела сялянская і рабочая беларуская частка насельніцтва краю. Заможнай поль-

скай, беларускай шляхце, каторая магла наняць для сваіх дзяцей настаўнікаў і мела грошы, каб аддаць дзяцей у рускія школы, нішто не перашкаджала навучыцца рускай мове. Разам з беларускай беднатой, пацярпела і польская бедната краю, бо яна таксама ня мела сродкаў, каб наўчыцца рускай мове.

У 1867 годзе выдаецца спэцыяльны загад, на аснове каторага забараняецца друкаваць кніжкі ў беларускай мове. Трудна разабраць, якія меркаваньні кіравалі політычным розумам рускай бюрократыі, калі яна выдавала гэты загад. У часы паўстаньня выдавалася проціўрадавая літаратура ў беларускай мове. Але ў беларускай мове друкавалася літаратура і проціпаўстаньніцкая. Апроч таго, мы ведаем, што проціўрадавая літаратура друкавалася і ў другіх мовах, у тым ліку ў польскай і рускай мовах. Тады, выходзіць, трэба было-б забараніць друк у польскай і рускай мовах. Калі ўжо быць лёгічным і карыстацца спробаю паўстаньня, то урад павінен быў-бы разьвінуць шырока афіцыяльна патрыотычнае выдавецтва ў беларускай мове, г. зн. паступіць якраз наадварот таму, як паступіў ён, забараніўшы зусім друк у беларускай мове. Так ці йначай, але вынікі ад загаду былі вельмі шкадлівыя для Беларусі. Беларускае слова на некалькі дзесяткаў год, аж да часоў рэволюцыі 1905 году, было заціснута ў вузкія рамкі рукапісу. А калі часам яно абманнымі спосабамі пападала ў друк, то гэта былі толькі вельмі рэдкія здарэньні.

Што да вялікарускага грамадзянства, то там, пры дапамозе афіцыяльнай прэсы, упарта пашыраецца погляд, што Беларусь ёсьць край «искони русский», прычым слова «русский» разумеецца ў вузкім сэнсе— вялікарускі. Паводле гэтай тэорыі, беларусы нічым ня розьняцца ад вялікарусаў і ня маюць ніякіх бытавых і культурных асаблівасьцяй. Ідзе націск на беларусаў-католікаў, каб іх зрабіць праваслаўнымі, бо калі яны будуць каталікамі, то пераробяцца на палякаў, а калі стануць праваслаўнымі, то зноў зробяцца «искони русскими людьми». На захадзе імпэрыі ўтварылася атрутная атмосфэра барацьбы польскага і рускага нацыяналізму, праваслаўнага і каталіцкага клерыкалізму. У гэтую атмосфэру папала Беларусь з яе рознанацыянальным і рознарэлігійным насяленьнем. Вынікі былі дрэнныя. Край атручваўся нацыянальнай і рэлігійнай атрутаю. Нацыянальныя меншасьці прыгняталіся і глыбока хварэлі нацыянальна-рэлігійнаю хваробаю, паратунак ад каторай дала толькі сучасная нам соцыяльная рэволюцыя.

## Беларускі рух у 50-х, 60-х і 70-х гадох.

Вырасшы на экономічным і разам з тым на політычным грунце ў канцы першай і пачатку другой чвэрці XIX-га ст., беларускі рух пераходзіць і ў трэцюю чвэрць сталецьця, апіраючыся на ранейшыя

падставы. Ён узмацняецца, як рух опозыцыйны ў адносінах да русіфікацыі на Беларусі. Беларускі рух, як і сучасны яму грамадзянскі рух у Расіі, ахварбоўваецца ў лібэралізм, каторы адзначае сабою прыбліжэньне эпохі прамысловага капіталізму. Лібэралізм у такіх земляробскіх краінах, як Расія і Беларусь, выяўляецца ў свайго роду сантымэнтальным народалюб'і, каторае бярэ пад сваю, праўда нямоцную, апеку селяніна і становіцца ў опозыцыю прыгоньніцкаму гвалту над асобай селяніна. Само сабою зразумела, што гэта лібэральная опозыцыя—вельмі далікатная і зусім бясьпечная для прыгоннага строю, бо опозыцыянэры па сваім пахаджэньні і соцыяльных поглядах зьяўляюцца шляхціцамі. Мы ведаем, што на Беларусі прамысловы капіталізм прасякае ў шляхецкі быт даволі рана і ў 50-ыя і 60 годы разьвіваецца ўсё глыбей і шырэй; у сувязі з гэтым расьце і лібэралізм у шляхецкіх колах. Лібэралы-шляхціцы на Беларусі пачынаюць усё больш і больш разумець нявыгоднасьць для самых паноў тых гвалтаў і надужыцьцяў прыгону, каторыя яны бачаць наўкола. У лібэральных шляхецкіх колах на Беларусі зьяўляецца адпаведная літаратура, каторая хоча абараніць запрыгоненага селяніна. Яна хоча даказаць прыгоньніку-пану, што ня трэба рабіць уціску і зьдзеку над селянінам, каторы на яго працуе. Таксама, як калісь рускі пісьменьнік Карамзін, беларускія пісьменьнікі гэтага кірунку стараюцца пераканаць паноў, што «и крестьянки чувствовать умеют», што сяляне такія самыя людзі, як і паны. Зразумела, што гэтая сантымэнтальна-народніцкая літаратура вытвараецца ў беларускай мове, бо яна ня толькі апісвае быт селяніна, але хоча сама сайсьці ў народныя нізы і там знайсьці чытача яе твораў.



Палац і бібліотэка Храбтовіча ў Шчорсах над Нёмнам у Наваградчыне.

Пан на Беларусі ў сваёй масе—паляк, прыгнятальная політычная ўлада—расійская. Спачуваючы селяніну-беларусу прадстаўнікі руху становяцца ў опозыцыю паляку і рускаму. Беларускасьць, такім спосабам, становіцца ў сувязь з соцыяльнымі, сялянскімі сымпатыямі прадстаўнікоў руху. Беларускасьць руху зьвязана з яго народніцтвам. Выходзячы найчасьцей з беларускай дробнай шляхты, прадстаўнікі беларускага руху знаходзяцца ў меншай опозыцыі да польскасьці, чым

да русіфікатарства і царызму. Прычына гэтага зьяўленьня крыецца ў тым, што яны, як шляхціцы, зьвязаны з польскай шляхтай, каторая ў бягучы момант настроена опозыцыйна ў політычным сэнсе, гатуецца да паўстаньня 1863 году і, як мы ведаем, робіць яго.

Тыповым прадстаўніком беларускага руху гэтых часоў (50-ыя, 60-ыя і 70-ыя годы) зьяўляецца беларускі пісьменьнік Вінцук Дунін-Марцінкевіч (1807—1884). Яго бацька—дробны шляхціц, каторы сваёй зямлі ўжо ня мае, а займаецца арэндаю чужых маёнткаў. Пясьняр радзіўся ў Бабруйшчыне (фальв. Панюшкевічы), вучыўся раней у Бабруйску, потым у Вільні. За вышэйшай навукай Марцінкевіч паехаў у Пецярбург, дзе пачаў вучыць мэдыцыну, але хутка яе кінуў. З 1827 да 1840 году ён жыве бязвыезна ў Менску, служачы то ў духоўнай каталіцкай консысторыі, то ў судовых установах. У 1840 г. яму ўдалося купіць пад Менскам невялікі фольварак Люцынку, дзе ён і пражыў да канца сваіх дзён. Найбольшы лік твораў Марцінкевіча прыпадае на 50-ыя годы, але ён піша і пазьней у 60-ыя і нават у 70-ыя годы. Гэта—пладавіты аўтар, і звычайна лічыцца першым запраўдным беларускім песьняром.

Калі мы ўглядаемся ў творы Марцінкевіча, то адразу бачым, што перад намі—пясьняр-народнік, у тым сэнсе, як вызначана вышэй. Об'ектам яго творчасьці зьяўляецца просты беларускі люд і наагул вёска. Пасвойму ён любіць беларускага селяніна, добра ведае яго побыт, гора і радасьці і шчыра жадае паляпшэньня цяжкай долі яго. Аўтар сам кажа, што лічыць сябе дударом простага народу, што будзе пісаць папросту, пабеларуску, каб беларускі селянін ахватней чытаў і каб ахватней аддаваў сваіх дзетак да асьветы. Пры перакладзе «Пана Тадэуша» Міцкевіча на беларускую мову, Марцінкевіч у прадмове да перакладу гаворыць, што ён як-бы апрануў пана Тадэуша ў мужыцкую сярмягу, каб пусьціць яго ў нізы народныя, каб зрабіць яго больш зразумелым для беларускага селяніна. Там-жа ў прадмове далей ён гаворыць аб сабе, што апошнія мінуты свайго жыцьця ён хоча аддаць на карысьць беларускага простага народу.

Зразумела, што погляды Дуніна-Марцінкевіча на народ «просты», на сялянскае пытаньне—шляхецкія. Як шляхціц, ён ня можа спусьціцца ўва ўсю глыбіню яго. Ён пераконаны, што паміж прыгоньнікам-панам, з аднаго боку, і запрыгоненым бяспраўным селянінам, з другога боку, соцыяльнай прорвы няма. Ёсьць толькі яма, каторую магчыма запоўніць без соцыяльнай ломкі, аднымі моральнымі сродкамі. Трэба толькі, каб пан шанаваў селяніна, добра, палюдзку адносіўся да яго і клапаціўся аб яго дабрабыце. Селянін у вадказ на такія да яго адносіны павінен, на думку Марцінкевіча, «хваліць толькі бога, шчыра працаваці, любіць добрых паноў, маўляў, родных брацьцяў».

А калі пан нядобры, калі ён зьдзекуецца над селянінам, то трэба цярпець, бо праўда сама сябе скажа. Што датычыць да прыгоннай залежнасьці, то яна ня ёсьць цяжкая хвароба часу, а нормальны социяльны уклад жыцьця, у рамках каторага будуецца ўся экономічная і грамадзянская структура. Селянін ня толькі можа, але і павінен жыць у рамках гэтага ўкладу, не ламаючы іх. Марцінкевіч, як народнік, ёсьць выразны ўтопісты. Аўтар пераконаны ў тым, што злых паноў-прыгоншчыкаў магчыма перарабіць на добрых апякуноў над сялянамі шляхам моральных сэнтэнцый. Дзеля гэтага ў сваіх творах ён прагнецца зрабіць уплыў на паноў, каб усе яны былі ідэальнымі, добрымі панамі.



В. Д. Марцінкевіч.

Ідэальны пан, на яго погляд, заўсёды кіруе сваім маёнткам сам, седзячы ў ім, як гаспадар. Ён апякуецца над падуладнымі яму сялянамі, не абцяжае іх лішняю працаю, час-ад-часу робіць для іх пачастункі, без пагарды сам ходзіць да іх на вячоркі. Адным словам, гэта—патрыярхальны пан-народнік, якім быў і сам Дунін-Марцінкевіч. Такі пан ніколі не павінен садзіць у свой маёнтак староньняга кіраўнічага, рандатара ці аканома, адным словам, падпанка. Найчасьцей у творах Марцінкевіча перад намі выступаюць такія падсалоджаныя і падмалёваныя паны. Яны зьяўляюцца запраўднымі бацькамі, шчырымі

і ласкавымі дабрадзеямі сваіх сялян. Сяляне за гэта любяць і шануюць такіх паноў, як сваіх родных бацькоў. Усё зло, лічыць аўтар, у падпанках. Яны, карыстаючы з таго, што пана няма ў маёнтку, ці пан занадта даверыўся ім, зьяўляюцца штодзеннымі злыднямі для селяніна. Калі-б ня гэтыя злыдні-падпанкі—рандатары, аканомы і г. д.,—каторыя крыўдзяць, зьдзекуюцца і дзяруць з селяніна апошнюю скуру, то на Беларусі быў-бы патрыярхальны рай.

Часам Марцінкевіч асьмельваецца патрабаваць ад паноў, каб яны ня толькі ў імя карысьці сялянства, але й для сваёй карысьці зьвярнулі ўвагу на селяніна, на яго працу і цяжкую долю, бо селянін ёсьць экономічная апора ладу, ён сваёю працаю корміць і пана, і другія станы грамадзянства. А ў адным з вершаў («Вясна, голад, перапала»...) аўтар дашоў нават да такой сьмеласьці, што загаварыў аб волі для прыгнечанага селяніна. У гэтым вершы селянін кажа, што «вось нам вольнасьць дадуць скора, і, як птушкі, будзем жыць». Вольнасьць Марцінкевіч разумее вельмі прымітыўна. Селянін у яго вершы так вызначае вольнасьць: «Будзем роўныя з панамі, самі будзем мы паны—і гарэлку піць збанамі і гуляць так, як яны». Праўда, далей аўтар глыбей падходзіць да справы і кажа: «Перастануць нашым братам (селянінам), як скацінай, таргаваць; напускацца ліхім матам, скуру з ног да карку драць. Хоць халодна, хоць галодна—холад, голад ніпачом! Эх, каб толькі нам свабодна! На свабодзе аджывём». Палажэньне пана пры волі будзе дрэннае, і селянін вуснамі Марцінкевіча так кпіць над панам, згубіўшым дармовую працу свайго былога раба: «Вось паном ня дужа лоўка: самым трэба працаваць! Пабаліць ня раз галоўка, калі прыдзецца араць! Не адзін-то папацеець і заскача драпака—бо сам толькі есьць умеець ды драць скуру з мужыка». Без селяніна і ў далейшыя часы пан не абойдзецца, але ён павінен будзе падходзіць да селяніна не старымі сродкамі—«пугай ды дубінай», а зусім пановаму: «Мужык будзе не скацінай, ня раз скажа пан з паноў: пане Грышка, пане Міна! Як-жа васпан, ці здароў».

Цікава тое, што наагул рахманае і далікатнае народніцтва Дуніна-Марцінкевіча спатыкае опозыцыю ў шляхецкіх колах. Нават такі прогрэсыўны пясьняр, як У. Сыракомля, папаў у лік опозыцыянэраў. Яму, напрыклад, не спадабалася, што адзін з гэрояў Марцінкевіча—Гапон, катораму ўдалося выбіцца з сялян у афіцэры, робіць помсту мучыцелю сялян і свайму ворагу аканому. «Сыракомля заўважыў яму (Марцінкевічу), што ў апавяданьні няма эстэтычнага погляду арысты, ёсьць няхват заслоны, якая прыкрыла-бы надта жорсткую нагату самае праўды. Сыракомля ня мог згадзіцца з тым, што Гапон памшчаецца ворагу-аканому» (М. Гарэцкі. Гісторыя беларускае літаратуры. Вільня, 1920, стар. 81).

Спаткаў опозыцыю і той факт, што Марцінкевіч, як народнік, піша свае творы ў беларускай мове, каторая зьяўляецца мовай простага народу. Аб гэтай опозыцыі гаворыць сам Марцінкевіч у прадмове да



Л. Кандратовіч (Сыракомля).

свайго перакладу Пана Тадэуша: «Чаму-ж, думаю, наш народ просты, што з гэтымі панамі так блізка жыў, чаму-ж дробная акалічная шляхта, што, жывучы ў лясным зацішку, у хаце між сабою сваёй роднай ужывае мовы,—чаму-ж яна ня мае пазнаць абычаяў сваіх бацькоў. Вось гэта ўсё і нагнала мне думку пералажыць пана Тадэуша на беларускую мову. Праца мая ў гэтай мове, што мела заахвоціць нашага бела-

рускага мужыка і бедную шляхту да навукі, ня сустрэла прыяцеляў сярод багатых людзей нашае старонкі». Выходзіць так, што вялікія земляўласьнікі Беларусі няпрыхільна спаткалі народніцкія творы Марцінкевіча, каторыя ён напісаў у простай «мужыцкай» беларускай мове. Можа ім не спадабалася моральная сэнтэнцыя аўтара, можа не спадабалася мова, а можа і тое і другое разам.

Спаткаўшы з гэтага боку няпрыхільнасьць, Марцінкевіч зьвярнуўся да другіх кругоў грамадзянства. Ён пачаў шукаць падтрыманьня з боку беднага беларускага люду, прычым і дробную шляхту, і інтэлігэнцыю таго часу ён таксама прылучае да гэтага беднага, простага люду. «І вось я сягоньня ахфярую «Пана Тадэуша», прыбранага ў мужыцкую сярмягу, паном і простаму народу з-пад Дняпра, Дзьвіны, Бярэзіны, Сьвіслачы, Віліі і Нёмна. Можа народ той просты, што з маткай прыродай блізка жывець, прымець гэты гасьцінец ад свайго дудара, што апошнія мінуты свайго жыцьця на карысьць народу аддаець» (Прадмова да «Пана Тадэуша»). Трэба зазначыць, што селянін ня прыняў гасьцінца ад дудара, бо быў цёмны і няпісьменны, але гасьцінец прыняла з падзякай група тагочаснай беларускай інтэлігэнцыі, да каторай адносяцца Каратынскі, Вярыга-Дарэўскі і др.

У 1863 годзе разгараецца ў Польшчы і на Беларусі вядомае нам паўстаньне. У сувязі з ім, беларускі рух узмацняецца і разьвіваецца далей. Як паўстанцы, так і некаторыя з прадстаўнікоў рускіх інтарэсаў, таксама, як і ў часы паўстаньня 1831 г., з экономічных, а разам з тым і з політычных прычын павінны бліжэй падыйсьці да беларускіх працоўных мас і закрануць глыбей беларускае пытаньне. Асабліва зацікаўлен беларускім пытаньнем паўстанец як у Польшчы, так і на Беларусі, бо ад беларускага пытаньня залежыць посьпех паўстаньня. Паўстанцы прымаюць меры, каб залучыць у свае рады беларускага селяніна. Зразумела, што чырвоны паўстанец падыходзіць да селяніна найбліжэй і найшчырэй, нясучы яму лёзунгі зямлі і волі і ствараючы ідэал Беларусі, незалежнай ад Польшчы і Расіі.

Зьяўляецца даволі вялікая паўстанцкая літаратура ў беларускай мове, каторая заклікае селяніна, каб ён прыняў удзел у паўстаньні. Літаратура выдавалася як заграніцай, так і ў патаемных друкарнях Польшчы і Беларусі. Нам вядомы, напрыклад, патаемныя друкарні ў Беластоку, Вільні й Горадні. Вышлі з друку 8 нумароў падпольнага часопісу «Мужыцкая праўда», у каторым амаль што выключна працаваў вядомы беларускі рэволюцыянэр-народнік Кастусь Каліноўскі, што падпісваўся псэўдонімам «Яська—гаспадар з-пад Вільні». Апроч таго, вядомы: «Гутарка старога дзеда»—Вінцуся Каратынскага, «Перадсьмертны разгавор пустэльніка Пятра, каторы жыў у пушчы 90 год

і памёр, маючы 140 год»—невядомага аўтара, «Крыўда і праўда»—беларуская гутарка Ф. Пчыцкага і г. д.

Усе творы белых паўстанцаў прасякнуты польскім патрыотызмам. Беларусі і беларуса, асобных ад Польшчы і паляка, няма і не павінна быць. Беларускі селянін па адозвах павінен злучыцца з польскім паўстанцам, каб прагнаць маскаля, каторы захапіў як Беларускі край, так і Польшчу. З маскалём беларусу прыдзецца «прапасьць навек», «з маскалём добра ня будзе», уся бяда ў маскалі. Калі селяніна хто запытае аб яго пажаданьнях, то ён павінен адказаць, што ён хоча, каб зноў утварылася Польшча. «Так помніце-ж, што сказаці, як у вас будуць пытаці: крыкнем усе ў адно слова—няхай Польшча будзе знова» («Гутарка старога дзеда»).

На кожным кроку ў адозвах мы спатыкаемся з ідэалізацыяй старой Рэчы Паспалітай. Па адозвах выходзіць, што Польшча ўвесь час клапацілася аб тым, каб палепшыць долю беларускага селяніна. Пустэльнік Пятро апавядае кароткую гісторыю Польшчы, дзе ружоваю хварбаю малюе сялянскі дабрабыт. Аб цёмных баках старога польскага жыцьця (напрыклад, аб прыгоне) не гаворыцца ані слова. Зусім забыты факт сялянскіх паўстаньняў у Польшчы, вядомых у гісторыі пад назваю казацкіх; забыты крывавыя расправы з паўстанцамі-сялянамі і г. д. Цікава, што нават бесьперастанныя войны старой Рэчы Паспалітай з Маскоўскім гаспадарствам і Расійскай імпэрыяй матывуюцца зусім нечакана для нас тым, што Польшча змагалася з Расіяй за вызваленьне сялян. Польшча хацела даць свабоду сялянам, а маскаль перашкаджаў—вось з-за гэтага і ваявалі. «Эй, скажыце, добры людзі, што ужо на сьвеце будзе? Чы так бог судзіў з намі, прапасьць навек з маскалямі? Ой, не, браткі, ня тужыце, на ту пору ўспамяніце, як прад даўнымі гадамі біўся паляк з маскалямі. За што-ж яны ваявалі? Столькі крыві разьлівалі? Ой, за тое, што народу паляк хацеў даць свабоду» («Гутарка старога дзеда»). Калі беларускі селянін быў пад уладай Польшчы, то, нават, поле яго больш давала, бо «пан бог даваў уроду». Зусім адваротнае зрабілася, калі Беларусь пасьля падзелаў Польшчы папала ў склад тэрыторыі Расіі. На яе абрушыліся тады ўсялякія беды. Цяпер «за праклятым маскалём няма шчасьця ні ў чом» («Крыўда і праўда»).

Зразумела, што такі падход да беларускага селяніна ня мог зрабіць на яго таго ўплыву, які быў патрэбен паўстанцам. Што датычыць да ідэалізацыі старажытнай Рэчы Паспалітай, то яна была сшыта белымі ніткамі. Хоць селянін быў няпісьменны й нявучоны, але ён ад бацькоў сваіх добра ведаў, як добра жылося ім у хвалёнай Польшчы. Селяніну была патрэбна ня панская Польшча, і ня царская Расія, а проста зямля і вольнасьць ад пана.

Што да социяльнай часткі адозваў, выпушчаных белымі паўстанцамі, то яна амаль што зусім адсутнічае. Зацьвярджаць у вадозвах стары прыгонны строй ня было сэнсу, абяцаць новы лад, які-бы здаволіў селяніна, белыя не маглі, бо яны былі белыя. Адозвы ці зусім абходзяць бокам пытаньне аб зямлі і вольнасьці для сялянства, ці кідаюць як-бы ненарокам нейкія пустыя словы аб свабодзе, роўнасьці і г. д. З «Гутаркі старога дзеда» мы даведваемся, што калісь «народу паляк хацеў даць свабоду», але, бачыце, маскаль перашкодзіў яму рэалізаваць яго пажаданьні. Праўда, у канцы «Гутаркі» мы чытаем, што беларускія сяляне будуць «роўныя з панамі», калі зробяцца грамадзянамі адноўленай Польшчы. Што гэта за роўнасьць? У чым яна выявіцца? Можа і ў тым, што пан і селянін будуць дыхаць адным паветрам, а потым абодва разам памруць. Часам адозвы забываюцца, што яны напісаны для сялянства. У іх высоўваецца ўперад добра вядомая беларускаму селяніну і ненавісная яму польская шляхта. Яна малюецца, як абаронец беларускага сялянства, пакрыўджанага маскалямі. «Ай-да шляхта, малайцы! Паны былі, як айцы!» («Крыўда і праўда»). Зразумела, што такімі социяльнымі поглядамі і лёзунгамі белыя паўстанцы не маглі прыцягнуць да сябе селяніна, каторы на сваім карку добра даведаўся аб айцоўскай ласцы польскага пана да яго, селяніна.

Да ўсяго вышэйпаданага трэба далучыць клерыкальны кірунак белых адозваў. На кожным кроку мы спатыкаемся тут з богам, з каталіцтвам, вуніяй, праваслаўем, страшным судом божым, божай воляй і г. д. Трэба вызначыць, што гэтая атрута ўпівалася ў мазгі беларускага жыхарства і рабіла свой уплыў. Ксёндз у паўстаньні быў выдатнай асобай, каталіцкая царква была яго цэмантам. Ня дарма потым русіфікацыя павінна была апірацца на праваслаўе і вымагала ад яго, каб яно было ваяўнічым.

Адным словам, калі ўчытвацца ў белыя адозвы і творы паўстаньня, то відаць, што ідэолёгічна яны вялі барацьбу з трыма кітамі, на каторых апіраўся царызм пры русіфікацыі Беларусі й Польшчы. Гэтымі трыма кітамі царскага рэжыму і русіфікацыі былі вядомыя нам дэвізы—праваслаўе, самаўладзтва і руская народнасьць. Паўстанец белага лягеру проці гэтых дэвізаў высоўваў свае дэвізы—каталіцтва, панская Рэч Паспалітая і польская народнасьць. Зразумела, што ні тыя, ні другія дэвізы для Беларусі не падыходзілі. Дзьве стараны навязвалі беларускаму селяніну свае сьветапагляды і інтарэсы, даказваючы яму, што гэта яго сьветапагляды і інтарэсы.

Літаратура чырвоных паўстанцаў прадстаўлена нумарамі «Мужыцкай праўды» і лістамі Каліноўскага. Больш матар'ялаў мы пад рукамі ня маем. У сваіх адозвах-часопісах чырвоныя клічуць беларус-

кага селяніна да сябе. Трэба дабіцца лепшай долі, а для гэтага трэба прагнаць маскаля з беларускага краю і атрымаць «праўдзівую вольнасьць». Праўдзівая вольнасьць чырвоных не падобна ні на вольнасьць белых паўстанцаў, ні на вольнасьць, каторую дае царскі урад. Цар загаварыў аб вольнасьці пад націскам бунтаў. «Цар з Сэнатам, паталкаваўшы, як мінула трывога, так і аб'явіў, замест вольнасьці, маніфэст, а ў маніфэсьце прыказвае мужыком служыць да часу паншчыну пастарому, а пановаму плаціць больш грошай у скарб на пісароў, пасрэднікаў ды і чорт іх ведае на што. Судзіце-ж цяпер самі, чы-ж не ашукваюць нас? Але не надоўга здасца ім круціцельства, бо, як я казаў, мы ўжо пазналі, што нам не маніфэстаў, а вольнасьці патрэба, і то вольнасьці не такой, якую нам цар схоча даці, але якую мы самі, мужыкі, паміж сабою зробім» («Мужыцкая праўда», № 3).

Тут-жа вызначана, што павінен разумець селянін пад праўдзівай вольнасьцю. Чалавек вольны тады, калі без усялякага выкупу атрымоўвае для сябе кавалак панскай зямлі, аброку ня плаціць, паншчыны не адбывае, рэкрутаў не дае і г. д. Адным словам, соцыяльная програма чырвоных намалёвана яскравымі, зразумелымі селяніну словамі. Яна вызначае інтарэсы беларускага селяніна.

І чырвоным прыходзіцца ў адозвах гаварыць аб богу й веры. Прыходзіцца лічыцца з тым, што мазгі селяніна атручаны рэлігійнаю атрутаю. Але й тут чырвоныя не падобны да белых. Яны абараняюць не каталіцтва і не праваслаўе, а вуніяцкую веру, каторая была ў опозыцыі да каталіцтва і праваслаўя. Калі каталіцтва несла за сабою полёнізацыю, а праваслаўе—русіфікацыю, то вунія была нацыянальнай беларускай верай. Абараняючы вунію, чырвоныя абаранялі ня столькі веру, колькі нацыянальную самабытнасьць беларускага народу.

Політычная програма відна з двух лістоў Каліноўскага. У другім сваім лісьце Каліноўскі, зьвяртаючыся з-пад шыбеніцы маскоўскай да сваёй бацькаўшчыны «галубкі-Беларусі», кліча беларускага селяніна абараняць яе, гэтую шэрую мужыцкую Беларусь, «дзе няма шляхты, дзе ўсе роўныя». Замест трох польскіх і трох рускіх кітоў, чырвоныя паўстанцы выстаўляюць свае тры лёзунгі: вуніяцтва, мужыцка-народніцкая Беларусь і беларуская народнасьць.

У процівагу белай і чырвонай паўстанцкай літаратуры, каторая адрывала Беларусь ад Расіі, павінна была зьявіцца і зьявілася казённая ўрадавая літаратура ў беларускай мове. Яна выяўляла процілежныя політычныя пажаданьні. Беларусь ёсьць «искони русский край», і загэтым нідзе Беларусі так ня можа быць добра, як у Расійскай імпэрыі. Да такой беларускай літаратуры трэба аднесьці творы Апанаса Кісяля (Франца Блуса)—«Бяседа старога вольніка» і «Мова Старавойта», затым бязыменныя вершы—«Быў на Русі чорны бог», «Ой, калі-б, калі

маскалі прышлі» і інш. Усе вышэйпаказаныя творы маюць выразную рускую арыентацыю ў беларускім пытаньні. Ува ўсіх іх старанна падчыркваецца факт, што вызваленьне сялян на Беларусі зьдзейсьніваецца толькі дзякуючы народалюб'ю расійскага ураду. Зразумела, што вызваленьне сялян апісваецца ружовымі хварбамі. Вызваленьне зробіць селяніна зусім вольным чалавекам і забагаціць яго. За такія добрадзеяньні ў адносінах да яго селянін павінен дзякаваць рускаму ўраду. Акт аб вызваленьні ўжо напісан і падпісан царом, але вызваленьне можа быць рэалізавана памалу, паціху. Трэба цярпліва чакаць яго поўнага зьдзейсьненьня, не абурацца і ня слухаць агітатараў, каторыя падбухторваюць сялян, каб яны адразу забралі панскую зямлю і кінулі прыгонную працу на пана. Пад агітатарамі творы разумеюць беларускіх чырвоных паўстанцаў-народнікаў, бо белыя паўстанцы, па зразумелых для нас прычынах, такой агітацыі вясьці не маглі. Яны, як паны, былі ярымі ворагамі чырвонай агітацыі і чырвоных агітатараў. У гэтым пункце белы паўстанец папрыяцельску падаваў руку мураўёўскаму ураду. Калі белы паўстанец ідэалізуе пана і панскі лад жыцьця, то тое самае робяць і творы казённа-рускага кірунку. Непадобнасьць іх заключаецца толькі ў тым, што кожны з іх разумее свайго пана, першы—польскага, другія—рускага. «Мова Старавойта» так хваліць пана: «Паны цару і краю служаць, у савеце і з царом сядзяць, за ўсіх нас думаюць і тужаць». Каб не паны, мужыку зусім ня было-б жыцьця. Усё гора ў самым селяніне: ён любіць гарэлку, ён вядзе гультайскае жыцьцё, ня мае розуму і г. д. Аўтар нават баіцца, што пасьля волі сяляне надта забагацеюць, і тады яны стануць яшчэ горшыя.

Адным словам, паўстаньне 1863 году з двух бакоў падымае беларускі рух, як гэта было і ў 1831 годзе. Розьніца тая, што цяпер беларускі рух зрабіўся больш глыбокім, дзякуючы яго моцнай сувязі з народніцкай праграмай Каліноўскага і чырвоных паўстанцаў. Палітычны рух прышоў да прызнаньня незалежнай Беларусі. Літаратурныя творы ў беларускай мове пачалі пашырацца. Пашырэньне беларускіх твораў павінна было прыпыніцца, дзякуючы вышэйпамянёнаму загаду 1867 году, на аснове каторага было забаронена друкаваць пабеларуску. З гэтага часу легальна могуць зьяўляцца творы аб Беларусі толькі ў рускай мове. Да гэтых твораў мы і прыступаем.

## Цікавасьць да Беларусі рускіх вучоных.

Як відно з ранейшага, паўстаньне 1863 году ізноў востра паставіла пытаньне аб Беларусі. Што гэта за край такі Беларусь? Які гэта народ беларусы? Белыя паўстанцы даказвалі, што Беларусь ёсьць проста провінцыя Польшчы, крэсы польскія. Чырвоныя паўстанцы глядзелі на Беларусь, як на краіну самабытную і незалежную. У тым і другім

тлумачэньні выходзіла, што Беларусь не павінна ўваходзіць у склад Расійскай імпэрыі. Рускім вучоным заставалася задаць сабе мэту— пазнаць Беларусь і давесьці, што гэта краіна ёсьць частка Расіі. Яны, адным словам, узялі на сабе абавязак разьвіваць далей працу ранейшых рускіх вучоных.

Апроч вучоных, пачынае цікавіцца Беларусьсю і рускае грамадзянства. У Маскве выходзіць славянафільская газэта «День», каторая даволі многа месца адводзіць польскаму пытаньню, закранаючы паралельна і беларускае пытаньне. Тут пішуць—Каткоў, І. Аксакаў, Гільфэрдынг, Еленеў і інш. У вадным з нумароў газэты мы чытаем: «Мы вінаваты перад вамі (беларусамі). Мы, рускае грамадзянства, як-бы забыліся аб існаваньні Беларусі». Гэтая, між іншым, кінутая фраза вельмі тыповая і цікавая. Мы добра разумеем, як гэта здарылася, што рускае грамадзянства амаль што забылася аб Беларусі, а польскаму грамадзянству нават і ўначы сьнілася Беларусь. Прычына гэтаму экономічная і разам з тым політычная. Палякі ў свае часы згубілі Беларусь і хацелі, прыступаючы ў 1863 годзе зноў да адбудаваньня Польшчы, атрымаць тое, што лічылі сваім і без чаго адноўленая Польшча ня была-б моцнаю. Што датычыць да Расіі, то яна ня згубіла, а набыла Беларусь, каторая была для імпэрыі каштоўным, смачным кавалкам. Дзякуючы сваёй ваеннай моцы, яна была спакойная, не ажытавалася і не непакоілася. Яна грамчэй загаварыла аб Беларусі толькі тады, калі вынікла раней адно паўстаньне, а потым другое, калі Польшча, што прагнула адрадзіцца, заявіла на Беларусь свае прэтэнзіі. Рускія вучоныя і публіцыстыя ўспомнілі аб Беларусі і пачалі, асабліва пасьля другога паўстаньня, падыходзіць да яе з навуковымі сваімі мэтодамі ўсё шчыльней і шчыльней. Падыходзілі яны амаль што заўсёды выключна з навукова-дасьледчага боку яшчэ й затым, што другія шляхі падходу былі забаронены расійскім самаўладзтвам, каторае ня любіла, каб у політыку ўмешваліся людзі, што не належалі да ўрадавых кругоў.

Праўда, у Маскве зьявілася думка падыйсьці да Беларусі больш прыватна. Там хацелі нават выдаваць газэту ў беларускай мове, каторая павінна была заняцца ня толькі культурна-навуковым аглядам Беларусі, але й разглядам беларускага пытаньня. Але гэтая думка аб беларускай газэце павінна была зьнікнуць сама сабой пасьля таго, як рускі ўрад абвясьціў у 1867 годзе, што друк у беларускай мове забараняецца.

Вялікарускія вучоныя, як мы ўжо вызначылі вышэй, узялі для свайго разгляду сьцісла навуковыя тэмы па этнографіі, географіі і гісторыі Беларусі. Яны найчасьцей зьяўляюцца ўраджэнцамі Беларусі й Украіны, у чым хаваецца іх індывідуальная зацікаўленасьць «Западной

Россией». Але яны вучыліся ў рускіх школах і ўзгадаваліся на паняцьцях рускай афіцыяльнай культуры й політыкі. Беларусь для іх—гэта адна з ускраін Расіі, іначай кажучы—«Северо-Западный край Российской империи», а беларусы—«русское население Северо-Западного края».

Ня гледзячы на гэта, вучоныя вялікарускага тыпу сабралі шмат матар'ялаў і пачалі апрацоўку сабраных матар'ялаў.

У 1866 годзе ў Вільні зьяўляецца «Сборник памятников народного творчества в Северо-Западном крае», апрацованы Гільтэбрандам. Тут зьмешчана 300 песень, 150 пагаворак і 50 загадак. Дагэтуль у такім



Шляхецкі двор (дом, дзе радзіўся Сыракомля) на Меншчыне.

вялікім ліку навуковага зьбіраньня матар'ялаў аб Беларусі ня было. Матар'ялы для кніг зьбіраліся вучнямі Маладзечанскай настаўніцкай сэмінарыі. Яны разьяжджаліся на вакацыі па сваіх хатах, раскіданых па глухіх кутках Беларусі і там, на мясцох, зьбіралі народныя творы і перадавалі іх Гільтэбранду. Яны вельмі падыходзілі для справы, бо добра ведалі мову і звычаі глухой вёскі; апроч таго, ім, яшчэ не адарваным ад сялянства, вёска ахвотна адчыняла крыніцы сваёй творчасьці, каторыя звычайна зачыняюцца перад тымі, хто носіць панскую вопратку. Але трэба прызнацца, што праца маладых зьбірацеляў папала ў рукі ня надта здольнага рэдактара. Атрымаўшы добрыя матар'ялы, пачаў ён іх перапраўляць, падпраўляць і адмалёўваць, каб яны лепш выглядалі для «культурнай» публікі. Іначай кажучы, ён пачаў стары залаты чырвонец шараваць цэглаю.

Такая падмалёўка толькі сапсавала добры матар'ял. Голас народу ў яго сьпевах, гаворках і загадках ня зычэў ужо так праўдзіва й яскрава, як гэта было раней. Усё-ж такі чырвонец, хоць ён зрабіўся менш поўнаважным, не перастаў быць чырвонцам.

Адначасна з Гільтэбрандам над зьбіраньнем беларускіх народных твораў працаваў П. Бяссонаў. Радзіўся ён на Вялікарусі, але жыць яму прышлося на Беларусі. Дзякуючы гэтаму, ён меў магчымасьць зацікавіцца й пазнаёміцца з мясцовай старасьветчынай, народнай мовай і жыцьцём. Працаваў ён не адзін. Сярод мясцовых людзей знашлося шмат такіх, якія дапамагалі яму ў зьбіраньні матар'ялаў. Дзякуючы шчасьліваму здарэньню, яму пашанцавала знайсьці песьні, якія яшчэ раней былі пазьбіраны для вядомага зьбіраццеля народных твораў П. В. Кірэеўскага. У 1867 годзе ў яго руках было ўжо больш, як 500 песень. У Маскве пачалося выданьне зборніку, і ў 1871 годзе вышла з друку першая яго кніжка пад назваю «Белорусские песни с подробными об'яснениями их творчества и языка, с очерками народного обряда, обычая и всего быта». Шкода, што выданьне прыпынілася на першым томе, у які ўвашло толькі 181 песьня. Куды загінулі другія песьні, так і невядома. Недахват выданьня той, што пры песьнях не адзначана, з якога месца яны вышлі.

Да 60-х і 70-х год належыць аднясьці і пладавітую працу І. Насовіча, які сам быў родам з Беларусі, жыў у ёй і добра ведаў яе жыцьцё. Выдатнейшы з яго твораў—гэта «Словарь белорусского наречия», надрукаваны ў Пецярбурзе ў 1870 годзе Расійскай Акадэміяй Навук. Над слоўнікам Насовіч працаваў каля 16 год і за гэты час сабраў у купу і абсьледваў больш, як 30.000 слоў. Матар'ял для яго працы давалі народныя творы: песьні, казкі, пагаворкі і г. д. Апроч таго, ён зьбіраў асобныя словы з натуры, езьдзячы па Магілеўшчыне, Меншчыне і Горадзеншчыне. Гаворку слоў аўтар узяў тую, якая пануе ў Магілеўшчыне. І да нашага часу слоўнік захаваў сваю вартасьць, хоць у ім і ёсьць значныя недахваты. Насовіч запісаў у слоўнік шмат такіх слоў, якія ня ўжываюцца агульна, а вядомы толькі апалячанай шляхце, напрыклад: абсалюцыя, аўстэрыя, аўтэнтыкаваць і г. д. Наадварот, у слоўніку няма такіх слоў, якія ўжываюцца агулам, напрыклад: абшар, дзіцё, кашолка і інш. Перад вучонымі нашага часу стаіць заданьне стварыць новы навуковы слоўнік. Як мы казалі вышэй, зьбіраючы матар'ялы для слоўніка, Насовіч карыстаўся з народных твораў, якіх за часы працы ў яго шмат набралося. Гэтыя матар'ялы ён таксама выдаваў. У 1873 годзе вышаў з друку зборнік Насовіча—«Белорусские песни», у 1874 годзе—«Белорусские пословицы». Зборнік беларускіх баек Насовіча не надрукован і да нашага часу: ён маецца ў рукапісе ў кнігарні Расійскай Акадэміі Навук.

З 60-х год пачаў сваю працу вельмі выдатны зьбірацель народных твораў П. В. Шэйн. Ён працаваў на працягу больш як 30 год і даў шмат этнографічнага матар'ялу для навукі і для будучых працаўнікоў па адраджэньню Беларусі. Родам ён ня быў беларус. У 1865 годзе ён атрымаў месца настаўніка нямецкай мовы ў Віцебскай гімназіі і зацікавіўся Беларусьсю і яе людам. Ён хутка выўчыў беларускую мову, знашоў сабе супрацоўнікаў з мясцовых жыхароў, якіх таксама зацікавіў беларускім этнографічным матар'ялам. Шмат дапамаглі яму старшыя вучні гімназіі, каторыя на вакацыях зьбіралі матар'ялы і аддавалі яму. I сам Шэйн у вольны час езьдзіў па Беларусі і заахвочваў да працы зьбіраньня матар'ялаў вясковых настаўнікаў, каторыя, як пастаянныя жыхары вёскі, заўсёды маглі запісваць народныя творы, звычаі і жыцьцё. Так, працуючы да 1887 году, Шэйн сабраў шмат матар'ялаў, каторыя і пачала друкаваць Расійская Акадэмія Навук. З 1887 да 1902 году вышлі з друку 4 кнігі пад агульнай назваю «Матерьялы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края». Першы том, каторы складаецца з 2 кніжок, зьмяшчае ў сабе абрадавыя і лірычныя песьні; други том—эпічныя творы: казкі, паданьні, гаворкі, загадкі, загаворы, закляцьці, духоўныя вершы і г. д. Трэці том зьмяшчае ў сабе чыста этнографічныя матар'ялы: тут малюецца хата беларуса, гаспадарка, вопратка, прыкметы і хваробы. Адным словам, Шэйн даў для далейшай працы нявычэрпны матар'ял з розных куткоў Беларусі: Віленшчыны, Віцебшчыны, Гарадзеншчыны, Меншчыны, Магілеўшчыны, Смаленшчыны і нават Куршчыны. Шэйн ня толькі запісвае матар'ял, але ён заўсёды вызначае, адкуль гэты матар'ял узяты: называе губэрню, павет і вёску. Маючы на ўвазе, што супрацоўнікі рэдактара мелі розную падгатоўку да працы, часта надта малую, нам лёгка зразумець, якую цяжкую працу павінен быў узяць на сябе Шэйн, каб прыдаць сабраным матар'ялам навуковую аднастайнасьць. Сваю працу ён зрабіў добра, і мы маем у яго зборніках каштоўны уклад у скарбніцу беларускай культуры.

За Шэйнам мы павінны назваць яго выдатнага супрацоўніка Н. Я. Нікіфароўскага. Сам Шэйн выдзяляе яго. Апроч супрацоўніцтва з Шэйнам. Нікіфароўскі вядомы нам і сваймі ўласнымі творамі. Найзначнейшыя з іх маюць такія назвы: 1) «Очерк простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии»; 2) «Простонародные приметы и поверья»; 3) «Простанародные загадки» і г. д. Аўтар найбольш працуе над апісаньнем Віцебшчыны, вясковае жыцьцё каторай ён добра ведае, як вясковы настаўнік. Перад намі ня толькі вучоны, каторы з об'ектыўнай стараннасьцю зьбірае этнографічныя матар'ялы. Яго творы поўны спачуцьця да сялянскай цяжкай долі. Аб чым-бы

ён ні пачаў пісаць, чутно, што ён любіць і шкадуе селяніна беларуса, каторы жыве, як чорт у пекле. Тым ня менш опачуцьцё да беларускай вёскі не перашкаджае аўтару маляваць добрыя і благія, яскравыя й цёмныя бакі беларускага жыцьця. Працу Нікіфароўскага па Віцебшчыне працягнуў далей А. П. Сапуноў («Витебская старина», т. т. I—V), каторы памёр у 1924 годзе.

З 1876 году аж да нашых часоў працаваў над этнографіяй Беларусі Е. Р. Раманаў. Ён найбольш вядомы сваім «Белорусским Сборником». Першы і другі выпускі зборніку зьмяшчаюць у сабе народныя песьні, пагаворкі й загадкі. Раўнуючы гэты зборнік з іншымі, якія былі надрукованы раней да Раманава, мы бачым, што ён карысна ад іх вызначаецца. Кідаецца ў вочы багацьце яго зьместу. Такога багацьця раней нідзе ня было. Зборнік зьмяшчае 1.210 песень, 757 пагаворак і 450 загадак. Амаль ня ўвесь матар'ял запісан самым аўтарам. Аўтар быў ураджэнцам Беларусі і, дзякуючы гэтаму, добра ведаў яе быт. Трэці і чацьверты выпускі зьмяшчаюць у сабе байкі. Зьбірацель добра быў знаёмы з сучаснымі яму зборнікамі вялікарускіх і украінскіх баек, дзякуючы чаму ён з беларускіх баек мог выбраць самыя самабытныя і орыгінальныя. Што датычыць да самай гаворкі баек, то Раманаў растлумачвае нам, чаму яны маюць у сабе шмат вялікарускіх слоў і зваротаў мовы. Уся справа ў тым, што казальнік, баючы байку і бачачы перад сабой незнаёмага зьбірацеля ў панскай вопратцы, прагнецца, каб баяць ня зусім папросту, памужыцку. Дзякуючы гэтаму, ён часта ўплятае ў сваю гаворку разумныя «панскія» словы, якія ён чуў у горадзе ці сярод адукаваных людзей. Гэта трэба мець на ўвазе, тым больш, што іншы раз сам зьбірацель ня ўмее падыйсьці да казальніка, і казальнік са скуры лезе, каб ня быць мужыком і гаварыць не папросту, не памужыцку. Пяты выпуск зьмяшчае ў сабе загаворы, духоўныя вершы, апокрыфы і г. д. Найкаштоўнейшую частку кнігі складаюць загаворы, каторых тут сабрана больш чым 800. Такога багацьця загаворнага матар'ялу да Раманава ў нас ня было. Шосты выпуск дае нам працяг матар'ялаў, зьмешчаных у трэцім і чацьвертым выпусках. Тут надрукована больш як 50 баек, у якіх малююцца дзеі асілкаў-багатыроў: яны змагаюцца з чужаземнымі чудзішчамі, зьмяямі-цмокамі, бабай-ягой і кашчэем. Найчасьцей асілкі перамагаюць іх, бо моц асілкаў вялікая, як у мітычных гэрояў-паўбогаў. Запіс баек зроблен добра, байкі расказаны добрымі казальнікамі. Падзеі, апісаныя ў байках, намалёваны падрабязгова, дзякуючы чаму некаторыя байкі надта вялікія. Значную большасьць баек Раманаў запісаў сам, а меншасьць запісалі пад яго даглядам супрацоўнікі, якія таксама добра ўмелі зразумець казальніка й добра запісаць. З Раманавым у гэтых адносінах можа супернічаць толькі Сяржпутоўскі, запісаўшы байкі



Возера Сьвіцязь на Меншчыне.

паляшукоў. Матар'ялы, каторыя сабраў Раманаў, ня ўсе яшчэ надрукаваны да нашага часу і чакаюць свайго выдаўцы. Найвыдатнейшае значэньне з прац у расійскай мове маюць у нашыя часы працы акадэміка проф. Е. Ф. Карскага. Пералічыць і абхарактарызаваць усё, што ён напісаў і надрукаваў па беларускаму пытаньню, тут няма магчымасьці. Мы адзначым толькі адну яго вялікую працу, вельмі цікавую і каштоўную пад назваю „Белоруссы“, каторая закончана толькі цяпер. Е. Ф. Карскі зьяўляецца выдатным мовазнаўцам і славесьнікам. Зразумела, што яго найбольш цікавіць мова і славесная творчасьць беларуса. Але ў яго кніжцы мы знахо-

дзім гістарычны і этнографічны матар'ял. Сваю працу аўтар пачаў у канцы XIX ст. Першы том твору «Белоруссы» быў надрукован у 1904 годзе і мае такі падзагаловак: «Введение к изучению языка и народной поэзии белоруссов». Грунтуючыся на тым факце, што мова народу разьвіваецца поруч з народам, аўтар пачынае сваю працу з вызначэньня граніц Беларусі па мове беларускага народу. Потым ён дае гістарычны нарыс жыцьця і мовы старажытных насельнікаў Беларусі і паказвае, як складалася і злажылася беларуская народнасьць і беларуская мова к пачатку XIV ст., як жылі беларусы ў Літоўска-Рускім гаспадарстве да Люблінскай вуніі й пасьля яе. У канцы кнігі проф. Е. Ф. Карскі дае два цікавыя нарысы: 1) нарыс навуковай працы над мовай і этнографіяй Беларусі і 2) нарыс сучаснай прыгожай літаратуры ў беларускай мове. Другі том твору друкаваўся з 1908 да 1912 г. Падзагаловак яго такі: «Язык белорусского племени». Гэты том складаецца з трох кніжак. Першая кніжка зьмяшчае ў сабе гістарычны нарыс гукаў беларускай мовы; другая кніжка—морфолёгію мовы, іначай кажучы, складаньне й зьмену слова; трэцяя кніжка дае сынтакс беларускай мовы. Такім спосабам, аўтар даў у сваёй грунтоўнай працы фундамант для будоўлі школьнай граматыкі нашага часу. Апроч таго, у 3 кніжцы другога тому маюцца дадаткі, датычаныя да літаратуры па беларускім пытаньні і да сучаснага культурна-нацыянальнага беларускага руху. Колькі працы было аўтару над сваім творам, відаць ужо з аднаго таго, што толькі другі том «Белоруссов» складае больш 1.300 старонак. Пасьля таго, як мова беларуса была навукова разгледжана, проф. Карскі пачаў займацца творамі вуснага й пісанага беларускага слова. Трэці том «Белоруссов» дае нам гісторыю гэтых твораў. Першая кніжка дасьледжвае гісторыю народнай вуснай творчасьці. Другая кніжка дае гісторыю старой беларускай пісьменнасьці. Трэцяя кніжка—гісторыю новай беларускай літаратуры.

Затрымаемся крыху на навуковай працы рускіх вучоных па гісторыі Беларусі. Тых, хто хоча больш дэтальна пазнаёміцца з гэтым пытаньнем, мы пасылаем да вельмі каштоўнай кніжкі Ў. І. Пічэты «Введение в русскую историю» (Источники и историография), стар. 178—191. Настрой гісторыкаў такі самы, як і настрой вышэй названых вучоных. На іх погляд Беларусь—гэта «Северо-Западный край России», у каторым жыве «искони русское население». З зачыненьнем Віленскага унівэрсытэту, праца над гісторыяй Беларусі сконцэнтравалася ўкола Кіеўскага унівэрсытэту, потым яна перашла ў Варшаву, Пецярбург, Маскву і інш. гарады.

Першымі пачалі працаваць гісторыкі-юрыстыя Антановіч і Уладзімірскі-Буданаў. Антановіч зьвярнуў увагу на пабудову Літоўска-Рускага гаспадарства. Ён дасьледжвае пытаньне аб хуткім узросьце і

хуткім заняпадзе Літоўска-Беларускай дзяржавы. Апошні факт, на яго погляд, залежаў ад нацыянальных спрэчак паміж ліцьвінамі і беларусамі. Антановіч дасьледжвае факты, ён зусім мала цікавіцца тэорэтычна-філёзофскімі пытаньнямі. Уладзімірскі-Буданаў разглядае праўныя нормы Беларускага гаспадарства і асабліва цікавіцца Майдэборскім правам гарадоў і Літоўскім Статутам. Часта ён закранае пытаньне аб культурных узаемаадносінах Польшчы і Беларусі. У такім-жа кірунку працуе проф. раней Адэскага, потым Варшаўскага унівэрсытэту Ф. І. Леантовіч.

Калі ў вышэйназваных аўтараў фактычны бок працы стаяў на першым месцы, то мы ня можам гэтага сказаць аб М. Каяловічу. Політыка-філёзофскі момант у яго працах высоўваецца ўперад, і мы маем поўную магчымасьць даць характарыстыку яго поглядаў, як гісторыка Беларусі. У 1864 годзе ён выпусьціў з друку кніжку пад назваю «Чтение по истории Западной России». Кніжка вышла другім выданьнем у 1884 годзе. Мы зробім тыповыя выняткі з прадмовы аўтара да другога выданьня кніжкі. Ён піша: «Выконваю мой абавязак да Заходняй Расіі, на абшары каторай я нарадзіўся і ўзрос блізка ад рускага яе народу і ў каторай у мяне з раньніх год закладаліся галоўнейшыя асновы ўсёй далейшай маёй дзейнасьці». І далей: «Як дваццаць год таму назад, так і цяпер перад намі стаіць вялікая патрэба знаць Заходнюю Расію паруску, разумець паруску, што, як пабачым, бліжэй ад усіх другіх поглядаў да праўды і ўводзіць у гэтае пазнаньне і разуменьне мільёны новых нашых грамадзян Заходняй Расіі, простых маларосаў, беларусаў і ліцьвіноў, каторыя ўсё больш і больш пасьля вызваленьня сялян уваходзяць у межы ведаў і імкненьняў адукаваных людзей». Калі чытаеш гэтыя цікавыя выняткі з рускага прафэсара, ураджэнца Беларусі, але афіцыяльна патрыота царскай Расіі, то так і выплывае параўнаньне яго з Рыпінскім. Рыпінскі хоча, каб беларускі селянін навучыўся раней чытаць, а потым і думаць папольску, а Каяловіч хоча, каб мільёны простых украінцаў, беларусаў і ліцьвіноў пазналі і зразумелі свой край і саміх сябе паруску. І той і другі хоча выкасаваць самабытнасьць беларуса і Беларусі, адзін—на карысьць Польшчы, другі—на карысьць Расіі. Пасьля Каяловіча, у такім самым кірунку працуюць П. П. Жуковіч, К. В. Харламповіч, Бацюшкаў, Бранцаў і другія. Выдатнейшымі гісторыкамі нашага часу зьяўляюцца Любаўскі, Доўнар-Запольскі і Пічэта. Яны вышлі з рускай школы вучоных, перанялі ўсю навуковую спадчыну гэтай школы, выкінуўшы яе старыя політыка-філёзофскія погляды.

## Рэакцыя канца XIX сталецьця.

Годы глыбокай рэакцыі займаюць сабою канец XIX і самы пачатак XX сталецьцяў як ува ўсёй Расіі, так і на Беларусі. Гэтая рэакцыя

ёсьць палітычнае выяўленьне экономічнага стану царскай Расіі, каторая перажывае глыбокі аграрны крызіс. Вызваленае з прыгону сялянства выбіваецца з сіл, каб пракарміцца з тых дзялянак, якія яно дастала. Яго гняце малазямельле, каторае расьце з кожным годам. Ужо пры самым надзяленьні, па вельмі оптымістычным падліку, 42,6 проц. сялянства атрымалі надзелы, каторыя не маглі іх пракарміць, у некаторых губэрнях гэты сярэдні процант значна падымаўся. У Менскай губэрні ён даходзіў да 57,3. Зразумела, што, пры лічэбным росьце сялянства, процант гэты з кожным годам узрастаў. Пры ліквідацыі прыгону ў сярэднім на адну душу прыходзіўся надзел у 4,8 дзесяціны; у 1880 годзе гэтая цыфра падае да 3,5 дзесяцін. У 1900 годзе на адну душу ў сярэднім прыходзіцца ўжо толькі 2,6 дзес. надзельнай зямлі. За 40 год цыфра надзелу, як мы бачым, спусьцілася з 4,8 дзес. да 2,6 дз. Малазямельле ўзрасло, такім спосабам, у два разы. Ужо ў канцы 70-х гадоў урад добра ведаў, што робіцца ў «вызваленай» вёсцы, але, стоячы на грунце абароны дваранска-панскіх інтарэсаў, ён не зварачаў увагі на тое, што ведаў.

Якраз у гэтыя часы на замежным рынку, дзякуючы конкурэнцыі Амэрыкі, нізка палі цэны на рускі хлеб, каторы вывозіўся ў Заходнюю Эўропу. Значна скараціўся прыток з-за граніцы золата, каторым аплачваўся экспортаваны хлеб. Пануючыя групы жыхарства, каторыя вывозілі хлеб, павінны былі так ці іначай папоўніць свае недахваты шляхам павялічэньня эксплёатацый працоўнай масы. Пахінуўшыся ад паніжэньня цэн бюджэт гаспадарства таксама трэба было паставіць на цьвёрдыя ногі. Усё гэта прымушала ўрадавы апарат мацней націскаць налогавы прэс на тыя працоўныя бяспраўныя клясы, каторыя зьяўляюцца вытворцамі матар'яльных каштоўнасьцяй, на сялянства і на паступова вырастаючы пролетарыят.

Царскі ўрад паставіў сабе за мэту прыняць усе меры, каб ня пускаць за межы гаспадарства тое золата, каторае йшло на закупку фабрычных прадметаў замежнай прамысловасьці. Для гэтай мэты замежныя тавары, каторыя прывозіліся на рускую граніцу, былі абложаны павышанымі пошлінамі. Паралельна з гэтым урад бярэ пад сваю апеку мясцовую рускую прамысловасьць і прагнецца ўзмацніць яе бяспроцантнымі пазычкамі і субсыдыямі, каторыя выплачвае ў скарб зьбяднелае сялянства. Продукты мясцовай прамысловасьці запаўняюць рынак. Вызваленыя урадам ад конкурэнцыі з заходнімі таварамі, яны маюць магчымасьць значна павышаць сваю рыначную каштоўнасьць. Утварэньне пры падтрыманьні ураду мясцовымі прадпрыемцамі сындыкатаў і трэстаў таксама судзейнічае гэтаму. Купляе выкінутыя на рынак продукты мясцовай прамысловасьці той самы зьбяднелы, малазямельны ў масе селянін і рабочы. Яны плацяць за патрэбныя ім у іх

гаспадарцы і абыходзе тавары столькі, колькі хоча і можа з іх узяць прадпрыемца, над якім апякуецца царскі ўрад. Прамысловец і гандляр нажываюцца, хаваючы ў сваю тоўстую кішэню ня толькі грошы шырокага спажывача, але й дадатковую працу пролетара-рабочага. Урад падтрымвае прадпрыемца і тут, забараняючы рабочаму арганізавацца і абараняцца.

У прадсьмертных сударгах корчыцца канаючая Расійская імпэрыя. Каб выратавацца ад крызісу, яна старымі спрабаванымі сродкамі прагнецца скаваць моцнымі ланцугамі рэакцыі працоўныя нізы гаспадарства. Усё пушчана ў ход, каб захаваць старыя падставы імпэрыі— самаўладзтва, праваслаўе і руская народнасьць. Ажывае добра вядомая нам мікалаеўшчына з яе прыёмамі поліцэйскага гаспадарства, але капіталізм узрастае. Побач з капіталістым-прадпрыемцай, нарастае магутная сіла ўжо рэволюцыі—пролетарыят, нарастае і організуецца няпрыкметна, але ўпарта, няўхільна й беспаваротна. «Вызваленае» сялянства ўсё больш і больш уцягваецца ў барацьбу за сваё запраўднае вызваленьне і падгатаўляе на вёсцы базу для дзейнасьці пролетарыяту.

Царскі пасад у эпоху рэакцыі канца XIX і пачатку XX ст. займаюць адзін за другім няўдалыя пасьледышы старога, што выраджаюцца фізычна і інтэлектуальна, дому Раманавых. Раней кіруе бацька Аляксандар III (1881—1894), потым сын яго Мікалай II (1894—1917). Трохсотгодняя дынастыя дала гэтых двух дэгэнэратаў для паратунку канаючай імпэрыі.

Аляксандар III быў другім сынам Аляксандра II. Дзеля гэтага з дзяцінства яго не тагавалі для выконваньня царскіх абавязкаў, бо быў жывы яго старэйшы брат Мікалай, каторы па закону быў абвешчан насьледнікам царскага пасаду. Аляксандар III зрабіўся насьледнікам толькі пасьля таго, як у 1865 годзе памёр яго брат Мікалай. З гэтага часу яго і пачалі адукаваць на слаўную пасаду ўсерасійскага імпэратара. Адукацыя да новага насьледніка прышчаплялася вельмі туга, бо яму было ўжо 20 год і, апроч таго, здольнасьці яго да навукі былі вельмі й вельмі невялікія. Гэта прызнаваў, нават, яго бацька, Аляксандар II, і быў нездаволен няздольнасьцю сына. Трэба яшчэ дадаць, што новы насьледнік быў алькоголікам, і навука не магла ўвайсьці ў галаву, заўсёды адурманеную гарэлкаю. Зрабіўшыся ўсерасійскім самаўладцам, Аляксандар III не расстаўся са сваім алькоголізмам. «Божы памазальнік» рэдка калі быў цьвярозым. Алькоголізм зьвёў яго і ў магілу параўнальна яшчэ ў маладыя годы. Гэта быў цар з вельмі абмяжованым сьветапаглядам, з «истинно-русским» чорнасотніцкім настроем. Даволі адзначыць, што ён з скарбовых грошай выдаў нагароду вядомаму авантурыку Лютастанскаму, каторы паднёс яму паскудную сваю брошуру «Об употреблении евреями христианской крови».

Мікалай II прыняў у спадчыну ад бацькі ня толькі царскі пасад, але і алькоголізм разам з сапсаванай мазговай і нэрвовай сыстэмай. Дэгэнэратызм у яго асобе дашоў да апошняй ступені свайго разьвіцьця. Зусім абмяжованы розумам, ён ня мог бяз цыдулькі, напісанай кім-небудзь з яго прыдворных, сказаць пры народзе некалькі слоў. Гэтая поўная нікчэмнасьць тым ня менш прагнулася бараніць сваё самаўладзтва самымі жорсткімі сродкамі. У 1895 годзе дэпутаты дваран, земстваў і гарадоў зьявіліся ў Зімні палац прывітаць новага імпэратара. На́ іх прывітаньне цар адказаў так: «У вапошнія часы на некаторых земскіх сабраньнях былі чутны галасы людзей, каторыя захапляліся «бессмысленными мечтаниями» аб удзеле прадстаўнікоў земства ў справах унутранага кіраваньня. Няхай усе ведаюць, што я буду сьцерагчы самаўладзтва таксама цьвёрда й няўхільна, як сьцярог яго мой незабыўны нябожчык-айцец».

Зразумела, што гэтыя два пасьледышы дынастыі не маглі самастойна кіраваць справамі гаспадарства. Яны былі марыёнэткамі ў руках дваранска-бюрократычнай камарыльлі, на чале каторай да рэволюцыі 1905 году стаяў добра вядомы рэтроград К. П. Пабеданосцаў. Ён быў выхавацелем і настаўнікам абодвух астатніх Раманавых і, уласна кажучы, быў запраўдным кіраўніком Расійскай імпэрыі перад яе канцом.

Царызм, пасьля забойства Аляксандра II, згубіў сваю лінію і ня ведаў, што яму рабіць. Аляксандра III спалохала забойства сярод белага дня на людзях, пры моцнай варце, яго бацькі. Аляксандар III даваў процілежныя даручэньні й загады; то ён падаў духам і як-бы згаджаўся на ўступкі рэволюцыі, то прагнуўся абараняць гнілы распарадак жыцьця. Але адразу на сцэну зьявіўся Пабеданосцаў, каторы ўзяў руль кіраваньня ў свае рукі і стаў на апошнюю абарону старых спрабаваных асноў—фэўдальна-дваранскага самаўладзтва, праваслаўя і рускай народнасьці. Яго падтрымлівалі ўжо вядомыя нам прадстаўнікі тагочаснай казённай публіцыстыкі, на чале каторых стаялі Каткоў і І. Аксакаў, а роўна і рэакцыйныя дваранскія колы. На іх погляд, самаўладзтву нішто не пагражае. Рэволюцыйны рух ёсьць нешта прыпадковае, папаўшае ў Расію з заграніцы. Рускі народ ня можа і ня хоча ісьці за рэволюцыянэрамі, бо ён «не развращен» асьветаю і палітычнымі вольнасьцямі. «Праваслаўная Русь» бога баіцца і цара паважае, яна ня любіць і чужаецца «інаверцаў» і «інародцаў». «Расія толькі для рускіх».

Нерашучасьць ураду пад уплывам такіх абставін пачала зьнікаць. Аляксандар III зусім аддаўся ў рукі Пабеданосцава. Яму было даручана апрацаваць звычайны пры ўступе на пасад кожнага цара маніфэст, каторы зьяўляецца як-бы праграмай новага монарха. Зразумела, што маніфэст быў утворан у адпаведным настроі і быў падпісан Аляк-

сандрам III у канцы красавіка 1881 г. Там мы чытаем такое тыповае месца: «Пасярод вялікага нашага жалю голас божы загадуе нам бадзёра стаць на справу кіраваньня з надзеяю на боскі промысел, з вераю ў моц і справядлівасьць самаўладнай улады, каторую бог заклікаў нас зацьвярджаць і вартаваць для народнага дабра ад усялякіх нядобрых замераў».

Такім спосабам, лібэралам было дадзена знаць, што пачынаецца пара абароны самаўладзтва, што скончыліся ружовыя мары добрадушнай «дыктатуры сэрца» Лорыс-Мэлікава. Над імпэрыяй працягнуўся пабеданосцаўскі кулак, абараняючы старое самаўладзтва. У жніўні 1881 году абвешчана была пабеданосцаўская «констытуцыя»—вядомае «Положение об усиленной охране», каторым карысталася рэакцыя аж да рэволюцыі 1917 году. На аснове яго губарнатары і гэнэрал-губарнатары мелі амаль што неабмяжованую ўладу над жыхарствам: яны маглі часова выкасоўваць існуючыя законы, выдаваць новыя, бяз суду арыштаваць, высылаць у выгнаньне на аснове толькі памысьленьня на каго і г. д. У далейшыя часы Беларусь вельмі часта на сваім карку перажывала ўсе жахі, зьвязаныя з «Палажэньнем».

Найраней ад усіх сталі адчуваць моц пабеданосцаўскага кулака акраіны імпэрыі, у тым ліку і Беларусь. І тут, у імя прынцыпаў праваслаўя, самаўладзтва і рускай народнасьці, пачалася бязупынная неміласэрная барацьба з «інародцамі» і «іншаверцамі». На Беларусі ўваскрасьлі часы вешальніка-Мураўёва. Накінуліся на каталікоў-беларусаў, прымаючы іх за палякоў. Усюды шукалі «польскую інтрыгу і польскі сэпаратызм». Да польскага сэпаратызму далучаўся і беларускі рух. Успомнілі і аб вуніі. Знайшлі, што ў некаторых мясцовасьцях вуніяты неяк яшчэ не прылучыліся да праваслаўнай царквы і спаўняюць каталіцкія абрады, лічачы сябе каталікамі, а не вуніятамі. Так было, напрыклад, у некаторых валасьцёх заходняй часткі Горадзенскага павету. Быў выдадзен спэцыяльны загад, каб перапісаць такіх вуніятаў з каталікоў у праваслаўныя. Касьцёлы ў такіх парафіях перарабляліся на цэрквы, ксяндзы выганяліся і на іх месца прысылаліся праваслаўныя сьвяшчэньнікі. На такія мерапрыемствы ураду парафіяне вельмі часта адказвалі адкрытым непаслушэнствам, а яшчэ часьцей бойкотам. Пашлі процэсы і прасьледваньні «упорствующих», як называла непакорных афіцыяльная мова. У некаторых парафіях непакорныя рабілі нягласную ўмову з праваслаўным сьвяшчэньнікам такога сорту: сьвяшчэньнік запісвае ў мэтрычныя кнігі праваслаўнай царквы радзіны, хрэсьбіны, шлюбы, хаўтуры парафіян, за што бярэ з іх плату, не адпраўляючы абрадаў. Абрады адпраўляе патаемна які-небудзь ксёндз, паводле каталіцкага звычаю, вядучы нелегальна запіс гэтым нелегальным каталіком. Найчасьцей такія ўмовы адбываліся ў глухіх

вясковых кутках Беларусі, куды не магло заглянуць нядрэмнае вока паліцыі, каторая была офіцыяльным абаронцам казённага праваслаўя. Бядняк-селянін, атручаны яшчэ раней рэлігійнаю атрутаю, цёмны й забіты векавым прыгнечаньнем, плаціў з сваіх жабрацкіх сродкаў на два фронты—і папу і ксяндзу, а часам і на трэці фронт—паліцэйскаму ураднiку, адрываючы астатнія грошы ад сваёй зьбяднелай гаспадаркі і галоднай сям'і.

Цэлы рад абмежаваньняў у правох упаў на яўрэйства, большасьць каторага жыла на Беларусі і Літве. Урад прагнецца зрабіць яўрэя як-бы «казлом адпушчэньня» за ўсе свае праступствы. Пры дапамозе скарбовых грошай арганізуюцца пагромы, аб яўрэях распускаюцца ўсялякія провокацыйныя чуткі, утвараюцца судовыя процэсы па абвінавачваньню яўрэяў у рытуальных забойствах. Ідуць у гарадох паджогі яўрэйскіх кварталаў і г. д. Руская буржуазія ўжо стала на ногі, абзавялася ўласнымі капіталамі, ёй ужо былі непатрэбны яўрэйскія капіталістыя і іх капіталы, бо яны конкуравалі з ёю. Трэба было зьнішчыць конкурэнта, абапёршыся для гэтага на яго яўрэйскае пахаджэньне. Урад пашоў насустрач такім пажаданьням рускай буржуазіі. Пачалі сачыць за тым, каб яўрэйства якімі-небудзь сродкамі не перашло за «черту оседлости», што даволі часта бывала ў ранейшыя часы і на што ранейшы урад глядзеў скрозь пальцы, бо меў патрэбу ў лоўкіх гандлярох і кваліфікаваных рамесьніках. У 1882 годзе былі выданы так званыя «часовыя правілы» для яўрэйства. На аснове гэтых правіл для яўрэяў у «черте оседлости» была праведзена яшчэ новая «черта». Тэст правіл такі: 1) забараніць яўрэям сяліцца за межамі гарадоў і мястэчак, 2) прыпыніць утварэньне на імя яўрэяў купчых актаў і арэндных дагавораў на нярухомую маемасьць за межамі гарадоў і мястэчак, 3) забараніць яўрэям таргаваць у дні нядзелі і ў двунадзесятыя хрысьціянскія сьвяты. Яўрэйскае жыхарства, такім спосабам, штучна адрывалася ад вясковай гаспадаркі. Яно запіралася ў горад і мястэчка і прымацоўвалася да іх прамысловасьці і найчасьцей гандлю.

Межы яўрэйскай аселасьці звужваюцца. У 1887 годзе Растоў на Доне і Таганрог з паветам, каторыя раней уваходзілі ў «черту оседлости», былі выключаны з яе. Яўрэі, каторыя там жылі, былі выселены. Такія мерапрыемствы ураду зьбівалі яўрэйскую масу ў адзін цесны куток і згушчалі ў ім экономічную барацьбу за існаваньне. Яўрэйская дробная буржуазія не магла вытрымаць абвостранае конкурэнцыі ды пачынае паступова пролетарызавацца. Слаба разьвітая прамысловасьць у краі ня можа даць работы як яўрэйскай беднаце, так і беларускай вёсцы. Экономічнае палажэньне беднаты ў краі робіцца нявыносным. А голад прымушае шукаць выхаду. Узмацняецца

масавая эміграцыя ў Амэрыку. Раней рушыў туды больш рухавы, больш абяздолены яўрэйскі безработны пролетары, за ім пасунуўся беларускі селянін, каторага гнала з дробнай гаспадаркі малазямельле.

У 1891 годзе выдаецца яшчэ загад, каторы мацней сьціскае яўрэйскую беднату. Загад забараняе жыць у Маскве яўрэям-рамесьнікам, на што яны мелі права з 1865 году разам з тымі яўрэямі што даставалі вышэйшую асьвету. На аснове гэтага загаду, з Масквы выкідаецца каля 17.000 рамесьніцкай яўрэйскай бедноты. Маленькая гаспадарка іх і без таго слабы дабрабыт зусім руйнуюцца. Загнанымі, бяспраўнымі жабракамі зьяўляюцца яны ў сваё «гетто», у межы аселасьці. Яшчэ больш згушчаюцца фарбы жыцьця яўрэйскай беднаты на Беларусі. Што датычыць да багатай яўрэйскай буржуазіі, то яе палажэньне, зразумела, лепшае. Грошы даюць ёй амаль што поўную магчымасьць абыйсьці ўсялякія законы і распараджэньні. Тым больш, што і абмежаваньняў на яе кладзецца менш, чым на беднату. Прыклад перад намі: у той час, як яўрэй-фабрыкант і гандляр, атрымаўшы вышэйшую асьвету, мае права жыць у Маскве і пасьля загаду 1891 г., яўрэй-рабочы і рамесьнік, катораму ў масе вышэйшая асьвета не даступна, павінен быў пакінуць месца працы і зрабіцца безработным у сваіх «межах аселасьці».

У 1886 годзе сам Аляксандар III загадаў міністру народнай асьветы вядомаму обскуранту Дзялянаву прыняць меры для абмежаваньня прыёму яўрэяў у школы як сярэднія, так і вышэйшыя. Больш як паўгода бюрократы думалі над гэтымі мерамі. Урэшце ў ліпені 1887 году міністар выдаў два цыркуляры на гэтую тэму. Была ўстаноўлена такая процантная норма для вучняў-яўрэяў: у межах аселасьці яўрэі прымаюцца ў школу ў разьмеры 10% хрысьціян, за межамі аселасьці— 5%, а ў сталіцах—3%. Потым ідуць абмежаваньні для яўрэяў, што дасталі асьвету. Яўрэй ня можа займаць урадавую службу, ня мае права быць «вышэйшым чынам» (афіцэрам) у арміі, ня мае права быць профэсарам, прысяжным паверанным і г. д. Усё гэта ў буржуазных яўрэйскіх колах утварае так званы сіоністкі рух і цяжкі настрой у масах. Яўрэйскі пясьняр Я. Фруг так апісвае сучасны яму настрой:

Все поникло кругом, помертвело,
Как средь диких пустынных равнин.
Зарыдал-бы хоть кто-нибудь сьмело,
Застонал-бы хоть громко один!
Эти ночи без звезд и без бури,
Эти дни без теней и лазури,—
Мой народ, как похожи они
На печальные годы твои!

У пролетарскіх колах узмацняецца соцыялістычны рабочы рух, які ахварбоўваецца паступова ў нацыянальны колер. Зараджаецца корань моцнай і шырокай організацыі «парыяў паміж пролетарымі»—Бунда, каторы аформліваецца ў партыю ў 1897 годзе, адначасна з аформленьнем сіонізму.

Школа на Беларусі ізноў пачынае вясьці ўпартую русіфікацыю. Для сярэдняй школы русіфікатараў дастаўляюць рускія унівэрсытэты і асабліва духоўныя акадэміі, для ніжэйшых школ адпаведных настаўнікаў—мясцовыя настаўніцкія сэмінарыі і Віленскі настаўніцкі інстытут. Для рабочых і сялян Беларусі даступны толькі ніжэйшыя школы і так званыя гарадзкія вучылішчы. Прычым, програмы іх пабудованы так, што пасьля іх сканчэньня ніяк ня можна папасьці ў гімназію і ў унівэрсытэт, каторыя такім спосабам застаюцца толькі для заможных груп жыхарства. Каб яшчэ больш загарадзіць гімназію і вышэйшую школу ад працоўных нізоў, на Беларусі сыстэматычна праводзіцца цыркуляр Дзялянава, вядомы ў шырокай публіцы пад назваю цыркуляру «аб кухаркіных дзецях». Асноўная думка цыркуляру такая: кожны падданы імпэрыі павінен заставацца ў тым стане, у каторым ён радзіўся на сьвет. Калі бедны чалавек пападае ў гімназію, а праз яе і ў унівэрсытэт, то ён выходзіць з сваіх соцыяльных абставін і пападае ў новыя. Ён, жывучы сярод заможных таварышаў, на сваёй асобе бачыць клясавыя супярэчнасьці, азлабляецца і робіцца супраціўнікам існуючага парадку. Дзеля ўсяго гэтага начальнікам сярэдніх школ даецца загад, каб яны ня пускалі дзяцей бедната ў гімназію, а для гэтай мэты рабілі ім правалы на прыёмных экзамэнах. Такім спосабам школа на Беларусі адгароджана была процэнтнаю нормаю ад яўрэйства, а цыркулярам «аб кухаркіных дзецях»—ад працоўнай масы Беларусі наогул.

Адначасна з боку Сыноду і Пабеданосцава ішоў паход на сьвецкую школу, нават у тым выглядзе, які яна мела тады. Ваяўнічае праваслаўе не здавальнялася сваёй роляю. Пабеданосцавым быў апрацован проэкт аб перадачы ўсіх ніжэйшых школ у рукі духоўнага ведамства. Проэкт у цэлым не прашоў і быў праведзен у жыцьцё толькі часткаю выданьнем закону 1884 году. На аснове яго пад загад праваслаўнага «сьвяцейшага» Сыноду папалі самыя ніжэйшыя вясковыя народныя школы, вядомыя пад назваю школак граматы. Пад націскам Сыноду і епархіяльных епіскапаў парафіяльныя сьвяшчэньнікі адчынілі на Беларусі шмат такіх школак. Школы граматы ўтрымваліся на сялянскія сродкі. Настаўнікі іх былі зусім нізкай кваліфікацыі. Кармілі іх сяляне па чарзе і зьбіралі ў канцы зімы ці продуктаў, ці грошай на некалькі рублёў. Настаўнікі школак на Беларусі вядомы пад назваю дарэктараў. Толькі ў канцы XIX і пачатку XX сталецьця

Сыноду былі адпушчаны са скарбу грошы на царкоўныя пачатковыя школы. Яны на Беларусі зьявіліся ў вялікім ліку, перавышаючы лік сьвецкіх народных школ. Была ўтворана духоўная інспэктура царкоўна-парафіяльных школ. Былі адчынены царкоўна-настаўніцкія школы, каторыя выпускалі спэцыяльных настаўнікаў для царкоўных школ. Яны апынуліся зусім у руках духавенства і былі часам шчырымі, а часам нявольнымі праваднікамі той рэлігійнай атруты, каторая на працягу соцень год і раней атручвалася наша Беларусь. У процівагу праваслаўным сьвяшчэньнікам ксяндзы адчыняюць патаемныя каталіцкія школы ў польскай мове. Па мястэчках і гарадох яўрэйскія абшчыны адчыняюць хэдэры, каторыя зьяўляюцца выключна рэлігійнымі школамі і атручваць мазгі дзяцей яўрэйскай беднаты. Усе гэтыя школы, апроч таго, выхоўваюць дзяцей у нацыянальным шовінізьме—рускім, польскім і яўрэйскім.

У 1889 годзе, паводле пропозыцыі міністра ўнутраных спраў Толстога, вышла «палажэньне аб земскіх начальніках». У гэтым-жа годзе зьявіліся земскія начальнікі і на Беларусі. У Расіі на пасады земскіх начальнікаў урадам сажаліся рускія памешчыкі «из потомственных дворян». Што датычыць Беларусі, то тут такі прынцып назначэньня прыкладаўся толькі да памешчыкаў-дваран рускага пахаджэньня, каторых тут было ня так і многа. Паны з польскай шляхты і магнацтва, каторых на Беларусі была большасьць, ня мелі права быць земскімі начальнікамі, бо ім рускі урад ня верыў, лічачы іх, як палякоў, палітычна ненадзейнымі. Дзякуючы гэтаму, земскія начальнікі на Беларусі назначаліся найчасьцей з рускіх зьбяднелых паноў і заслужоных бюрократаў, што не перашкаджала ім падтрымліваць інтарэсы і рускіх, і польскіх паноў на Беларусі і быць пужалам для забітага беларускага селяніна. Вызвалены юрыдычна з панскай няволі ў 1861 годзе, селянін зноў папаў у новую прыгонную залежнасьць пры дапамозе інстытуту земскіх начальнікаў.

У 1890 годзе, паводле пропозыцыі таго самага Толстога, была ў Расіі праведзена «рэформа земства». Калі і па рэформе 1864 г. земства было замаскіраванай саслоўна-дваранскай інстытуцыяй, то цяпер была скінута нават і гэтая маскіроўка. Дваране паводле новай рэформы пападалі ў земскія органы не як земляўласьнікі, а проста, як дваране. Лік дваранскіх месц быў значна павялічан за кошт недваранскіх. Ідуць увесь час разгаворы, каб надарыць гэтым «рэформаваным» земствам і Беларусь. Але заходнім губэрням імпэрыі не ўдалося пакаштаваць і такога земства. Расійскі ўрад ня верыў польскаму дваранству ў заходніх губэрнях і баяўся, як-бы яно, арганізованае ў земскіх установах, не ўтварыла опозыцыі «искони русским началам», каторыя насаджваліся на захадве імпэрыі. Дзеля гэтага толькі ў 1903 годзе для

Беларусі было падаравана яшчэ раз «рэформаванае» земства. Было выдана так званае «положение об управлении земским хозяйством в 9 западных губерниях». У лік гэтых 9 шчасьлівых губэрань з Беларускай тэрыторыі ўвашлі толькі Магілеўская, Віцебская і Менская губэрні. На аснове «положения» ў губэрні ўтвараліся ўстаўвадаўчыя органы, губэрскія комітэты ў справах земскай гаспадаркі. Склад іх быў бюрократычны. Старшынёю комітэту па абавязку лічыўся губарнатар. Частка членаў комітэту складалася з мясцовых земляўласьнікаў, назначаных міністрам унутраных спраў, паводле прадстаўленьня губарнатара. Такім спосабам з мясцовых польскіх земляўласьнікаў урад адбіраў самых добранадзейных. Другая частка членаў складалася з вышэйшых губэрскіх ураднікаў. Яны былі як-бы процівагай у вадносінах да першай польскай часткі. Усе члены комітэту носяць назву земскіх гласных. Выканаўчым органам комітэту зьяўляецца губэрская земская ўправа, каторая складаецца з старшыні і трох-пяці членаў; усіх іх назначае міністар. Павятовы комітэт у справах земскай гаспадаркі складаецца з старшыні—павятовага маршалка шляхецтва, вышэйшых павятовых чыноўнікаў і некалькіх валасных старшынь, па назначэньні губарнатара. Земская ўправа на павеце мае на чале таксама павятовага шляхецкага маршалка і складаецца з 3-4 гласных, назначаных губарнатарам. Баючыся вольнадумства нават такога земства, урад зрабіў пастанову, каб усе каштарысы яго па заходніх губэрнях (з даходнымі і расходнымі артыкуламі) зацьвярджаліся ў цэнтры Гасударственным Саветам.

З такім характарам «земства» на Беларусі існавала з 1903 да 1911 году. У 1911 годзе яно ўрэшце дачакалася, што яму на абшары трох вышэйпамянёных губэрань, урад падараваў «Земское Положение» 1890 году. Зноў, баючыся ўплыву на мясцовае жыцьцё польскіх земляўласьнікаў, урад даў на Беларусі выбарнае права праваслаўнаму духавенству, апроч таго, на губэрню праводзіўся адзін гласны ад вясковых вобчастваў. Зразумела, што й такое земства таксама ня мела ўплыву на разьвіцьцё гаспадаркі на Беларусі.

Вызваленьне сялян на Беларусі выклікала малазямельле, якое павялічвалася з кожным годам, аб чым мы ўжо гаварылі раней. На 5 беларускіх губэрань—Віленскую, Горадзенскую, Менскую, Магілеўскую і Віцебскую—лік надзельных сялянскіх зямель складае толькі 35,1 проц. усяго абшару, у той час, як прыватнаўласьніцкія землі складаюць 55 проц. Асабліва пацярпела сялянства Меншчыны. Тут мы маем прыватнаўласьніцкай зямлі 60,7 проц., а надзельнай сялянскай толькі 25,9 проц. (лічбы мы бярэм па проф. Фортунатаву). Зразумела, што селянін з такога надзелу карміцца ня можа. Ён шукае выйсьця ў арэндзе чужой зямлі. Беларускі прыватнаўласьнік моцна трымаецца за

свой маёнтак і абрабляе яго цалком, стараючыся інтэнсіфікаваць сваю гаспадарку і прыстасаваць да тэхнічнай апрацоўкі сырыя продукты, дабытыя з зямлі. Дзеля гэтага дастаць у варэнду кавалак зямлі з маёнтку вельмі трудна. Дзе-ні-дзе селяніну ўдаецца дастаць арэнду з маёнтку пры умове аплаты арэнды сваёю працаю. Наадварот, моцна разьвіваецца батрацтва: прыватнаўласьніцкія маёнткі на Беларусі апрацоўваюцца як пастаяннымі вяскова-гаспадарскімі рабочымі, так і сэзоннымі. Але гэта ня вычэрпвае лішніх рабочых рук. Селянін за працаю ідзе ў горад. Серадняцкае сялянства запаўняе сваймі дзяцьмі танныя школы: настаўніцкія сэмінарыі, гарадзкія вучылішчы. Стыпэндыі часта прывабліваюць сюды і беднату. Наплыў сялянскіх дзяцей учыняе тут такі конкурс, якога ня ведалі вышэйшыя спэцыяльныя тэхнічныя школы. Сярэднія лічбы конкурсу ў настаўніцкую сэмінарыю такія: прыяжджае на экзамэн 350-400 хлапцоў, а прымаецца ў школу 30-35 вучняў. Бедната з вёскі прагнецца папасьці на фабрыкі і заводы. Гарады ня могуць прыстроіць новага пролетара дзеля таго, што яны ня маюць шырока разьвінутай фабрычна-заводзкай прамысловасьці. Апроч таго, гарады і мястэчкі Беларусі набіты рамясловаю і пролетарскаю яўрэйскаю беднатою, каторую сілком сабрала сюды з аднаго боку мяжа аселасьці, з другога боку—часовыя правілы 1882 году. Перапаўненьне гарадоў беднатою як яўрэйскаю, так і беларускаю, утварыла тут сыстэматычнае масавае безрабоцьце. Трэба было шукаць выйсьця. І вось пацягнуліся безработныя з Беларусі ў далёкую Амэрыку, шукаючы там працы й лепшай долі. З кожным годам эміграцыя ў Амэрыку ўсё расьце. Апроч Амэрыкі, з 1889 году, калі быў выдан закон аб перасяленьнях, безьзямельле і малазямельле гоняць беларускага селяніна ў халодную Сібір. Да вайны ў Сібір выехала каля 800.000 перасяленцаў з Беларусі.

У 1882 годзе быў адчынен і ў 1883 годзе пачаў свае опэрацыі Сялянскі Зямельны Банк. За сваю мэту ён паставіў пашырэньне сялянскага земляўладаньня. Зразумела, што банк не памог безьзямельным і малазямельным, бо ў іх ня было грошай на гандлёвыя опэрацыі. Да банку зьвярнулася зусім малая частка беларускай сялянскай беднаты. Яны зрабілі з банкам умовы, унесьлі першыя ўзносы, а потым іх землі, як землі неакуратных плацельшчыкаў, вярнуліся назад у банк. Заможнае сялянства, а часам і серадняк праз банк крыху павялічылі свае надзелы, але гэтае павялічэньне было нязначным. У Меншчыне, напрыклад, каторая мела 57,3% малазямельных, праз банк было куплена толькі каля 500 дзесяцін зямлі. Банк ня столькі памог малазямельным, колькі дапамог расслаеньню беларускай вёскі. Заможнае сялянства прыкупіла зямлі, а незаможнае, як і раней, ішло па шляху пролетарызацыі, павялічваючы лік тае клясы, каторая потым стала на чале рэволюцыі.

## Беларускі рух у канцы XIX сталецьця.

Беларускі рух у трэцяй чвэрці XIX ст. быў у сваёй сутнасьці выяўленьнем народніцтва двух кірункаў. Адзін кірунак народніцтва выцякаў з лібэральнага шляхецкага народафільства. Ён насіў сантымэнтальна-ўтопічны характар. Тыповым яго прадстаўніком і выявіцелем быў беларускі пісьменьнік Вінцэнты Дунін-Марцінкевіч. Другі кірунак народніцтва, зьвязаны сваймі карэньнямі з рускім рэволюцыйным народніцтвам 60-х і 70-х гадоў, насіў практычна-рэволюцыйны характар. Ён быў поўна і яскрава прадстаўлен чырвоным дыктатарам Беларусі ў часы паўстаньня 1863 году, Кастусём Каліноўскім і яго таварышамі па зброі. І ў далейшыя часы беларускі рух зьяўляецца выражэньнем народніцтва, каторае прыме толькі новую ахварбоўку.

Спроба часу і экономічнае разьвіцьцё Беларусі скінулі з марцінкевіцкага народніцтва сантымэнтальны утопізм. Вярнуцца да яго зноў ня было ўжо ніякай магчымасьці. Мураўёўшчына і далейшыя часы царска-дваранскай рэакцыі задушылі запал рэволюцыйнага народніцтва эпохі паўстаньня. У далейшыя часы народніцтва пашло па сярэднім шляху паміж двума крайнімі старымі, па шляху радыкальна-дэмократычнаму.

Народнік-беларус апошняй чвэрці XIX ст. па сваім соцыяльным палажэньні найчасьцей ёсьць зьбяднелы дробны шляхціц. Зямлі ў яго ўжо няма. Ён павінен шукаць хлеба ці шляхам атрыманьня службовай пасады, ці вольнай інтэлектуальнай працай. Гэта той гісторыка-соцыяльны тып, каторы атрымаў вядомую ўсім назву рознанчынца-інтэлігэнта. Ён, трэба прызнаць, умее вельмі блізка й шчыра падыйсьці да простага, працоўнага беларускага люду. Паміж ім і беларускім селянінам ужо не стаіць маёнтак. Даволі часта новы народнік зьяўляецца былым удзельнікам польскага паўстаньня 1863 году ў яго чырвоным кірунку. Ён пералжыў слаўныя часы рэволюцыі Каліноўскага, перажыў цяжкі кулак мураўёўшчыны і рэакцыі далейшых часоў. Усё гэта навучыла яго, што да селяніна трэба падыходзіць рэальна.

Селянін на Беларусі жыве ў цяжкіх умовах. Яго душыць малазямельле і безьзямельле. Ён вядзе цяжкую барацьбу за сваё існаваньне ў нявыноснай беднасьці, у цемнаце і несьвядомасьці. У свае часы народнік у стылі Марцінкевіча быў пераканаты, што прычына цяжкага стану селяніна крыецца ў надужыцьцях благіх паноў, аканомаў, арандароў і другіх падпанкаў. Не такія настроі і пераконаньні народніка 80-х і 90-х гадоў. Ён добра разумее, што гарапашніку-селяніну жывецца на Беларусі дрэнна не ад гэтых дробных надужыцьцяў, а ад таго, што ён выносіць на сваім карку сучасны яму лад жыцьця, пабудованы на экономічнай эксплёатацыі і на політычным прыгняценьні працоўных

мас. Што датычыць да Беларусі, то на яе абшары экономічная эксплёатацыя і політычны уціск моцна зьвязаны з нацыянальным прыгняценьнем. Папярэдняя гісторыя аставіла тут цяжкую спадчыну: соцыяльныя групіроўкі, пануючыя экономічна і політычна на Беларусі, належаць да другіх нацый, культурна вышэйшых ад беларускай нацыі, да каторай у сваёй масе належыць беларускі селянін. Беларускі селянін экономічна й політычна прыгнятаецца польскім ці рускім панам і рускім чыноўнікам, а разам з ім прыгнятаецца яго мова й культура. Пан і вураднік бачаць у васобе селяніна ня толькі прадстаўніка асобнай соцыяльнай групы, але й прадстаўніка асобнай нацыі. Яны душаць яго з гэтых двух бакоў. Такім спосабам народніцтва канца XIX ст. на Беларусі зноў, як і раней, павінна было паставіць радам сялянскае соцыяльнае пытаньне і беларускае нацыянальнае пытаньне. Народніцтва, такім чынам, разам з тым было й беларускім рухам. Само сабой зразумела, што народнік на Беларусі, калі хацеў блізка падыйсьці да селяніна і быць для яго зразумелым, то ён павінен быў зьвярнуцца да яго і пісаць аб ім у тэй мове, якой думае й гаворыць селянін. А селянін на Беларусі карыстаўся сваёй «простай», беларускай мовай. Калі народнік у цэнтральнай Расіі піша парускu, то для беларускага народніка абавязкова беларуская мова. Калі народніку Расіі рускай мовы абараняць ня трэба, то народніку Беларусі прыходзіцца абараняць беларускую мову, каторая ўціскаецца разам з беларускім селянінам.

Тыповым прадстаўніком беларускага народніцтва, а разам з тым і беларускага руху гэтага часу зьяўляецца Францішак Багушэвіч, каторы пісаў пад псэўдонімамі—Мацей Бурачок і Сымон Рэўка з-пад Барысава (1840—1900). Радзіўся ён у Віленшчыне, у Ашмянскім павеце. Бацькі яго належалі да дробнай шляхты і жылі даволі бедна. Сярэднюю асьвету Багушэвіч атрымаў у Вільні, а для вышэйшай адукацыі паступіў у Пецярбурскі унівэрсытэт на фізыка-матэматычны факультэт. Перад паўстаньнем 1863 году пясьняр кідае навуку і едзе на бацькаўшчыну. Тут ён займае пасаду вясковага настаўніка ў Дацішках і прымае дзейны удзел у паўстаньні. Пасьля аднэй бойкі, паранены ў нагу, Багушэвіч апынуўся ў беднай сялянскай хаце. Селянін схаваў раненага настаўніка ад рускіх жандараў і пасьля доўгага лячэньня адхадзіў песьняра. Калі паўстаньне было задушана, ён зноў узяўся за навуку. Неяк яму ўдалося паступіць у Нежынскі юрыдычны ліцэй, каторы ён і скончыў у 1868 годзе. Потым пашла служба па судовых пасадах у розных кутках імпэрыі (Чарнігаў, Волагда і г. д.). Даволі доўга пражыў Багушэвіч на Украіне, дзе ён займаў пасаду сьледавацеля пры судзе ў Канатопскім павеце. Тут ён азнаёміўся з украінскім рухам і навучыўся гаварыць паўкраінску. Толькі пад старасьць удалося яму

перабрацца на Беларусь. Тут ён працаваў у Вільні—раней як адвакат, потым—як міравы судзьдзя. Апошнія годы жыцьця пясьняр пражыў у сваім невялікім фальварку Кушляны ў Ашмяншчыне.

Багушэвіч пісаў у 80-ыя і 90-ыя годы. Творы яго, як і творы другіх радыкалаў-народнікаў, не маглі друкавацца ў Расіі, тым больш, што яго творы зьявіліся ў беларускай мове, каторая была забаронена ў 1867 годзе. З твораў Багушэвіча зложыліся зборнікі: а) «Дудка Беларуская», надрукованая ў Кракаве, у 1891 годзе, пад псэўдонімам Мацея Бурачка, б) «Смык Беларускі», надрукованы ў Пазнані, у 1894 г., пад псэўдонімам Сымона Рэўкі з-пад Барысава, в) «Беларуская Скрыпачка» і др. рукапісы, каторыя так і не маглі ў тыя часы пабачыць сьвету.

Забарона беларускага друку балюча адазвалася на творчасьці беларускіх народнікаў. Вось чаму ў першым сваім зборніку «Дудка Беларуская» аўтар у прадмове да зборніку з болем у сэрцы ставіць пытаньне аб мове. Беларуская мова забаронена урадам, над ёю зьдзекуюцца рускія і палякі, як над моваю «мужыцкай, хамскай»; нідзе ёй няма месца, апроч сялянскай хаты. Багушэвіч тым ня менш будзе пісаць у гэтай мове свае творы і будзе бараніць яе ад усіх нападаў. «Братцы мілыя, дзеці Зямлі-Маткі маей! Вам афяруючы працу маю, мушу з вамі пагаварыць троху аб нашай долі-нядолі, аб нашай бацькавай спрадвечнай мове, каторую мы самі, да й не адны мы, а ўсе людзі цёмныя мужыцкай завуць, а завецца яна беларускай». Далей аўтар прызнаецца, што раней і сам ён, паддаючыся агульнаму погляду, лічыў беларускую мову мужыцкай, але знашліся добрыя людцы, каторыя пазнаёмілі яго з гэтай мовай і пераканалі яго ў тым, што яна— мова народу. Апроч таго, ён сам чытаў старыя урадавыя паперы і навуковыя творы, напісаныя ў гэтай мове і пераканаўся яшчэ раз, што беларуская мова такая самая, «як француская альбо нямецкая, альбо іншая якая», што яна ёсьць ня мова толькі «мужыка», а мова народу.

Як-жа гэта так зрабілася? Справа ў тым, што зьняважана доля беларуса, што беларус у масе ёсьць «мужык». А калі так, то зьняважана і яго мова, якая стала мовай «мужыка». Усе народы, нават зусім маленькія народы, нашыя пабрацімцы (харваты, чэхі, баўгары і інш.), і чужыя (яўрэі) маюць пасвойму пісаныя і надрукованыя кніжачкі і газэты. Усе маюць магчымасьць учыць сваіх дзетак у тэй мове, на якой яны гавораць. «А ў нас, як-бы захацеў цыдулку ці да бацькі лісток напісаць пасвойму, дык можа-б і ў сваёй вёсцы людзі сказалі-б, што піша памужыцку і, як дурня, абсьмяялі-б» (Прадмова). Тым ня менш Багушэвіч будзе пісаць «памужыцку», бо ён «мужыцкі» і разам з тым беларускі пясьняр.

Цяжкое жыцьцё выпала на долю беларуса-селяніна. Панурая хатка яго ледзьве трымаецца. Яна—«і цячэ, і гніе, і крывая, у сярэдзіне гной і стаіць на гнаі». Увесь свой век беларускі селянін без перарыву працуе, але ад працы яго маюць здабытак другія, а ня сам ён. «Арэ, сее усё лета, а як прыдуцца дажынкі, няма збожжа ні асьмінкі». Вось, глядзі, стаіць высокі, аж да неба, касьцёл, узросшы на крывавым поце земляроба. Валаснoе праўленьне, пакрытае бляшаным дахам, пануе над сялянскімі хатамі. Калі трэба, то земляроб пакрые яго нават



Хата беднага селяніна.

срэбрам, бо з яго ўсё можна выбіць. А сам гарапашнік «жыве ў мокрай яме, дзьверы заткнуў анучамі». Усё зрабіў селянін сваёю працаю, але не для сябе. З працы яго карыстаюць «разумнейшыя», а ён, вядома: «дурны мужык, як варона».

Глыбокая, бяздонная прорва падзяляе людзей на два процілеглыя лягеры. На адным баку прорвы стаіць працоўны люд Беларусі. Ходзіць ён у лахманох, бо яму няма ўва што апранацца. Жыве ён у сваёй хаце, як у хлеве, разам з кароваю, сьвіньнямі і курамі. Прыдзе зіма, ён мерзьне. Звычайная яда яго—хлеб з мякінаю. На другім баку соцыяльнай прорвы стаіць заможны, багаты пан. Ходзіць ён у срэбры-золаце, мае многа пакояў, чыстых, сьветлых і цёплых. Яда яго смачная, толькі

мяса і пірог. Нічога ён на сябе ня робіць, бо на яго працуюць дзесяткі служак. Зразумела, што ад такога жыцьця ён толькі таўсьцее; «рукі яго, як падушкі, як кісель дрыжыць жывот». Разам з панам знаходзіцца улада і царква, каторыя таксама зьяўляюцца ворагамі сялянскай беднаты: «асэсар зганяе, зьдзірае і муча нас досьць, а поп сабе так-жа дзярэць з нас бывала».

Інтэлігэнт належыць таксама да соцыяльнай групіроўкі паноў. Вопратка яго панская. Ходзіць ён «у храку», у кашулі белай, «як той сьнег, як папер». І праца яго чыстая, ад каторай ня бывае мазалёў на руках. Тым ня менш, да гэтага інтэлігэнта аўтар зьвяртаецца ад імя селяніна, заклікаючы яго на працу для народу. Аўтар кажа: далонь мужыка пакрываюць мазолі, ходзіць ён у грубой сярмязе, у прапацелай, тыдзень нямытай кашулі; жыве ён у бруднай і цёмнай хаце, каторая «і цячэ, і гніе, і крывая». І вось дзеля ўсяго гэтага інтэлігэнт павінен ня цурацца селяніна, а падаць яму руку дапамогі, давясьці да простага, торнага шляху, каб ён ня блудзіў сярод лому і тых калючак, каторыя, «раняць ногі й сэрца», раджаючы ў ім «злосьць і ненавісьць». Ты, інтэлігэнт, «пазнаў, што ў кніжках стаіць,—а там розуму шмат ад вякоў,—і ўсё можаш па ксёнжках рабіць. А дзе-ж ксёнжка для нас—мужыкоў?» Гэтай «ксёнжкі», «ксёнжкі», зразумелай для селяніна зьместам і мовай, няма. Інтэлігэнт павінен утварыць яе, а пакуль яна ня ўтворана, замяніць яе сваім вусным словам.

Ад цяжкай працы, ад гарамычнага жыцьця ў голадзе і холадзе выраджаецца й вымірае беларускі селянін, а разам з ім вымірае фізычна й культурна беларускі народ, прадстаўлены сялянствам. Вось чаму засмучана сэрца песьняра. Вось чаму дудка песьняра ніяк ня зможа зайграць вясёлых мэлёдый. Сорак год б'ецца пясьняр, як тая рыба аб лёд, і ніяк ня зьвернецца, ніяк не патрапіць на кроплю такой вадзіцы з такой крыніцы, «што як хто нап'ецца, дык вольным стаецца». Пясьняр грае на «смутнай жалейцы», каторая як зайграе, то аж жудасна стогне зямля. Плачуць вочы песьняра, плача яго дудка-жалейка над нявыносна-цяжкай доляй народу, над яго выміраньнем. Багушэвіч зьвяртаецца да сваёй дудкі з такімі горкімі словамі:

Што дзень і што ночы
Плач, як мае вочы,
Над народу доляй,
І плач што раз болей!
Плач так да астатку,
Галасі, як матка,
Хаваючы дзеці,
Дзень другі і трэці,
Іграй сьлёзным тонам
Над народу сконам!

З выміраньнем беларускага селяніна, вымірае беларускі народ. Разам з мужыцкім народам вымірае яго мужыцкая беларуская мова. І здаецца песьняру, што калі захаваць мову беларускую, то не сканае і народ беларускі. Вось чаму ў прадмове да сваёй «Дудкі Беларускай» Багушэвіч зварачаецца да селяніна з такімі словамі: «А можа сапраўды наша мова такая, што ёю нічога добрага ні сказаць, ні напісаць няможна? Ой, не! Наша мова для нас сьвятая, бо яна нам ад бога даная, як і другім добрым людцам, і гаворым-жа мы ёю шмат і добрага, але так ужо мы самі пусьцілі яе на зьдзек, не раўнуючы, як і паны вялікія ахватней гавораць пафранцуску, як пасвойму... Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш мову сваю так, як той чалавек прад сканаьньем, катораму мову займае, а потым і зусім памёрлі. Не пакідайце-ж мовы нашай беларускай, каб ня ўмерлі». Мова, на думку аўтара, ёсьць «адзежа душы» народу. Па мове пазнаецца народ, па мове пазнаецца й тэрыторыя народу. «Можа хто спытае: дзе-ж цяпер Беларусь? Там, братцы, яна, дзе наша мова жывець: яна ад Вільні да Мазыра, ад Віцебска за малым чым не да Чарнігава, дзе Гродна, Менск, Магілеў, Вільня і шмат мястэчкаў і вёсак».

Багушэвіч беларускую мову селяніна лічыць сваёй моваю. Ён называе яе «нашай мовай». Ува ўсіх яго творах адчуваецца глыбокая патрэба «сайсьці ў народныя нізы», як гаварыў яшчэ раней Марцінкевіч, працягнуць сялянскай беднаце руку, памагчымасьці зьліцца з ёю і яе пажаданьнямі.

Зусім так настроен і другі народнік апошняй чвэрці XIX ст. Янка Лучына (праўдзівае прозьвішча яго—Ян Няслухоўскі). Радзіўся ён у сям'і менскага адваката ў 1851 годзе. Пасьля сканчэньня сярэдняй школы, ён потым вучыўся ў Петраградзе, дзе скончыў тэхнолёгічны інстытут. Нейкі час служыў на жалезнай калеі на Каўказе, а потым працаваў у жалезна-дарожным тэхнічным бюро ў Менску. Няслухоўскі пісаў папольску і пабеларуску. Беларускіх твораў яго дашло да нас вельмі мала. Праўда, і польскія яго творы апісваюць беларускае жыцьцё. У 1891 годзе заграніцаю была выдадзена невялічкая кніжачка яго беларускіх вершаў пад назваю «Вязанка». У 1903 годзе яна была выдана ў Петраградзе гуртком беларускіх студэнтаў. Кажуць, што яна прашла праз цэнзуру пад відам баўгарскай поэзіі. Апроч таго, некаторыя вершы Няслухоўскага неяк папалі ў кніжкі «Северо-Западного Календаря» і ў «Минский Листок». Вершы «Вязанкі» малююць яскрава гаротную долю беларускага селяніна, яго думкі й пажаданьні, даюць малюнкі беларускай прыроды, жывёл, птушак і г. д. Аўтар лічыць, што ён моцнымі ланцугамі скуты з беларускім мужыцкім народам. Яго песьні ёсьць толькі выраз гаротных думак прыгнечанага беларускага народу. У вершы-прадмове да сваёй «Вязанкі» Няслухоўскі вельмі



Панскія палацы (дв. Лагойск, Менскай акругі).

яскрава выказвае тэта. «Не я пяю,—народ божы даў мне ў песьні лад прыгожы, бо на сэрцы маю путы і з народам імі скуты. З ім я зьліўся з добрай волі, чы то ў долі, чы ў нядолі, чы гдзе гора абзавецца,—як асіна, грудзь трасецца, чы пра радасьць чую весьці,—усё ў грудзь хаваю дзесьці. Мне гавораць вёска, хата, мне гаворыць сэрца брата. Рад, зьбіраю, што пачую, у грудзэі сваёй нашу я, аж, як кветка на кургане, яно ўзыдзе, песьняй стане».

Працоўныя масы беларускага сялянства выміраюць ад непамернацяжкага жыцьця. Але ёсьць яшчэ непрацоўная частка жыхарства на Беларусі—гэта паны ўсякіх рангаў. Здаецца, што іх жыцьцё—запраўдны рай. Яны спраўляюць свае «панскія ігрышчы», банкетуюць, п'юць, ядуць і гуляюць. Беднага, цёмнага селяніна Юрку («Панскае ігрышча», Багушэвіча) нават завідкі бяруць, калі ён глядзіць на такое жыцьцё. Ён кажа: «Вось, каб гэтак мы гулялі і так пілі, і так елі». Багушэвіч вызначае Юрцы («Адказ Юрку на «Панскае ігрышча»), што няма тут чаму завідваць. Калі ён, Юрка, гібее ад цяжкай працы, голаду й холаду, то вымірае й панства ад адсутнасьці працы, абжорства і п'янства. «А што паны ядуць ласа і што смагла могуць ліць: ото соляць сваё мяса, бо ўжо сталі чыста гніць». Вымірае селянін, а побач з ім гніе і пан на Беларусі.

Прышла на беларускую вёска новая сіла—гарадзкі грашовы капітал. Народніцтва бачыць у гэтай новай сіле толькі адмоўны бок, не прыкмячаючы таго, што новая сіла нясе ў вясковае і гарадзкое жыцьцё Беларусі новы творчы соцыяльны элемэнт у васобе пролетара. Народнік зьвяртае увагу толькі на тое, што з прыходам новай сілы зьяўляецца на вёсцы новы экcплёататар—грашавік. Новая пражэрлівая акула будзе пажыраць і прадстаўнікоў старога зямельнага капіталу. Заскача пад яго дудку ня толькі селянін, але й вяльможны пан. Вельмі часта новы тып экcплёататара быў прадстаўлен у беларускай вёсцы грашавіком-яўрэем у постаці шынкара, арандара, пактара і г. д. Не прыкмячаючы нарастаючага ў кругох беларускага яўрэйства пролетарыяту, народнік Багушэвіч бачыць на вёсцы толькі яўрэяэксплёататара, каторага ён малюе ў сваім вершы «Жыдок». Зьяўляецца на вёску шынкар Бэра. Ён мае ярмолку, трэпкі, цыцаль, у балахоне новы гіцаль, шэсьць дзяцей ад жонкі Рохлі, паўасьміны картоплі, столік, шафку, дзьве чаркі, карафку, паўкварты з дзьвюма днамі. Маетнасьць невялікая. Праз тры гады шынкараваньня Бэра мае кароў з дзесятак, даволі хлявоў, хатак, коніка, павозку і г. д. Усе цяпер яго паважаюць. У яго руках уся мясцовая адміністрацыя. «Ён з судзьдзёю, ён з маршалкам, ён з пасрэднікам, як валкам, круціць імі, усё зробе: табе добра й сам заробе». Тыпова тое, што экономічны уціск капіталістага новага тыпу для селяніна ўсё-ж такі лягчэй, чым уціск пана, бо

Бэра ня зьдзекуецца з асобы селяніна; ён стрыжэ, а не дзярэ скуру, як рабіў заўжды на Беларусі фэўдальны абшарнік-пан. «У бядзе ён і пазычыць, а заробіш, ён заліча. Добры жыд, хоць грошы любіць, а згубіць зусім ня згубіць».

Народніцтва 80-х і 90-х гадоў на Беларусі носіць ня проста лібэральны, а радыкальна-дэмократычны характар. На такі яго характар зрабіла свой ўплыў паўстаньне 1863 году сваёй чырвонаю часткаю ў васобе чырвонага дыктатара Беларусі, Кастуся Каліноўскага. Яно ня мірыцца з самаўладзтвам Расіі, яно ня лічыць за добрае «Великие реформы» эпохі Аляксандра II. Адсутнасьць на Беларусі земстваў падтрымвае такі яго настрой, не даючы магчымасьці народнікам на Беларусі ўліцца ў легальнае русло рускага земскага лібэралізму. Забарона беларускага друку яшчэ больш робіць моцным радыкальна-дэмократычны кірунак беларускіх народнікаў.

Народнікаў-беларусаў зусім не здавальняе вызваленьне сялян, што нарабіла столькі лібэральнай шуміхі. Праўда, няма прыгону, няма й паншчыны з усімі да яе дадаткамі. Але вызвалены селянін ад гэтага ня вышаў на лепшы шлях жыцьця. Замест аднаго пана, цяпер іх стала яшчэ больш. «А цяпер? Ой, штосьці кепска выходзе. Цяпер ці ня болей настала паноў?! Ня надта свабодна ў гэтай свабодзе. І давай я лічыць паноў новых зноў: стараста, соцкі, пісар, старшыня, пасрэднік, вураднік, асэсар, і суд, зьезд міравы, прысуцтвы і сход... Аж паднялася ад страху чупрына, аж пальцаў ня стала на ўвесь гэты шчот... А пальцамі-ж трэба карміць гэты люд». («Быў у чысцы» Багушэвіча).

Рэформаваны суд, каторым так захапляліся рускія лібэралы, таксама не здавольвае беларускіх народнікаў. Новы суд—зусім незразумелы для селяніна і па сваім працэсе, і па мове. Старое зьдзірства не прыпынілася, дзякуючы новаму суду. У вершы Багушэвіча «У судзе» даецца яскравы малюнак адносін да суду цёмнага селяніна. Пантурка папаў у суд за тое, што ў пушчы меў патайны браварок. Акцызьнік даўно ведаў пра гэты браварок і браў з Пантурка ўзяткі за маўчаньне. Потым, пабачыўшы, відаць, што з Пантурка мала можна ўзяць, напісаў на яго пратакол, і справа папала ў суд. Пантурка засудзілі ў турму, а апавяданьнік, каторы быў сьведкаю на судзе, канчае сваё апавяданьне так: «Я-ж якось уцалеў ад суду ў той час. Каб-жа бог не давёў на той суд другі раз».

Да народнікаў прымыкаюць больш умеркаваныя інтэлігэнцкія колы лібэральнага кірунку. Іх цікавіць культурная праца сярод сялянства ў легальных рамках. Лібэралы-культурнікі ў 90-ыя гады XIX ст. робяць спробы ўтварыць зусім популярную літаратуру чыста практычнага характару, каторая магла-б прасякнуць у глухую вёску і заці-

кавіць там сваім зьместам беларускага селяніна, як вясковага гаспадара. Выдаўцам такой беларускай літаратуры зьяўляецца багаты земляўласьнік Менскага павету А. Ельскі, каторы быў опозыцыйна настроен у вадносінах да рускага ураду. Апіраючыся на свае багацтвы і сувязі ў пецярбурскіх чыноўных колах, ён робіць спробу заснаваць беларускае выдавецтва. Спроба скончылася нічым. Тым ня менш, Ельскаму ўдалося, ня гледзячы на забарону 1867 году, выпусьціць некалькі невялічкіх кніжачак у беларускай мове спэцыяльна для селяніна, напрыклад, «Аб перасяленьні», «Аб п'янстве» і г. д.

У 80-х і 90-х гадох у Менску і другіх губэрскіх і павятовых гарадох Беларусі зьяўляюцца невялікія гурткі вучняў. Складаюцца яны з вучняў старэйшых кляс гімназіі, рэальных вучылішч, настаўніцкіх і духоўных сэмінарый. Гурткі ўбіраюць у сябе больш здольную моладзь, каторай ня можа здаволіць офіцыяльная схолястыка царскай школы. Звычайна гэта моладзь трымаецца опозыцыйнага настрою і належыць да радыкальна-дэмократычнага, народніцкага кірунку. Паміж асобнымі гурткамі розных школ вельмі часта ўстанаўліваецца сувязь і вядуцца жывыя зносіны. Поруч з рускай забароненай літаратурай сябры гурткоў знаёмяцца з літаратурай польскай і беларускай. Пры гуртках організуюцца невялічкія бібліотэчкі. Адзін з такіх гурткоў у Менску яшчэ ў 1884 годзе выдае першую нелегальную газэту ў беларускай мове пад назваю «Гоман». Газэта сваім зьместам адбівае опозыцыйны настрой вучнёўскай моладзі. Газэта друкавалася на гэктографе і пашыралася сярод вучняў менскіх школ. Апроч агульна-народніцкіх думак, у гуртках вельмі часта спатыкаецца думка аб аўтономіі Беларусі.

1886 годзе ўтвараецца гурток з культурнікаў-інтэлігэнтаў, каторы концэнтруецца каля рускай менскай газэты «Минский Листок». Гурток складаецца большаю часткаю з лібэралаў, каторыя знаходзяцца пад народніцкім уплывам. Сябрамі гуртка зьяўляюцца М. Доўнар-Запольскі, Завітневіч, Ляцкі, Слупскі, Ян Няслухоўскі і інш. Сябры гуртка выяўляюць асаблівую цікавасьць да мясцовае культуры і навукі: гісторыі, археолёгіі, этнографіі і г. д. Свае творы яны зьмяшчаюць часам у газэце «Минский Листок», часам у выдаваемых імі штогод кніжках «Северо-Западного Календаря». Кніжкі «Календаря» выходзяць з вялікаю труднасьцю з цэнзурных перашкод. Тым ня менш, гуртку ўдалося выпусьціць 6 кніжак календара за гады 1888—1893. На апошнія дзьве кніжкі (1892-1893 г. г.) у Менску немагчыма было атрымаць цэнзурнага дазволу, прышлося абіваць парогі цэнзурных установ у Маскве (календар за 1892 год) і Пецярбурзе (календар за 1893 год). Творы аб Беларусі тут друкуюцца ў рускай мове. Часам зьяўляюцца ў беларускай мове, напр., Няслухоўскага. Беларускія вершы выдаюцца за рускія, каб абыйсьці загад 1867 г., забараняючы друк пабеларуску.

Вучнёўскія гурткі на Беларусі ўтвараюць контынгэнт тэй моладзі, катарая пашырае цікавасьць да Беларусі сярод студэнцкіх колаў унівэрсытэцкіх гарадоў Расіі. Для пашырэньня сваёй адукацыі беларуская моладзь, скончыўшая сярэднія школы, накіроўваецца найчасьцей у Маскву і Петраград, а часам у Харкаў, Варшаву, Кіеў, Адэсу і інш. гарады. Па гэтых гарадох і ўтвараюцца студэнцкія беларускія гурткі опозыцыйнага кірунку, з даволі няяснымі програмамі як культурнага, так і палітычнага кірунку.

У Маскве з'арганізаваўся беларускі гурток вельмі цікавым спосабам. У 1891 годзе пасьля студэнцкіх «непарадкаў» было заарыштавана шмат студэнтаў як унівэрсытэту, так і другіх вышэйшых школ.

Седзячы ў Бутырках, студэнты—ураджэнцы Беларусі—арганізавалі «Беларускі Соцыялістычны Гурток», хутчэй народніцкага, чым марксыцкага кірунку. Гурток не распаўся і пасьля выхаду студэнтаў з турмы. Вынікам яго працы быў пераклад Гаршынскага «Сигнала» на беларускую мову і выданьне яго.

У Пецярбурзе ў 1902 годзе студэнты з Беларусі заснавалі гурток пад назваю «Круг беларускай народнай прасьветы і культуры». Гурток выдае на гэктографе невялічкія літаратурныя зборнікі—«Калядную пісанку» і «Вялікодную пісанку». Апроч таго, ён надрукаваў «Вязанку» Няслухоўскага, падаўшы яе ў цэнзуру, як зборнічак баўгарскай літаратуры. Студэнты гэтага гуртка (браты Іваноўскія, Бурбіс, Валейка і інш.) абселіся ў вёсцы Лябёдка, Лідзкага павету і там выдалі на гэктографе газэту «Свабода», толькі адзін нумар. Усё выданьне за выключэньнем двух экзэмпляраў прышлося зьнішчыць пры вобыску.

Амаль што ўсе студэнцкія гурткі—больш народніцкія, чым марксыцкія. Усе носяць рэволюцыйны характар. Ужо адчуваецца наступная рэволюцыя 1905 году.

## Разьвітак рабочага руху і зубатаўшчына.

Калі народніцкі рух на Беларусі быў зьвязан з беларускай вёскай, то рабочы марксыцкі рух нашага краю быў зьвязан з горадам і мястэчкам, каторыя, дзякуючы «межам аселасьці» і другім падобным законам і распараджэньнем царскага ураду, былі перапоўнены яўрэйскім жыхарствам. Калі сялянства на Беларусі было прадстаўлена беларусамі, то пролетарыят і дробнае рамесьніцтва былі прадстаўлены амаль што выключна яўрэйствам. Яўрэйская буржуазія, асабліва буйная, як заможная групіроўка яўрэйства, усялякімі праўдамі і няпраўдамі вырывалася з свайго «гетто» на вольны прастор і знаходзіць больш-менш смачныя кавалачкі за межамі яўрэйскай аселасьці. Ей лягчэй было знайсьці здабычу і на тэрыторыі Беларусі. Зусім інакшым было палажэньне яўрэйскага пролетарыяту і наагул яўрэйскай пра-

цоўнай беднаты. Сьціснутая штучна ў гарадох і мястэчках Беларусі, яна задыхалася ад узаемнай конкурэнцыі і беспрацоўя. Разам з яўрэйскім рабочым душыўся ў вузкім глухім кутку пападаўшы сюды і рабочы другой нацыі. Эксплёатацыя рабочага на Беларусі даходзіць да страшэнных разьмераў. Рабочы дзень даходзіць да 14, а часам да 16 і 18 гадзін у суткі. Рабочы З. Райчук, успамінаючы аб тых часох, піша: «мне было тады ўсяго 15-16 гадоў, але працаваць прыходзілася па 17-18 часоў у суткі» («Звезда», 1923 г. 14/III, № 59).

Само сабою зразумела, што, дзякуючы такім умовам жыцьця, яўрэйскі рабочы, а разам з ім і наогул рабочы на Беларусі павінен быў організавацца і ратавацца ад эксплёатацыі куды раней, чым у Расіі. Рабочыя організацыі па гарадох Беларусі існуюць з пачатку 80-х гадоў. Гэтыя організацыі ў некаторых местах яднаюць шмат рабочых. У Менску, напрыклад, рабочыя марксыцкія гурткі ў 1880-2 г. г. налічваюць па 150-200 чалавек. Цікава, што, ня гледзячы на тое, што пераважнай большасьцю членаў гурткоў зьяўляюцца яўрэі, нацыянальнае яўрэйскае пытаньне тут не стаіць востра. Кіраўнікі і сябры гурткоў карыстаюцца як легальнай, так і нелегальнай літаратурай у рускай і польскай мовах. Інтэлігэнты, каторыя кіравалі гурткамі, лічылі сябе рускімі інтэлігэнтамі. Апроч таго, яны і ня думалі ў той час аб масавай працы сярод рабочых. Сваім заданьнем яны ставілі ўтварыць асобных інтэлігэнтаў з рабочых, каторыя потым у сваю чаргу рабілі сярод другіх рабочых тую самую працу, што й яны. Праўда, абыйсьціся зусім без яўрэйскай мовы ўсё-ж такі было немагчыма, бо яўрэйскія рабочыя ў тыя часы яшчэ менш ведалі рускую мову, чым пазьней. Звычайна заняткі ў гуртку адбываліся так: раней чыталася кніжка паруску ці папольску, а потым размовы аб прачытаным і тлумачэньні вяліся ў яўрэйскай мове.

Кіраўнікі першых гурткоў былі найчасьцей марксыстымі. Народніцтва наагул у 80-ыя годы ў гарадох Беларусі пачало губіць сваю популярнасьць; апроч таго рабочы-яўрэй быў пазбаўлен усякай магчымасьці заняцца сялянскай, земляробскаю працаю і асесьці ў беларускай вёсцы. Ясна, што яго не здавальняла народніцтва, програма каторага была прыстасована да інтарэсаў селяніна. Зьявілася марксыцкая літаратура, што выдавалася замежнай «Групай вызваленьня працы». У рабочых гуртках на Беларусі ў 80-ыя годы пачалі сваю працу многія вядомыя правадыры сучаснага комуністычнага руху. Паміж іх трэба вызначыць Шарля Рапапорта, каторы зьяўляецца цяпер адным з відных францускіх комуністых.

Апроч агульна-асьветных гурткоў, у канцы 80-х гадоў сярод рабочых на Беларусі зьяўляюцца эконömістыя організацыі, як, напрыклад, рабочыя пазычковыя касы. Такія касы былі ў панчошніц, краў-

цоў, скурнякоў і г. д. Кожная каса яднала каля сябе па некалькі дзесяткаў рабочых таго ці іншага рамясла. Тыповым для яўрэйскага рабочага руху было тое, што ў ім прымалі удзел каля 25 проц. жанчынработніц. Гэта валежала ад эканомічнага стану яўрэйскай рабочай масы на Беларусі. У той час, як рабочы-беларус ня згубіў канчаткова сувязі з вёскаю і вясковай гаспадаркай, дзе ён пакідаў для хатняй працы жонку, сястру і дачку, рабочы яўрэйскага пахаджэньня быў моцна прыкуты да гораду і адарваны ад вёскі на грунце «часовых правіл 1882 году». Вёска, затрымаўшая пролетарызацыю працоўнай не-яўрэйскай жанчыны, не існавала для яўрэйскай работніцы.



Яўрэі-кажамякі.

У эканомічных рабочых арганізацыях, каторыя шырэй і глыбей захаплялі яўрэйскую масу, чым агульна-асьветныя гурткі, ужо ня можна было абыйсьціся без яўрэйскай мовы (ідыш). З пашырэньнем працы яўрэйская мова займала тут усё больш і больш месца. Ужо было амаль што немагчыма чытаць кніжкі і артыкулы ў рускай ці польскай мовах. Трэба было іх перакладаць на «ідыш». Такім спосабам, з канца 80-х і пачатку 90-х гадоў пачала зьяўляцца політычная літаратура ў мове «ідыш», раней гэктографаваная, потым друкаваная.

З пачатку 90-х гадоў яўрэйскі рабочы рух ужо робіцца масавым рухам. Усё часьцей і часьцей пачынаюць адбывацца організованыя стачкі. Узмацняецца клясавае пачуцьцё яўрэйскага рабочага, расьце разуменьне сваіх інтарэсаў, расьце яго солідарнасьць з інанацыянальнымі рабочымі Беларусі і з рабочымі ўсяго сьвету. Парываецца сувязь паміж яўрэем-эксплёататарам і яўрэем-рабочым. Клясавая барацьба выклікае організацыі ў розных гарадох Беларусі масавых эканомічных гурткоў, стачачных кас. Касы добра організованы і маюць падрабяз-

гова апрацованы статут. У вадным з статутаў заданьне стачачнай касы вызначаецца так: «Мэта касы—аб'яднаць рабочых, каб змагацца за лепшае жыцьцё і даваць сродкі, якія патрэбны для такога змаганьня. Нашы гаспадары прынуджаюць нас працаваць 14-15 гадзін у дзень і даюць нам так мала, што немагчыма жыць палюдзку. Нам канечне трэба ўсім злучыцца і разам старацца палепшыць сваё палажэньне. Але палепшыць сваё палажэньне мы зможам толькі тады, калі будзем адзін з другім злучаны і будзем змагацца ўсе разам, робячы стачку, г. зн. усе кідаць працу і гэтым прынуджаць гаспадара ўступіць нам ува ўсім, чаго мы патрабуем. Але для таго, каб зрабіць стачку, мы павінны мець сродкі, на каторыя мы маглі-б трымацца... Мы павінны ведаць і памятаць, што ніхто не дапаможа нам грашыма, калі мы будзем мець у іх патрэбу; загэтым мы павінны старацца, каб усімі магчымасьцямі адкладаць грошы хоць-бы й з невялічкай пэнсіі і заснаваць касу, бо чым меншая пэнсія, тым больш трэба змагацца; для гэтай мэты патрэбна такая каса» (Рафес М. Очерки по истории Бунда. 1923, стр. 315—316). Статут ува ўсіх сваіх пунктах падкрэсьлівае значэньне і патрэбу солідарнасьці ўсіх рабочых і праводзіць прынцып самай сьціслай консьпірацыі. Організацыйная частка статуту пабудована на прынцыпе дэмократычнага цэнтралізму: рабочая маса выстаўляе сама сваіх кіраўнікоў, але, выбраўшы іх, яна павінна бясспрэчна іх слухацца. Сходка асобнай касы падпарадкавана раёну, раён—агульна-гарадзкой сходцы.

Такім спосабам, да сярэдзіны 90-х гадоў на Беларусі ўтварыліся рабочыя організацыі, што абхапілі шырокія пролетарскія масы. Яўрэйскі рабочы займаў у гэтых організацыях першае месца і ў якасных і ў колькасных адносінах. Нацыянальнае пытаньне, каторае раней у іх амаль што не адчувалася, у сярэдзіне 90-х гадоў шукае для сябе выхаду. Польскія рабочыя, папаўшыя пад уплыў і кіраўніцтва нацыяналістычнай «Польскай Партыі Соцыялістычнай», пачынаюць адрывацца ад агульна-рабочых мас. Рабочы-яўрэй, гэты «парыя сярод пролетараў», прыгнечаны царскім самаўладзтвам, таксама пачынае цікавіцца нацыянальным яўрэйскім пытаньнем. Шырокі рух яўрэйскіх рабочых, абкружаных з усіх бакоў шовіністычнай ідэолёгіяй дробнага яўрэйскага мяшчанства, сярод каторага пашыраецца сіонізм і каторае жыве ў вузкай сфэры нацыянальных інтарэсаў,—гэты рух паступова прасякаецца нейкім недавер'ем да інанацыянальных рабочых мас і пачынае ізоляваццa на нацыянальным грунце. Праўда, гэтая ізоляцыя не зачыняе яго пролетарскіх вачэй зусім. Ён разумее, што ён куды больш зьвязан з рускім рабочым, чым з сваім «родным» яўрэйскім купцом і фабрыкантам. Хоць ён і парыя мяжы аселасьці, але ён пролетары. Яскравую характарыстыку яўрэйскага клясавага рабочага руху дае

М. Я. Фрумкіна. «Нацыянальны ўціск парадзіў тое хворае нацыянальнае пачуцьцё, каторае прынуджала яўрэйскага рабочага ацэньваць партыі і групоўкі ня з пункту погляду іх об'ектыўнай рэволюцыйнасьці, а з пункту погляду таго, што яны гавораць па пытаньні яўрэйскага роўнапраўя, аб суботнім адпачынку і яўрэйскай мове... Але той самы нацыянальны момант дапамагаў раньняму абуджэньню яўрэйскага пролетарыяту. Надзвычайная згушчанасьць, якую выклікалі асаблівыя гістарычныя умовы, здольнасьць да організацыі, залежная ад бяспраўнасьці, большая ступень эксплёатацыі,—усё гэта вытварала сярод іх (яўрэйскіх рабочых) адпаведныя умовы для разьвіцьця клясавай барацьбы і масавай організацыі, у той час, як такія-ж рамесьнікі, дробна-фабрычныя рабочыя і прыказчыкі ў гарадох Вялікарасіі спалі яшчэ непрабудным сном» («Звезда», 1923 г. 14, III, № 59).

Яшчэ ў 1895 годзе ў асобных кіраўнікоў яўрэйскага рабочага руху пачалі вынікаць думкі аб утварэньні «спэцыяльнай яўрэйскай рабочай організацыі», якая была-б кіраўніцаю яўрэйскага пролетарыяту ў барацьбе за экономічнае, грамадзянскае і політычнае вызваленьне (Рафес, тоже, стр. 36). Такая організацыя і аформілася ў кастрычніку 1897 г. ў Вільні пад імем «Агульнага Яўрэйскага Рабочага Саюзу ў Літве і Польшчы», каторы вядом нам пад назваю «Бунду». Па ўспамінах Ар. Крэмера (Аляксандра) справа заснаваньня Бунду абстаяла так: «Усяго адбылося 3-4 пасяджэньні, былі справаздачы з месц, рэфэрат аб патрэбе Бунду. Ніякіх пытаньняў програмы і тактыкі не разважалася. Дыскусія вынікла толькі наконт назовы. Джон прапанаваў назваць новую організацыю «Яўрэйская Социял-Дэмократыя». Гэта назва ня была прынята. Думалі, што гэта назва ня выказвала-б сутнасьці організацыі, каторая складалася з напалову сырых яшчэ рабочых, якія часта ня мелі ніякага паняцьця аб тым, што такое социял-дэмократыя. Найбольшую ролю ў руху мелі тады экономічныя касы. І вось згадзіліся на назьве «Агульны Яўрэйскі Рабочы Саюз» (Алгемейнэр) Ідышэр Арбэйтэр Бунд). Гаварылі паруску. Паяўрэйску гаварылі, здаецца, толькі Ліза з Коўны і шчаціншчык Абрам. Ніякіх формуляваных рэзолюцый не ўхвалілі. Зрабілі пастанову, каб «Арбэйтэр Штымэ» стаў офіцыяльным часопісам Бунду. Абралі Цэнтральны Комітэт, складзены з трох особ: Ул. Касоўскага, Глеба (Мутніка) і мяне (Рафес, тоже, стр. 42).

Так проста й няпрыкметна адбыўся важны гістарычны факт заснаваньня Бунду, як социял-дэмократычнай організацыі. І гэта зусім зразумела, бо зьезд аформіў толькі тую організацыю, якая была ўжо раней і не адзін год яднала для клясавай барацьбы яўрэйскі пролетарыят. У васнове організацыі ляжалі, як і раней, экономічныя гурткі, стачачныя касы, да каторых цягнула нават клясава несьвядомая

яшчэ маса. Яна, аднак-жа, паступова рабілася сьвядомай, як клясава, так і палітычна, знаходзячыся ўвесь час пад уплывам кіраўнікоў кас, сьвядомых партыйных работнікаў. Уся бундаўская організацыя, як і асобныя стачачныя касы, была пабудована на прынцыпе дэмократычнага цэнтралізму і кожны момант была гатова вясьці барацьбу.

У той час, як Польская Соцыялістычная Партыя замкнулася ў нацыянальных рамках і, такім спосабам, адарвалася ад рускіх працоўных мас, здрадзіўшы лёзунгам старой польскай партыі «Пролетарыят», зьвязанай увесь час з рускім народавольствам, Бунд стаў на процілеглую позыцыю. Ня гледзячы на тое, што ў яго колах зарадзіўся ўжо дробна-буржуазны нацыяналізм, ён цьвёрда разумеў, што яму для сваіх і агульна-рабочых інтарэсаў ня можна парываць сувязі з інанацыянальным пролетарскім рухам. Ён не замкнуўся ў працу сярод выключна яўрэйскіх рабочых мас, а вельмі часта пашыраў свой уплыў на беларускую вёску, дзе яго добра знала вясковая беларуская бедната. Такія беларускія комуністычныя сілы, як Д. Жылуновіч і Д. Чарнушэвіч былі выхаванцамі бундаўскай організацыі.

Бунд ня толькі удзельнічаў у заснаваньні агульна-расійскай соцыял-дэмократычнай організацыі ў 1898 годзе, але быў актыўнейшым організатарам першага ўстаноўчага зьезду Расійскай Соцыял-Дэмократычнай Рабочай Партыі. Гэтым і магчыма аб'яснiць, чаму ўстаноўчы зьезд адбыўся на тэрыторыі Беларусі, у Менску, каторы быў адным з старэйшых і важнейшых цэнтраў Бунду. Такім спосабам, дзякуючы Бунду, каторы быў тэхнічным організатарам зьезду, Менск, сталіца Беларусі, мае гонар быць калыскаю РС-ДРП, а значыць і РКП.

Зноў ня можам прайсьці міма вельмі цікавай характарыстыкі данага моманту, зробленай вядомай рэволюцыянэркай М. Я. Фрумкінай. «Перамога соцыялізму, як момант канчатковага зьнішчажэньня нацыянальнага рабства і бяспраўя, барацьба разам з рабочымі другіх нацый, як адзіны шлях да нацыянальнага вызваленьня,—гэты мотыў зьвінеў у душы яўрэйскага рабочага з першых-жа яго крокаў; і калі інтэлігэнцкі-нацыяналістычныя пабудаваньні пазьней затуманілі гэтую простую, ясную думку, то ў першыя годы яўрэйскага рабочага руху яна была пераважнаю. І ня дзіва загэтым, што, аб'яднаўшы ў 1897 годзе свае, заложаныя яшчэ з пачатку 90-х гадоў, соцыял-дэмократычныя групы ў «Агульны Рабочы Яўрэйскі Саюз», яўрэйскі пролетарыят ужо ў гэты момант меў перад вачыма плян утварэньня адзінае Расійскае Соцыял-Дэмократычнае Рабочае Партыі. Пасілкі Бунду з аднэй стараны і Кіеўскай Групы «Рабочай Газэты»—з другой, што ўвесь час дзейнічалі ў поўным контакце, давялі да скліканьня першага зьезду РС-ДРП. Тэхнічны бок працы ўзяў на сябе Бунд, ужо меўшы практыку ў такіх справах» («Звезда», 1923 г. 14, III, № 59).

Такім спосабам, у Менску, па ініцыятыве Бунду і Кіеўскай Групы «Рабочай Газэты» быў склікан устаноўчы зьезд партыі, праца каторай павінна была абхапіць і абхапіла ўсю царскую Расію. У невялікім дзеравяным доміку на ўскрайне гораду (Захараўская, 135, цяпер Савецкая, 137) няпрыкметна адбылася вялікая справа. На зьезьдзе былі прадстаўлены ніжэйпаданыя організацыі: 1) Бунд, 2) Група Кіеўскай «Рабочай Газэты», 3) Саюзы Барацьбы: Пецярбурскі, Маскоўскі, Кіеўскі, Харкаўскі, Кацярынаслаўскі і 4) Замежны «Саюз Рускіх Соцыял-Дэмократаў». Ад Бунду былі прысутнымі два дэлегаты: Ар. Крэмер і Гл. Мутнік. З другіх удзельнікаў зьезду мы ведаем—



Дом, у якім адбыўся першы зьезд РС-ДРП у 1898 г. ў м. Менску.

Пятрусевіча, Тучанскага, Ваноўскага, Радчанку і Эйдэльмана. У справе програмы і тактыкі на зьезьдзе гаварылі вельмі мала. Больш прышлося абгаварваць пытаньні ў справе організацыі соцыял-дэмократыі на шырокай тэрыторыі Расіі. У гэтым кірунку вяліся перагаворы з літоўскімі соцыял-дэмократамі. Перагаворы не далі рэальных вынікаў. Пэпэсаў на зьезд не заклікалі. Бунд увашоў у партыю, як аўтономная адзінка. Быў абраны Цэнтральны Комітэт партыі з 3-х асоб: Крэмера, Радчанкі і Эйдэльмана і апублікован маніфэст РС-ДРП. Часопісам Цэнтральнага Комітэту была абвешчана Кіеўская «Рабочая Газэта».

Адразу пасьля зьезду пачаліся арышты. Амаль што ўсе удзельнікі зьезду і ўвесь Ц. К. партыі апынуліся ў турме. Тым ня менш, со-

цыял-дэмократыя на Беларусі была організована і магла шырока распачаць сваю працу. Па ўсёй Беларусі пачынаюць організоўвацца рабочыя організацыі як бундаўскія, так і агульна-соцыял-дэмократычныя. Сувязь паміж асобнымі організацыямі мацнее і расьце. Праводзіцца больш рэзкая мяжа паміж марксызмам і народніцтвам.

Пасьля арыштаў соцыял-дэмократычныя організацыі хутка зноў сталі на ногі. Тым ня менш унутранае жыцьцё партыі перажывала цяжкі крызіс. У партыі вынік напрамак, вядомы пад назваю эконамізму. «Эконамістыя» лічылі, што рабочая кляса яшчэ не дарасла да політычных інтарэсаў; што для таго, каб павясьці за сабою рабочую масу, трэба зусім адмовіцца ад політыкі і стаць на грунт толькі эконамічных інтарэсаў рабочых, што зразумела для шырокіх мас і што іх здавальняе. Толькі пасьля таго, як рабочы пройдзе праз гэтую эконамічную стадыю свайго разьвіцьця, да яго магчыма будзе падыйсьці з політычнай агітацыяй. Эконамізм у партыі стаяў у сьціслай сувязі з так званым легальным марксызмам, каторы рабіў на яго ўплыў. «У эконамічным напрамку выявіўся ўплыў буржуазнага лібэралізму, каторы заўсёды і ўсюды, а ня толькі ў Расіі, прагнуўся звузіць заданьне рабочай партыі, зьвясьці рабочы рух да чыста эконамічнай барацьбы, пазбавіць яго рэволюцыйнага клясавага характару». (Батурин Н. Очерк истории социал-демократии в России. М. 1923, стр. 64). Апроч таго, умацаваньню эконамічнага напрамку ў партыі дапамагаў пад'ём у Расіі прамысловасьці ў 90-ыя годы. Фабрыкі былі завалены заказамі, асабліва скарбовымі, прадпрыемцы атрымвалі высокі даход і абараняліся урадам ад чужаземнай конкурэнцыі. Каб ня згубіць даходаў, яны пры эконамічных вымаганьнях рабочых даволі лёгка рабілі ўступкі і здавальнялі рабочых. Выкінуўшы рабочым лішнюю капейку, яны на гэтым зараблялі лішнія рублі. Зразумела, што рабочыя карысталі з гэтага і лёгка ўцягваліся ў эконамічную барацьбу з сваймі гаспадарамі-прадпрыемцамі.

Бунд на Беларусі і ў Польшчы таксама перажываў дамовы крызіс. Яго таксама залівала хваля опортуністычнага эконамізму. У той час, як загранічная група «Іскры» (1900 г.) абараняла позыцыю політыка-эконамічнай барацьбы пролетарыяту з буржуазным ладам, загранічны комітэт Бунду стаў на позыцыю чыстага эконамізму і адмежаваўся ад рэволюцыйна-марксыцкай позыцыі іскраўскай групы.

А між тым організацыя Бунду ўсё больш урастала ў масу. Вярхі Бунду мелі ў сваім складзе значны лік сьвядомых рабочых, што ўвашлі сюды пасьля доўгалетняй працы ў гурткох і касах і не парвалі сувязі з рабочымі масамі. Карані Бунду глыбока ўрасталі ў яўрэйскую рабочую і рамесьнічую гушчу. Рух захапіў такіх дагэтуль неорганізаваных рабочых, як ламавікі, плытнікі, грузчыкі і г. д. Расійскі урад павінен быў зьвярнуць на яўрэйскі рабочы рух асаблівую увагу, бо

гэта быў вельмі шырокі, добра організованы, а загэтым вельмі небясьпечны рух. Тым больш, што яўрэйскі рабочы, баронячы свае інтарэсы, ужо адважыўся выходзіць на вуліцу і выступаць проці існуючага парадку. У 1900 годзе, 23, V, у Вільні да 500 рабочых пад кіраўніцтвам рабочага-шаўца Гіршы Лекерта адбілі ад поліцыі тры асобы, арыштаваныя за пашырэньне проклямацый. Падобныя здарэньні бывалі і ў другіх гарадох. Вось што піша аб яўрэйскім рабочым руху дэпартамант поліцыі 1—VI, 1900 г. Зубатаву, каторы концэнтраваў у сваіх ру-



„Катадральная площча“ ў Менску (цяпер „Пляц Волі“) у палавіне XIX сталецьця.

ках барацьбу з ім: «Абставіны навочна паказваюць, да чаго распушчана яўрэйская маса ў паўночна-заходнім краі і ў якой меры яна зьбіта з глузду рэволюцыйнай пропагандай, каторая за апошнія годы абхапіла ўсю мяжу яўрэйскай аселасьці і на тэрыторыі Царства Польскага ўжо пасьпела вызначыцца некалькімі тэрорыстычнымі актамі, а ўласна забойствам 3 рабочых, западозраных у шпіонажы. Палажэньне, як бачыце, трывожнае і патрабуе прыняцьця хуткіх і рашучых мер (Рафес, тоже, стр. 62—63).

Першае, што зрабіў урад у адносінах да рабочага руху на Беларусі—гэта былі рэпрэсіі. Заход Расіі быў абвешчан «на положении усиленной охраны». У Вільно быў назначан губарнатарам фон-Валь,

вядомы, як старонынік рашучых мер. Поруч з рэпрэсіямі, была высунута сыстэма, катораяа ад імя яе ініцыятара носіць назву «зубатаўшчыны». Рэпрэсіі, каторыя выхоплівалі з рэволюцыйнага руху тых ці іншых барацьбітоў, дасягалі мэты толькі тады, калі рух быў гуртковы, няглыбокі і няшырокі, калі ён выклікаўся дзейнасьцю таго ці іншага інтэлігэнта. Ясна, што пры масавым руху, каторы разьвінуўся на Беларусі, мэтод рэпрэсіі ні да чаго ня прыводзіў. Трэба было скарыстаць недахваты рабочага руху, павялічыць іх і такім спосабам разлажыць рэволюцыйны рух.

Зубатаў надумаў скарыстаць для мэт дэпартаманту паліцыі эканомізм як Бунд, так і ўсёй соцыял-дэмократыі. У бундаўскіх колах, прыняўшых у свой склад вялікія масы і несьвядомых рабочых, эканомізм быў вельмі пашыраны. Нават у кіруючых колах Бунду часта магчыма было спаткацца з думкаю, што палітычная барацьба патрэбна толькі для таго, каб скінуць перашкоды, каторыя стаяць на шляху эканомічнай барацьбы. Апроч таго, у бундаўскіх масах пачаў выяўляцца разлад паміж інтэлігэнцкімі ў агуле вярхамі і рабочымі нізамі. Рабочым здавалася, што вярхі, каторыя клічуць іх да палітычнай барацьбы, гэтым перашкаджаюць эканомічнай барацьбе за паляпшэньне быту рабочых. Зубатаўская пропаганда праводзіць сярод рабочых думку, што палітычная барацьба пакіравана на карысьць буржуазіі, што рабочыя павінны весьці выключна эканомічную барацьбу, у чым іх падтрымае царызм проціў буржуазіі. Такім спосабам, зубатаўшчына была крайнім пунктам эканомізму і легальнага марксызму. Гэта быў прымітыўны зародышавы фашызм нашага часу. Зубатаўшчына вучыла, што рабочыя ў імя сваіх жыцьцёвых эканомічных інтарэсаў павінны йсьці за урадам і выкінуць з сваёй гушчы рэволюцыянэраў, аддаўшы іх у рукі самаўладзтва.

Зубатаўшчына распачалася ў 1900 годзе ў Менску, дзе былі найлепшыя умовы для яе пашырэньня. Тут у бундаўскіх колах быў вельмі пашыран эканомізм. Каб пераканацца ў гэтым, даволі пазнаёміцца з програмаю рабочых гурткоў, каторая была зацьверджана Менскім Комітэтам Бунду. Тут ясна сказана, што рабочы ў пачатку павінен быць уцягнут толькі ў эканомічную барацьбу. Толькі пасьля гэтага ён пастулова ўваходзіць у стадыю палітычнай барацьбы. Прычым палітычная барацьба ў програме абмяжована непасрэднымі эканомічнымі інтарэсамі рабочага. Група бундаўскіх работнікаў, што апрацавалі гэтую програму, і выдзеліла з сябе першых правадыроў зубатаўшчыны на Беларусі, напр., Маню Вільбушэвіч, Грыгора Шахновіча і др.

Адзін з спосабаў агітацыі Зубатава быў такі. Падпольнік-рэволюцыянэр арыштоўваўся і накіроўваўся ў Маскву беспасрэдна да Зубатава. Пры дапамозе застрашваньня, падлогаў, чужых лістоў і подпісаў,

абяцанак, льгот і ўсялякіх другіх падобных сродкаў, Зубатаў прагнуўся перацягнуць на свой бок нясталых ці ўжо раней застрашаных рэволюцыянэраў. Часам гэта яму ўдавалася. Асобы, завербаваныя Зубатавым, робяцца правадырамі яго сыстэмы ў рабочых організацыях пад кіраўніцтвам ахранкі.

Трэба згадзіцца, што Зубатаў быў чалавек далёка ня дурны, уладаў красамоўствам і ўмеў блізка падыйсьці да непрактычнага чалавека. Нават добра вядомы рэволюцыянэр-тэрорысты Г. Гершуні здаўся і адзін раз даў патрэбнае Зубатаву паказаньне. Трэба было быць вельмі практычным і стойкім рэволюцыянэрам, каб не папасьціся ў яго сілкі, каторыя ён лоўка раскідаў. Вельмі часта Зубатаў рабіў так: ён вымагаў ад папаўшага ў яго кіпці рэволюцыянэра паказаньняў толькі аб яго ўласнай асобе і працы бяз выдачы таварышаў, чым разьвязваў іх вусны. Так, напрыклад, было з Г. Гершуні, А. Залкіндам і інш.

Стары практычны барацьбіт Адам, цяпер комуністы, т-ш Рудэрман, так апісвае сваю размову з Зубатавым. Праз некалькі дзён пасьля арышту Адама, Зубатаў выклікаў яго да сябе ў габінэт. Зубатаў быў відны мужчына, сярэдніх гадоў і ў цывільнай вопратцы. Гаварыў спакойна, проста і, трэба прызнацца, падабаўся людзям. Ён спаткаў Адама прыветна, проста, як знаёмага, запытаўся нават аб здароўі. За гарбатаю і добрымі цыгарамі пачалася размова. Пачаў Зубатаў з газэтных навін, расказаў аб апошніх арыштах, проклямацыях і брошурах, крытыкаваў урад, апісваў яго закулісную політыку, гаварыў аб заходнім рабочым руху, а потым перашоў да сваёй мэты, даказваючы наколькі інтэлігэнцыя маніць рабочых, зацягваючы іх у політыку, каторая патрэбна толькі ім самім, і гэтым зацямняе іх бягучыя інтарэсы—барацьбу з капіталам. Адам больш маўчаў і толькі час-ад-часу адкрыта заяўляў яму, што ён Зубатаву ня верыць і лічыць непатрэбным яму адказваць. Зубатаў пратрымаў Адама ў сваім габінэце каля 4-5 гадзін. За два месяцы высідкі ў турме Зубатаў выклікаў яго да сябе на гутарку каля 6 раз. Гутаркі гэтыя скончыліся нічым для Зубатава, а т-шу Адаму яны прынясьлі высылку ў месцы «не столь отдаленные» («Вперед», 1923 г. № 1, стр. 95—97).

Як вынік экономізму, у Бундзе пад уплывам Зубатава ў 1902 г. ў Менску ўтварылася «Незалежная Яўрэйская Партыя», каторая ў сваёй тэорыі і практыцы паставіла над і кропку, каторую дагэтуль ня ставілі экономістыя. Сутнасьць сваёй ідэолёгіі партыя выявіла ў дэклярацыі такога зьместу. Яўрэйская рабочая кляса патрабуе для сябе хлеба і ведаў. Ня можна гэтыя рэальныя патрэбы рабочых прыносіць у ахвяру чужым для іх політычным мэтам. Рабочы політычна можа належыць да ўсякай партыі і ўсё-ж такі мае права абараняць свае экономічныя і культурныя інтарэсы, каторыя павінны быць мэтаю, а ня

сродкамі якой-бы то ні было політычнай партыі. Партыя находзіць шкадлівым тое, што Бунд рукаводзіць экономічнымі організацыямі яўрэйскіх рабочых, бо ён ёсьць політычная партыя, каторая ставіць сваёй мэтай рэволюцыянізаваць рабочых праз экономічныя організацыі.

У сваёй програме Яўрэйская Незалежная Партыя вызначае, што яе мэта зводзіцца да разьвіцьця шырокіх экономічных організацый (трэд-юніёнаў, кас, клюбаў, асоцыяцый), да разьвіцьця сярод рабочых навуковых і профэсыянальных ведаў і да выхаваньня яго колектыўнага жыцьця. Далей гаворыцца, што партыя датыкаецца політычных пытаньняў толькі ў той меры, у якой яны зачапляюць штодзенныя інтарэсы рабочых, што яна яднае рабочых усялякіх політычных поглядаў, і, нават, зусім бяз іх.

Партыя ў Менску мела вялікі посьпех, і былі моманты, калі яна ў сваіх радох мела больш рабочых, чым Бунд. На чале яе стаялі быўшыя работнікі Бунду, падманутыя самі і падманваўшыя другіх. Пышнаю кветкаю разьвіваецца самая злосная провокацыя і данос. Па даносах зубатаўцаў ідуць арышты відных рэволюцыйных дзеячаў таго часу. Утвараецца цяжкая атмосфэра.

Але на гэтым зубатаўшчына ня спынілася. Яна скарыстала для разлажэньня рэволюцыйнага руху яшчэ і нацыянальнае пытаньне. З гэтага боку зноў было скарыстана слабое месца Бунду, каторы ў канцы 90-х гадоў падаецца моцнаму ўплыву дробна-мяшчанскай нацыяналістычнай ідэолёгіі. Затушоўваюцца клясавыя процілегласьці і падкрэсьліваецца нацыянальная еднасьць прыгнечанага яўрэйства. Чацьверты зьезд Бунду ў 1901 годзе прымае пункт аб культурна-нацыянальнай аўтономіі. Бунд перажывае нацыяналістычны крызіс, каторы ў 1903 годзе кончыцца выхадам яго з РС-ДРП.

Зубатаў і яго староньнікі з увагай прыглядаліся да росту нацыянальнага пытаньня сярод яўрэйскіх рабочых. Нацыяналістычны рух яны лічылі моцнаю апораю ў барацьбе з рэволюцыйнымі настроямі. Паміж Зубатавым і Маняю Вільбушэвіч ідзе жывая перапіска па гэтым пытаньні. Зубатаў пачынае падтрымліваць сіоніцкія організацыі рабочых. Тут зусім выкасоўваецца, нават бундаўскі, клясавы падход да рабочай справы і замяняецца прынцыпам еднасьці нацыянальнай. У сваіх лістох да Зубатава Вільбушэвіч з захапленьнем апісвае посьпехі сіонізму ў Менску, дзе ўжо зарадзіўся і расьце даволі хутка так званы рабочы сіонізм (Поалей-Цыон). Зубатаў пасылае лісты сваёй корэспондэнткі Вільбушэвіч па начальству, у дэпартамант поліцыі і робіць свае ўвагі і прыпіскі да іх. Ён піша: «Разлучыўшыся на аснове маіх слоў з інтэлігэнцкімі забабонамі аб ненавісьці самаўладзтва да рабочых, уступіўшы ў рабочай справе на легальны грунт і бачачы, што дэмократызм «жыду» нічога не дае,—мае прыяцелі кінулі полі-

тыку і завяршылі сваю легальную працу нацыянальным ідэалам. Ці ня выйгрыш гэта для нас? Ці не згладжае гэта нас з яўрэйствам у палітычных адносінах? Трэба сіонізм падтрымаць і наагул сыграць на нацыяналістычных пажаданьнях. Бліжэйшым для гэтага сродкам зьяўляецца дазваленьне жаргоннай літаратуры, якое здавальняе нацыянальны гонар» (Д. Заслаўскі. Зубатаў і Маня Вільбушэвіч. М. 1923, стар. 51, 52, 53).

Зубатаўшчына, такім спосабам, пачала пашырацца на Беларусі, асабліва ў Менску. Зубатаўцы працавалі энэргічна, скарыстаўшы мясцовы эканомізм і нацыяналізм. Рабочыя раней ішлі за імі, дзякуючы сваёй несьвядомасьці. Забастоўкі пад кіраўніцтвам зубатаўцаў праходзілі даволі ўдачна, дзякуючы таму, што мясцовая поліцыя іх часта падтрымлівала, маючы загад з цэнтру. Але хутка посьпехі зубатаўшчыны пачалі зьмяншацца.

Найперш ад усяго проціў зубатаўшчыны і Зубатава пачаў энэргічную і ўпартую кампанію Бунд. Пашыралася нелегальная літаратура: брошуры і асабліва проклямацыі. Вялася вусная пропаганда і агітацыя. Выяўлялася сутнасьць зубатаўшчыны, як сыстэмы, і роля Зубатава, як правакатара. Усё гэта рабіла, па прызнаньні самых зубатаўцаў, вялікае ўражаньне на рабочыя масы. Яны пачалі больш удумчыва адносіцца да таго, што бачылі; пачало абуджацца затуманенае клясавае пачуцьцё. Загаварыла старая ненавісьць да пагромнага рускага царызму. Вось што піша Маня Вільбушэвіч на гэтую тэму Зубатаву: «Пасьля многіх з імі (рабочымі) размоў, я ўсё больш і больш прыходжу да пераканаНьня, што політыка цікавіць іх вельмі мала, але яны не давяраюць і ненавідзяць урад, яны ня могуць разлучыцца з думкаю, што урад—гэта зьвер і абаронца буржуазных кляс» (Д. Заслаўскі. Тое самае, стар. 30).

Вельмі важнай перашкодай для ўсталяваньня зубатаўшчыны была агульная політыка царызму, каторы з зразумелых прычын ня мог не выяўляць варожых адносін да рабочага руху. Падтрымваючы аднэю рукою зубатаўшчыну, ён другою рукою праводзіў рэпрэсіі проціў рабочых. У Вільні політыку рэпрэсій праводзіць фон-Валь. У красавіку 1902 году дэмонстранты-рабочыя тут былі пабіты нагайкамі на Нямецкай вуліцы. На другі дзень 28 дэмонстрантаў у вучастку былі высечаны. У траўні рабочы Г. Лекерт страляў за гэта ў фон-Валя, зраніў яго і быў пакаран карай на сьмерць 11 чэрвеня 1902 году. Пад уплывам рэпрэсій нарастае ў рабочых колах і ў самым Бундзе ўхіл у другі бок. Расьце лік староньнікаў тэрору, як выяўленьня «арганізованай помсты».

Само сабой зразумела, што пры такіх умовах зубатаўшчына на Беларусі павінна прыпыніць свой далейшы разьвітак. У пачатку 1903 г.

распадаецца «Незалежная Яўрэйская Партыя». Што датычыць да сіонізму, то ён застаецца ў дробна-буржуазных колах. Поалей-цыонізм—дзіця зубатаўшчыны і нацыянальнага прыгнечаньня—таксама існуе і ў далейшыя часы, але значнага пашырэньня ён ужо мець ня будзе. Соцыял-дэмократыя і Бунд на Беларусі зноў займаюць сваё звычайнае месца ў рабочым руху.

Зубатаўшчына пераносіцца на ўсход—у Маскву і асабліва ў Пецярбург. Тут яна канчаецца гапонаўшчынай і расстрэлам рабочых 9 студзеня 1905 г.

## Рэволюцыя 1905 году на Беларусі.

Як відаць з ранейшага, у пачатку XX сталецьця на Беларусі існавалі моцныя рабочыя організацыі Бунду і РС-ДРП. Праўда, царскаму ураду ўдавалася ня раз разьбіваць вяршкі гэтых організацый, але справа зноў папраўлялася, бо рух вырастаў з нізоў. У красавіку 1902 г. ў Беластоку зьбіраецца конфэрэнцыя РС-ДРП з прадстаўнікоў Бунду, Пецярбурскага Комітэту, «Паўднёвага Работніка» і заграні́чнага цэнтру. Конфэрэнцыя абрала організацыйны комітэт для склі́каньня другога зьезду РС-ДРП. Ня гледзячы на арышты амаль-што ўсіх удзельнікаў конфэрэнцыі, другі зьезд партыі ўсё-ж такі адбыўся ў жніўні 1903 году ў Брусэлі (Бэльгія). На зьезьдзе лінія Бунду прывяла яго да выхаду з радоў РС-ДРП, пасьля чаго пачаў узмацняцца ў ім нацыяналістычны ўхіл. Зразумела, што РС-ДРП павінна была адразу ўтварыць на Беларусі, паралельна з бундаўскімі, свае організацыі, каторыя-б аб'ядналі рабочых неяўрэяў і тых яўрэяў, каторыя не стаялі на позыцыі Бунду. У 1903 годзе для Палескага абшару ў Гомлі вынікае Палескі Комітэт, а для абшару на поўначы Беларусі з пачатку 1904 году ўтвараецца Паўночна-заходні Комітэт. К пачатку рэволюцыі соцыял-дэмократычныя групы, падпарадкаваныя гэтым двум комітэтам, мы знаходзім амаль што па ўсіх гарадох Беларусі: у Вільні, Менску, Віцебску, Гомлі, Бабруйску, Пінску і г. д. Групы прылучаюць да сябе сотні рабочых, каторыя потым разам з бундаўскімі рабочымі стануць на чале мас, што паўсталі проці існуючага парадку.

У гэтыя-ж часы (1901 г.) організуецца і народніцкая Партыя соцыялістых-рэволюцыянэраў, што вырасла з Саюзу соцыялістых-рэволюцыянэраў. Асобныя гурткі С-Р на Беларусі зьявіліся ў 90-ыя годы. К пачатку XX ст. яны зьліліся ў «Рабочую Партыю Політычнага Вызваленьня Расіі», каторая потым увашла ў партыю С-Р. Цэнтрам РППВР быў Менск. Выдатнейшымі работнікамі партыі былі Радзівонава-Клячка (каторая потым выдала організацыю), Е. А. Гальперын, Г. Гершуні (будучы галава Баявой Організацыі С-Р), А. О. Бонч-Асмалоўскі (каторы жыве і цяпер), К. Брэшка-Брашкоўская (каторая наяжджала

ў маёнтак Асмалоўскага Блонь, пад Менскам), кровельшчык Гатоўскі і інш. У 1898 годзе Гершуні ўтварыў у Менску майстэрню варштатаў для падпольных друкарань, бюро фальшывых пашпартоў і разам з Бонч-Асмалоўскім організаваў пераправу праз граніцу як людзей, так і нелегальнай літаратуры. Попыт на ўсё гэта ў рэволюцыйных колах быў вялікі, і на Беларусь, у Менск, зьяўляліся прадстаўнікі падпольных організацый за варштатамі.

У 1900 годзе «Рабочая Партыя» мела ў Менску, на Серабранцы, добра абсталёваную ўласную друкарню. Тут, паміж іншым, была надрукована брошура пад назваю «Свабода», напісаная Л. М. Радзівонавай-Клячка. Зьмест брошуры меў програмны характар. Брошура вызначае, што заданьне РППВР—дабіцца соцыялістычнага ладу. Тэрор, як сродак барацьбы з урадам, прызнаецца. Усе існуючыя ў Расіі рэволюцыйныя і опозыцыйныя групы павінны зыйсьціся ў прызнаньні бязумоўнай неабходнасьці політычнай свабоды. Прапануецца такі плян організацыі: складаецца фэдэрацыя аўтономных мясцовых груп, каторыя аб'яднаны агульнай програмай і тактычнымі прыёмамі. Кожная група мае свой цэнтр, складзены з абраных сяброў. Мясцовы цэнтр, не адыходзячы ад агульнай програмы, мае права прыстасоўваць організацыю да мясцовых абставін. Дэлегаты аўтономных груп складаюць вышэйшы орган, Раду партыі (С. Слетов. К истории возникновения Партии С-Р. СПБ. 1917 г., стр. 98). Заканчваецца брошура так: «На соцыял-дэмократаў мы глядзімо, як на братоў: мэта адна, але шляхі розныя. Ідэя соцыял-дэмократыі атрымае права грамадзянства ў Расіі не раней, як пры існаваньні політычнай волі, а покі што мы будзем рабіць сваё, а соцыял-дэмократы хай робяць сваё... Наша партыя для Расіі—партыя цяперашняга часу. Партыя соцыял-дэмократыі—партыя наступнага за намі пэрыоду. У гэтым уся розьніца» (Зборнік «Беларусь». Зіміенка. Соцыялістычны рух на Беларусі. Менск. 1924 г., стр. 158). Пасьля аб'яднаньня РППВР з Партыяй С-Р у 1904 годзе была ўтворана «Паўночна-заходняя Організацыя Партыі С-Р», якая складалася з Віленскага, Менскага, Беластоцкага, Віцебскага, Гомельскага і др. комітэтаў.

З пачатку 90-х гадоў на Беларусі зьяўляюцца і польскія соцыялістычныя організацыі: Соцыял-Дэмократычная Партыя Польшчы і Літвы і Польская Соцыялістычная Партыя (ППС). Першая партыя стаяла на чыстым клясавым грунце і зьяўлялася строга вытрыманай марксыцкай організацыяй. На чале партыі стаялі такія выдатныя рэволюцыянэры-марксыстыя, як Роза Люксэмбург, Мархлеўскі і Дыкштэйн, аўтар вельмі пашыранай у свой час і вельмі каштоўнай кніжачкі «Хто чым жыве». Зусім не такою была Польская Соцыялістычная Партыя. Нацыянальнае польскае пытаньне і вызваленьне польскага гаспадарства ад улады рускага царызму яна ставіла на першае месца. Соцыяльная яе програма

была хутчэй народніцкая, чым марксыцкая. У ППС куды больш, чым у Бунда, адчуваецца недавер'е да рускай рэволюцыі і да рускай рабочай клясы. Дробна-буржуазны нацыяналізм гэтых партый у пачатку 1900 гадоў расьце пад уплывам нацыянальнага ўціску, каторы пануе на Беларусі.

Побач з нацыянал-соцыялізмам яўрэйскім і польскім, толькі крыху пазьней ад іх, зараджаецца на Беларусі пры дапамозе сяброў Польскай Соцыялістычнай Партыі і беларускі нацыянал-соцыялізм. Алесь Бурбіс, сучасьнік і ўдзельнік тагочаснага соцыялістычнага руху, так апісвае гэтае зьявішча:

«Узімку 1902 году частка моладзі соцыялістычнага кірунку разам з беларусамі (выхаванымі ў польскай культуры), працаваўшымі ў організацыях ППС на Беларусі, засноўваюць «Беларускую Рэволюцыйную Партыю». Радзілася яна ў Менску, дзе працавалі студэнты Пецярбурскага унівэрсытэту—Антон Луцкевіч (Антон Навіна), Іван Луцкевіч, Казюк Кастравіцкі (Каганец), работнік Віктар Зелязей і інш. Адначасна ўтвараюць організацыю гэтай партыі і ў Вільні—студэнт-тэхнолёг Пранцыск Умястоўскі (Дзядзька Пранук), гімназісты Аляксандар Бурбіс (Пініп) і інш., а таксама ў Пецярбурзе—студэнт-тэхнолёг Вацлаў Іваноўскі (Вацюк Тройца), курсыстка Алёіза Пашкевіч (Цётка). Спачатку гэта партыя апрацованай програмы ня мела. Яна распаўсюджвала надрукаваныя заграніцай творы Ф. Багушэвіча, выразна адзначаючыя соцыяльную несправядлівасьць і клічучыя беларускія народныя масы да практычна-рэволюцыйнай працы. Яна друкуе ў Лёндоне кніжку яго твораў на папіроснай паперы пад назвай «Песьні» з надпісам на вокладцы: «С разрешения Синодальной типографии». Першая проклямацыя гэтай партыі была надрукована на гэктографе ў 1902 годзе і прызначалася для пашырэньня сярод беларусаў-каталікоў Віленшчыны; напісана яна была папольску Лявонам Малецкім у Вільні і пачыналася словамі: «Widzieliście zapewna biedną chłopską wynędzniałą szkapę». Яна была надрукована і ў лютаўскім нумары заграцічнага «Пшэдсьвіту». У тым-жа 1902 годзе партыя зьмяніла сваю назву на «Беларускую Рэволюцыйную Грамаду». З найбольш энэргічных працаўнікоў БРГ магчыма адзначыць, апрача вышэйназваных,—Фэлікса Стэцкевіча (Аганёк), студэнта Пецярбурскага унівэрсытэту, родам з Шчучына Віленскай губэрні, Лідзкага павету, студэнта Матусевіча, студэнта Рыскага політэхнікуму А. Ўласава. У 1903 годзе адбыўся першы зьезд партыі, які прыняў агулам програму ППС; ён пастанавіў дабівацца краёвай аўтономіі Беларусі з соймам у Вільні й культурна-нацыянальнай аўтономіяй для нацыянальных меншасьцяй на Беларусі і наказаў распрацаваць зямельную програму на аснове конфіскацыі бяз выкупу маёнткаў паноў, казённых земляў і інш. На гэтым зьезьдзе БРГ пастанаўляе

называцца «Беларускай Социялістычнай Грамадой» (Вестник Наркомпроса Белоруссии. 1921 год, X, № 1, стр. 6-7).

Так зьявілася першая социялістычная партыя на Беларусі, стаўшая на мясцовы беларускі нацыянальны грунт і паставіўшая сабе за мэту разьвязаць беларускае нацыянальнае пытаньне. Царызм завастрыў нацыянальныя ўзаемаадносіны на Беларусі. Ён паставіў у палажэньне інародцаў яўрэяў, палякоў і беларусаў-каталікоў, а беларусаў-праваслаўных сілком падганяў у лік вялікарусаў. Гэта прывяло на Беларусі да ўтварэньня нацыянал-социялістычных партый, як Бунд, ППС і Бел. Соц. Грамада. Бунд прагнуўся абхапіць колы гарадзкога і местачковага працоўнага яўрэйскага жыхарства. Што датычыць да БСГ, то яна пакіравалася на беларускую вёску. Тут яна пачала гуртаваць наўкола сябе вясковую працоўную інтэлігэнцыю, вяскова-гаспадарскіх рабочых і сялян.

У 1904 годзе на Беларусі ўтвараецца яшчэ адна нацыянал-социялістычная партыя пад назваю «Социялістычная Партыя Белай Русі». Партыя знаходзілася таксама, як і БСГ, пад уплывам Польскай Социялістычнай Партыі. Сваю працу партыя пашырыла ў Горадзеншчыне і заходняй частцы Меншчыны. На чале партыі стаялі ўраджэнцы Горадзеншчыны, варшаўскія студэнты браты Трускоўскія, М. Фальскі, студэнт-аграном родам з Меншчыны А. Жаба і інш. Ня гледзячы на тое, што СПБР і БСГ абедзьве былі пад уплывам ППС, тым ня менш паміж імі былі нейкія прынцыповыя нязгоды, і яны працавалі кожная асобна. Устанавіць пункты супярэчнасьцяй паміж СПБР і БСГ мы ня маем магчымасьці, бо ня ведаем програмы СПБР. Нам толькі вядома, што ў восень 1904 году з боку БСГ былі зроблены спробы згаварыцца з прадстаўнікамі СПБР наконт аб'яднаньня працы, для якое мэты вяліся перагаворы раней у Варшаве, потым у Горадні і Менску. Гэтыя перагаворы ні да чаго не прывялі, і СПБР увесь час працавала асобна ад БСГ. Партыя існавала нядоўга. З 1906 году вестак аб ёй мы ўжо ня маем.

Такім спосабам, як мы бачым з ранейшага, рэволюцыйныя сілы на Беларусі ў пачатку XX ст. ужо былі добра організованы. Беларусь магла ўступіць у рэволюцыйную барацьбу разам з усёй Расіяй.

Па ўсёй імпэрыі адчуваецца, што стары царска-самаўладны лад перашкаджае экономічнаму разьвіцьцю дзяржаўнага організму. Не гаворачы ўжо пра сялянства і значна вырасшы пролетарыят, самаўладзтва сваёю апекаю душыла і прамыслова-гандлёвую сярэднюю буржуазію. Самаўладзтвам былі нездаволены ўсе социяльныя групы грамадзянства, апроч невялікай кучкі фэўдальна-дваранскай арыстократыі і буйнай буржуазіі, меўшай скарбовыя заказы і концэсіі. Насьпявала

шырокая опозыцыя нездаволеных царызмам. Набліжалася доўга гадованая рэволюцыя.

Пачалося з вайны. У самым пачатку 1904 году, дзеля выгад кучкі прыдворных спэкулянтаў, імпэрыя абвясьціла вайну Японіі. Царызм спадзяваўся, што яму нічога ня будзе каштаваць разьбіць сілы маленькай Японіі. «Шапкамі закідаем». А пры пабеднай вайне ўтворыцца як-бы політычная аддушына, праз якую выйдзе нездаваленьне урадам і ўвойдзе падняты патрыотычны настрой. Але надзеі ураду ня спраўдзіліся. Вайна ад самага свайго пачатку пашла няўдачна. Ня глядзячы на вымуштраванасьць рускага салдата, няўдача за няўдачаю падалі на рускую армію, дрэнна з'організованую і дрэнна дагледжаную. Паўтарылася Крымская кампанія, толькі ў большым маштабе: стрэльбы не палілі, снарады ня ўзрываліся, вярхі кралі, як маглі і ўмелі, пілі і распусьнічалі, а нізы ці паміралі, ці рэволюцыянізаваліся. Вайна, такім спосабам, павялічвала рэволюцыйны настрой у імпэрыі.

Што датычыць Беларусі, то тут, апроч таго, вайна выклікала прамысловы крызіс. Тавары польскай і беларускай прамысловасьці звычайна мелі шырокі рынак на Далёкім Усходзе. Вайна заняла залезныя калеі на Ўсход для сваіх мэт і, такім спосабам, зачыніла рынак збыту. Фабрыкі і іншыя прадпрыемствы пачалі скарачаць свой выраб, а некаторыя і зачыняцца. Расло безрабоцьце. На гэтым фоне ўзрастаў рабочы рух па гарадох. Крызіс у горадзе закрануў і вёску, каторая згубіла і без таго малы заработак. Мацней стала душыць яе малазямельле і панская эксплёатацыя. І на вёсцы ўзрастае рэволюцыйны настрой. Яна глуха шуміць. Усюды пачынаюць пастулаць усё часьцей і часьцей справы аб самавольных парубках дрэва ў казённых, удзельных і панскіх лясох, аб самавольнай пасьцьбе быдла на панскіх землях.

Лібэральных банкетаў, каторыя шырокаю хваляю абхапілі ў восень 1904 году Расію, на Беларусі было вельмі мала. Тут ня было таго земства, наўкола каторага групавалася лібэральная «банкетная» опозыцыя ў Расіі. Што датычыць гарадзкога самакіраваньня, то яно найчасьцей групавала наўкола сябе ці польскіх, ці рускіх нацыяналістых-чорнасотнікаў. Некалькі банкетаў утварыў «Яўрэйскі Саюз Роўнапраўя». У Менску лібэралы організавалі банкет у будынку гарадзкой думы. Была прапанована рэзолюцыя з запатрабаваньнем констытуцыі. Банкет скончыўся заарыштаваньнем на некалькі гадзін аднаго з палякоў-адвакатаў і перапіскай асоб, прысутных на банкеце. Зразумела, што ніякага ўплыву на жыцьцё ні ў Расіі, ні тым больш на Беларусі банкеты ня мелі.

Стрэлы, накірованыя ў пецярбурскі пролетарыят 9 студзеня 1905 году, палажылі пачатак рэволюцыі і на Беларусі. Тут пролета-

рыят адгукнуўся на гэтыя стрэлы стачкамі. У Вільні забастоўка цягнулася 3 дні і абхапіла каля 4.000 рабочых. Менск баставаў 3 дні. У Гомлі баставалі цэлы тыдзень каля 2.000 рабочых. У Крынках Гарадзенскай губэрні баставалі каля 2.000 рабочых. Яны захапілі ў сьае рукі мястэчка, і поліцыя цэлы дзень не магла туды ўвайсьці. У Віцебску баставалі 6 дзён 1.200 рабочых. Забастоўкі ў сярэднім ад 2 да 4 дзён адбыліся ўва ўсіх губэрскіх і павятовых гарадох Беларусі, а таксама і ў іншых прамысловых пунктах. Для аднастайнага кіраўніцтва рабочым рухам паміж рознымі соцыялістычнымі партыямі адбываліся згоды. Такія згоды вядомы, напр., у Вільні, Менску, Бабруйску і г. д.

Рух перакінуўся ў вёску, каторая пачала барацьбу з буйным і сярэднім земляўласьніцтвам. Барацьба была ўпартая і зацяжная. Разгар яе падае на вясну і лета 1905 году, а цягнецца яна аж да 1907 году. Ідзе адкрытая самавольная парубка лесу, заворваецца панская зямля. Палаюць мясцамі панскія маёнткі, стагі і г. д. Былі здарэньні забойства больш абрыдлых паноў. Тэрор проці паноў атрымаў большае разьвіцьцё ўва Ўсходняй Беларусі, у губэрнях Віцебскай, Магілеўскай і часткай Менскай. Там нават утварыліся па вёсках баявыя дружыны. У заходняй частцы Беларусі, Літве і Польшчы мы спатыкаемся ўжо з больш організованай барацьбой, накіраванай супроць панскага земляўласьніцтва. Тут, як сродак барацьбы, ужываецца стачка. Прымаючы удзел у вяскова-гаспадарчых стачках, сялянства, з аднаго боку, руйнавала моц панскай гаспадаркі, з другога боку—павялічвала для пастаянных батракоў і падзённых рабочых заработную плату, каторая на Беларусі была вельмі нізкаю. Малазямельле і безьзямельле гналі тут селяніна прадаваць за бясцэн сваю рабочую сілу на панскім двары. Трэба адзначыць, што галоўную ролю ў сялянскім рэволюцыйным руху гралі батракі, за каторымі йшлі ня толькі сяляне-бednякі, але й серадиякі. Што датычыць да заможнага беларускага сялянства, каторае за часы існаваньня сялянскага пазямельнага банку да старых надзелаў нешта яшчэ дакупіла, то яно не спачувала руху з прычын зразумелых. Разам з засьцянковаю і фальварковаю шляхтаю яно было варожа настроена да рэволюцыі і трымала сябе пасыўна.

У жніўні 1905 году зьявілася пастанова царскага ураду аб так званай булыгінскай Думе, надзеленай законарадчымі правамі. Усе соцыялістычныя партыі на Беларусі, апроч адных меншавікоў, абвясьцілі гэтай Думе бойкот. На чале барацьбы з Думай на Беларусі становіцца Бунд і організуе шырокую кампанію бойкоту выбараў у Думу. Рэволюцыйны рух ня спыняецца. Кастрычнікавая забастоўка руйнує булыгінскую Думу. 17 кастрычніка Мікалай II выдае маніфэст аб конституцыі, а 21—маніфэст аб амністыі за політычныя праступствы.

Забастоўка пракрацілася па ўсёй Беларусі з маніфэстацыямі і тэрорыстычнымі актамі, каторыя былі адказам на стрэлы ў маніфэстантаў з боку мясцовай улады. Як і ў студзені, рэволюцыйны рух на Беларусі праходзіць ня толькі па гарадох; ён глыбока закранае вёску. Беларускае сялянства скідае валасную адміністрацыю, праганяе земскіх начальнікаў, стражнікаў і г. д., чакае вясны, каб захапіць панскую зямлю.

У канцы лістапада 1905 году рабочыя Пецярбургу ўтварылі Савет Рабочых Дэпутатаў, каторы 2 сьнежня выдаў свой вядомы маніфэст. У Менску маніфэст быў атрыман 5 сьнежня і надрукован для пашырэньня ў ліку 5.000 экз. Вынікла пытаньне аб утварэньні Саветаў Рабочых Дэпутатаў і на Беларусі: у Вільні, Беластоку і другіх рабочых цэнтрах. Саветы ня былі ўтвораны, дзякуючы таму, што бундаўцы і польскія соцыялістыя не згадзіліся на іх. Вельмі хутка самаўладзтва, сабраўшы ўсе свае сілы, пачало рашучую барацьбу з рэволюцыйным рухам. Пецярбурскі Савет быў заарыштован. Ува ўсе буйныя рабочыя цэнтры былі пасланы войскі, у паўсталыя вёскі— карныя атрады. Зноў пачалася забастоўка. 8 сьнежня далучыўся да яе Менск, 12 сьнежня—Вільня. Пролетарская Масква пакрылася барыкадамі. Палажэньне царызму было вельмі няцьвёрдае. Толькі неорганізованасьць рэволюцыйных сіл дае яму магчымасьць атрымаць перамогу над рэволюцыяй. Маскоўскае паўстаньне прыпынена, рэакцыя атрымала верх як у Расіі, так і на Беларусі. Пашлі масавыя расстрэлы, арышты, высылкі і г. д. Для Беларусі рэакцыя, апроч таго, прынесла яўрэйскія пагромы (Гомель, Беласток і інш.).

Разам з політыка-соцыяльным пытаньнем, рэволюцыя на Беларусі падняла і нацыянальнае пытаньне. У 1903 годзе, як мы казалі вышэй, Бунд выступіў з радоў РС-ДРП. Рэволюцыя 1905 году зноў паставіла пытаньне аб сьціслым злучэньні ўсіх нацыянальных організацый соцыял-дэмократыі. Вынікала пытаньне аб злучэньні Бунду з РС-ДРП. Адна частка Бунду ня была прыхільнаю да злучэньня. За два гады асобнага існаваньня Бунду яна звыклася з такім яго палажэньнем і хацела захаваць на далейшыя часы поўную яго незалежнасьць і самастойнасьць. Былі супраціўнікі такога погляду. Яны лічылі, што Бунд павінен увайсьці ў РС-ДРП з захаваньнем у складзе яе самастойнасьці сваёй організацыі. У красавіку 1906 году ў Стокгольме сабраўся IV зьезд РС-ДРП. Зьезд прыняў проэкт аб'яднаньня Бунду з РС-ДРП. На аснове яго Бунд уваходзіць у склад РС-ДРП, як організацыя яўрэйскага пролетарыяту, неабмяжованая ў сваёй дзейнасьці раённымі рамкамі. Ён прымае агульную програму партыі і пастановы агульнапартыйных зьездаў. У гэтых рамках па пытаньнях агітацыі, прапаганды і організацыі Бунд мае самастойнасьць. Ён мае мясцовыя організацыі, цэнтральныя ўстановы і зьезды. Організацыі Бунду

пасылаюць сваіх прадстаўнікоў на агульна-партыйны зьезд і конфэрэнцыі; Бунд мае сваіх прадстаўнікоў у ЦК партыі, лік іх вызначаецца па згодзе між ЦК Бунду і ЦК партыі. На Міжнародных соцыялістычных конгрэсах у дэлегацыі ад партыі павінны быць і прадстаўнікі Бунду. У верасьні 1906 году пытаньне аб аб'яднаньні з РС-ДРП было пастаўлена і на VII зьезьдзе Бунду. Яшчэ да зьезду гэтае пытаньне было разгледжана па організацыях Бунду і дзеля гэтага на самым зьезьдзе доўга над ім ня спыняліся. Зьезд большасьцю 48 галасоў проціў 20 вынес такую пастанову: зацьвердзіць прынятыя IV зьездам РС-ДРП умовы аб'яднаньня і абвясьціць аб'яднаньне Бунду з РС-ДРП адбытым. У канцы пастановы ёсьць такі дадатак: «Зьезд заяўляе, што, уступаючы ў РС-ДРП і прымаючы яе програму, Бунд не зьмяняе свае програмы па нацыянальным пытаньні, і што гэта програма, прынятая VI зьездам Бунду, можна быць перамененa ці зыкасавана толькі зьездам Бунду».

Такім спосабам, як мы бачым з вышэйпаданага, злучэньня Бунду з партыяй адбылося, але яно было толькі формальным. Аб'яднаных організацый Бунду і РС-ДРП і пасьля злучэньня ня было як у цэнтры, так і на мясцох. Бунд увашоў у партыю, як самастойная організацыя яўрэйскага пролетарыяту. Адбытае аб'яднаньне было пабудована на прынцыпе нацыянальнага разьмежаваньня. Поруч з тым, Бунд паступова ўсё больш і больш адходзіў ад бальшавіцкай фракцыі партыі і бліжаўся з меншавіцкаю. У 1911 годзе ён дашоў да сьціслага організацыйнага зьвязку з меншавікамі. Гэты зьвязак трываў аж да самага канца 1918 году.

Побач з Бундам, на Беларусі працуе, як мы казалі вышэй, і другая нацыянал-соцыялістычная партыя—Беларуская Соцыялістычная Грамада. Дзякуючы спэцыфічным умовам жыцьця на Беларусі, у ёй, як і ў Бундзе, віднае месца займае нацыянальнае пытаньне. Соцыялістычная частка яе програмы няясная. Партыя вядзе жывыя зносіны і мае цесную сувязь з ППС. Даволі часта па практычных пытаньнях яна контактуе сваю працу з партыяй С-Р. Пасьля спаду рэволюцыйнай хвалі Грамада, як і ўсе другія соцыялістычныя партыі, хаваецца ў падпольле. З організацыйнага боку ўтвараюцца 2 краёвыя комітэты партыі, першы ў Менску і другі—у Вільні. Партыя выдае пры дапамозе ППС рад проклямацый у беларускай мове, разьлічаных на вясковага чытача.

У канцы 1905 году Б. С. Грамада заснавала ў Менску падпольную беларускую друкарню. Друкаром у ёй быў Ф. Стацкевіч, каторы навучыўся гэтай справе заграніцаю ў Галіцыі, куды ў свой час для гэтай мэты пасылаўся партыяй. Зразумела, што, дзякуючы гэтаму, друкарская праца Грамады значна паляпшаецца і пашыраецца. Асаблівым посьпехам сярод мас карыстаюцца вершы рэволюцыянэркі-поэтэсы

Цёткі (А. Пашкевіч): «Мора», «Хрэст на свабоду», «Пад штандарам» і інш. Адозвы і вершы, надрукованыя Грамадой, найчасьцей абходзяць соцыяльныя пытаньні і абмяжоўваюцца палітычным зьместам. Першае месца займае барацьба з рускім самаўладзтвам. Кідаецца ў вочы замена лёзунгу «Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!» на лёзунг «Працавітая *) бедната ўсіх краёў, злучайся!» Гэты факт гаворыць нам аб тым, што БСГ пачынае глядзець на сябе хутчэй як на сялянскую, чым пролетарскую організацыю.

Беларускаю друкарняю і беларускаю моваю карыстаюцца для сваіх адозваў і проклямацый і іншыя падпольныя організацыі краю. Беларускай мовай карыстаюцца, напрыклад, нават літоўская падпольная організацыя «Драў-час» («Таварыш»), каторая потым прымае назву літоўскай Соцыял-Дэмократычнай Рабочай Партыі. Асабліва часта карыстаецца беларускаю моваю «аграрная група» РС-ДРП для больш пасьпешнай працы сярод беларускага сялянства. Часам карыстаюцца беларускаю моваю звычайныя вясковыя (раённыя) організацыі РС-ДРП, каторым прыходзіцца працаваць сярод вясковага жыхарства. Вядома, напрыклад, што раённая капыльская організацыя, у каторай працуе беларускі пясьняр-пролетары Цішка Гартны (Д. Жылуновіч), выдае ў беларускай мове падпольны гэктографаваны журнал пад назваю «Голас нізу». Гэтым журналам вельмі зацікавіўся ў свой час вядомы рускі пісьменьнік Максім Горкі (Пяшкоў).

Бел. Соц. Грамада імкнецца працаваць і найчасьцей працуе ў вёсцы. Ужо перамена партыйнага лёзунгу з чыста пролетарскага на працоўна-бядняцкі гаворыць аб гэтым імкненьні Грамады ў бядняцкія вясковыя колы. І трэба прызнаць, што агітатары Б. С. Грамады забіраліся вельмі часта ў такія глухія вясковыя куткі, куды дагэтуль ніякая соцыялістычная агітацыя і пропаганда не пападала. Асаблівую увагу Грамада зьвярнула на працу сярод вясковa-гаспадарскіх рабочых у маёнтках. Наўкола рабочых групавалася наогул беларуская сялянская бедната, каторая, дзякуючы малазямельлю і безьзямельлю, павінна была за бясцэн прадаваць сваю працу ў панскіх маёнтках.

Яшчэ ў сакавіку 1905 году ў Менску сабраўся першы сялянскі зьезд. Тут уплыў Грамады быў вельмі моцны. Гэта відна ўжо з таго, што зьезд, апроч пастановы, каб адабраць зямлю ад паноў, касьцёлаў, царквей, манастыроў і г. д., ухваліў патрэбу для Беларусі краёвай аўтономіі з соймам у Вільні, што, бязумоўна, магло выходзіць толькі ад работнікаў Грамады. Як вынік зьезду, організуецца Грамадою ў тым-жа 1905 годзе Беларускі Сялянскі Саюз, каторы організацыйна ўсганаўляе пастаянную сувязь БСГ з беларускаю вёскаю. Да нас дашла невялічкая лістовачка пад загалоўкам «Беларускі Сялянскі Саюз»,

*) Працоўная.

выданая ад імя комітэту саюзу. Тут вызначана, што Дума, якую царскі урад абяцае склікаць, ня дасьць карысьці сялянству і дзеля гэтага яму зусім непатрэбна. Усе сяляне павінны дабівацца скліканьня Ўстаноўчага Сойму з прадстаўнікамі ад сялянства. Толькі ён адзін можа здаволіць, як належыць, патрэбы сялянства. Усе землі, лясы, рэкі, вазёры і нетры павінны перайсьці ў рукі ўсяго народу. Зямлёю павінен карыстацца толькі той, хто сам на ёй працуе. Самы парадак перадачы прыроднага багацьця народу павінны ўстанавіць па справядлівасьці народныя прадстаўнікі кожнага краю.



Жабрак.

У студзені 1906 г. адбываецца другі зьезд Бел. Соц. Грамады. На зьезьдзе апрацоўваецца нарыс праграмы партыі. Афармляецца дэвіз, каторы ўвашоў у карыстаньне яшчэ ў канцы 1905 году: «Працоўная бедната ўсіх краёў, злучайся!» Пачынаецца нарыс праграмы так: «Беларуская Социялістычная Грамада ёсьць організацыя социяльна-палітычная беларускага працоўнага народу; (яна) хоча раскідаць цяперашні капіталістычны парадак і аддаць у рукі ўсяго народу зямлю, сьнасьці рабочыя і ўсе способы комунікацыі для супольнага ўладаньня. У гэтай рабоце найбольшая завада—цяперашняя політычная няволя, загэтым БСГ за найблізшую політычную мэту мае: скінуць самаўладзтва ў Расіі разам з пролетарыятам усіх народаў Расійскага гаспадарства». Зьезд асабліва дэтальна спыняецца на аграрным пытаньні, выходзячы з таго, што Беларусь ёсьць наогул краіна вяскова-гаспадарская. З боку дзяржаўнага зьезд ухваліў: Беларусь павінна быць аўтономнай рэспублікай з соймам у Вільні; як такая, яна павінна ўваходзіць у склад Расійскай Дэмократычнай Фэдэрацыйнай Рэспублікі. Зьезд, апроч праграмы, апрацаваў організацыйную ўставу і абраў Цэнтральны Комітэт з 4 асоб: Антона і Івана Луцкевічаў, Вацлава Івеноўскага і Алеся Бурбіса.

Пасьля зьезду праца Грамады на нейкі час моцна пашыраецца. Грамада закладае сувязі і з гарадзкімі рабочымі. Яна праводзіць у

Менску амаль што двохмесячную забастоўку шаўцоў, забастоўку парыкмахераў і г. д., арганізуе культурна-асьветныя рэволюцыйныя гурткі сярод вучнёўскай моладзі, напр., у віленскім настаўніцкім інстытуце, віленскай і менскай духоўных сэмінарыях, віленскай, менскай, магілеўскай гімназіях і г. д. Улетку 1906 году партыя наладзіла і правяла вясковa-гаспадарскія забастоўкі. Яны асабліва ўдаліся пры зборы бульбы ў Віленскай і Менскай губэрнях (бульбяныя забастоўкі). Вядзецца праца сярод гарадзкіх і вясковых настаўнікаў.

У сьнежні 1905 году быў найвышэйшы пад'ём рэволюцыі, каторы выявіўся ў рэволюцыйнай збройнай барацьбе рабочых за ўладу ў Маскве. Паўстаньне рабочых было задушана. Рэволюцыя пачала зьніжацца, каб зноў падняцца толькі ў лютым і кастрычніку 1917 году. Пачалася рэакцыя, каторая асабліва ўзмацнілася летам у 1906 годзе пасьля разгону I Думы (9-VII). Зразумела, што рэакцыя перакінулася на Беларусь. Пачаліся арышты, ссылкі, турма і катарга для ўдзельнікаў рэволюцыі, што не магло не адбіцца на падпольных арганізацыях па Беларусі. Яны аслаблі і ў колькасьці і ў якасьці. Сярод дробна-буржуазнай партыйнай інтэлігэнцыі зьяўляецца плынь так званага легалізму і ліквідатарства. Лігалістыя лічылі, што пры існаваньні падпольнай партыі цэнтр цяжасьці працы павінен легчы на скарыстаньне легальных магчымасьцяй (Дума, прэса, рабочыя клюбы, профсаюзы). Ліквідатары ішлі яшчэ далей і даходзілі да думкі скасаваньня падпольных арганізацый. Легалізм і ліквідатарства зьявіліся ў Бундзе і ў Грамадзе. Легалізм у Грамадзе выявіўся ў заснаваньні першай легальнай беларускай газэты і ў концэнтрацыі працы грамадаўцаў наўкол гэтай газэты.

## Міжрэволюцыйныя часы (1905—1917 г. г.).

Першая легальная беларуская газэта «Наша Доля» адчынілася ў Вільні ў верасьні 1906 году. Зразумела, што быць штодзеннай газэтай «Наша Доля» не магла, бо ня было ні сілы, ні сродкаў. Яна выходзіла раз у тыдзень і мела форму журналу з рысункамі. На чале газэты сталі сябры Цэнтральнага Комітэту Беларускай Соцыялістычнай Грамады: Іван і Антон Луцкевічы і Вацлаў Іваноўскі. Апроч іх, дзейны ўдзел у газэце прымаюць А. Уласаў, Я. Купала (Я. Луцэвіч) і Я. Колас (К. Міцкевіч). Апошні супрацоўнічае ў газэце, адбываючы кару ў менскім вастрозе за тое, што належаў да настаўніцкага саюзу, які залажыўся быў улетку 1906 году ў сяле Мікалаеўшчыне Менскага павету. Вялікім цяжарам на газэту падае той факт, што яна павінна друкавацца ў двух выданьнях: адно кірыліцаю, а другое лацінкаю, каб часопіс маглі чытаць і беларусы-праваслаўныя, якія ўмелі чытаць парускy, і беларусы-каталікі, якія чыталі папольску. Як газэта легальная, яна, зра-

зумела, не магла быць і ня была газэтай социялістычнай па свайму зьместу. У рэдакцыйным артыкуле 1 нумару было толькі вызначана, што газэта ставіць сваёю мэтаю абараняць інтарэсы вясковага люду і нясьці яму асьвету ў зразумелай для яго мове. Ня гледзячы на такую, на наш погляд, нясьмелую заяву, ня гледзячы на тое, што новая газэта ў самай рэчы была ня клясава-социялістычнай, а нацыянальна-дэмократычнай, яна для тых часоў рэакцыі была занадта радыкальнаю і вельмі непакоіла адміністрацыю. На газэту адразу пасыпаліся кары, як з мяшка. З першых 6 нумароў 5 было конфіскавана, а на шостым яна зусім была забаронена.

Энэргія выдаўцоў і культурны пад'ём сярод беларускіх інтэлігэнцкіх кругоў далі магчымасьць зноў зьявіцца ў сьвет беларускаму друкаванаму слову. Праз два месяцы (у лістападзе), замест прыпыненай адміністрацыяй «Нашай Долі», пачала выходзіць «Наша Ніва». Увакол новай газэты згуртаваліся ранейшыя культурнікі з дадаткам новых, больш правых элемэнтаў. Дзякуючы гэтаму, новая газэта была правейшаю за «Нашу Долю». З клясавым кірункам яна зусім парвала і стала на грунт адзінага нацыянальнага фронту. Дэвізы часопісі зьмешчаны ў рэдакцыйным артыкуле № 1 «Нашай Нівы». Там напісана так: «Ня думайце, што мы хочам служыць толькі ці паном, ці адным мужыком. Не, ніколі не! Мы будзем служыць усяму беларускаму пакрыўджанаму народу; пастараемся быць люстрам жыцьця, каб ад нас, як ад люстра, сьвет падаў у цёмнасьць. Мы будзем старацца, каб усе беларусы, што ня ведаюць, хто яны ёсьць, зразумелі, што яны беларусы і людзі, каб пазналі свае правы і памаглі нам у нашай рабоце». Газэта абвяшчае, што яна ня будзе служыць «адным мужыком». Выходзіць, што, апроч пакрыўджаных мужыкоў, яна будзе служыць і «пакрыўджаным паном», каб яны зразумелі, што яны не палякі, ня рускія, а беларусы і ў дадатак да гэтага—людзі. Бязумоўна, газэта ў апошнім выпадку далёка пашла па шляху нацыянальнага фронту і дагаварылася да абсурду. Ясна, што паны не патрабавалі абароны сваіх чалавечых праў.

У рэдакцыйным артыкуле вызначана і тая тактыка, катораю газэта будзе карыстацца, праводзячы ў жыцьцё свае лёзунгі. Там сказана, што газэта «ня будзе пісаць громка, будзе пісаць спакойна, цьвёрда, кідаючы ўсім праўду ў вочы». Дзякуючы сваім скромным дэвізам і нягромкасьці сваіх слоў, газэта неяк праіснавала аж да вайны 1914 году, зрабіўшыся проста лібэральнай газэтай і адбіваючы на сабе ліхалецьце цяжкай эпохі глыбокай апошняй царскай рэакцыі. Трэба ўсё-ж такі прызнаць, што «Наша Ніва» часта выходзіла з рамак сваіх дэвізаў і тактыкі. Паміж яе радкамі часта знаходзім мы здаровыя

думкі. Часта яна ня толькі громка гаворыць, нават крычыць. Але ўдары рэакцыі зноў гоняць яе ў русло лібэралізму.

Рэакцыя налажыла сваю пячатку нават на такую моцную організацыю, як Бунд. Яўрэйскія пагромы, каторыя пасьля 17 кастрычніка пракаціліся па паўдні Расіі, перакінуліся і на Беларусь, у Магілеўшчыну, Меншчыну і Горадзеншчыну. Гэта была помста яўрэйскім працоўным масам за удзел у рэволюцыі з боку царызму. Пагромы выклікалі шырокую эміграцыю яўрэйства ў Амэрыку. Зразумела, што і пагромы і эміграцыя найбольш закранулі бяднейшую наогул і пролетарскую ў асобку частку яўрэйства. А гэта ў сваю чаргу балюча ўдарыла па організацыі Бунду, каторая губіла для Беларусі сваіх сяброў, аддаючы найбольш пролетарскую сваю частку соцыялістычным організацыям Амэрыкі. Памалу ў організацыі Бунду ўсё больш і больш брала перавагу дробна-буржуазная і інтэлігэнцкая стыхія. Бунд пакаціўся па нахільнай плошчы да меншавізму і легалізму.

Бунд пачынае цікавіцца і прымаць удзел у разьвязваньні такіх пытаньняў, каторыя зусім не павінны датычаць яго, як клясавай організацыі. Бунд, напрыклад, прыняў жывы удзел у такім пытаньні, як дзень адпачынку для яўрэйскіх прадпрыемстваў. На аснове закону 15 лістапада быў устаноўлен абавязковы адпачынак у нядзелю для ўсіх без выключэньня прадпрыемстваў і рабочых, да якой-бы веры яны ні належалі. Да гэтага закону яўрэйскія прадпрыемствы і рабочыя сьвяткавалі суботу, а ў нядзелю адчыняліся на 5-6 гадзін. Пасьля закону ад 15 лістапада яўрэйскія прадпрыемствы папалі ў палажэньне, калі ім трэба было сьвяткаваць і суботу, на аснове закону Майсея, і нядзелю, на аснове царскага закону. Такое сьвяткаваньне двух дзён у тыдзень наносіла экономічную страту прадпрыемцам і рабочым яўрэям і было карысна для хрысьціянскіх прамысловых і гандлёвых прадпрыемстваў, каторыя сьвяткавалі толькі нядзелю, а ў суботу ня мелі конкурэнтаў—яўрэйскіх прадпрыемстваў. Дробна-яўрэйская буржуазія разьдзьмухала пытаньне аб абавязковым дні адпачынку ў вялікае нацыянальнае пытаньне. Бунд таксама быў захоплен гэтым рухам.

У часы рэакцыі нацыянальнае пытаньне ў Бундзе пачынае займаць першае месца, адсоўваючы далёка назад клясавыя проблемы. У партыйнай бундаўскай прэсе мы знаходзім вялікі лік артыкулаў аб разьвіцьці яўрэйскай культуры, барацьбе за роўнапраўнасьць і пашырэньне яўрэйскай мовы, за культурна-нацыянальную аўтономію і г. д. Бунд прымае дзейны ўдзел у руху, каторы падняўся навакол пытаньня аб утварэньні сьвецкай яўрэйскай абшчыны. Бунд лічыў, што органы абшчыны, абраныя на аснове агульнага, роўнага, простага і патаемнага галасаваньня, будуць тэю базаю, на каторай будзе будавацца культурна-нацыянальная аўтономія. Бунд паставіў сабе за мэту ўцяг-

нуць у гэты дэмократычна-нацыянальны рух рабочых, што яму часта і ўдавалася. Шмат энэргіі было аддадзена на працу ў легальных культурных яўрэйскіх організацыях, як, напрыклад, літаратурна-музыкальна-драматычныя гурткі, вячэрнія рабочыя школы, «Яўрэйскае літаратурнае вобчаства», «Вобчаства для пашырэньня асьветы сярод яўрэяў» і г. д. Яўрэйская культура і мова, каторая ў часы рэволюцыйнага пад'ёму былі для Бунду сродкамі пашырэньня яго ўплыву на рабочыя яўрэйскія масы, цяпер зрабіліся самамэтаю. Як кажа т-ш М. Рафес, Бунд зрабіў поўны паварот да чырвонага яўрэйскага нацыяналізму. «Пачалі раздавацца галасы, што няма нічога дрэннага, калі будуць закладацца асобныя яўрэйскія больніцы; гаварылі, пісалі і друкавалі ў бундаўскіх органах, што гэта, можа быць, нават вельмі патрэбна, гэта—нават зручна, бо (як пісаў адзін літаратар таго часу Літвак) хворы яўрэй, знаходзячыся ў псыхічна-цяжкім настроі, будзе сябе куды лепш адчуваць, маючы побач з сабою яўрэя, каторы гаворыць з ім у той самай роднай мове, а ня чужога, незразумелага яму хворага другой нацыянальнасьці. Сьвяты жах, каторы раней бундаўцы мелі перад пашырэньнем компэтэнцыі яўрэйскай нацыянальна-культурнай аўтономіі, паступова вытхнуўся. Пытаньне пачало разважацца не прынцыпова, а чыста практычна; уносіліся розныя пропозыцыі аб пашырэньні компэтэнцыі яўрэйскай нацыянальна-культурнай аўтономіі. Прынцыповая мяжа паміж Бундам і левым соцыялістычным крылом сіонізму зьнікала» (М. Рафес. Очерки по истории Бунда. 1923, стр. 221).

Такім спосабам, і Бунд і Бел. Соц. Грамада ў часы рэакцыі падпалі моцнаму ўплыву легалізму і ліквідатарства. Клясавыя соцыялістычныя межы забываліся. Падпольная праца ўсё больш і больш аслаблялася. На першы плян была пастаўлена нацыянальна-культурная праца наўкол легалізованых устаноў. Яна патрабавала для сябе шмат работнікаў і шмат энэргіі. І трэба прызнаць, што ў гэтым кірунку як Грамадою, так і Бундам была эроблена значная праца. Зьнік партыец-рэволюцыянэр, яго месца заняў нацыянальны адраджэнец.

Што датычыць гуртка грамадаўцаў, каторыя стаялі на чале «Нашай Нівы», то яны, як зазначалася вышэй, узяліся з вялікай энэргіяй за культурна-нацыянальную беларускую працу. Трэба сказаць, што газэта ў цяжкія часы рэакцыі згуртавала ўвакол сябе шмат бескарысных культурнікаў. Вельмі часта яна з лібэральнага грунту зыходзіла ў бок народніцкага дэмократызму. У такія моманты яна кідала свой лібэральны дэвіз службы «паном і мужыком» разам і схілялася да службы адным прыгнечаным мужыком. Дзеля гэтага газэта ўсё больш і больш пашыралася і рабілася популярнаю ў вёсцы сярод настаўніцтва, вучнёўскай, студэнцкай, сялянскай моладзі, а часам пападала ў мазольныя рукі звычайнага беларускага селяніна, якому яна падаба-

лася і за сваю простую «мужыцкую» мову. Вёска добра падтрымлівае газэту. На аснове справаздачы рэдакцыі, мы ведаем, што за першыя тры годы свайго вельмі цяжкога існаваньня газэта атрымала 960 корэспондэнцый з 489 вёсак, надрукавала 246 вершаў 61 песьняра і 91 апавяданьне 36 аўтараў. У працу газэты было ўцягнута шмат народу. «Наша Ніва» зрабілася зьбірацелькаю дэмократычна-народніцкай інтэлігэнцыі прадрэволюцыйнага тыпу, якая, ня гледзячы на рэакцыю, толькі што пачала нараджацца: тут пісалі народнікі-адраджэнцы, пісьменьнікі і песьняры, як, напрыклад, Янка Купала, Якуб Колас, М. Багдановіч; тут пачаў сваю літаратурную працу будучы пясьняр пролетарскай рэволюцыі Ц. Гартны. Усё гэта людзі, каторыя вышлі ня з панскіх палацаў і маёнткаў, а з працоўных сялянскіх гушч, з глухіх вёсак, з курных хат. Ім ня трэба было сходзіць у нізы і прыстасоўвацца да іх, бо яны самі вышлі з нізоў і добра ведалі жыцьцё іх і іх патрэбы. Газэта «Наша Ніва» зрабілася іх ідэёвым асяродкам, каторы яны падтрымваюць усімі сіламі: дапамагаюць сабранымі і асабістымі грашыма, працаю і нават папераю. Захопленыя ідэяю адраджэньня Беларусі, яны вядуць індывідуальную агітацыю і пропаганду, утвараюць у вёсках культурна-асьветныя гурткі, каторыя даволі часта ўваходзяць у сувязь з падпольнымі социялістычнымі організацыямі. Царскі урад вядзе бязупынную барацьбу з адраджэнчаскім рухам, вінавацячы яго ў сэпаратызьме і ставячы на адну дошку з социялістычнымі клясавымі падпольнымі організацыямі.

Пад уплывам культурна-нацыянальнага руху пачынае расьці выдавецкая справа ў беларускай мове. Дзякуючы таму, што ў Вільні вельмі цяжкія цэнзурныя ўмовы, некалькі грамадаўцаў на чале з В. Івановскім засноўваюць у Пецярбурзе коопэрацыйную выдавецкую суполку пад назваю «Загляне сонца і ў наша ваконца». Суполка гуртуе вакол сябе радыкальна-народніцкую беларускую інтэлігэнцыю, каторая зьвязана з пецярбурскімі вышэйшымі вучэбнымі ўстановамі. Суполка знаходзіцца ў цеснай экономічнай і ідэёвай сувязі з «Нашай Нівай». Свае выданьні яна друкуе, як і «Наша Ніва», лацінкай і кірыліцай. Яе коштам і працаю былі выданы з аднаго боку—ранейшыя беларускія пісьменьнікі, напрыклад: В. Дунін-Марцінкевіч, Я. Няслухоўскі, Ф. Багушэвіч, з другога боку—новыя, напрыклад: Я. Купала, Я. Колас, А. Паўловіч і інш. Апроч Пецярбургу, утвараюцца беларускія выдавецтвы і ў іншых гарадох, напрыклад, у Менску. Выдавецтвам кніжак займаецца і рэдакцыя газэты «Наша Ніва».

У траўні 1907 году, дзякуючы працы грамадаўцаў і культурнікаў-адраджэнцаў, пасьля ўсялякіх перашкод, зьбіраецца першы зьезд беларускіх настаўнікаў. Ня гледзячы на сыстэматычную русіфікацыю, якая праводзілася сярод настаўніцтва урадам, на зьезьдзе ўсё-ж такі

набралася даволі значная група настаўнікаў-беларусаў, каторая адгукнулася на агітацыю адраджэнцаў. Яна палажыла пачатак арганізацыі «Беларускага настаўніцкага саюзу». Саюз, як відаць з яго статуту, ставіў сабе за мэту аб'яднаць беларускіх настаўнікаў на шырокіх дэмократычных асновах. Ён прапанаваў сваім сябром вучыць дзяцей-беларусаў у іх матчынай беларускай мове. Настаўніцкі саюз быў хутка выкрыт паліцыяй, разгромлен і больш энэргічныя сябры яго папалілася турмою, як, напрыклад, пясьняр Я. Колас, катораму за ўдзел у саюзе прышлося прасэдзіць у менскім вастрозе 3 гады.

Дэмократычна-народніцкі беларускі рух зьвярнуў на сябе увагу царскай рэакцыі. Ім цікавіліся, з аднаго боку, правыя часткі ўсіх дум і асабліва сталыпінскае міністэрства, а з другога боку, польскія шляхецка-клерыкальныя колы. Утвараецца адзіны агульны фронт польскай шляхты і рускага дваранства і чынавенства, пакіраваны на барацьбу з беларускім рухам. І тыя і другія, упарта змагаючыся з ім, высунулі кожны з свайго боку «тоже» беларускі рух. З 1909 году ў Вільні пачынае выдавацца газэта ў беларускай мове пад назваю «Беларусь». Газэта мае клерыкальны, каталіцкі кірунак. Адначасна з гэтым, у Вільні, пры дапамозе царскага ураду, організуецца дваранска-чыноўніцкае вобчаства пад назваю «Крестьянин», каторае выдае ў рускай мове часопісь «Белорусская жизнь» офіцыяльна-ўрадовага кірунку. Трэба сказаць, што ў сэнсе расколу беларускага руху больш зрабіла польская панска-ксяндзоўская група. Яна глыбей уцёрлася ў беларускі народніцкі рух, мела больш грошы і праз касьцёл часам пападала ў вёску. Што датычыць да руска-чыноўніцкага вобчаства «Крестьянин», то яно з сваёю «западно-русской» орыентацыяй засталося збоку, бо было дыскрэдытавана блізкасьцю да «истинно-русских» чорнасотнікаў. Тым ня менш увесь час ішло бязупыннае цкаваньне беларускага нашаніўскага руху з двух бакоў. Яно лягло вялікім цяжарам на нашаніўцаў. Нашаніўцы энэргічна адмяжоўваліся і адбіваліся як ад царскіх воўчых зубоў, так і ад панскага лісінага хваста.

Выбары ў Думу і праца Думы не закранулі зусім беларускай вёскі. Вёска пасылала мэханічна намечаных урадам дэлегатаў, каторыя былі земляўласьнікамі, папамі і зрэдка заможнымі сялянамі. Земляўласьнікі, як палякі, стаялі на варце земляўласьніцкіх польскіх інтарэсаў на Беларусі. Папы і заможныя сяляне падбіраліся з «истинно-русским» кірункам, каб яны маглі скласьці опозыцыю ў адносінах да польскіх паноў. Грамадаўцы і нашаніўцы бойкотавалі Думу. Вёска крыху ажывілася ўлетку 1906 году ў сувязі з разгонам І-ай Думы і выборскай адозваю. Соцыялістычныя партыі на Беларусі, наперакор пажаданьням самых кадэтаў, карыстаюцца адозваю, як повадам для шырокай агітацыі сярод сялянства. Агітатары заклікаюць вёску не пла-

ціць падаткаў, не даваць рэкрутаў і шляхам збройнай барацьбы выкінуць цара разам з панамі. Такая-ж самая кампанія праводзіцца і ў пролетарскіх цэнтрах Беларусі. Кампанія ня мела водгуку ні ў горадзе ні ў вёсцы. Рэакцыя, узброеная да зубоў, моцна трымала ўладу ў сваіх руках. Па гарадох выбары ў думы выклікалі некае ажыўленьне. Бунд прымаў удзел у выбарах ува ўсе Думы, апроч першай. Яго лінія была ня клясавай, а нацыянальнай. Наогул, паўсюды выбары адбываюцца па нацыянальным курыям. Мы спатыкаемся з польскай, рускай і яўрэйскай курыямі. Руская і яўрэйская куры часам разьбіваюцца на правых і левых. З беларускай курыяй мы не спатыкаемся, бо беларусы—жыхары вёскі, каторыя адносіліся да выбараў пасыўна, апроч таго, беларускія палітычныя і культурныя организацыі бойкотавалі ўсе Думы.

Увосень 1913 году рэакцыя, пасьля амаль што двухгадовай падгатоўкі, пусьціла ў ход вядомы процэс Бэйліса. Угалоўныя праступнікі забілі ў Кіеве хлопчыка Андрэя Юшчынскага. Урад прыцягнуў да адказу яўрэя Бэйліса, вінавацячы яго ў рытуальным забойстве. У паветры запахла сярэднявяковымі процэсамі інквізыцыі. Беларусь, каторая была цэнтрам яўрэйства ў імпэрыі, балюча пераживала гэты процэс. Буржуазія яўрэйская абвясьціла ў дзень процэсу агульны пост і малітву. Гэты лёзунг пасыўнасьці і апатыі ня мог захапіць яўрэйскіх рабочых мас. Бунд падняў пытаньне аб забастоўцы протэсту і пачаў праводзіць яе. Рабочыя масы адгукнуліся на покліч Бунду. Забастоўкі адбыліся ў Вільні, Менску, Магілеве і другіх гарадох. Ня гледзячы на шырокую чорнасотніцкую агітацыю, беларуская вёска трымала сябе ў адносінах да злосна абвінавачанага яўрэйства вельмі спакойна. Ураду не ўдалося організаваць нідзе пагрому. Ня гледзячы на тое, што міністар юстыцыі Шчэглавітаў вельмі старанна падбіраў склад суду, назначыўшы туды судзьдзяў-юдафобаў, процэс для ураду праваліўся, і ні ў чым не павінны Бэйліс быў апраўдан. Урад не чакаў такога канца. Абураны няўдачай, ён абрушыўся з рэпрэсыямі на рэдактароў лібэральных газэт і адвакатаў. Як вынік процэсу Бэйліса, адбыўся вядомы процэс адвакатаў у Пецярбурзе, які скончыўся за месяц да вайны (IV,1914 г.) асуджэньнем 25 адвакатаў.

У ліпені 1914 году рускі урад зноў утварае «аддушыну». Распачынаецца вялікая імпэрыялістычная вайна паміж так званымі вялікімі дзяржавамі, на грунце экономічных супярэчнасьцяй паміж імі. Рускі урад сьпешна прымае ў вайне удзел. Што датычыць да Беларусі, то яна, як заходняя частка імпэрыі, адразу робіцца тым фронтам, на каторым ідзе крывавая бойня працоўных мас Расіі, Гэрманіі і Аўстрыі, каторыя гінуць дзеля інтарэсаў пануючых кляс гэтых гаспадарстваў. На працягу гэтай бойні ня толькі льлецца кроў, але

руйнуецца ўвесь дабрабыт Беларусі наогул і асабліва заходняй яе часткі. Прыпыняецца ўся мірная праца, і край становіцца на ваенную нагу. Зямля ўзрыта акопамі і ямамі, абцягнута калючымі драцянымі загародкамі. Паляцца і руйнуюцца гарады і вёскі, пустошацца палі, лугі і лясы. Для Беларусі, апроч таго, настаюць доўгія часы добра вядомага ўсім нам бежанства, каторае лягло цяжкім крыжам якраз на працоўныя яе масы і каторае не зьліквідавана яшчэ й дагэтуль. Дакладнага ліку бежанства мы ня маем, але толькі па прыблізным падліку з тэрыторыі Беларусі выехала і вышла на ўсход у Расію каля двух



Уцекачы.

мільёнаў людзей. Частка іх пачала цяжкі бежанскі шлях па сваёй уласнай ахвоце, зрушыўшыся з наседжаных гнёзд пад страхам ваеннага тэрору. Частка павінна была зьняцца з месца па загаду ваеннай улады, каторая чамусь лічыла немагчымым, каб пры адступленьні рускай арміі жыхары заставаліся на пакінутым арміяй месцы. У некаторых мясцох казакі, каторыя адходзілі на ўсход апошнімі, палілі вёскі і мястэчкі і гналі беларускую і яўрэйскую масу ў Расію, дзе бежанцаў чакала горкая доля. Калі тыя, што выехалі па сваёй ахвоце, вязьлі з сабою сякія-такія рэчы, то выгнаныя сілком апынуліся амаль што голымі. Што рабілася на бежанскім шляху, ня трэба казаць. Кожны і цяпер можа пазнаць дарогі, па якім ішлі бежанцы, па тых капцох-магілах, каторыя насыпаны з двух бакоў ад дарогі.

У 1918 годзе беларускі нацыянальны комісарыят у Маскве рабіў рэгістрацыю бежанцаў-беларусаў. У рэгістрацыйнай картачцы, па-

між іншым, была графа з запытаньнем аб працы, якой займаліся бежанцы, выкінутыя імпэрыялістычнаю вайною за межы Беларусі. Па адказам, зьмешчаным у гэтай графе, мы ўкосна можам выявіць соцыяльнае палажэньне беларускіх бежанцаў. Графа дае нам такія матар'ялы: чорнарабочымі працавала 50 проц. усёй бежанскай масы, майстравымі былі 12,8 проц., земляробствам займаліся 23,6 проц. і нясьлі інтэлігэнцкую працу 10,9 проц. З вышэйпаданых статыстычных матар'ялаў даволі ясна відаць, што бежанства пала якраз на працоўныя нізы Беларусі. Найчасьцей гэта былі сяляне, адарваныя ад зямлі, меншая частка каторых і ў палажэньні бежанцаў неяк абсажвалася на зямлі, а большасьць зарабляла хлеб чорнаю працаю.

Вайна і бежанства выкінулі на вуліцу і аставілі бяз хлеба шмат зьнішчанага, а часам і пакалечанага народу. Гэтая абяздоленая галодная маса пагражала царызму. Трэба было ўтварыць нейкія паліятывы, каб зрабіць уражаньне дапамогі бежанскім масам. У розных гарадох Расіі закладаюцца бежанскія комітэты дапамогі ахвярам вайны. Будуюцца для бежанцаў баракі, харчавальныя пункты, раздаюцца пайкі натураю і грашыма. Вельмі хутка бежанскія комітэты пачынаюць ахварбоўвацца ў нацыянальныя хваробы. Вынікаюць польскія, яўрэйскія, літоўскія, латыскія і інш. комітэты. Дзе-ні-дзе ёсьць спробы з'арганізаваць і беларускія комітэты. Урад і русіфікаваная беларуская чыноўная інтэлігэнцыя перашкаджаюць арганізаваць беларускія бежанскія комітэты, лічачы, што гэта ёсьць выяўленьне беларускага сэпаратызму. Зразумела, што, дзякуючы гэтаму, вельмі часта беларусы-бежанцы пападалі яшчэ ў горшае палажэньне, як бежанцы інш. нацыянальнасьцяй.

У пачатку верасьня 1915 году нямецкія войскі занялі Вільню. Руская армія пачала адыходзіць далей на ўсход, і Заходняя Беларусь папала ў раён так званай першай окупацыі. Сюды ўвашлі—Горадзеншчына, большая частка Віленшчыны і невялічкая частка Меншчыны. Кайзэраўская Гэрманія адчувала сябе ў гэты момант гаспадыняю палажэньня і вуснамі свайго канцлера абвясьціла, што вызваленыя ад Расіі землі яна ня верне ёй назад. У дэмократычных інтэлігэнцкіх колах Віленшчыны нямецкае «вызваленьне» абудзіла незалежніцкія думкі. 19-га сьнежня 1915 году апублікоўваецца на чатырох мовах—беларускай, літоўскай, польскай і яўрэйскай—«Унівэрсал конфэдэрацыі Вялікага Княства Літоўскага». Тут абвяшчаецца, што прадстаўнікі беларускіх, літоўскіх, яўрэйскіх і польскіх організацый утварылі конфэдэрацыю, дабіваючыся, «абы Літоўскія і Беларускія землі, каторыя здаўна прыналежалі да Вялікага Княства Літоўскага, а цяпер апанованы нямецкімі войскамі, станавілі пры новых гістарычных варунках неразьдзельнае цела на фундаманце незалежнасьці Літвы і Беларусі». Сябры конфэдэрацыі зьвяртаюцца да ўсіх грамадзян краю, каб яны.

забыўшы ўзаемныя крыўды і сваркі, у імя карысьці супольнай бацькаўшчыны, прылучыліся да конфэдэрацыі (Зборнік «Наша Ніва» 1920 г. стар. 7).



Раскіданае гняздо.

З усіх прызываў нічога ня вышла. Паміж палякамі і прадстаўнікамі другіх нацыянальнасьцяй адразу пачаліся «ўзаемныя крыўды і сваркі». Польскае панства мысьліць Літву і Беларусь, як складаныя непадзельныя часткі будучай Рэчы Паспалітай Польскай. Узмацняецца

полёнізатарства. Конфэрэнцыя чатырох краёвых нацыянальнасьцяй распадаецца. Тым ня менш, беларуская культурна-грамадзянская праца ў Заходняй Беларусі разьвіваецца. Адчыняюцца беларускія школы, друкуюцца кнігі, выходзіць беларуская газэта «Гоман». Існуюць беларускія арганізацыі—Беларускі Комітэт для дапамогі пацярпеўшым ад вайны, Беларускі Клюб, літаратурна-асьветнае таварыства «Золак», навуковае таварыства, беларускі настаўніцкі саюз і інш. Як завяршэньне арганізацыі, утвараецца «Цэнтральны Саюз беларускіх нацыянальных грамадзкіх арганізацый». Прадстаўнікі яго ў красавіку 1916 году прынялі ўдзел у Стокгольмскай Конфэрэнцыі народаў Расіі, дзе яны ад імя беларускага народу заявілі, што ён чакае вызваленьня з-пад ярма расійскай няволі.

У чэрвені 1916 году беларускія прадстаўнікі падаюць асобую мэморыю на трэцяй конфэрэнцыі народаў у Лёзане. Гэта мэморыя («Вольная Беларусь», 1917 г. № 21, ст. 2-3) выкладае гісторыю Беларусі з IX ст. да 1916 году. Асаблівая увага зьвяртаецца на ўціск царскае Расіі над беларускім народам. Вайна сваім цяжарам таксама найбольш душыць Беларусь. «Каля году ўжо, як армія расійская і нямецкая б'юцца на землях Беларусі і Украіны, і людзі гэтых старонак мусіць цярпець усе жахі вайны, будучы выстаўлен на поўнае руйнаваньне яго экономічнага быту і спыненьне культуры». Канчаецца мэморыя так: «Цяпер, дзякуючы конфэрэнцыі народаў, мы маем магчымасьць першы раз за сто дваццаць гадоў заявіць цывілізованаму сьвету аб поўным браку ў нас правоў, ад каторага мы цярпелі ў дзяржаве Расійскай. Мы просім у цывілізованых народаў спагады нам і падтрыманьня, каб змусіць шанаваць нашы нацыянальныя і культурныя правы. Мы можам мець нарэшце надзею, што які-б сабе ня быў канец вайны, эўропэйскія народы памогуць нам запэўніць Беларусі ўсе політычныя і культурныя правы, якія дадуць нашаму народу магчымасьць вольна разьвіваць свае інтэлектуальныя, моральныя і экономічныя сілы, і што гэтыя правы дазволяць нам быць гаспадарамі на нашай уласнай зямельцы». Надзеі беларускіх дэмократаў ня спраўдзіліся. «Цывілізованыя» народы не маглі даць і не далі Беларусі ніякіх праў.

Між тым літоўскія нацыяналістычныя колы па-за плячыма беларусаў пачынаюць вясьці асобныя зносіны з нямецкім камандваньнем і хутка зусім парываюць з беларускімі коламі. Пры дапамозе немцаў яны ўтвараюць у Літве і Заходняй Беларусі «Літоўскую Народную Рэспубліку», на чале каторай становіцца Літоўская Дзяржаўная Рада, палітоўску «Тарыба». Сталіцай новай рэспублікі абвяшчаецца Вільня. Дзяржаўныя пляны беларускіх незалежнікаў, такім спосабам, разваліліся.

Што да Ўсходняй Беларусі, што засталася ў межах царскай Расіі, то яна перажывае разам з ўсёю імпэрыяй астатнія часы перадрэволюцыйнай рэакцыі. На яе межах ляжыць паласа Заходняга фронту царскай арміі. Мясцовыя інтарэсы засланяюцца агульна-расійскімі інтарэсамі. А сярод салдат на фронце ўжо адчуваецца прыбліжэньне Лютаўскай рэволюцыі. Усходняя Беларусь цалком увойдзе ў русло вялікай рускай рэволюцыі.

## Нашаніўскае адраджэнства.

Перадрэволюцыйныя часы і рэволюцыя 1905 году, хоць і прыпыненая на нейкі час царскім урадам, падняли і ўскалыхнулі працоўныя гушчы народу як ува ўсёй Расіі, так і на Беларусі. Яны вышлі з рэволюцыі не такімі, якімі яны ўвашлі ў яе. Не гаворачы ўжо аб гарадзкім пролетару і рамесьніку, заварушылася і прачнулася ад векавечнага сну і беларуская вёска. Малазямельле і безьзямельле селяніна, побач з вялізарнымі панскімі маёнткамі, утваралі ў няпісьменнай вёсцы той моцны экономічны грунт, на каторым вясковая беднята лёгка і проста пераймала рэволюцыйныя ідэі і факты. Ня гледзячы на сваю нярухавасьць, беларускі селянін добра зразумеў, што такое рэволюцыя, для каго яна шкадлівая рэч і для каго яна зьяўляецца вельмі карыснаю.

Як у горадзе, так і ў вёсцы ў часы рэволюцыі было пастаўлена ў першую чаргу пытаньне аб політыка-соцыяльным вызваленьні пролетара і селяніна Беларусі. Але, поруч з гэтым пытаньнем, рэволюцыя паставіла і яшчэ пытаньне аб нацыянальным вызваленьні прыгнечаных царскім урадам яўрэя і беларуса. У горадзе стала на парадак дзенны яўрэйскае пытаньне, а на вёсцы—беларускае пытаньне.

Да пачатку XX ст. беларуская вёска ня мела інтэлігэнцыі, каторая была-б беспасрэдна зьвязана з інтарэсамі сялянства. Інтарэсы беларускай вёскі дагэтуль абслугоўваліся інтэлігэнцыяй, якая вышла з шляхецкіх кол і якой трэба было для зразуменьня селяніна і яго многапакутнага жыцьця спускацца з гары ўніз. Народніцтва ранейшай эпохі было ў сваім корані народніцтвам шляхецтва, каторае вельмі часта ўжо было ў палажэньні розначынца. Цяпер пачнецца новы тып беларускага народніцтва. Справа ў тым, што рэволюцыя ўтварыла магчымасьць для выхаду ў сьвет новай інтэлігэнцыі, якая вырасла з глебы працоўнай вёскі.

Зьяўляюцца прадстаўнікі гэтай новай інтэлігэнцыі, сыны малазямельнай і безьзямельнай «засьцянковай шляхты», сялян і рамесьнікаў з мястэчка, уладары дум, песьняры—Янка Купала, Якуб Колас, Цішка Гартны, Зьмітрок Бядуля, Алесь Гарун, Максім Багдановіч і інш. Рэдакцыя адзінае беларускае газэты «Наша Ніва» робіцца

тым асяродкам, наўкола якога ўсе яны гуртуюцца. Усе яны, як мы казалі раней, так ці іначай зьяўляюцца народнікамі і, як такія, яны па свайму сьветапогляду ёсьць ідэалістыя і індывідуалістыя. Выключэньне складае толькі рабочы, гарбар па рамяслу, Цішка Гартны. Як рабочага, яго цягне да сябе марксызм з яго матар'ялістычным сьветапаглядам. Але ён у пачатку, як і другія песьняры, найчасьцей апісвае беларускую вёску, бо ён сам вышаў з сялянскай хаты. Праўда, яго з самага пачатку цікавіць ня толькі доля селяніна, але й доля вясковага пролетара.

Нашаніўскія адраджэнцы, як вышаўшыя з працоўных беларускіх гушч, найчасьцей зьяўляюцца ці соцыялістымі, ці людзьмі вельмі блізкімі да соцыялізму. Соцыялізм нашаніўцаў-песьняроў цесна зьвязан з нацыянальным, нават нацыяналістычным настроем; гэта ёсьць нацыянал-соцыялізм. Такая ахварбоўка іх соцыялістычных поглядаў зразумела, калі мы ўспомнім, што Беларусь перажывала нацыянальны ўціск, што беларуская нацыя была «мужыцкай» нацыяй, беларуская мова—«мужыцкай» мовай. Пішуць яны выключна ў беларускай мове, абараняючы яе ад нападаў царызму і абруселай інтэлігэнцыі. Беларуская мова—іх матчына мова. Яна—мова таго прыгнечанага беларускага селяніна і чорнарабочага, якіх яны хочуць вучыць і абараняць.

Моцна зьвязаны нашаніўцы з сялянскаю Беларусьсю. Уся увага іх зьвернута на сваю родную маці-старонку. Яны моцна любяць яе і за ёю ня бачаць хараства ў чужых краёх. Ёсьць бацькаўшчына і ёсьць «чужая старонка», і яны зусім не падобны адна на другую ў вачох песьняроў. Чужая старонка, куды папаў пясьняр, гняце яго душу, губіць яго здароўе і спакой; яна—нялюбая, вочы песьняра ня хочуць глядзець на яе. На чужой старонцы і птушачкі не сьпяваюць, і лета там здаецца песьняру, як зіма. «На чужой староначчы ня шумяць лясы, і няма прыгожасьці ў палявой красы; замірае душачка на чужой зямлі» (А. Гарун). Зусім ня так на бацькаўшчыне. Усё там сьпявае голасна, бадрыць і падымае настрой песьняра. «Дзе-ж вы, ніўкі родныя і дубровы шум? Засьпявайце голасна, каб пазнаў, пачуў. Ўскаланеце песьняю векавечных сноў, ўскаланеце душачку, ўскаланеце кроў!» (А Гарун. «Песьня»). Але калі песьняры прыглядаюцца да свайго роднага краю безадносна, не раўнуючы яго з чужой старонкаю, то «маці-Беларусь» ужо іначай апісваецца імі. Гэта—край пануры, у ім жыве люд забіты, бедны і шэры (А. Гарун. «Чаму з маленства»). Але, ня гледзячы на цяжкае палажэньне роднага краю, песьняры любяць яго моцна і шчыра, любяць толькі за тое, што ён ня чужы, а родны край. «Край лясоў і балот, і туманаў гнілых! Хоць і бедна ў табе, і ў лозах тваіх вецер ў восень жудою шуміць... А люблю-ж я той край, бы яго родны сын, і па ім маё сэрца баліць» (Я. Колас. «Палесьсе»).

Цяжкае ўражаньне робяць на чытача малюнкі Беларусі, напісаныя рукою і сэрцам песьняроў-нашаніўцаў, прыдушаных і прыгнечаных цяжарам міжрэволюцыйнай рэакцыі. Няма сілы, няма веры, няма сонца і ясных дзён. Беларусь у іх песьнях—гэта зусім бедны край. Толькі відна кругом, што «гразь, балота ды пясок». «Туманы, як пялёнка, засьцілаюць лес і гай... Ой, ты, бедная старонка! Ой, забыты богам край!» Поле на Беларусі не дае добрых ураджаяў. Шмат працы кладзе над ім беларускі селянін, але жыве бедна. Па краі параскіданы бедныя, нудныя вёскі, якія смутна пазіраюць наўкол сябе. Пануе нейкая ціша, як у вастрозе, як на могілках. Цішу часам будзіць песьня народу, але гэтая песьня не нясе бодрасьці і радасьці. «А як песьня панясецца, колькі ў песьні той нуды. Уцякаў-бы, бег, здаецца, сам ня ведаеш куды». Край—сірата, яму долю дала ня маці, а мачыха. «Край наш родны! Бедна поле! Ты глядзіш, як сірата. Нудны ты, як наша доля, як ты, наша цемната» (Я. Колас. «Наш родны край»). Над краем, уздоўж Нёмна—сына Беларусі, вісьне скарга на цяжкую долю, на беднасьць, на цемнату. Не протэст, а скарга. Усё спавіта векавечным горам у гэтым краі: «І той вецер, што дзьме з гаю, што шуміць над борам; тая песьня, што на полі жнеі засьпяваюць; тыя думкі, што да болю сэрца калыхаюць». Зразумела, чаму Беларускі край родзіць песьні смутку, каторыя разьліваюцца плачам у сіняй далі. Яны сьпяваюцца для таго, «каб усе людзі ў сьвеце знали, як нам тут жывецца» (Я. Колас. «Родныя Песьні»). Гоні-загоны пакрыўджаный Беларусі жаляцца сьвету сваёй руньню зялёнай і сваім коласам сьпелым. Няма сілы! Незавідны народ! «Спавітыя плесьняю вёскі між пустак заселі бясьсільна, ўтуліўшыся ў цені бярозкі на вечным кургане бадыльным. А люд... ён сагнуўшыся ходзіць пад ношай зьнямогі-пакуты і, роячы сны аб свабодзе, з дня ў дзень сам сабе куе путы. Так сьпіш, так жывеш мімаходам, мой край, як сьцяпная магіла, з сваім незавідным народам, з патухлай і славай, і сілай» (Я. Купала. «Мой край»).

Цяжка на Беларусі жыць беларусу-селяніну, але не лягчэй жыць і таму, хто паставіў сабе за мэту стаць на яго абарону, даць яму асьвету, навучыць яго разумець свае правы працоўнага чалавека. Усякая абарона праў працоўнага люду моцна караецца нядрэмлючым вокам царскай рэакцыі. Абаронца сялянскай Беларусі вырвуць з яго сумнага, беднага, але любага яму, роднага яму краю, пасадзяць у цёмныя, цесныя муры турмы ці выганяць бадзяцца па далёкай халоднай Сібіры (А. Гарун, Я Лёсік і інш.). Зразумела, што любоў нашаніўцаў да бацькаўшчыны, неразрыўна зьвязаная з мучаніцтвам, ёсьць любоў балючая, як-бы хваравітая. Пры такім пачуцьці цяжка, нават ня можна сьпяваць яскрава-вясёлыя песьні. Вельмі зацяжкія абставіны для такіх песень. «Ня пытайце, не прасеце сьветлых песень у мяне, бо як песьню за-

сыпяваю, жаль ўсю душу скалыхне. Я-б сьмяяўся, жарбаваў-бы, каб вас чуць разьвесяліць, ды на жыцьце як паглянеш, сэрца болем зашчыміць» (Я. Колас. «Ня пытайце»).



Жабрачкі.

Не знаходзячы ўцехі ў сучасным стане Беларусі, песьняры-нашаніўцы часта шукаюць яе ў мінулым Беларусі. Мінулае дзеля таго, што далёка ад нас, часта маніць чалавека. Здаецца песьняром, што калісь на Беларусі было лепш, чымся цяпер. І вось перад намі праходзяць творы, дзе ідэалізуецца старажытная гісторыя Беларусі, дзе мінулае ахварбоўваецца ў ружовы романтычны тон. Няма сіл у адраджэнцаў, каб даць яскравы малюнак будучай шчасьлівай, вольнай Беларусі, бо няма моцнай, як загартованая сталь, веры ў яе, бо рэакцыя прыдушыла іх, бо рэакцыя падрэзвала магутныя крылы іх пясьнярскай фантазіі. А калі так, то што павінен рабіць пясьняр? Ён павінен знайсьці ўцеху ў мінулым.

Калісь Беларусь была зусім не такою як цяпер; зусім не такім, як цяпер, быў і беларус. Вольна, шчасьліва і радасна жылося на Беларусі. Яна была магутнай і слаўнай старонкаю. «У старыну беларус, непаддачы, гаспадарыў, быў сам над сабою, і далёка у сьвеце быў знаны за Літоўскай і Ляскай зямлёю. Але час прамінуў, і нядоля на народ, як-бы камень, зваліласъ, беларуская слава і воля адышла, адцьвіла, закацілась». Усе, хто хацеў, прыязджалі на Беларусь, зьневажалі правы яе жыхарства і рабавалі яго маетнасьць. «І зямлю, і лясы, і кілімы—ўсё забралі» (А. Гарун. «У чатырохлецьце «Нашай Нівы»). Тое самае гаворыць чулай душы песьняра і стары вольны Нёман у час непагоды, калі «вербы і вольхі калышуцца глуха, сінія

хвалі шумяць і бурляць». Нёман кажа, што яму сумна цяпер, бо калісь ён бачыў лепшыя часы і сам меў не такі жабрачы выгляд. Край шмат весялей глядзеў на сьвет, чуліся інакшыя песьні і казкі. На Беларускай зямлі шчасьце цьвіло, як макавы цьвет. «Буйным жыцьцём усё чыста кіпела, слава далёка за мора ішла». Патаптаны цяпер народ быў панам у сябе дома і слаўным за домам, ён умеў даць кніжны ход роднаму слову. «З вольнай дружынаю князь на пасадзе вольнаму люду законы пісаў; слухалі князя, а князь што ня ўладзіў, слухаў, што веча яму звон казаў» (Я. Купала. «Над Нёманам»). Але гісторыя кажа, што зусім ня так добра жылося на Беларусі тым працоўным масам, якія складалі пераважную большасьць народу і якія ў летапісі носяць назву «меншых» ці «подлых» людзей. А што датычыць да «вольнага князя», то тут нам нават і дадаваць нічога ня трэба. Які-б ён ні быў князь, ён усё-ж такі быў князь, якога вольнасьць была няволяю для працоўных беларускіх нізоў.

Але трэба сказаць, што і мінулае далёка не заўсёды дае нашаніўцам магчымасьць уцешыцца. У мінуты, калі гістарычныя дакуманты ляжалі перад іх вачыма, яны правільна адчувалі мінулае і бачылі, што ў мінулым Беларусі было шмат бяды для тых сялянскіх мас, на абарону якіх выступілі нашаніўцы. Прыгон, зьдзек над селянінам не маглі прайсьці няпрыкмечанымі перад зоркімі вачыма песьняроў-адраджэнцаў. Багаты, залаты, памастацку зроблены слуцкі пояс, сатканы на пэрсыдзкі ўзор, але з беларускім радзімым васільком, дае повад песьняру Максіму Багдановічу напісаць добра вядомы верш «Слуцкія ткачыхі». Залаты пояс будзіць у песьняра думкі не аб багатым і слаўным мінулым Беларусі, а аб цяжкім панскім прыгоне. «Ад родных ніў, ад роднай хаты, у панскі двор дзеля красы, яны, бяздольныя, узяты ткаць залатыя паясы». Яны—гэта беларускія дзяўчаты-сялянкі. Забыўшы радасьць дзявочых сноў, у цяжкай няволі панскага прыгону, пад даглядам панскага вока, ткуць яны на ўзор, прывезены з далёкай Пэрсыі, шырокія парчовыя тканіны. Не на сябе працуюць яны. Ня ім і не вясковым хлопцам насіць залатыя тканіны. А за сьцяною прырода сьвяткуе сваё вясёлае сьвята: зьзяе ў вышыні неба, сьмяецца поле, серабрыцца сярод узгоркаў рэчка, цямнее далёкі бор, сонца залоціць хвалі збожжа, сярод яго міла сінеюць кветкі беларускай вёскі, валькі. Вочы дзяўчат мімаволі спыняюцца на гэтай роднай, прыгожай кветцы. «І тчэ, забыўшыся рука, замест пэрсыдзкага узору, цьвяток радзімы васілька». Хто ведае? можа за гэтую «поэтычную вольнасьць» прыгоннай дзяўчыны-ткачыхі не чакае бізун на панскай стайні, бо яна сапсавала прывозны ўзор.

Часамі горкі боль поўнага адчаю абхапляе сэрца песьняроўадраджэнцаў. Ня было долі ў мінулым, няма яе і ў сучаснасьці і ня

шукайце яе ў будучыне. «На жыцьцё як паглянеш, сэрца болем зашчыміць. Нешчасьліва наша доля, нам нічога не дала. Ня шукайце кветак ў полі, як вясна к нам ня прышла» (Я. Колас. «Ня пытайце»).

Прыгнечана Беларусь, прыгнечана і мова беларуская, мова адраджэнцаў-нашаніўцаў і мова таго народу, з якога яны вышлі. Ідзе зьдзек над ёю, бо яна прызнаецца някультурнаю «мужыцкаю» мовай. Нашаніўцы, усе як адзін, выступілі на абарону гэтай «мужыцкай», а разам з тым і сваёй уласнай мовы. Уціск і зьдзек над беларускаю мовакю з боку царызму і пануючых на Беларусі кляс абвастрылі пытаньне і зрабілі яго вельмі балючым. Яшчэ Багушэвіч стаў на яе абарону, заклікаючы сыноў сваёй роднай зямелькі бараніць мову беларускую, каб не памёр народ беларускі. Таксама ставяць пытаньне аб мове і нашаніўцы. Трэба выратаваць ад сьмерці беларускі, «мужыцкі» народ, а для гэтага трэба выратаваць ад заняпаду беларускую «мужыцкую» мову. Часам утвараецца такое ўражаньне, што не народ творыць мову, а, наадварот, мова творыць народ. З вялікім пад'ёмам і болем у сэрцы звярачаюцца песьняры да «брата-беларуса», каб ён «роднай мовы сваёй ня цураўся». «Ад дзядоў і ад прадзедаў, брацьця, гэта скарб нам адзін захаваўся, у сялянскай аграбленай хаце, толькі ён незабраны астаўся» (А. Гарун. «Ты мой брат»). Беларушчыну энэргічна абараняе ад ворагаў і Я. Купала ў оваім добра вядомым вершы «Ворагам беларушчыны». Беларус гаворыць сваёй мовай—чужой ён ня краў. Калі ворагі зьдзекуюцца над «мужыцкай» мовай, то гэта затым, што яны баяцца яе. Дарэмна іх лаянка і зьдзек. «Не пагасіць вам праўды яснай: жыў беларус і будзе жыць».

Нацыянальнае беларускае пытаньне ў творах нашаніўцаў само сабой злучаецца з социяльным «мужыцкім» пытаньнем. Беларусь—мужыцкая старонка, беларус у масе—селянін. Вузенькая палоска, крывая хатка, садочак каля яе,—усё гэта тыповыя рысы Беларусі. Па жыцьцёвым шляху вагромністаю грамадою ідуць беларусы. Абутыя ў мужыцкія лапці, нясуць яны на паказ на цэлы сьвет сваю векавечную крыўду. Гора падняло іх на ногі, і хочуць яны ня так ужо многа: хочуць яны цяпер «людзьмі звацца». Сытыя і адзетыя павінны пашкадаваць мужыка-бедака, бо ён галодны, халодны, цёмны і бяшчасны. Ён цэлы сьвет хлебам корміць, а сам есьць мякіначку. Працуе ён зімой—цягне дровы ў Менск. Вясна настала—хлеба няма. «Працуй цяжка дні і ночы, пагарду цярпі. Сказаў праўду, дзяруць вочы—вось тут і жыві» (Я. Купала). Мужык-беларус сушыць балоты, за бясцэн косіць панскія лугі, рые, як крот, зямлю, будуе фабрыкі і масты, але сам—«голы як бац». Яго мочыць раса, пячэ сонца. На зямлю ён праліў шмат поту і сьлёз. Няма ў яго цяжкім жыцьці і адпачынку. Толькі ў магіле адпачынак. «Могілкі ў полі адны-адзінюткі. Прасьлы гнілыя на зямлю ляглі

Крыж пахінуўся, як кветка у боры. Многа іх, многа ляжыць на зямлі. Кучка бярозак, вярба ды хвайнка. Вецер разьвеяў іх, дождж спаласкаў. Вось дзе ад гора мужык адпачыне, вось дзе ён думкі і сьлёзы схаваў» (Я. Колас).

У нашанїўскім адраджэнстве знаходзіць сабе месца і беларускі пролетары. Дробная сялянская гаспадарка, ратуючы сябе ад яшчэ большага раздробленьня, выкідвае на вуліцу лішнія рукі. Такім спосабам вынікае пролетары, выкінуты вёскай з гаспадаркі. Ён ужо ня мае ўласнай хаты з садочкам, ня мае ён нават вузенькага шнурочку зямлі. З голымі мазолістымі рукамі выходзіць на шлях жыцьця гэты будучы правадыр сялянства на шляху социяльнай рэволюцыі. Песьняром беларускага пролетара зьяўляецца Цішка Гартны (З. Жылуновіч). Яго пролетары—«рыцар працы цяжкой», каторы здружыўся з ёю і загартован ёю. «Я здружыўся з трудом, я ў ім рос, я ў ім крэп. Запрацованы хлеб люблю мець за сталом. Не хачу, ня прывык, склаўшы рукі, хадзіць: я—гарбар-працаўнік, я жыву, каб рабіць» (Ц. Гартны. «Песьні гарбара»).



Грабары.

Але ня так лёгка знайсьці пролетару працу на Беларусі, каторая ня мае моцна разьвітае прамысловасьці. У халодны дажджлівы дзень галодны гарбар «шпаламі клыпае». Ён ужо прытаміўся, баляць косьці, жывот просіць хлеба, каторага няма. Ён ідзе ад хаты да хаты і просіць работы, каб зарабіць хлеба. З хат яму гукаюць, што працы няма, і гарбар ідзе далей. «З гораду ў гора[illegible] блукае, клыпае. Гоніць яго холад, голад падганяе». Гора ідзе за [illegible] сьледам, «каб ён не дабіўся сабе лепшай долі, шчасьця не дажыўся навекі, ніколі» (Ц. Гартны. «Гарбар на вандроўцы»).

Цяжкая рэакцыя адбілася і на настроі Ц. Гартнага. Бязвыхаднасьць і адчай часам запаўняюць сэрца і гэтага песьняра. Вось перад намі беларус-грабар, каторы ўсё жыцьцё сваё, як крот, капае зямлю.

Ен капае зямлю не як селянін. Ня ўласны шнурочак зямлі ўзрывае ён, каб засеяць і зьняць ураджай. Яго нанялі капаць зямлю для інтарэсаў чужога яму капіталу. Многа яе накапаў грабар. Многа свайго поту і крыві праліў ён на гэтую зямлю. Што-ж яму дала зямля? «О, дала яна мне, ой за працу дала. З калючковых расьлін мне вяночак сплялa, з медзі звонкай, цяжкой даравала шнурок, а дарогу жыцьця ухарошыла ў мрок, каб я шоў, як сьляпы, каб бяз конца ішоў, зямлю вечна капаў і дабра не знашоў» (Ц. Гартны. «Песьня грабара»).

Цяжкі, бязвыхадны настрой наогул нашаніўцаў, выкліканы цемрай міжрэволюцыйнай рэакцыі, часам усё-ж такі зьнікае і аддае сваё месца бодрым мотывам і настрою. Пад уплывам ужо ідучай рэволюцыйнай буры 1917 году часам прыходзіць і да іх вера ў лепшую будучыну. Ня можа быць, каб не насталі лепшыя часы. Асабліва часта спатыкаемся мы з такімі бодрымі мотывамі ў творах Ц. Гартнага. Ён кліча пролетараў і селяніна, каб яны не здаваліся, не апускалі рук, ня кідалі надзеі на лепшую будычыну. «Не здавайся, гарбар, ты за працай сваёй, і на шчасьце прыход не заплюшчвай вачэй. Песьню вольную пей у дыму, ў духаце, і надзея твая няхай кветкай цьвіце. Бо дзе сіла жыве, дзе работа кіпіць, там насеньне зярня лепшай долі ляжыць» (Ц. Гартны. «Песьні гарбара»). Часам песьняры ўжо адчуваюць у паветры нешта новае. Сярод цішы і смутку ўжо носіцца часам гарачае бурнае дыханьне няўхільнае рэволюцыі. І адраджэнцы сьпяваюць, што яны гатовы разам з ёю зламаць усе перашкоды старога жыцьця. «Чуйным ветрам вось-вось я гатоў зашугаць і сярдзітым віхром закруціць, па пуціне сваёй ўсе прашкоды зламаць і дарогу, як ток, пралажыць» (Ц. Гартны). Песьняры прадчуваюць рэволюцыю і прадказваюць яе блізкасьць. Кругом яшчэ спакой магільнай рэакцыі, але ўжо на небасхіле зьбіраюцца невялічкія хмаркі. Вось яны ўсё растуць і растуць, чорнымі клубамі пакрываюць толькі-што спакойнае неба. Будзе бура—«змоўклі ўсе вакруг абшары, бо замысьлілі штось хмары. Ой, знаць, бура загудзе» (Я. Колас. «Перад бурай»). Прадчуваючы буру рэволюцыі, песьняры клічуць працоўныя масы Беларусі ісьці наперад, да сонца, да зор лепшае будучыні. Праўда, бацьком дрэнна жылося, праўда, без пары ішлі яны ў цёмную магілу на адпачынак, але перад іх сынамі праясьняецца новы шлях і новая доля. «Гэй, наперад, покі сэрца б'ецца, рвецца на прастор! Годзі млеці ў паняверцы! Гэй, да сонца! Гэй, да зор!» (Я. Купала. «Гэй, наперад!»). Песьняром часам пачынае верыцца, што настануць калісь лепшыя часы для многапакутнай Беларусі. Ня можна пагасіць сьвету яснай праўды, ня можна запудзіць і зьбіць з толку жывых людзей, каторыя столькі бяды вынесьлі на карку ў сваім мінулым. Яны праб'юцца ўперад і даб'юцца лепшай долі. «К свабодзе, роўнасьці і

знаньню мы працярэбім сабе сьлед! І будзе ўнукаў панаваньне там, дзе сягоньня плача дзед» (Я. Купала. «Ворагам беларушчыны»).

Часам у поэзіі нашаніўцаў зычаць мотывы соцыяльнай барацьбы. Песьняры клічуць беднату ў рашучую соцыяльную бітву. Яснай зоркай ляціць пясьняр па небе, падае па-над дахам роднай вёскі ды кліча: «Гэй, хто ёсьць тут? Люд галодны, люд пакутны! Да мяне! Станьма, брацьця, ў шых паходны,—наша гора праміне». На прызыў песьняра падымаецца бедната і пойдзе ў астатні рашучы бой. «Устануць, рушаць. Прэч з дарогі! Хто нам хоча заступіць! Мы пашлі, мы,— люд убогі, усё ўзяць, ці ўсё згубіць» (А. Гарун. «Эх, сягоньня, ў гэту ночку»).

Прачуваюць часам адраджэнцы і размах будучае рэволюцыі. Гэта будзе глыбокая і шырокая рэволюцыя, каторая ўскалыхне да нізу працоўныя масы Беларусі і ўсяго сьвету. Шмат пральлецца крыві, бо, разам з рэволюцыяй, прыдзе і помста за векавечную соцыяльную крыўду. «На сьвет прыдзе многа бяды, бо за крыўду сваю адамсьціць. Сьвіньням будзе крыві не пабраць! Адамсьціць, аж зямля задрыжыць, аж віхры зашумяць, загудзяць» (Я. Купала. «Пажалей мужыка»).

Зашумелі віхры, загудзелі. Прышла на сьвет вялікая соцыяльная рэволюцыя. Частка беларускіх адраджэнцаў адразу пазнала яе і кінулася ў яе рэчышча на барацьбу за вызваленьне соцыяльнае і нацыянальнае ўсяго сьвету, а разам з тым і Беларусі. Другая частка, ня бачачы за клясава-інтэрнацыянальным яе зьместам зьместу нацыянальнага, яшчэ прыглядалася да яе на працягу некалькіх год. Цяпер і яна ўвашла ў яе рэчышча. Беларускі адраджэнчаскі рух зрабіўся аднэй з складаных частак сучаснага вялікага руху соцыяльнай рэволюцыі, каторая вызваляе пролетараў і сялян з аднаго боку і прыгнечаныя народы—з другога боку; каторая, змагаючыся наогул з капіталізмам, змагаецца разам з тым і з вышэйшаю яго формаю—імпэрыялізмам.

## Лютаўская рэволюцыя.

У часы Лютаўскай рэволюцыі Беларусь была парэзана на дзьве часткі: заходняя частка, як мы казалі вышэй, была пад нямецкай окупацыяй, а ўсходняя была занята заходнім фронтам царскай рускай арміі. Рэволюцыя захапіла толькі Ўсходнюю Беларусь. Зразумела, што армія жыла сваім жыцьцём ваеннага часу. У яе былі свае агульнаімпэрскія інтарэсы і складалася яна з салдат, сабраных сюды з усёй многанацыянальнай Расіі. Для ўсёй гэтай організаванай масы Беларусь была ня больш, як часоваю ваеннаю стаянкаю. Армія не магла зразумець і ўвайсьці ў мясцовыя інтарэсы Беларусі, тым больш, што маса яе ня ведала, нават, што яна займае тэрыторыю Беларусі, як організму. Салдат ведаў Менскую, Магілеўскую, Віцебскую губэрні, як часткі

імпэрыі, а не як часткі Беларусі. Калі з цэнтру на захад перакінулася рэволюцыя, то яна пашла на Беларусі ў двух кірунках—фронтавым і мясцовым, бо грунт для яе і там і тут быў добры. Вельмі часта гэтыя два кірункі перапляталіся паміж сабою, але часта яны і разыходзіліся, кожны ў свой бок.

Першыя весткі аб пераваропе ў цэнтры і аб утварэньні ў Пецярбурзе часовага ураду прышлі ў Менск першага сакавіка 1917 году. У гэты час на Беларусі пэўнага социялістычнага цэнтру няма. Царская рэакцыя папярэдняга часу моцна біла па соцыялістычным руху і значна падарвала яго; нацыянальная розьніца разьбіла рух на часткі, а імпэрыялістычная вайна дакончыла справу і раскідала на ўсе бакі мясцовыя соцыялістычныя сілы і сродкі. Справу ўзялі ў свае рукі інтэлігэнцкія групы лібэральнага і радыкальнага кірунку, сабраныя сюды фронтам з розных канцоў імпэрыі і згуртаваныя наўкол саюзу земстваў і гарадоў (Земгор). Яны ліквідавалі старую ўладу. Праз некалькі дзён (5 сакавіка) утвараецца Менскі Савет Рабочых Дэпутатаў, у каторы праз тры дні ўваходзяць ужо і салдацкія дэпутаты. Хутка пачынаюць зьбірацца і брацца за справу соцыялістычныя сілы. З соцыялістычных партый найбольшую сілу забіраюць агульна-расійскія партыі С-Д і С-Р, што залежыць ад прысутнасьці на Беларусі заходняга фронту арміі. Першымі пачынаюць афармліваць сваю організацыю соцыял-дэмократы. 11 сакавіка адбываецца першы многалюдны (да 200 асоб) сход С-Д організацыйнага характару. На сходзе выяўляецца, што пераважную большасьць С-Д складаюць меншавікі. Што датычыць да бальшавікоў, то яны, разам з спачувальнікамі ім, налічваюць ледзьве 13 асоб. Утвараецца аб'яднаная організацыя РС-ДРП, і бальшавікі павінны ўвайсьці ў яе склад. Усю сваю увагу яны зварачаюць на агітацыйную працу ў арміі і на організацыйную працу ў Менскім Гарадзкім Савеце. У вёску бальшавікі яшчэ не прабраліся. Сярод сялянства пачынае мець уплыў толькі што абуджаная організацыя С-Р. Сялянства, праўда, праз салдат арміі, ужо даведалася аб бальшавіках і пачынае з увагаю прыслухоўвацца да іх зусім простых і зразумелых сялянскаму сэрцу лёзунгаў. На першым сваім зьезьдзе, у красавіку, старшынёю Савету Сялянскіх Дэпутатаў яны даволі аднадушна абіраюць М. А. Міхайлава-Фрунзэ.

Пачала адраджацца і Беларуская Соцыялістычная Грамада. Зноў у розных мясцох Беларусі і Расіі (бежанцы) вынікаюць яе організацыі. Такія організацыі мы ведаем—у Менску, Віцебску, Магілёве, Бабруйску, Маскве, Пецярбурзе, Саратаве і іншых мясцох. Ідуць мітынгі (Масква, Пецярбург) і дэмонстрацыі (Пецярбург, Менск). 25 сакавіка ў Менску адбыўся зьезд Беларускай Соцыялістычнай Грамады, на каторым былі абгавораны адносіны да бягучага моманту, да рускіх і на-

цыянальных социялістычных партый, да беларускіх і рускіх грамадзянскіх організацый і г. д. Програма партыі пакуль што не разглядалася. Было ухвалена ў найбліжэйшай будучыне склікаць другі, больш сталы зьезд і на ім паставіць пытаньне аб програме. Пасьля зьезду ў Менску стаў выдавацца цэнтральны орган партыі пад назваю «Грамада». У той час, як пецярбурская і некаторыя іншыя грамадаўскія організацыі зьвязаліся з рабочымі беларускімі коламі і станавіліся паступова на выразны рэволюцыйна-клясавы грунт, менская організацыя,



Пляц Волі ў Менску.

каторая для Беларусі мела ў той час самае важнае значэньне, ня мела гэтай апоры і павінна была ўвайсьці ў зносіны з дробна-буржуазнымі нацыянальнымі беларускімі коламі і прыняць права-социялістычную ахварбоўку. Гэты факт меў вялізнае значэньне ў ходзе рэволюцыі на Беларусі.

З 25 сакавіка пачаўся ў Менску і зьезд прадстаўнікоў беларускіх організацый і партый. З розных месц сабралося каля 150 дэлегатаў. Зьезд абраў «Беларускі Нацыянальны Комітэт» у складзе 18 сяброў. Было ухвалена перадаць Комітэту роль вышэйшай краёвай установы да выбараў у Краёвую Раду. У складзе Комітэту быў адзін земляўласьнік (Скірмунт), адзін ксёндз, 14 інтэлігэнтаў і чыноўнікаў, адзін селянін і адзін рабочы. Грамадаўцаў у Комітэце было 6 асоб. Зразу-

мела, што пры такіх умовах грамадаўцы, як меншасьць, не маглі мець ніякай моцы ў Комітэце. Гэта стала яона з самага пачатку, калі старшынёю Комітэту быў абраны быўшы член Першай Дзяржаўнай Думы, вялікі беларускі земляўласьнік Раман Скірмунт.

Пад уплывам Нацыянальнага Комітэту пачынаюць засноўвацца ў розных мясцох новыя беларускія нацыянальныя організацыі самых розных політычных кірункаў. У Маскве організуецца Беларуская Народная Грамада. Яна мае звычайную на тыя часы агульна-дэмократычную програму і патрабуе аўтономіі для Беларусі. Яна гуртуе наўкол сябе прогрэсыйна-радыкальныя беларускія колы. У далёкім Туркестане вынікае організацыя беларусаў-аўтономістых, каторая складаецца з беларускіх бежанцаў-інтэлігэнтаў і стаіць за аўтономную Беларусь у складзе Расійскай Фэдэрацыйнай Рэспублікі. У Магілеве складаецца Беларускі Нацыянальны Комітэт руска-кадэцкага кірунку. У Гомлі залажыўся Саюз Беларускай Дэмократыі, які складаўся з эвакуаваных з Вільні русіфікатараў-чыноўнікаў Віленскае вучэбнае акругі; беларускасьць і дэмократызм Саюзу вельмі падазроныя. Зусім чорнасотніцкі характар насіў Саюз Беларускага Народу ў Віцебску. Апроч таго, зьявіліся Беларускія Грамады ў розных гарадох Расіі, дзе было шмат бежанцаў. Ядром іх звычайна былі бежанскія комітэты, а програма насіла агульна-дэмократычны характар. Такія Грамады былі ў Яраслаўлі, Саратаве, Пензе і другіх гарадох. Вынікалі і хрысьціянскія беларускія організацыі, як, напрыклад, Каталіцкая Хрысьціянская Дэмократычная Злучнасьць Беларусаў. Усе нацыянальныя беларускія організацыі ваража адносіліся да Беларускай Социялістычнай Грамады і вялі з ёю бязупынную полеміку ў прэсе, на мітынгах, зьездах і г. д. Амаль што ўсе яны былі зьвязаны праз сваіх прадстаўнікоў з Беларускім Нацыянальным Комітэтам у Менску.

Беларускі Нацыянальны Комітэт ставіў сваёю мэтаю культурна-нацыянальнае і політычнае адраджэньне беларускага народу Ён стаяў за ўтварэньне агульнай Расійскай Дэмократычнай Фэдэрацыйнай Рэспублікі, прычым у яе склад павінна была ўвайсьці Беларусь, як аўтономная рэспубліка. У адозьве да жыхарства Беларусі Бел. Нац. Комітэт падкрэсьлівае сваю расійскую орыентацыю. Ён піша: «Экономічнае становішча *) і тыя шырокія магчымасьці, якія адчыніліся з рэволюцыяй перад дэмократычнай Расіяй, зьвязвае нас з Расійскай Фэдэрацыйна-Дэмократычнай Рэспублікай. Комітэт лічыць патрэбным перасьцерагчы ад тых людзей, каторыя, прыкрываючыся імем беларускім, вялі-б пропаганду за далучэньне да Польшчы або да якога другога гаспадарства. Гэтакіх людзей Бел. Нац. Комітэт, паколькі

*) Стан. палажэньне.

яны выступалі-б ад яго імені, будзе лічыць за провокатараў» (Адозва Бел. Нац. Комітэту. «Вольная Беларусь», 1917 г. № 2, стар. 2). Па аграрным пытаньні Комітэт ня мае ніякай програмы, што зусім зразумела, калі прыняць пад увагу яго склад. Ён толькі вызначае, што зямельнае пытаньне на абшары ўсёй Расіі прынцыпова павінна быць выяўлена на Агульным Устаноўчым Сойме, а дэтальны разгляд гэтага пытаньня і прыстасаваньне яго да мясцовых умоў жыцьця на Беларусі павінны быць зроблены Краёваю Беларускаю Радаю.

У свой час зьезд беларускіх арганізацый і партый, утвараючы Нацыянальны Комітэт, абраў дэлегацыю ў складзе 7 асоб для зносін з Расійскім Часовым Урадам. Нацыянальны Комітэт, спадзяючыся на прыхільнасьць новага ураду Расіі да беларускага руху і выпаўняючы пастанову зьезду, арганізаваў пасылку дэлегацыі ў Пецярбург. Як дэлегаты паехалі—Скірмунт, Іваноўскі, Канчар і інш. Дэлегацыя хацела дабіцца ад рускага ураду згоды на арганізацыю краёвай улады на Беларусі, беларускай школы, права мясцовага законадаўства і г. д. З вялікай цяжкасьцю беларуская дэлегацыя дабілася прыёму ў Часовага Ураду, але аўдыенцыя не дала ніякіх вынікў. Дэлегацыя вярнулася ні з чым. Іншага і чакаць нельга было ад імпэрыялістычнага Часовага Ураду.

Прысутнасьць у Нацыянальным Комітэце земляўласьніка Скірмунта і правых элемэнтаў вельмі пашкодзіла беларускаму руху і асабліва соцыялістычнаму яго крылу. Беларускае пытаньне сталі лічыць панскай інтрыгай, пакірованай проціў сялянства і проціў зьвязку з рэволюцыйнай Расіяй. Пад падазронасьць былі ўзяты і левыя соцыялістычныя групоўкі беларусаў. З аднаго боку, беларусаў пачалі травіць гаспадары часу—меншавікі, эсэры, кадэты і правыя чорнасотніцкія элемэнты, абаронцы вялікай, адзінай, непадзельнай «матушкі»-Расіі. З другога боку, з згодніцкім беларускім рухам не маглі ісьці разам ужо заложаныя бальшавіцкія арганізацыі. Так было на першым зьезьдзе сялянскіх дэпутатаў Менскай губэрні, дзе бальшавікі прыпынілі разгляд беларускага пытаньня ў прэзыдыуме зьезду, абвясьціўшы яго нагул панскім рухам.

Адразу пасьля губэрскага зьезду Сялянскіх Дэпутатаў, Менскі Гарадзкі Савет у тым самым красавіку склікае зьезд Рабочых, Салдацкіх і Сялянскіх дэпутатаў Заходняга фронту і тылу. Пад фронтам і тылам разумелася ўся пазьнейшая так званая Заходняя Вобласьць, якая складалася з губэрань—Менскай, Магілеўскай, Віцебскай і Смаленскай. Сабраліся дэлегаты. Яны яшчэ зусім мала разьбіраюцца ў політыцы. Для іх кадэт-гэнэрал, эсэр-інтэлігэнт і бальшавіцкі прамоўца пакуль што роўныя велічыні. Згодніцкія партыі яшчэ маюць пасьпех. Зьезд выносіць усё-ж такі пастанову, каб у Выканаўчы Комітэт Заходняга фронту

і тылу ўвайшлі прадстаўнікі толькі соцыял-дэмократаў і соцыялістых-рэволюцыянэраў. Разам з соцыял-дэмократамі ў Выканаўчы Комітэт заходняга фронту праходзіць некалькі і бальшавікоў.

Паступова лік сяброў бальшавіцкай організацыі пачынае расьці. Цэнтрам іх дзейнасьці зьяўляецца Менскі Гарадзкі Савет Дэпутатаў. У сярэдзіне траўня бальшавіцкая фракцыя ў Горсавеце налічвае ўжо да 40 асоб. 21 траўня абіраецца, пакуль яшчэ нягласна, Менскі Комітэт бальшавіцкай фракцыі, каторы концэнтруе увагу організацыі на шырокім разьвіцьці агітацыі сярод салдат заходняга фронту. А тут якраз наступаюць перавыбары ў Горсавет. Травеньскія перавыбары даюць бальшавіком яшчэ больш месц у Савеце. З кожным днём усё больш адчуваецца нязгода паміж Выканаўчым Комітэтам Зах. фронту, дзе бальшавікоў вельмі мала, і Менскім Саветам, каторы, дзякуючы апошнім перавыбарам, зрабіўся гняздом бальшавікоў. Далейшае існаваньне бальшавіцкай фракцыі ў аб'яднанай С-Д організацыі робіцца непатрэбным, бо фракцыя ўжо настолькі моцная, што можа існаваць асобна ад меншавікоў. 4 чэрвеня адбываецца раскол паміж бальшавікамі і меншавікамі. Утвараецца ліквідацыйная Комісія, каторая дзеліць папалам сродкі С-Д організацыі. Абіраецца ўжо гласны комітэт бальшавіцкай партыі.

Адначасна з утварэньнем на Беларусі партыі бальшавікоў і Беларуская Соцыялістычная Грамада занялася пераглядам сваёй програмы і тактыкі. У Пецярбурзе, 4—6 чэрвеня адбыўся зьезд партыі, каторы прыняў проэкт новай програмы. Новая програма старалася прыстасавацца да ўсё лявеючага настрою мас, паднятых рэволюцыяй і, апроч таго, яна, замест народніцкіх элемэнтаў, уводзіць у сябе соцыял-дэмократычны марксыцкі зьмест. Проэкт програмы максымум быў такі: «Бел. Соц. Грамада ставіць сваёю мэтаю увядзеньне соцыялістычнага парадку цераз разьвіцьцё клясавай барацьбы і соцыяльную рэволюцыю». Проэкт програмы мінімум у політычным і экономічным аддзелах па зьместу такі самы, што і ў С-Д. Па нацыянальным пытаньні зьмест проэкту програмы такі: «Дзеля таго, што політычныя і соцыяльныя рэформы могуць удацца і ўмацавацца толькі пры магутным падняцьці культурнага роўню народных мас, Беларуская Соцыялістычная Грамада лічыць патрэбным: 1) Шырокае разьвіцьцё беларускай культуру, як адзіная дарога да разьвіцьця грамадзкасьці і агульнага падняцьця культуры мас на Беларусі. 2) Нацыяналізацыя школы. 3) Поўнае самаўпраўленьне Беларусі з законадаўчым органам, Краёваю Радаю, выбранаю на аснове агульнага, роўнага, простага, патаемнага і пропорцыянальнага выбарнага права, для мясцовага законадаўства, распрацаваньня і разьвіцьця законаў, выданых Расійскім парлямантам. 4) Адсутнасьць мытных граніц паміж Беларусьсю і іншымі часткамі

Расійскай Фэдэрацыі. 5) Поўныя політычныя і экономічныя правы для ўсіх нацый, што жывуць на Беларускай зямлі». Гэты проэкт програмы быў зацьверджан зьездам Грамады 14—25 кастрычніка ў Менску, як програма. Былі зроблены нязначныя рэдакцыйныя папраўкі.

Між тым урад Керанскага падгатаўляе чэрвенскае наступленьне на немцаў. 18 чэрвеня яно абвешчана. У Менску адбылася ў гэты дзень вулічная дэмонстрацыя. Побач з штандарамі згодніцкіх партый, што падтрымлівалі наступленьне, зьявіліся штандары, на якіх былі напісаны бальшавіцкія лёзунгі, якія патрабавалі ўстанаўленьня ўлады Саветаў, замірэньня з немцамі, рабочага контролю, безадкладнай перадачы зямлі сялянству і г. д. Вакол штандараў шмат дзе адбываліся бойкі паміж прыхільнікамі Часовага Ураду і прыхільнікамі бальшавікоў. Бальшавіцкія лёзунгі ў канцы канцоў усё-ж такі былі зьнішчаны. Контр-рэволюцыя ня дрэмле. Хутка пачынаюць формавацца ўдарныя часьці, каторыя, разам з жаноцкімі батальёнамі і рознымі чорнасотніцкімі організацыямі (саюз афіцэраў, саюз георгіеўскіх кавалераў і інш.), утвараюць трывожны настрой на Беларусі. На яе тэрыторыі, у Магілеве, хутка адбываецца карнілаўшчына, каторая політычна зусім дыскрэдытуе ўладу Керанскага. Бальшавіцкія організацыі вядуць упартую барацьбу як проціў карнілаўшчыны, так і проціў усёй контр-рэволюцыі. Згодніцкія фронтавыя комітэты і камандны склад робяць масавыя арышты салдат за іх бальшавіцкі настрой, паводзеньне і агітацыю. Арыштаваных шлюць у турмы, напр., у Менск, каторы лічыць іх тысячамі. Хутка ў Менску з'агітаваная бальшавікамі варта адмаўляецца іх сьцерагчы, і арыштаваныя, разам з сваімі варгаўнікамі, вольна ходзяць па горадзе і прымаюць удзел у бальшавіцкай агітацыі і пропагандзе. Паводле пропозыцый Горсавету яны організуюцца ў асобны полк. Цяпер палажэньне Горсавету значна паляпшаецца. У яго руках маецца збройная сіла, каторую заўсёды можна пакіраваць на сваю абарону.

Што да Беларускага Нацыянальнага Комітэту, то ён ня мае амаль што ніякага ўплыву на гэтыя падзеі. Беларускія соцыялістыя прымаюць меры, каб палажыць канец яго існаваньню і ўтварыць, замест яго, новую організацыю, больш адпавядаючую бягучаму моманту. Яны лічаць, што трэба адсунуць ад беларускага руху буржуазныя элемэнты, каторыя не адпавядаюць паглыбленьню рэволюцыі і кладуць пляму на ўвесь беларускі рух. Згодна запатрабаваньню Бел. Соц. Грамады, Нацыянальны Комітэт склікае другі зьезд прадстаўнікоў партый і організацый, каторы адбываецца 8—12 ліпеня 1917 году На зьезьдзе вынiклі бурныя спрэчкі паміж Бел. Соц. Грамадою і буржуазнаю часткаю Нацыянальнага Комітэту, аб'яднанаю наўкол утворэнай перад зьездам Беларускай Партыі Народных Соцыялістых. Зьезд

амаль што не сарваўся. Пасьля некаторых компромісаў з боку Бел. Соц. Грамады, зьезд выбірае, замест Нацыянальнага Комітэту, Цэнтральную Раду Беларускіх Організацый і Партый.

Першая сэсія Цэнтральнае Рады, якая адбылася 5-6 жніўня ў Менску, у прысутнасьці дэлегатаў ад 23 беларускіх організацый, апрацавала Статут Рады. Прыводзім тут важнейшыя пункты з Статуту. «Адпавядальным кіраўніком і прадстаўніком усяе беларускае справы ёсьць Цэнтральная Рада Беларускіх Організацый. Рада будуецца на прынцыпах: політычным—поўнага дэмократызму і соцыяльным—перадача ўсёй зямлі бяз выкупу працоўнаму народу і абарона інтарэсаў рабочых. Рада складаецца з дэпутатаў, якіх пасылаюць усе беларускія організацыі, гэтак сама гарады, валасьці, мястэчкі, бежанскія організацыі і ваенныя часьці, калі прызнаюць патрэбу аўтономіі Беларусі, роднай мовы і разьвіцьця беларускай нацыянальнай культуры». Такім способам, Цэнтральная Рада моцна розьніцца ад Нацыянальнага Комітэту сьцісла абмяжованымі прынцыпамі. Круг яе чыннасьці значна пашыраецца. Яна завязвае зносіны з вялікім лікам бежанскіх організацый і вайсковых часьцей. Для лепшай сувязі з апошнімі на той-жа самай першай сэсіі Рада прымае «Статут Беларускіх Нацыянальных культурна-прасьветных гуртkoў у войску». На аснове Статуту, у кожнай часьці вайсковыя беларусы яднаюцца ў «Грамаду» і кіруюцца ў політычнай і нацыянальнай справе пастановамі Беларускай Цэнтральнай Рады. Вайсковыя беларусы павінны стаяць проціў усякіх цэнтралістычных кірункаў з таго ці іншага боку і дбаць аб абароне інтарэсаў рэволюцыі. «Калі інтарэсам рэволюцыі і новага рэспубліканскага ладу будзе пагражаць якая небясьпека з боку контр-рэволюцыянэраў і прыслужнікаў старога самадзяржаўнага рэжыму, то беларускія гурткі і праз іх беларускія вайсковыя грамады павінны разам са ўсімі дэмократычнымі організацыямі і прыхільнікамі рэволюцыі змагацца ўсімі способамі з такімі контр-рэволюцыйнымі захадамі» (§ 5 Статуту). «Жадныя стараньні ў справе організацыі асобных беларускіх палкоў ня могуць мець месца, пакуль аб гэтым не паведаміць Цэнтральная Рада Беларускіх Організацый» (§ 10 Статуту). Як відаць з Статуту, Цэнтральная Рада добра адчувае патрэбы моманту. Яна, падобна партыі бальшавікоў, звярачае вялікую ўвагу на замацаваньне свайго ўплыву сярод збройных сіл, каторыя былі-бы для яе апораю ў будучай барацьбе. Вельмі хутка яна бярэ пад свой уплыў цэлы рад беларускіх вайсковых організацый, каторыя да гэтага часу вынiклі ў розных мясцох на паўднёвым, заходнім і паўночным франтох, у Балтыцкім флоце, Гэльсінгфорсе і г. д. Скора ўсе беларускія вайсковыя організацыі злучаюцца ў адну Цэнтр. Беларускую Вайсковую Раду, каторая трымае сьціслую сувязь з Цэнтр. Радай Беларускіх Організацый і Партый.

А бальшавіцкія сілы на Беларусі ўсё растуць і растуць. Менскі комітэт робіць крокі для іх організацыі. Ён назначае партыйную конфэрэнцыю на першае верасьня. Карнілаўскае паўстаньне было перашкодаю да конфэрэнцыі. Сабраліся прадстаўнікі далёка ня ўсіх бальшавіцкіх організацый. Тым ня менш прысутныя на конфэрэнцыі мелі за сваімі плячыма каля 2.500 організаваных членаў партыі. Замест конфэрэнцыі была зроблена толькі нарада па організацыйных пытаньнях, і прысутныя разьехаліся з тым, каб зьявіцца ў поўным ліку на конфэрэнцыю праз два тыдні. Першая Паўночна-Заходняя Абласная конфэрэнцыя партыі бальшавікоў пачалася 15 верасьня. Яна мела за сваймі плячыма больш 9.000 організаваных членаў і каля 25.000 спачувальнікаў. Гэта была вялікая рашучая сіла, гатовая на барацьбу. Конфэрэнцыя абгаварвала пытаньне аб збройным паўстаньні і абрала Паўночна-Заходні Абласны Комітэт партыі бальшавікоў.

У пачатку кастрычніка сабралася другая Абласная Конфэрэнцыя. Яна адзначыла надзвычайны рост бальшавізму. Конфэрэнцыя прадстаўляла 28.500 організаваных членаў партыі і каля 30.000 спачувальнікаў. Гэта былі ў большасьці салдаты арміі, каторыя толькі па пачуцьці былі бальшавікамі, але заўсёды былі гатовы кінуць вайну імпэрыялістычную і кінуцца ў вайну грамадзянскую.

Пачынаючы з гэтай конфэрэнцыі, шлях рэволюцыі ідзе ўжо проста да Кастрычніка.

## Вялікі Кастрычнік на Беларусі.

У муках творчасьці праходзіла социяльная рэволюцыя на Беларусі. Тут супыніўся фронт імпэрыялістычнай вайны і падзяліў Беларусь на нямецкую і расійскую частку. Тут Кастрычнік спаткаўся з узброеным старым сьветам Заходняй Эўропы. Доўга ішла барацьба і перавага была то на тэй, то на другой старане. Апроч таго, социяльная рэволюцыя на Беларусі спаткалася з нацыянальным пытаньнем. Заблутанае на працягу сотак год і разбуджанае Лютаўскай рэволюцыяй, востра стала яно на парадку дзенным і павінна было разьвязвацца ў сувязі з социяльным клясавым пытаньнем. Патрэбен быў час для таго, каб устанавіць гэтую сувязь і замяніць у нацыянальным пытаньні прынцып адзінага нацыянальнага фронту прынцыпам адзінага, рэволюцыйнага, рабоча-сялянскага фронту. Нацыянальны рух, які ў пачатку ішоў ня помеж з Кастрычнікам, павінен быў уліцца ў русло социяльнай рэволюцыі.

Тры гады ішла барацьба паміж старым і новым, каб давясьці да канца мэты Вялікага Кастрычніка на ўсходняй частцы Беларусі, бо яшчэ й цяпер Заходняя Беларусь чакае рэволюцыі. Яшчэ ня прышоў

час, каб даць гісторыю Кастрычнікавай рэволюцыі на Беларусі, тым ня менш мы адзначым важнейшыя факты.

Пачаўся Кастрычнік на Беларусі ў абставінах фронту. На чале фронту стаіць абраны яшчэ раней Фронтавы Выканаўчы Комітэт, дзе перавагу маюць згодніцкія элемэнты. Ініцыятыву социяльнай рэволюцыі бярэ ў свае рукі Менскі Гарадзкі Савет, дзе сконцэнтравалі свае сілы бальшавікі. З пачаткам Кастрычнікавай рэволюцыі ў Пецярбурзе, па ініцыятыве Мен. Гарадз. Савету, 26-га кастрычніка ўтвараецца Ваенна-Рэволюцыйны Комітэт Заходняй Вобласьці, на старану каторага паступова пераходзяць асобныя вайсковыя часьці фронту, каторы і забірае ўладу ў свае рукі.

19-га і 20-га лістапада ў Менску адбываецца тры зьезды: 1) Абласны зьезд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў; 2) Абласны зьезд сялянскіх дэпутатаў і 3) Фронтавы зьезд. Усе зьезды ухвалілі патрэбу на Беларусі Савецкай улады і зложылі адзіны Выканаўчы Комітэт Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласьці і фронту (Абліскомзап). Пэрсональны склад комітэту больш адпавядае інтарэсам фронту, чым Беларусі. Беларускія вайсковыя організацыі засталіся за межамі яго ўплыву, ён наогул не ўвабраў у сваю працу беларускага нацыянальнага руху.

Беларускі рух сконцэнтраваўся ў Менску наўкол Цэнтральнай Рады Беларускіх Організацый і Партый і Цэнтральнай Беларускай Вайсковай Рады, якая організавалася ў сярэдзіне кастрычніка. Рада стаіць на грунце адзінага нацыянальнага фронту і прагнецца сабраць наўкол сябе «ўсе жывыя сілы бацькаўшчыны».

Сярод нацыянальных беларускіх організацый вынікае думка склікаць Усебеларускі Конгрэс. Гэтай думкай зацікавілася і беларуская соц.-дэмократычная партыя бальшавікоў, якая вырасла ў Пецярбурзе з левага крыла Белар. Соцыялістычнай Грамады. Беларусы-бальшавікі хацелі скарыстаць Конгрэс для таго, каб пакіраваць рабоча-сялянскую частку яго ў бок соцыяльнай рэволюцыі. Дзеля гэтага яны павінны былі прыбыць на Конгрэс, але спазьніліся і ня мелі ўплыву на працу Конгрэсу.

Конгрэс адчыніўся ў Менску 14-га сьнежня 1917 году. Сабралося 1.872 дэлегаты, з якіх 1.167 былі з пастанаўляючымі галасамі. У большасьці сваёй Конгрэс быў сялянскім, хоць было тут і шмат рабочых, прадстаўнікоў коопэрацыі, гарадоў, соцыялістычных партый і г. д. Як відна з асноўнага пункту агульнай рэзолюцыі Конгрэсу, ён стаў на дэмократычную пляцформу. Пад націскам рабочых і пасавецку настроеных салдат і сялян ён прызнаў, праўда, як часовую, Савецкую уладу на Беларусі, абраную з яго складу, і сувязь яе ў дзелавых толькі зносінах з Савецкай Расіяй. Конгрэс як-бы хацеў знайсьці сярэдняе

месца паміж рэволюцыяй і контр-рэволюцыяй, стаўшы на пляцформу адзінага нацыянальнага фронту.

Пры такім настроі Конгрэс павінен быў быць прызнан мясцовай Савецкай уладай варожым для яе, бо ён ня прызнаў уладу абранага зьездам Саветаў Абласнога Выканаўчага Комітэту Зах. вобласьці і фронту. У ноч на 18 сьнежня ён быў сілаю распушчан камісарамі Абліскомзапу. Нацыянальны рух адарваўся ад агульнага рэволюцыйнага руху. Социяльная рэволюцыя губіць, з свайго боку, уплыў на тыя масы рабочых і сялян, якія стаялі за плячыма беларускіх нацыянальных організацый.

Распушчаны конгрэс пасьпеў абраць Раду Конгрэсу. Рада зышла ў падпольле і абвясьціла сябе сувэрэннай уладай беларускага народу. Усе другія беларускія організацыі былі ёю распушчаны, каб аб'яднаць беларускі рух у сваіх руках. Настрой на Беларусі быў напружаны. Няўдачна йшлі мірныя перагаворы ў Бярэсьці. Руская армія разыходзілася, астаўляючы граніцы Беларусі безабароннымі перад нямецкім імпэрыялізмам. Урэшце перагаворы прыпыніліся, і кайзэраўская армія пашла ў наступленьне. 19-га лютага 1918 г. Савецкая ўлада пакінула Менск. Рада Конгрэсу забрала ўладу ў свае рукі. Яна напоўніла сябе прадстаўнікамі нацыянальных меншасьцяй і выдзеліла з свайго складу выканаўчую ўладу, Народны Сакратарыят (1 Грамата Рады 21-II 1918 г.). Дзейнасьць новага ураду пачала разьвівацца з вялікай быстрынёй, але была прыпынена прыходам немцаў (25-II). Немцы захапілі ўсю уладу ў свае рукі, але спачатку яны не перашкаджалі формальнаму існаваньню ўлады Рады.

Рада ўцягнула ў свой склад прадстаўнікоў земстваў і гарадоў і Ўстаўнай Граматай (9-III) абвясьціла Беларусь Народнай Рэспублікай, у каторай заканадаўчую ўладу мела Рада, а выканаўчую—Народны Сакратарыят. Сувязь з Савецкай Расіяй фактычна парвана, але юрыдычна гэты акт яшчэ не абформлен. Юрыдычна парвала сувязь з Расіяй Віленская Беларуская Рада, якая яшчэ 18-га лютага абвясьціла аб гэтым у сваёй пастанове. Аформленьне незалежнасьці Беларускай Дзяржавы Радаю Конгрэсу адбылося ў ноч на 25-III 1918 г. (III-я Устаўная Грамата). Рада абвяшчае, што «ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца незалежнай і вольнай дзяржавай». Пасьля акту аб незалежнасьці прадстаўнікі земстваў і гарадоў вышлі з Рады, бо Рада парушыла прынцып «адзінай, недзялімай» Расіі. Ясна, што пад Расіяй яны разумелі не савецкую, а кадэцка-эсэраўскую Расію. Іх месцы былі аддадзены Беларускаму Прадстаўніцтву гор. Менску, якое складалася з менскіх домаўласьнікаў, чынавенства, духавенства, панства і г. д. Рада значна правее.

Яе не здавальняе фіктыўная незалежнасьць. Некаторыя з радных высоўваюць думку зьвярнуцца да Вільгэльма асабіста з просьбаю аб прызнаньні незалежнай Беларускай Рэспублікі. Магчыма, што да такога палітычнага акту іх хілілі літоўскія падзеі. 23-га красавіка кайзэр асобным рэскрыптам прызнаў незалежнасьць Літоўскай Рэспублікі. 25-га красавіка Рада большасьцю галасоў ухваляе паслаць тэлеграму Вільгельму. У сваёй тэлеграме Рада дзякуе кайзэра за «вызваленьне» Беларусі і просіць яго «ўмацаваць дзяржаўную незалежнасьць і недзялімасьць краю ў зьвязку з Гэрманскай імпэрыяй». Тэлеграма сьведчыць аб поўным адрыве Рады ад беларускіх працоўных мас, стагнаўшых пад цяжарам нямецкай окупацыі.

Зусім іначай пашоў беларускі рух на ўсходзе, у межах улады Саветаў. Ён сконцэнтраваўся ў Пецярбурзе каля Беларускай соцыялдэмократычнай організацыі і левага крыла Беларускай Соцыялістычнай Грамады. Тут вынікае думка аб утварэньні Незалежнай Рабоча-Сялянскай Савецкай Беларусі, якая павінна ўвайсьці ў агульна-Расійскую Савецкую Фэдэрацыю. Замест адзінага нацыянальнага фронту, тут ставіцца адзіны клясавы, рэволюцыйны фронт. У пачатку лютага 1918 году пры Наркамнацы організуецца Беларускі Нацыянальны Камісарыят, дзе працуюць беларусы-комуністыя і лева-грамадаўцы. У сакавіку Бел. Нац. Кам. пераносіць сваю працу ў Маскву і пашырае яе сярод шырокіх бежанскіх мас: скликаюцца зьезды, высылаюцца эмісары, пашыраецца літаратура ў беларускай мове і г. д. У Магілеўшчыне, Віцебшчыне і Смаленшчыне працуе Абліскомзап. К восені 1918 году тут устанаўліваецца пэўны пагляд на важнасьць правільнай пастаноўкі нацыянальнага беларускага пытаньня.

Тымчасам соцыяльная рэволюцыя пераносіцца ў Гэрманію. Падае Вільгэльм, кайзэраўская армія раскідаецца і паступова пакідае Беларусь. Чырвоная армія без вялікіх перашкод вызваляе тэрыторыю акупаванага немцамі краю. 12-га сьнежня вызваляецца сталіца Беларусі Менск. У сярэдзіне сьнежня ў Маскве зьбіраецца конфэрэнцыя беларускіх сэкцый РКП. Яе адозва, пакірованая да рабоча-сялянскіх мас Беларусі, кліча іх ісьці ня з Радаю, а з бальшавікамі. Конфэрэнцыя прызнае канечную патрэбу ствар цfolь вольную рабоча-сялянскую савецкую Беларусь у сьціслай фэдэрацыі з Савецкай Расіяй. Крыху пазьней, 26-га сьнежня 1918 году, у Смаленску сабралася VI Паўночна-Заходняя Абласная Конфэрэнцыя РКП. І тут таксама стала пытаньне аб Беларусі. Выявілася, што нацыянальнае беларускае пытаньне павінна быць разьвязана. Выходзячы з гэтае прадпасылкі і маючы на мэце далейшы пасьпех у барацьбе за Савецкую ўладу на Беларусі, Конфэрэнцыя абвясьціла, што яна стаіць за ўтварэньне незалежнай

Беларускай Савецкай Рэспублікі. Разам з тым яна абвясьціла сябе Першым Зьездам Комуністычнай партыі Беларусі (29-га, XII, 1918).

Першага студзеня 1919 году ў Смаленску адбылася ўрачыстасьць абвяшчэньня Незалежнай Савецкай Соцыялістычнай Беларускай Рэспублікі. Утворан Часовы Урад, на чале якога быў пастаўлен вядомы беларускі працаўнік З. Жылуновіч. Другога студзеня Часовы Работніцка-Сялянскі Урад Беларусі выдае маніфэст, пакіраваны да рабочых беднага сялянства і чырвонаармейцаў Беларусі. Зьмест яго такі: Вялікая Кастрычнікаўская Рэволюцыя ў Расіі вызваліла рабочых і сялян, гэтых праўдзівых гаспадароў жыцьця. Ідзе шчасная пара і для працоўных мас Беларусі, якія «паміж народамі Расіі, Літвы, Украіны і Латвіі ад сягонешняга дня становяцца вольнымі і поўнапраўнымі гаспадарамі вольнай незалежнай Беларускай Соцыялістычнай Рэспублікі. Ад гэтага дня Беларусь—Савецкая Рэспубліка—становіцца рэспублікай працоўнага народу, рабочых, сялянскай беднаты і чырвонаармейцаў Беларусі». «Уставайце ўсе на абарону яе». «Да барацьбы з чорнымі грамадамі польскіх легіянэраў». Улада окупантаў ад гэтага часу лічыцца скасованай, яе забіраюць у свае рукі Саветы. Беларуская Рада з яе народнымі міністрамі абвяшчаецца без абароны законам. Працоўныя масы ўсіх нацыянальнасьцяй карыстаюцца роўным правам. «Уся зямля памешчыкаў, манастыроў, цэркваў, касьцёлаў, духоўнікаў, з усім жывым і мёртвым багацьцем, а таксама ўсе лясы, воды і нетры зямлі становяцца дастаткамі працоўнага народу Беларусі». «Уводзіцца 8 гадзін працы ў дзень без зьверхурочных гадзін». Урад даручае Чырвонай арміі, рабочым і сялянскай беднаце Беларусі абарону заваяваньняў соцыяльнай рэволюцыі.

Крыху раней (6, XII, 1918) організуецца Літоўская Савецкая Рэспубліка. Націск з боку Польшчы, якая і Літву і Беларусь лічыла сваймі провінцыямі, вымусіў абедзьве новыя рэспублікі задумацца аб сваім палажэньні. Вынікала пытаньне аб злучэньні сіл тэй і другой рэспублікі для лепшай іх абароны. Злучэньне і адбылося 27/II 1919 году. Літва і Беларусь злучыліся ў адну Літоўска-Беларускую Савецкую Соцыялістычную Рэспубліку. У дэкларацыі было вызначана, што злучэньне рэспублік ня мае сваёю мэтаю ніякіх ваяўнічых плянаў у адносінах да суседзяў; што яно зроблена выключна для лепшай абароны праў рабоча-сялянскіх мас Літвы і Беларусі і для цьвярдзейшага ўстаўленьня злучаных гаспадарстваў. Быў абраны агульны прэзыдыум Цэнтральных Выканаўчых Комітэтаў абедзьвюх рэспублік і зацьверджана Рада Народных Камісараў.

Імпэрыялістычная вайна, а потым окупацыя зруйнавалі край. Трэба было шмат працаваць над падняцьцем народнай гаспадаркі як у галінах земляробства, так і прамысловых. Закладаюцца саўхозы ў

вялікім ліку, што вызвала, нават, нездаваленьне сялянства, якое лічыла, што панская зямля ўва ўсім яе абхваце павінна перайсьці да сялянства. Фабрыкі і заводы, спыніўшы сваю чыннасьць у папярэднія часы, пакрыху пачынаюць ажываць. Зьвернута асаблівая увага на адраджэньне скураной і дрэвавырабнай прамысловасьці. Народная асьвета пашыраецца. Першы раз на тэрыторыі Беларусі Савецкая ўлада прыступае да будоўлі школы ў шырокім маштабе на беларускай мове. Ідуць спробы ажыцьцявіць дэкрэт аб чатырох дзяржаўных мовах на Беларусі, аднэю з якіх і зьяўляецца беларуская мова. Шырыцца популярнае выдавецтва. Апрацоўваюцца пляны будучага беларускага дзяржаўнага унівэрсытэту; часова заданьні вышэйшай школы нясе Пэдагогічны Інстытут Народнае Асьветы. Вялікаю перашкодаю для працы зьяўляецца адсутнасьць комуністычных і савецкіх працаўнікоў, якія ведалі-б беларускую вёску. Дзеля гэтага вёска ня можа ўцягнуцца ў савецкае будаўніцтва маладой савецкай рэспублікі. Бракуе і працаўнікоў, ведаючых беларускую мову, што вельмі парашкаджае разьвязаньню нацыянальнага пытаньня. Апроч таго, яшчэ адчуваюцца вялікадзяржаўныя перажыткі сярод савецкіх працаўнікоў, што вызывае дробна-буржуазны нацыяналізм сярод мясцовых работнікаў-інтэлігентаў і падрывае веру да партыі і Савецкай улады ў нацыянальным пытаньні.

Далейшаму разьвітку працы ставіць перашкоды польскі імпэрыялізм. Белыя арлы белай Польшчы працягваюць свае кіпці, каб упіцца ў жывое цела рабоча-сялянскай Беларусі. Польшча, моцная капіталам Антанты і дзеючая па яе плянах і загадах, выступае проціў Вялікага Кастрычніка на Беларусі. Расія акружана з усіх бакоў; яна ня мае сілы зьвярнуць поўную увагу на заходні фронт. Адходзіць Чырвоная армія крок за крокам. Зноў наступаюць для працоўных мас Беларусі цяжкія часы окупацыі. На гэты раз, замест немцаў і Вільгэльма, зьявіліся бела-палякі з панам Пілсудзкім. Менск, сталіца Беларусі, 8-га жніўня ўжо знаходзіцца ў руках польскага гэнэрала Шэптыцкага. Польская армія дайшла да Бярэзіны. Захапіўшы Вільню, Пілсудзкі выдае 22-га красавіка вельмі цікавую адозву да насяленьня быўшага Вялікага Княства Літоўскага. Гэтая адозва ў вялікім ліку зьявілася і на вуліцах Менску праз некалькі гадзін пасьля захвату гораду окупантамі. Вось зьмест яе: Беларусь шмат гадоў ня ведае свабоды; яна ўвесь час знаходзілася пад гвалтам—расійскім, нямецкім, урэшце, бальшавіцкім, «гэткая бязупынная няволя, добра вядомая мне самому, як радзіўшамуся на гэтай нешчасьлівай зямельцы, павінна быць урэшце спынена. Польскае войска, прышоўшае на Беларусь, нясе ўсім Вам свабоду». «Хачу Вам даць магчымасьць разьвязаць унутраныя нацыянальныя і рэлігійныя справы так, як самі захочаце, без якога-небудзь гвалту або націску з боку Польшчы». На Беларусі яшчэ грымяць гарматы, але

ўлада з ваенных рук перададзена ў цывільны загад, у каторы будуць запрошаны мясцовыя людзі.

Мэты ураду такія: 1) даць магчымасьць жыхарам пагутарыць аб сваіх патрэбах праз абраных імі прадстаўнікоў; 2) памагчы каму трэба жыўнасьцю, памагчы ў працы вытвараючай, абясьпечыць лад і супакой; 3) апекавацца над усімі бяз розьніцы веры і нацыянальнасьці. Канчаецца адозва прызывамі зьвяртацца да пастаўленых улад «адкрыта і шчыра ў кожнай патрэбе і ў справах, каторыя ляжаць вам на сэрцы і цікавяць вас».

Адозва напісана ў сантымэнтальна-романтычным стылю «многаглаголівага Керанскага. Тут і «забытая богам старонка», і «нешчасьлівая зямелька», тут і «сэрца», і «шчырасьць». Але цікава тое, што ёсьць тут і «жыўнасьць». Калі ня зробіш уплыву на сэрца, то рабі яго на жывот. У адозьве гаворыцца толькі аб «унутраных» справах і нічога ня сказана аб агульнай незалежнасьці. Само сабой зразумела, што аб соцыяльных справах няма ні слова, бо разьвязваць соцыяльныя справы—гэта справа бальшавікоў, якіх так ня любіць пан Пілсудзкі; апроч таго, калі паставіць у абвестку соцыяльныя справы, тады ня можна было-б Пілсудзкаму гаварыць аб прызыве да ўлады «мясцовых людзей, сыноў гэтае зямлі», якіх бальшавікі пагналі з іх беларускіх маёнткаў; гэтыя «мясцовыя людзі» потым у самай справе былі пакліканы да ўлады, і беларускае сялянства добра памятае іх.

У канцы жніўня выдаецца абвяшчэньне № 16, якое таксама думае аб гэтых «мясцовых людзях». Там ясна, чорным па беламу, напісана так: усякая прыватная ўласнасьць, ці будзе яна гвалтоўна захоплена ці мо' прыпадкова папаўшая, павінна быць безадкладна зьвернута ўласьнікам. Уласьнікі зямельнай маемасьці альбо іх правамоцныя намесьнікі змушаюцца да 10-га верасьня прыняць у сваё ўладаньне зямельную маемасьць. Зразумела, што паны-земляўласьнікі, «сыны гэтае зямлі», пасьпяшылі выканаць гэтае прадпісаньне і пачалі забіраць свае маёнткі ад пасынкаў Беларусі, якія дзе-ні-дзе ў часы бальшавіцкай улады захапілі панскую зямлю.

Каб задаволіць нацыянальнае пытаньне, хутка пасьля захвату Менску (20-га жніўня 1919 г.) выдаецца загад № 2 аб карыстаньні беларускаю моваю. Загад абвяшчае: «Ст. I. На абшарах, занятых польскімі войскамі, урадовай мовай лічыцца мова польская. Урадовыя загады будуць выдавацца ў польскай мове побач з перакладам іх на мову беларускую. Першае месца займае аснова польскай мовы. Ст. II. У сваіх зносінах з уладай насяленьне можа ўжываць побач з польскай і мову беларускую».

Гэты загад аб мове таксама вельмі двухсмысловы. Так і няясна, што такое з формальна-юрыдычнага боку беларуская мова. Мова польская—урадовая. А беларуская?—У кожным разе не урадовая. Тым ня менш яе можна ўжываць, праўда, гэтае ўжываньне паводле тэксту загаду не забясьпечана абавязковасьцю са стараны ураду «разумець» гэтую мову.

Пры ўступленьні ў Менск Пілсудзкі выдаў яшчэ адну здозву да беларускага насяленьня. У адозьве вызначалася доўгае сужыцьцё беларускага народу з польскім народам. Гэтае сужыцьцё намалёвана ружоваю хварбаю. Адозва вызначае, што польскія войскі, заняўшыя Менск і прагнаўшыя бальшавікоў, адчынілі зноў для Беларусі магчымасьць далейшага шчасьлівага сужыцьця двух братніх народаў. Пілсудзкі заяўляе, што ён «хацеў-бы бачыць гэты край вольным паміж вольнымі народамі»; што належыць да ўзаемаадносін з Польшчаю, то Беларусь будзе гаварыць з ёю, «як роўны з роўным і вольны з вольным».

Сярод прыхільнікаў Беларускай Рады прыход белапалякаў падняў надзеі. Яны хацелі верыць яго адозвам і не прымячаць усёй няяснасьці і адмоўных бакоў гэтай адозвы. Пакрысе зьбіраюцца сябры Рады. У тагочаснай беларускай прэсе («Звон», «Беларусь») вызначаецца, што польская дэмакратыя павінна шанаваць незалежнасьць Беларусі, бо Польшча ў часы царызму на сваім карку вынесла шмат няволі; польскі і беларускі народ заклікаюцца да дружнага сужыцьця і працы.

У Менск сабралася значная частка радных. Польская захватная палітыка вельмі хутка зрабілася яснай, што адзначылася і ў беларускай прэсе, якая пачала выражаць нездаваленьне польскай палітыкай. Сярод радных утварыліся дзьве групіроўкі. Адна частка (беларускія С-Р і соцыялістыя-фэдэралістыя) лічыла, што працаваць з окупантамі няма ніякай магчымасьці, другая частка лічыла, яшчэ чакаць зьмены да лепшага ў польскай палітыцы. На гэтым грунце адбыўся 13/XII 1919 году раскол старой Рады. Анты-польская эсэраўская частка ўтварыла новую Раду і свой габінэт міністраў, каторы выехаў у белую Літву. Другая частка, назваўшы сябе Найвышэйшай Радай, яшчэ зьбіралася працаваць з окупантамі.

Як мы казалі вышэй, 8-га жніўня 1919 г. польская армія ўваходзіла ў Менск і лавінаю расшыралася па Беларусі. Армія, што й гаварыць, па надворным сваім выглядзе была вельмі бліскучая. Добрыя коні, зброя і вопратка, вялікі лік артылерыі, танкаў. За арміяй цягнуліся абозы на фурманках з запаснымі коламі і тармазамі. Вельмі часта ў абозах і артылерыі магчыма было бачыць асобую пароду коняй-цяжкавозаў з доўгімі вушамі. Фурманкі былі набіты ўсякаю «жыўнасьцю».

Буржуазія спаткала армію з захапленьнем. Зусім не такі настрой быў у пролетарскіх колах і ў колах гарадзкой і вясковай беднаты. Прышла армія на абарону фабрыкантаў, паноў, ксяндзоў і г. д., і чым больш яна была бліскучая, тым цямней было на сэрцы беднаты. У галовах бадзяліся думкі, зьвязаныя з страхам і адчаем. Здавалася, што ніколі ня хопіць сіл у пролетарыяту і сялянства, каб прагнаць гэтае бліскучае белапольскае войска.

Адразу пасьля ўваходу арміі, па гарадох, мястэчках і вёсках Беларусі пачаліся пагромы. Шукалі комуністых, білі яўрэяў, сялян, якія спачувалі саветам. Даволі было каму-небудзь з паноў ці падпанкаў паказаць на чалавека пальцам, што гэта—бальшавік, як гэты чалавек ставіўся да сьценкі. Шмат загінула народу, нават зусім непавіннага ў бальшавізьме. Дасталося коопэрацыйным і яўрэйскім крамам, якія таксама чамусь лічыліся бальшавіцкімі і аддаваліся на грабества. Па гарадох і мястэчках найбольш цярпелі яўрэйскі пролетарыят і бедната, па вёсках—батракі маёнткаў і сялянская бедната.

Вярнуліся фабрыканты і паны. І тыя і другія пачалі шукаць і забіраць сваю маентнасьць і зямлю, адабраную ў іх бальшавікамі. Пашлі ўдаваньні, вобыскі. Запоўніліся вастрогі гарадзкою і вясковай беднатою. У вастрогах для лепшага сузнаньня намечаных праступнікаў былі пушчаны ў ход жорсткія кары. Па вёсках разьехаліся «канаркі»—жандары, утварылі вясковыя «постэрункі» і, разам з зьвярнуўшымся панствам, вышуквалі тых, хто быў процiў пана. Загулялі па мужыцкіх карках шомпалы і бізун. Паны паатрымлівалі вышэйшыя пасады як у цэнтры, так і на мясцох. У паветах яны сядзелі як старасты, у валасьцёх-гмінах—як войты. Моц экономічная злучылася з уладай політычнай. Рабочыя па гарадох і сялянства па вёсках былі зусім без абароны.

Паўсюды насаджаўся зьвярыны каталіцка-польскі шовінізм. Каталік і паляк сталі сынонімамі. Беларусы-каталікі былі запісаны ў палякі, Назва «беларус» была для окупантаў пудзілам. Паны бралі пачуцьцём, што беларускі рух, як рух запрыгоненага імі сялянства, ёсьць рух у корані не нацыянальны толькі, але і соцыяльны. Па гарадох прагнуліся пры дапамозе рэлігіі і нацыі разлажыць рабоча-профэсыянальны рух. Зьявіліся каталіцка-польскія і юдэйска-яўрэйскія рабочыя саюзы. Каталіцкім саюзам даваліся ўсякія прывілеі. Нават коопэрацыю разьбівалі па рэлігійна-нацыянальных прыметах. Пашла полёнізацыя школы. Падтрымваліся ўсякімі незаконнымі сродкамі каталіцка-польскія школы. Школы рускія чыноўнага і «истинно-русского» напрамку лічыліся як магчымыя і цярпімыя. Асабліва даставалася беларускім школам. Ня выратаваліся і яўрэйскія хэдэры, хоць яны былі клерыкальнымі школамі яўрэйскіх сынагогальных вобшчын.

У вадказ на такія окупацыйныя злачынствы пачынаецца на Беларусі патаемны рух, які ў гарадох носіць амаль што выключна політычна-соцыяльны кірунак, а на вёсцы яшчэ і нацыянальна-беларускі кірунак. Найраней пачаўся рух сярод рабочых. Профсаюзы, у якіх дагэтуль меў вялікую сілу Бунд і Поалей-Цыон, ня хочуць і ня могуць ісьці за гэтымі згодніцкімі партыямі. Шырока разьвіваецца тут комуністычная праца. Бунд павінен ахварбавацца ў комуністычную хварбу. Падпольная організацыя Компартыі Літвы і Беларусі з кожным днём мае ўсё больш і больш прыхільнікаў. Вельмі хутка ад агітацыі і прапаганды партыя пераходзіць да падгатоўкі паўстаньня. Здабываецца зброя, організуецца разьведка і невялічкія аддзелы паўстанцаў.

Заварушылася і вясковая бедната. Дагэтуль яна мела слабую сувязь з комуністычным рухам. Раней сялянства на Беларусі было перакanана, што бальшавікоў на Беларусі няма, што яны выключна расійцы, правадыры іх жывуць у Маскве, а сюды толькі прыяжджаюць, каб змагацца з панамі. Окупанты-імпэрыялістыя, што праганялі Вялікі Кастрычнік з Беларусі, падтрымлівалі гэты вясковы міт аб бальшавікох.

Політыка-соцыяльны і нацыянальны уціск над вёскай прабудзілі вясковую моладзь. І сюды прышла Компартыя і Комсамол. Побач з імі, вырастае «Беларуская Комуністычная організацыя». Яна вырастае на каранёх беларускай вёскі. Складаецца яна большасьцю з сялян і вясковых настаўнікаў. Цэнтрам організацыі зьяўляецца Беларускі Пэдагогічны Інстытут у Менску; на чале організацыі хутка ўтвараецца Комітэт пад назваю Першай тройкі. Програма організацыі зусім супадае з програмаю Компартыі. Асаблівым сваім заданьнем яна ставіць абхапіць актыўныя элемэнты вёскі, выдзеліць там беднату, а з яе выбраць актыўнейшыя элемэнты ня толькі для рэволюцыйнай, але й для комуністычнай працы. Для гэтых мэт організацыя шырака карыстаецца «мужыцкай» беларускай мовай. Апроч таго, організацыя ставіць сваёю мэтаю разлажыць беларускі рух, пакіраваць яго па чырвонаму руслу соцыяльнай, клясавай рэволюцыі і ўліць у інтэрнацыянальны рух пролетарска-сялянскага вызваленьня. Ня раз падымаецца пытаньне аб злучэньні організацыі з Компартыяй Літвы і Беларусі, чаго жадае і на чым настайвае організацыя. Злучэньню перашкаджаюць падпольныя умовы існаваньня. Наступае час вялікага бою; няма часу займацца аформленьнем; яно адкладзена да лепшых часоў, якія былі недалёка.

Як рэзультат цяжкіх умоў жыцьця пад окупацыяй і працы комуністычных організацый вырастае паўстаньніцкі рух, які з асаблівай сілай выбухае вясною 1920 году. Працуюць ува ўсю партызанскія групы, працуюць адзіночкі-тэрорыстыя. Крывёю паноў і крывёю паўстаўшых мас пакрываецца змучаная Беларусь. Расстрэлы, турмы, шом-

палы і бізуны ўжо ня могуць задушыць паўстаньня рабочых і сялян Беларусі.

А тут яшчэ пачынаюцца недахваты экономічнага характару ў польскай арміі. Справа ў тым, што «жыўнасьць» у белапалякаў была не свая, а Антанты. Антанта зьменшыла порцыі жыўнасьці. Сталі падымацца цэны, стала ўніз падаць польская марка.

11 ліпеня 1920 году Чырвоная армія заняла Менск. Польская армія ўцякала ў поўным разлажэньні пры поўнай адсутнасьці дысцыпліны.

Прышоў чырвонаармеец, змучаны, галодны, часта бяз ботаў. Працоўныя масы стараліся знайсьці для яго ў хаце кавалак хлеба. Спакойна, бяз шуму, бяз гвалтаў ішоў ён за працоўныя масы і разам з працоўнымі масамі Беларусі. Ішоў ён на Варшаву.

Праз некалькі месяцаў (у кастрычніку) белапольская армія, стаўшы зноў на ногі, прагнулася яшчэ раз захапіць цалком Беларусь. Яна адарвала ад уплыву Вялікага Кастрычніка Заходнюю Беларусь, але не змагла зруйнаваць Савецкай Беларусі.

Першага жніўня была зноў абвешчана незалежная Савецкая Соцыялістычная Рэспубліка Беларусі. Па гэтым пытаньні была выдадзена дэклярацыя такога зьместу: Змучаная Беларусь пры дапамозе Чырвонай арміі завяршае справу свайго вызваленьня. Цяпер рабоча-сялянскі народ Беларусі можа выявіць сваю волю. Організаваная рабочая кляса і працоўнае сялянства Беларусі (Комуністычная Партыя Літвы і Беларусі, Беларуская Комуністычная Організацыя, Агульны Яўрэйскі Рабочы Саюз—Бунд і Цэнтральнае Бюро Профэсыянальных Саюзаў г. Менску і Менскай губэрні), грунтуючыся на волі працоўных мас, выяўленай на Першым Зьезьдзе Саветаў Беларусі ў лютым 1919 г. ў шэрагу рэзолюцый, «у поўнай згодзе з Чырвонай арміяй і Рэволюцыйным Ваенным Саветам Заходняга фронту, імем паўстаўшых рабочых і сялян абвяшчаюць незалежную Соцыялістычную Савецкую Рэспубліку Беларусі». «Яшчэ раз пацьвярджаецца, што права прыватнай уласнасьці на зямлю касуецца назаўсёды». Да склікаеньня Зьезду Саветаў уся паўната ўлады на Беларусі перадаецца Ваенна-Рэволюцыйнаму Комітэту, у які Компартыя Літвы і Беларусі дэлегуе тры прадстаўнікі, Агульны Яўрэйскі Рабочы Саюз—Бунд—аднаго прадстаўніка, Беларуская Комуністычная Організацыя—аднаго прадстаўніка.

З гэтага часу пашла праца па адбудаваньні зруйнаванага жыцьця на Беларусі на асновах Вялікага Кастрычніка. Будуецца цэнтр, які ў будучыне павінен аб'яднаць рабочых і сялян усёй этнографічнай Беларусі.

# ЗЬМЕСТ


| | Стар. |
|---|---|
| Прадмова | 3 |
| Інкорпорацыя Беларусі ў Расійскую імпэрыю | 5 |
| Апошні год XVIII сталецьця | 12 |
| Урад і яго адносіны да Беларусі ў першай чвэрці XIX сталецьця | 22 |
| Асьвета на Беларусі | 30 |
| Часы кампаніі 1812 году | 38 |
| Сялянскае пытаньне | 51 |
| Пачатак мікалаеўскай эпохі | 58 |
| Паўстаньне 1830-31 году | 64 |
| Русіфікацыя Беларусі | 71 |
| Ліквідацыя царкоўнай вуніі 1596 году | 77 |
| Беларускі рух у першай палавіне XIX сталецьця | 84 |
| Сялянскае пытаньне ў часы мікалаеўскай эпохі | 93 |
| Урад Аляксандра II (1855—1881) | 102 |
| Сялянская рэформа 1861 году | 107 |
| Паўстаньне 1863 году | 117 |
| Ліквідацыя паўстаньня | 131 |
| Русіфікацыя на Беларусі | 144 |
| Беларускі рух у 50-х, 60-х і 70-х гадох | 152 |
| Цікавасьць да Беларусі рускіх вучоных | 162 |
| Рэакцыя канца XIX сталецьця | 170 |
| Беларускі рух у канцы XIX сталецьця | 181 |
| Разьвітак рабочага руху і зубатаўшчына | 191 |
| Рэволюцыя 1905 году на Беларусі | 204 |
| Міжрэволюцыйныя часы 1905—1917 г.г. | 214 |
| Нашаніўскае адраджэнства | 225 |
| Лютаўская рэволюцыя | 233 |
| Вялікі Кастрычнік на Беларусі | 241 |



233118

281233, 336375

1 руб

ЦАНА 1 р. 30 к.

B000000402G694

Бел. 2305